А. Я. Барсук

# БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННІ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

МГПУ им. И.П.Шамякина

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя І. П. Шамякина»

А. Я. Барсук

# Беларуска-ўкраінскія ўзаемадачыненні ў Рэчы Паспалітай: гістарыяграфічная рэканструкцыя

МГПУ им. И.П.Шамякина

Мазыр
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна
2017

УДК 930(476):930(477)
ББК 63
Б26

Б26 **Барсук, А. Я.** Беларуска-ўкраінскія ўзаемадачыненні ў Рэчы Паспалітай: гістарыяграфічная рэканструкцыя / А. Я. Барсук ; пад рэд. С. Я. Рассадзіна. – Мазыр : УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2017. – 190 с. : іл. – ISBN 978-985-477-630-9.

У манаграфіі прааналізаваны працэсы фарміравання гістарычнай памяці і складвання гістарыяграфічнай традыцыі на беларускіх і ўкраінскіх землях у Рэчы Паспалітай. Прадстаўлены характарыстыкі рэлігійна-палемічных твораў XVI–XVIII стст., вызначаны асноўныя гістарыяграфічныя канцэпцыі XIX – пачатку XX ст. ваенна-палітычнага і сацыякультурнага аспектаў беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння ў Рэчы Паспалітай.

Прызначана навуковым супрацоўнікам, выкладчыкам і студэнтам гуманітарных дысцыплін, таксама усім тым, хто цікавіцца гісторыяй.

Табл. 1. іл. 46. Бібліягр. 173 назв.

Друкуецца па рашэнні
навукова-тэхнічнага савета УА МДПУ імя І. П. Шамякіна
(пратакол № 6 ад 10.11. 2017)

навукова-метадычнага савета філалагічнага факультэта
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна
(пратакол № 10 ад 17.06.2017),

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук, прафесара
Рассадзіна Сяргея Яўгеньевіча

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *С. Я. Рассадзін*,
доктар гістарычных навук, прафесар *І. А. Марзалюк*

ISBN 978-985-477-630-9

© Барсук А. Я., 2017
© УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2017

МГПУ им. И.П.Шамякина

## ЗМЕСТ

**Прадмова ........ 7**

**Раздзел 1. Гістарычныя ўмовы беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння ў XVI–XVIII стст. ........ 11**

1.1. Ваенна-палітычныя падзеі на беларуска-ўкраінскім памежжы ў XVI–XVIII стст. ........ 12
1.2. Сацыякультурныя ўзаемаўплывы на беларускіх і ўкраінскіх землях ў складзе Рэчы Паспалітай ........ 20

**Раздзел 2. Археаграфічныя крыніцы па гісторыі беларуска-украінскіх узаемадачыненняў у Рэчы Паспалітай ........ 28**

**Раздзел 3. Рэлігійна-палемічныя творы ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. як гістарыяграфічныя крыніцы беларуска-ўкраінскай супольнасці ........ 40**

3.1. Перадумовы разгортвання рэлігійнай палемікі ў XVI ст. ........ 40
3.2. Каталіцка-ўніяцкая літаратура ў Рэчы Паспалітай ў канцы XVII–XVIII стст. ........ 42
3.3. Касіян Саковіч – праваслаўны, уніят, католік і яго творы ........ 48
3.4. Пачатак антыўніяцкай палемікі ........ 56
3.5. Творчасць Мялецця Сматрыцкага: ад абаронцы праваслаўя да ўніята ........ 62
3.6. Аскетычна-нігілістычны накірунак праваслаўнай літаратуры (І. Вішанскі, А. Філіповіч) ........ 70
3.7. Пошукі кампрамісу ў праваслаўным асяродку (П. Магіла, С. Косаў, І. Трызна) ........ 77
3.8. Этнаканфесійнае вызначэнне беларусаў і ўкраінцаў у літаратуры XVI–XVII стст. ........ 90

**Раздзел 4. Фарміраванне праваслаўнай традыцыі ў гістарыяграфіі ў другой палове XVII–XVIII стст. ........ 95**

4.1. Творчасць Ф. Сафановіча ........ 96
4.2. Кіеўскі “Сінопсіс” І. Гізеля ........ 99
4.3. Казацкія летапісы як прыклад замацавання праваслаўнай традыцыі ў гістарыяграфіі ў пачатку XVIII ст. ........ 104
4.4. Г. Канiскі і яго творы ........ 111

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Раздзел 5. Гістарыяграфія XIX – пачатку XX стст. канфесійных адносін у Рэчы Паспалітай ........................................... 114**

5.1. Міжканфесійная барацьба ў расійскай гістарыяграфіі першай паловы XIX ст. ........................................................................ 114
5.2. Расійская дзяржаўная гістарыяграфічная школа (О. Турчыновіч, В. Аскачэнскі М. Каяловіч, Р. Кіпрыяновіч)........................................................................ 115
5.3. Украінская гісторыяграфія канфесійных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у Рэчы Паспалітай (канец XIX – пачатак XX ст.)................................................................ 130
5.3.1. У.Б. Антановіч ...................................................................... 130
5.3.2. А. Лявіцкі .............................................................................. 135
5.3.3. Міхаіл Грушэўскі – прадстаўнік нацыянальнай украінскай гістарыграфіі.................................................................................. 140
5.4. Беларуская нацыянальная гістарыяграфія сацыякультурных і этнапалітычных працэсаў ўзаемадзеяння ў Рэчы Паспалітай на пачатку XX ст. ................................................................ 153

**Заключэнне ............................................................................... 160**

**Бібліяграфічны спіс ................................................................... 162**

**Паказальнік гістарычных асоб ................................................... 176**

**Імянны паказальнік ................................................................... 189**

МГПУ им. И.П.Шамякина

## ОТ РЕДАКТОРА

В современной исторической науке дискуссионными являются проблемы развития национального самосознания народов Европы в XVI–XVIII вв., следствием чего становится борьба за соответствующую идентификацию, что выявило необходимость изучения процессов политического и социокультурного взаимодействия в обществе и государстве.

В Речи Посполитой борьба за национальную идентичность наиболее остро выразилась в межконфессиональном противостоянии православия, католичества и униатства, в создании белорусско-украинской православной оппозиции, обусловленной взаимодействием в рамках единой иерархической структуры и правового поля, нашла отражение в полемических произведениях конца XVI–XVIII вв. Проблематика, представленная в монографии Барсук Е.Е., является весьма актуальной, поскольку позволяет проследить процессы накопления исторических знаний на белорусских и украинских землях в XVI–XVIII вв., на основе которых формируются историографические традиции с принципиально разным пониманием сущности явлений. Таким ключевым моментом являются различные оценки конфессиональной политики в Речи Посполитой, сущности Брестской церковной унии 1596 г., ее роли и значения в историографии от резко негативных оценок православных деятелей до позитивных в работах католических и униатских авторов, разделив тем самым общество на два противоположных лагеря.

Автор не ограничилась только характеристикой историографии межконфессиональных и этнополитических взаимодействий на белорусских и украинских землях в составе Речи Посполитой, но и выявила исторические условия этого взаимодействия, определила факторы формирования историографической традиции, в первую очередь, православной.

В монографии представлена характеристика произведений религиозно-полемической литературы XVI–XVII вв. известных католических, униатских и православных авторов, поскольку полемика являлась одним из средств межконфессиональной борьбы в Речи Посполитой. По мнению автора, именно религиозная полемика стала идеологическим обоснованием формирования православной традиции в историографии. В Киево-Печерской лавре во второй половине XVII в.

МГПУ им. И.П.Шамякина

издаются известные историко-религиозные трактаты «Patericon» С. Косова, «Патерик» И. Тризны, «Синопсиса» И. Гизеля и др., определившие концепцию православной историографической традиции, которая обосновывала исторические права «русинов» на исповедание веры предков, утверждала преемственность византийских традиций Киевской митрополией, пропагандировала тезис славянского единства, духовным центром которого был Киев.

Барсук Е.Е. приходит к выводу, что однозначно отрицательные оценки Брестской греко-римской унии, распространенные в православной полемической литературе на белорусских и украинских землях, оказали огромное влияние на российскую историографию. Это нашло свое отражение в работах представителей западнорусского направления, которые стали приобретать в первой половине XIX в. законченный системный вид и характер, опирающийся на обширную документальную базу.

В современной исторической науке сохраняется тенденция различных подходов к оценке конфессиональных отношений в Речи Посполитой от православной традиции до признания культурно-просветительской деятельности католических орденов и оценки униатства как социокультурного феномена, способствующего сохранению самобытности народов. В связи с этим представленная монография "Беларуска-украінскія ўзаемадачыненні ў Рэчы Паспалітай: гістарыяграфічная рэканструкцыя" отличается научной новизной и практической значимостью.

доктор исторических наук, профессор

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Памяці майго навуковага кансультанта,*
*доктара гістарычных навук, прафесара*
*Рассадзіна Сяргея Яўгеньевіча*
*прысвячаецца*

МГПУ им. И.П.Шамякина

# ПРАДМОВА

Вывучэнне працэсаў узаемадзеяння народаў Еўропы, складвання этнічнай тэрыторыі дзяржавы і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці застаецца актуальнай задачай сучаснай гістарычнай навукі. Найбольш дыскусійнымі з'яўляюцца пытанні развіцця нацыянальнай самасвядомасці еўрапейскіх народаў ў XVI–XVIII стст., вынікам чаго стала барацьба за адпаведную ідэнтыфікацыю і неабходнасць вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны. Рэч Паспалітая ў апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст. была адной з самых моцных шматнацыянальных і поліканфесійных краін Усходняй Еўропы і перспектывы яе развіцця залежалі ад функцыянавання ўсіх структурных кампанентаў. Гістарычным прыкладам паспяховага суіснавання і ўзаемадзеяння ў складзе поліэтнічнай і поліканфесійнай дзяржавы былі беларускія і ўкраінскія землі ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай, якія на працягу стагоддзяў назапасілі вопыт эфектыўнага ўзаемадзеяння ў розных сферах жыццядзейнасці: сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, культурнай. Аднак мелі агульныя і асобныя рысы, формы і характар узаемадачыненняў.

Ва ўмовах Ранняга Новага часу рэлігія заставалася найважнейшай часткай жыцця чалавека, грамадства, дзяржавы, была інстытутам культуры і палітыкі. Яна рэгламентавала паводзіны чалавека і падданага, ахоўвала грамадскія асновы, нормы і традыцыі, вызначала накірункі развіцця мастацтва, літаратуры, адукацыі.

У час нацыятворчых працэсаў у Еўропе канфесійны фактар ператвараецца ў этнавызначальную прыкмету, уплывае на самаідэнтыфікацыю, вызначае ўнутраную і знешнюю палітыку дзяржавы. У Рэчы Паспалітай барацьба за нацыянальную ідэнтычнасць найбольш востра вызначылася ў міжканфесійным супрацьстаянні праваслаўя,

каталіцтва і ўніяцтва. Канфесійныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай абумовілі дзейнасць беларуска-ўкраінскай праваслаўнай апазіцыі ў межах адзінай царкоўнай іерархіі і права з мэтай абараніць "звычаі і веру продкаў".

Змястоўнай крыніцай па гісторыі міжканфесійнай барацьбы ў Рэчы Паспалітай у XVI–XVII стст. з'яўляюцца шматлікія творы рэлігійнай палемікі, асабліва пашыранай пасля Берасцейскага сабору 1596 г. Яны вызначалі не толькі ідэалагічныя спрэчкі і царкоўна-рэлігійныя супярэчнасці католікоў, праваслаўных і ўніятаў, але мелі сацыякультурны і этнапалітычны характар. Так, праваслаўныя брацтвы часта выкарыстоўвалі ідэю рускага адзінства для пашырэння беларуска-ўкраінскай апазіцыі з мэтай забеспячэння роўнасці праваслаўнага насельніцтва, маючы на ўвазе канфесійнае адзінства. Спробы нацыянальнай ідэнтыфікацыі насельніцтва дзяржавы знайшлі сваё адлюстраванне ва ўжыванні саманазваў у палемічнай літаратуры. Тэрміны "Русь", "рускі народ" маюць дачыненне пераважна да беларускага і ўкраінскага этнасаў, якія амаль не адрозніваюцца ад канфесіёнімаў і адначасова звязваюцца з уяўленнем пра агульнае грамадзянства ў межах Рэчы Паспалітай незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці. Зыходзячы з тэкстаў найбольш вядомых палемічных твораў, беларусы і ўкраінцы ўсведамлялі сябе праваслаўнымі "русінамі" і адначасова грамадзянамі Рэчы Паспалітай, якую лічылі сваёй дзяржавай.

Найбольш вострыя дыскусіі ў сучаснай гістарычнай навуцы выклікаюць пытанні прыняцця і пашырэння Берасцейскай царкоўна-рэлігійнай уніі 1596 г., узаемаадносін хрысціянскіх канфесій (праваслаўя, уніяцтва, каталіцтва) на беларускіх і ўкраінскіх землях у Рэчы Паспалітай, іх ролі і месца ў гісторыі і культуры Беларусі і Украіны, Польшчы і Расіі. Прынцыпова рознае разуменне сутнасці уніі, яе прычын і вынікаў, мэт канфесійнай палітыкі дзяржавы, прыхільнікаў і праціўнікаў уніяцтва, розныя культурныя традыцыі аўтараў тых ці іншых дакументаў і трактатаў абумовілі супрацьлеглыя падыходы даследчыкаў да вывучэння дадзенай праблематыкі.

Асэнсаванне гісторыка-культурнай спадчыны свайго народа з'яўляецца неад'емнай і вызначальнай часткай нацыянальнай самасвядомасці, а вывучэнне працэсаў назапашвання гістарычных ведаў, адлюстравання мінулага ў працах і фарміравання гістарыяграфічных традыцый дазваляе асвятліць мэты, разнастайнасці і супярэчлівасці, дасягненні і хібы ў захаванні гістарычнай памяці. Менавіта таму ў якасці мэты

МГПУ им. И.П.Шамякина

дадзенай працы вызначаецца гістарыяграфічная рэканструкцыя XVI – пачатку XX ст. беларуска-ўкраінскіх сацыякультурных і этнапалітычных дачыненняў у Рэчы Паспалітай. Гэта, мажліва, дазволіць вызначыць ідэалагічную і палітычную запатрабаванасць з'яўлення тых ці іншых крыніц, пашырэння пэўных уяўленняў, абгрунтавання прэтэнзій вызначанай сацыяльнай групы і, адпаведна, прааналізаваць працэс фарміравання гістарыяграфічнай традыцыі згодна з мэтамі і ўяўленнямі аўтараў.

У працы прадстаўлены агляд археаграфічных крыніц, выдадзеных у XIX–XX стст. у Расіі, Літве, Беларусі і Украіне па гісторыі канфесійных адносін, супрацьстаяння каталіцтва, уніяцтва і праваслаўя на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспалітай. Зборы дакументаў таксама з'яўляюцца гістарыяграфічнымі крыніцамі і вызначаюць розныя падыходы да вывучэння падзеі і з'явы. Значную частку гэтых крыніц складаюць творы рэлігійна-палемічнай літаратуры XVI–XVII стст., якія вызначаліся па канфесійнай прыкмеце і не абмяжоўваліся багаслоўскімі спрэчкамі і рознагалоссямі ў разуменні дагматаў і вучэнняў святых айцоў (П. Скарга, І. Пацей, І. Вельямін Руцкі, А. Сялява, К. Саковіч, М. Сматрыцкі, З. Капысценскі, А. Філіповіч, І. Вішанскі, С. Косаў і інш.).

Менавіта розніца ў разуменні сутнасці Берасцейскай царкоўна-рэлігійнай уніі 1596 г., яе мэт і сродкаў яе рэалізацыі ў творах палемістаў каталіцка-ўніяцкай і праваслаўнай плыняў абумовіла супрацьлеглыя падыходы да вывучэння міжканфесійных адносін у Рэчы Паспалітай, у тым ліку месца і ролі ўніяцтва ў грамадстве і дзяржаве. У расійскай гістарыяграфіі XIX ст. склалася праваслаўная традыцыя, заснаваная на археаграфічных крыніцах, значную частку якіх складала менавіта антыўніяцкая палеміка XVI–XVII стст. Гэтыя абставіны абумовілі выключна негатыўную ацэнку з'яўлення і пашырэння ўніяцтва ў расійскай гістарыяграфіі XIX ст. і неадназначную ацэнку ў сучаснай гістарычнай навуцы.

Праблема міжканфесійных і этнапалітычных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспалітай застаецца адной з самых дыскусійных у сучаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Аўтар манаграфіі імкнулася акрэсліць шляхі вырашэння гэтай задачы: вызначыць гістарычныя ўмовы этнапалітычнага і сацыякультурнага ўзаемадзеяння, выявіць фактары фарміравання праваслаўнай традыцыі, аргументавана адказаць на пытанне, чаму адны і тыя падзеі разглядаліся рознымі аўтарамі часта з супрацьлеглых пазіцый. Так, аўтары гістарычна-рэлігійных твораў

МГПУ им. И.П. Шамякина

другой паловы XVII ст., выдадзеных у Кіева-Пячорскай лаўры, даводзілі пераемнасць візантыйскіх традыцый Кіеўскай мітраполіяй, сцвярджалі тэзіс славянскага адзінства, духоўным цэнтрам якога быў Кіеў. Менавіта гэтыя працы заклалі падмурак праваслаўнай гістарыяграфіі, якой супрацьстаяла каталіцка-ўніяцкая традыцыя. Адпаведна склаліся розныя накірункі ў гістарыяграфіі XIX ст. па гісторыі канфесійных і этнапалітычных адносін у Рэчы Паспалітай.

Аўтар прыходзіць да высновы, што ў сярэдзіне XIX ст. вызначыліся два асноўныя падыходы да вывучэння міжканфесійных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у XVI–XVIII стст.: праваслаўны (дыскрымінацыя праваслаўных вернікаў і адмаўленне ўніяцтва) і каталіцка-ўніяцкі (асветніцкая роля манаскіх ордэнаў і ацэнка уніі як сацыякультурнага феномена). Яны знайшлі сваё ўвасабленне і ў XX ст. Аднак пануючае месца займала афіцыйная ідэалогія “заходнерусізму”.

У выданні значная ўвага надаецца аналізу прац т.зв. Кіеўскай школы (У. Антановіч, А. Левіцкі і інш.), вызначаецца роля М. Грушэўскага, В. Ластоўскага, Ус. Ігнатоўскага ў фарміраванні ўкраінскай і беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. У сучаснай гістарычнай навуцы захоўваюцца розныя падыходы да вывучэння этнапалітычных і сацыякультурных працэсаў узаемадзеяння ў часы Рэчы Паспалітай. Аўтар спадзяецца, што чытач знойдзе адказы на некаторыя складаныя пытанні грамадскіх узаемаадносін і стаўлення да іх сучаснікаў падзей і нашчадкаў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

## Раздзел 1. ГІСТАРЫЧНЫЯ ЎМОВЫ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ Ў XVI–XVIII стст.

Гістарычныя працэсы культурнага і ваенна-палітычнага ўзаемадзеяння найбольш выразна адлюстраваны на трансмежавых тэрыторыях, напрыклад, беларуска-польскага ці беларуска-ўкраінскага памежжа і г.д. Пэўныя ўзаемадачыненні ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы абумоўлены геаграфічнымі ўмовамі, тэрытарыяльна-адміністрацыйным падзелам, канфесійнай палітыкай і культурнымі сувязямі. Калі ваенныя падзеі пераважна мелі лакальнае значэнне, то канфесійныя і культурныя дачыненні набывалі больш шырокія маштабы.

Беларуска-ўкраінскае ўзаемадзеянне закранула амаль усе сферы жыццядзейнасці грамадства: сацыяльную, палітычную, культурную. Калі ваенна-палітычныя падзеі больш значна ўплывалі на памежныя тэрыторыі, то культурныя ўзаемаўплывы праяўляліся найбольш яскрава і мелі агульнадзяржаўнае значэнне, што было абумоўлена неабходнасцю абароны агульнай сацыякультурнай супольнасці і гістарычнай спадчыны. Сацыякульныя ўзаемадачынні перш за ўсё выявіліся ў міжканфесійным супрацьстаянні ў Рэчы Паспалітай, што знайшло адлюстраванне ў рэлігійнай палеміцы, якая разгарнулася ў Рэчы Паспалітай у сувязі з Рэфармацыяй, Контррэфармацыяй і пашырэннем уніяцтва. Палемічныя творы XVI–XVII стст. дазваляюць вызначыць як багаслоўскія і ідэалагічныя спрэчкі, царкоўна-рэлігійныя супярэчнасці каталікоў, пратэстантаў, праваслаўных і ўніятаў, так і акрэсліць гістарычныя ўмовы прыняцця міжканфесійнай уніі, вынікі рэалізацыі рашэнняў Берасцейскага царкоўнага Сабора, паказаць сацыяльна-палітычныя і нацыянальныя вытокі канфесійных супярэчнасцей. Дыскрымінацыя праваслаўных у Рэчы Паспалітай вызначала формы і сродкі барацьбы беларусаў і ўкраінцаў за “веру продкаў”: фарміраванне агульнай праваслаўнай апазіцыі, дзейнасць брацтваў і культурна-асветніцкая дзейнасць рэлігійных і дзяржаўных дзеячаў, рэлігійная палеміка, антыўніяцкія паўстанні і адкрытае выступленне казакоў ў абарону праваслаўя. Фарміраванне беларуска-ўкраінскай апазіцыі было абумоўлена адзінай прававой прасторай і тэрытарыяльна-адміністрацыйным падзелам, агульнай іерархічнай структурай Царквы незалежна ад канфесійнай прыналежнасці.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Яскравым прыкладам працэсаў узаемадзеяння беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння з'яўляецца Палессе. Крыніцы геаграфічна акрэсліваюць Палессе гарадамі Пінск, Оўруч, Мазыр. Гэтыя гарады ўзгадваюцца ў скарзе праваслаўнай шляхты на дыскрымінацыю свабоды веравызнання Варшаўскаму сейму 1623 г. Мялецій Сматрыцкі таксама вызначаў беларускае Палессе Мазыром і Пінскам.[1]

Да 1569 г. Мазырскі павет уваходзіў у склад Кіеўскага ваяводства, аднак у сакавіку 1569 г. пасля далучэння Кіеўшчыны да Кароны Польскай павятовая шляхта адмовілася ўваходзіць у склад Каралеўства і Мазырскі павет застаўся ў Вялікім Княстве ў складзе Мінскага ваяводства. Пінскі павет знаходзіўся ў складзе Берасцейскага ваяводства.

## 1.1. Ваенна-палітычныя падзеі на беларуска-ўкраінскім памежжы ў XVI–XVIII стст.

Ваенна-палітычныя падзеі XVII ст. на ўкраінскіх землях значна паўплывалі на памежныя тэрыторыі. Падчас казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. паўднёва-ўсходняя Беларусь апынулася ў цэнтры баявых дзеянняў сувязі з намерам украінскага гетмана Багдана Хмяльніцкага стварыць уласную дзяржаву, у межы якой планавалася ўключыць Падняпроўе і Палессе. Летам 1648 г. на Мазыршчыну быў дасланы казацкі загон палкоўніка Міхненкі, а Пінск заняты казакамі Гладкага.[2]



*Багдан Хмяльніцкі*

[1] Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и материалов: в 3 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории, Арх. упр. МВД БССР; редкол.: А. И. Азаров [и др.] – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1960. – Т. 1: С древнейших времен до середины XVII века / сост. З. Ю. Копысский. – С. 393–403; Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: изб р. произв. XVI – нач. XIX в. / АН БССР, Ин-т философии. – Минск: Изд-во АН БССР, 1962. – С. 183–184.

[2] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С середины XVII в. до конца XVIII в. – С. 42; Kotlubaj E. Zycie Januszsa Radziwilla. – Wilno i Witebsk, 1859. – S. 116–118.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Мазырскі шляхціц Піліп Казімір Абуховіч у сваім “Дыярыушы” (дзённіку) пісаў: “…Той агонь праз гультайства ад купы Хмяльніцкага запушчаны, так далёка заняўся, што паветы Старадуб, Рэчыца, Мазыр, Пінск, Берасце ды іншых замкаў нямала на Белай Русі дашчэнту знішчана.”[1]

У кастрычніку 1648 г. войскі стражніка ВКЛ Мірскага па загадзе палявога гетмана Рэчы Паспалітай Януша Радзівіла падпарадкавалі Пінск, амаль поўнасцю знішчыўшы горад. Мірскі “мещан побил больши 3000 человек и жен их и детей велел побить без милости за то, што были у них черкасы, и они, поеднався с ними, отпустили их вцеле, а как пришли жолнере, они жолнерей к себе не пустили.”[2]

У лютым 1649 г. быў узяты Мазыр. Міхненка быў захоплены ў палон і “с повеления княжеского казнен смертью отсечением головы, которая после воткнута была на замковой веже”.[3] Замак і гарадскія ўмацаванні спалены, горад на два дні аддадзены на рэквізіцыю гетману.[4]

Падзеі вайны Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай 1654–1667 гг. таксама непасрэдна закранулі Беларусь увогуле і Палессе, перш за ўсё. На думку ўкраінскага даследчыка В. Гарабца, планы далучэння паўднёва-ўсходняй Беларусі да Гетманату садзейнічалі б не толькі ўмацаванню палітычнага становішча казацкай дзяржавы, але і абяцалі эканамічныя выгоды за кошт выхаду на заходнееўрапейскія рынкі. Дзеянні казацкіх загонаў наказнога гетмана Залатарэнкі на Беларусі летам 1654 г. выклікалі новую хвалю «паказачвання» сялян. Зацікаўленасць у замацаванні казакоў у Падняпроўі і Палессі пацвярджаецца атрыманнем І. Нячаем звання беларускага палкоўніка.[5] Аб стратэгічным значэнні Палесся падчас баявых дзеянняў сведчаць шматлікія ўніверсалы караля Рэчы Паспалітай Яна Казіміра ад 9 і 24 ліпеня 1654 г., 15 верасня 1654 г., 13 ліпеня 1655 г. аб неабходнасці першаснай абароны «tractu Poleskiego» і ўвогуле Палесся ад

---

1 Dyaryusz Kazimierza Filipa Obuchowicza // Pamistniki Historyczne do wyjasnienia spraw publicznych w Polsce XVII wieku. – Wilno:Wyd. M. Balinski, 1857. – S. 20.

2 Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 3. – Спб.: Тип. Эдуарда Праца,1861. – С. 297.

3 Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. С середины XVII в. до конца XVIII в. – С. 43.

4 Pamietniki Samuela i Boguslawa Maskiewiczow (wiek XVII) / Oprac. A. Sajkowswki. – Wroclaw, 1961. – S. 263–264.

5 Україна: хронолія розвітку. – Т. 4: На порозі Нового часу. Від Люблінськoї уніі до кінця XVIII століття / рэдкал. В.А. Смолій (гал. рэд) [і інш.]. Інститут історіі Украіни НАН Украіни. – Київ:ТОВ «Кріон», 2009. – С. 435.



МГПУ им. И.П.Шамякина

ворага.[1] Зразумела, што абодва супрацьлеглыя бакі рабілі захады перацягнуць насельніцтва ў сваіх інтарэсах, напрыклад, гарантаваць недатыкальнасць асобы і былыя прывілеі.

Так, у Пінскім павеце ў красавіку 1657 г.назіраюцца актыўныя баявыя дзеянні наказнога ўкраінскага гетмана Антона Ждановіча. Ён прадпісваў сваім універсалам ад 14 мая 1657 г. усім кіраўнікам казацкіх палкоў не чыніць гвалту жыхарам Пінскага павета. А 28 мая 1657 г. гетман ВКЛ Павел Сапега выдаў універсал войскам не абцяжарваць Пінскі павет.[2] А ў чэрвені 1657 г. шляхта Пінскага павета склала прысягу вернасці Б. Хмяльніцкаму і пажадала далучыцца да яго дзяржавы. У адказ украінскі гетман абяцаў абараняць яе з "усім Войскам Запарожскім" ад ворагаў і гарантаваў свабоду веравызнання і недатыкальнасць маёмасці шляхты, касцёлаў і кляштараў.[3] Аднак ужо ў жніўні 1657 г. пінская шляхта складае маніфестацыю аб нязгодзе далучыцца да Гетманату, нягледзячы на падпісанае раней пагадненне[4].



*Януш Радзівіл*

У выніку баявых дзеянняў казацка-сялянскай вайны і вайны Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай асабліва пацярпелі Мазырскі, Пінскі і Рэчыцкі паветы. Да казацка-сялянскай вайны ў 1648 г. у Мазырскім павеце налічвалася 42208 дымоў, а ў 1667 г. пасля заключэння Андрусаўскага міру – 17288. Атрымліваецца, што страты склалі 24920 дымоў, або 59% ці больш паловы жыхароў павета, у Пінскім павеце – 186095 дымоў у 1648 г. і 106583 – у 1667 г., страты склалі 79513 дымоў, ці 42,7%.[5] Казацкія наезды на Беларусь, у першую чаргу на Палессе як памежную тэрыторыю, адбываліся і ў 70-я гг. XVII – 50-я гг. XVIII стст. Часам

МГПУ им. И.П.Шамякина

---

[1] Акты, издаваемые Виленскою коммиссiею для разбору древних актов в Вильне: в 37 т. – Т. 34: Акты, относящiеся к времени войны за Малороссiю (1654–1667). (далей АВАК). – Вильно: Русскiй Почин, Сиротская, д. 20, 1909. – С. 8, 10, 17.

[2] Тамсама. – С. 106, 108.

[3] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 441.

[4] АВАК. – Т. 34. – С. 111.

[5] История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост.: И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. – Минск: Амалфея, 2000. – С. 79.

узнікалі сялянскія хваляванні на Мазыршчыне, падмацаваныя казацкім рухам на Украіне. Так, загоны Сямёна Палія, спачатку казака Нежынскага палка, затым Запарожскай Сечы, дзейнічалі ў павеце ў канцы 1676 г. – пачатку 1677 г. Ён імкнуўся аднавіць "казацкую вольніцу" ў Правабярэжнай Украіне. У сувязі з гэтым былі выдадзены ўніверсалы каронных вялікіх гетманаў Д. Вішнявецкага ў сакавіку 1677 г. да паноў палкоўнікаў, сотнікаў і ўсіх старшынаў войска Рэчы Паспалітай Запарожскага аб забароне затрымліваццa ў Палессі, забіраць правіянт і чыніць крыўды і папярэджванні аб цяжкім пакаранні за парушэнне загаду і С. Яблонскага ад 14 мая 1677 г. аб забароне казакам урывацца ў Мазырскі павет і прычыняць крыўды насельніцтву.[1] Казацкі рух пад кіраўніцтвам С. Палія набывае значныя памеры ў 80–90-я гг. XVII ст. Даследчык гісторыі казацтва XIX ст. Воўк-Карачэўскі наступным чынам вызначае яго памеры: "Палий, яко идельный пан, войска свои охотнии по Полесью до Литовской границы разстановляюще, десятины с пасек, индукты с всякия приходы со всего Заднепра, даже до Днестра и Случина себе отбирающи".[2] Летапіс Вялічкі распавядае, што шляхта з вялікімі цяжкасцямі выбіла войскі Палія з Палесся.[3]

З сярэдзіны 80-х гг. XVII ст. у Правабярэжнай Украіне зараджаюцца з'явы, што пазней атрымалі назву гайдамацкага руху, які аказаў значны ўплыў на памежныя тэрыторыі. У. Б. Антановіч сцвярджае, што паняцце "гайдамакі" з'яўляецца ў дакументах не раней 1717 г. і першапачаткова азначала "разбойничьи отряды, появившиеся в правобережной Украине в начале XVIII столетия, и название это стало применяться к крестьянским движениям только в половине этого столетия, когда около ядра, образованного гайдамаками-грабителями, мало-помалу сгруппировались беглые или недовольные крестьяне"[4]. Этымалогію слова гайдамак даследчык выводзіць ад турэцкага гайдэ з суфіксам мак і арабскага гада, якое азначае "человека, производящего смуту, беспокоящего, гонящего или гонимого"[5]. Перадумовы складвання гайдамацтва былі абумоўлены неабходнасцю засялення спустошанай Правабярэжнай Украіны і

---

[1] Игнатенко, А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. – Минск, 1974. – С. 88.

[2] Волкъ-Карачевскій, В.В. Борьба Польши съ козачествомъ во второй половине XVII и начале XVIII века. – Киевъ: Императорскаго университета Св. Владиміра, Н.Т. Корчакъ-Новицкаго, Михайловкая ул., д. 4, 1899. – С. 296.

[3] Летопись событий Самоила Величка, издана Временною комиссией для разбора древних актов. – Киев: Иосифа Вальнера. 1888. – С. 134.

[4] Антонович, В.Б. Исследования о гайдамачестве по актам 1700–1768 гг. / Моя сповідь: Вибрані історичні та публіцистичні твори / Упор. О. Тодійчук, В. Ульяновський. Вст. ст. та коментарі В. Ульяновського. – К.: Либідь, 1995. – С. 380.

[5] Тамсама. – С. 381.



МГПУ им. И.П.Шамякина

"приповедными" лістамі караля Яна Сабескага на фарміраванне казацкіх палкоў.[1] Воўк-Карачэўскі так характарызуе гэтыя фарміраванні: "козаки сохранили свое имя, в сущности находились на службе шляхтичей Киевского воеводства... Роль этих козаков состояла в том, чтобы, нанимаясь то к тому, то к другому шляхтичу, помогали им в наездах друг на друга и вообще поддерживали шляхетские безобразия... Это ничтожное полушляхетское ополчение – все, что осталось от многочисленного и сильного когда-то козацкого войска"[2]. Савецкія даследчыкі разглядалі гайдамацтва выключна як сацыяльны пратэст і сродак барацьбы за ўз'яднанне з Расіяй.[3]

Гайдамацкі рух пашыраецца за кошт сялянства, якое сялілася на новых землях, нападала на былых аднавяскоўцаў. Так, па словах Антановіча, "поселенцы немедленно приняли участие в общем брожении края: они отправились на лодках вверх по Днепру и Припяти и ограбили несколько сел и дворов в Мозырском повете"[4]. А ў 30-я гг. XVIII ст. на ўкраінскія землі Кароны распаўсюджваецца т.зв. рух гайдамакаў Верлана, звязаны з заклікам расійскага ўраду да надворнага казацтва выступіць супраць Станіслава Ляшчынскага і хваляваннямі сялян супраць улад Рэчы Паспалітай. Менавіта сотнік Шаргародскага надворнага казацкага палка Іван Верлан заклікаў да скасавання паншчыны і надзялення сялян зямлёй.[5]



*Казацкае паўстанне*

МГПУ им. И.П. Шамякина

[1] Архив Юго-Западной России, издаваемый временною комиссиею для разбора древних актов (далее АрЮЗР). – Киев: Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1883. – Ч. 3. Т. 2. – С. 118–119.
[2] Волкъ-Карачевскій, В.В. Борьба Польши съ козачествомъ. – С. 257.
[3] История Белорусской ССР. – Мн.: Наука и техника, 1977. – С. 83; Игнатенко, А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией.
[4] АрЮЗР. – Ч. III. Т. 3: Акты о гайдамаках (1700 – 1768). – С. 36.
[5] Україна: хронологія розвітку. Т. 4. – С. 732.

У 1735 г. у гайдамацкім руху з'яўляюцца запарожскія казакі, а ў 1750 г. гайдамацкія атрады фарміруюцца пераважна ў Запарожжы, што значна ўплывае на іх баяздольнасць і арганізаванасць. Складанасць сітуацыі вызначалася таксама тымі абставінамі, што для барацьбы з гайдамакамі выкарыстоўваліся т.зв. надворныя казакі (надворная міліцыя), якіх у другой палове XVII – пачатку XVIII стст. называлі драгунамі, гайдукамі, паюкамі. Яны фарміраваліся і ўтрымліваліся за кошт сялянства староства ці заможнага землеўладальніка. Па сваім сацыяльным стане амаль не адрозніваліся ад гайдамакаў, таму былі не вельмі надзейным сродкам барацьбы і мелі магчымасць злоўжываць рэквізіцыямі.[1] Рэквізіцыямі і гвалтам не грэбавалі таксама і жолнеры кароннага войска.[2]

Гайдамацкі рух набывае значныя памеры і ўплывае на памежныя тэрыторыі. Пад уздзеяннем гайдамакаў на Жытоміршчыне адбываюцца сялянскія хваляванні ва ўладаннях віленскага капітула ў Каменецкай воласці Мазырскага павета ў 1736 г., якая непасрэдна прымыкала да Жытомірскага павету. У верасні 1754 г. – лютым 1756 г. выступленні перарастаюць ва ўзброенае паўстанне. Для разгрому бунтаўнікоў, якіх налічвалася некалькі тысяч, спатрэбіліся вайсковыя сілы колькасцю каля 400 чалавек пад камандаваннем Панятоўскага.[3]

Аб пашырэнні гайдамацкага руху на Палессі сведчыць загад гетмана польнага ВКЛ у лістападзе 1736 г. прывесці ў баявую гатоўнасць 2 татарскія харугвы Казетульскага і Ахматовіча і размясціць іх уздоўж мяжы з Украінай. У лютым 1737 г. да гэтых злучэнняў былі дасланы часці лёгкай кавалерыі, спецыяльна падрыхтаваныя для барацьбы з гайдамакамі на чале з ротмістрам татарскай харугвы Бараноўскім. Аднак татарскі полк, размешчаны ў Мазыры, быў няздольны супрацьстаяць гайдамакам. Таму ў лютым 1738 г. у горад накіроўваецца палкоўнік Неслухоўскі са сваёю харугваю. Пад яго камандаванне перадаваліся харугва маршалка ВКЛ Сангушкі, 4 харугвы Панятоўскага і войскі навагрудскага кашталяна Незабытоўскага, надворнага падскарбія Сапегі і люблінскага старосты Навасельскага. Атрымаліся даволі значныя сілы, з якімі Неслухоўскі павінен быў назіраць за дзеяннямі гайдамакаў і не дапусціць іх уварвання ў межы ВКЛ. Аднак гэтыя меры не спынілі гайдамацкага руху. У студзені,

---

1 Антонович, В.Б. Исследования о гайдамачестве по актам 1700–1768 гг. – С. 391, 421–422.
2 АрЮЗР – Ч. III. Т. 3. № LII, CLX. – С. 93; 326–329.
3 Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч.1 / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.] – Мн.: Беларусь, 1994. – 527с. – С. 257–258.



МГПУ им. И.П.Шамякина

красавіку і чэрвені 1739 г. вялікі гетман ВКЛ выдаў загады аб узмацненні аховы шляхецкіх маёнткаў, размешчаных у паўднёва-ўсходняй частцы Палесся, а ўсе харугвы павінны размясціцца ўздоўж р. Прыпяць ад Мазыра да Чарнобыля і ад Чарнобыля да Брагіна.[1] Нягледзячы на прынятыя меры, Чарнобыль пацярпеў ад наездаў гайдамакаў у кастрычніку 1747 г., Хойнікі ў верасні 1750 г.[2]

З вясны 1750 г. гайдамацкі рух узмацняецца. Універсалам ад 18 мая 1750 г. украінскі рэгіментар Антоні Ожэга папярэджвае шляхту Оўруцкага і Жытомірскага паветаў аб з'яўленні ў ваяводстве больш за 1000 гайдамакаў.[3]



*Гайдамак*

Атрады гайдамацкіх ватажкаў (правадыроў) прыбывалі з Правабярэжнай Украіны і папаўняліся за кошт мясцовага насельніцтва, незадаволенага ўціскам і складанымі ўмовамі жыцця. Па ўсёй даліне Прыпяці яны рабавалі шляхецкія маёнткі, знішчалі "кабальныя" дакументы, разбуралі касцёлы і ўніяцкія цэрквы, забівалі купцоў. Летам 1750 г. гайдамакі захапілі манастыр цыстэрцыянак у Кімбараўцы каля Мазыра, разрабавалі маёнткі Пінскіх езуітаў. Іван Падаляка са сваімі паплечнікамі некалькі месяцаў рабаваў кіеўскае, оўруцкае і мазырскае Палессе, "скрываясь днем в прибрежных камышах, ночами на лодках поднялись вверх по Днепру и Припяти."[4]

Мясцовыя ўлады і накіраваныя туды раней войскі не здолелі кантраляваць становішча і абараніць павет ад рабаўнікоў. У сакавіку 1751 г. паслы Мазырскага павета да гетмана ВКЛ М. Вішнявецкага скардзіліся на пастаянныя наезды гайдамакаў і бунты ўласных сялян і прасілі прыслаць дадатковыя ваенныя сілы.

Гетман даў згоду і накіраваў у Мазыр палкоўніка Бараноўскага з 4 харугвамі. Усяго ж у гэтым раёне знаходзілася амаль палова ўсёй кавалерыі ВКЛ. І пасля гэтага гаварыць аб утаймаванні паўстанцаў няма падстаў. Падсуддзя Мазырскага павета Я. Пржыбора 14 снежня 1755 г.

[1] Игнатенко, А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. – С. 106.
[2] АрЮЗР, Ч. III. Т. 3. № CLXXXIII, CCLXV. – С. 380; 554.
[3] АрЮЗР, Ч. III. Т. 3. № CCVIII. – С. 427.
[4] АрЮЗР, Ч. III. Т. 3. № CCLII. – С. 523–532.



МГПУ им. И.П.Шамякина

пісаў, што “показанные в реестре собственные мои подданные в гайдамаки обратились и громят мои имения”.[1]

Толькі ў 1764 г. Варшаўскі Сойм вымушаны быў прыняць спецыяльную пастанову аб узмацненні аховы Мазырскага павета ад атрадаў гайдамакаў, у якой падкрэслівалася, што “пограничный Мозырский повет не охраняется от набегов гайдамаков, неоднократно имевших место, таму мы поручаем вельможному гетману ВКЛ, чтобы он обеспечил безопасность повета при помощи постоянных войск ВКЛ.”[2]



*Гетман Войска Запарожскага Пётр Канашэвіч Сагайдачны*

Адкрытае выступленне казацтва ў абарону праваслаўных вернікаў у пачатку ХУН ст. ператварыла канфесійнае пытанне ў Рэчы Паспалітай у сродак палітычнай барацьбы і знешне-палітычны фактар. Дзякуючы падтрымцы гетмана Пятра Канашэвіча Сагайдачнага ў 1620 г. Іерусалімскі патрыярх Феафан, які меў пэўныя паўнамоцтвы ад Канстанцінопальскага патрыярха, падчас вяртання з Масквы на Бліжні Усход надаў Кіеўскаму брацтву статус стаўрапігіі і аднавіў праваслаўную іерархію на беларускіх і ўкраінскіх землях, але яе паўнамоцтвы былі значна абмежаваны, а кафедры займалі ўніяцкія епіскапы.[3] Паводле слоў Н. П. Васіленкі, казакі ахоўвалі ў Кіеве патрыярха Феафана “аки пчелы матицу свою” і яго прыезд быў запланаваны падчас візіту ў Маскву, дзе ён сустрэўся і дамовіўся аб гэтым з казацкай дэлегацыяй.[4] Ён прызначыў Кіеўскім мітрапалітам Іова Барэцкага, епіскапамі Полацкім – Мялеція Сматрыцкага, Перамышльскім – Ісаю Капінскага, Уладзімірска-

1 Игнатенко, А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. – С. 137.
2 Тамсама. – С. 141.
3 Василенко, Н.П. Очерки истории Западной Руси и Украины / Н.П. Василенко. – Киев: Изданіе книжнаго магазина Н.Я. Оглоблина, Крещатикъ, 33. – С. 75.
4 Тамсама. – С. 71.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Берасцейскім – Ізэкііла Курцэвіча-Булыгу, Холмскім – Паісія Іпалітовіча, Луцкім – Ісаю Барыскавіча, Пінскім – грэчаскага епіскапа Аўрамія, які суправаджаў Феафана.[1]

"Самачыннае" абвяшчэнне праваслаўных іерархаў (без згоды сойма і караля Рэчы Паспалітай) выклікала абурэнне з боку ўрадавых колаў, абвінавачванні Іерусалімскага патрыярха Феафана ў шпіянажы на карысць Турцыі і Масквы, што абумовіла новую хвалю рэлігійнай палемікі. У красавіку 1621 г. супраць урадавай канфесійнай палітыкі выступіў новапрызначаны мітрапаліт Кіеўскі, Галіцкі і Усея Русі Іоў Барэцкі і епіскапы Ізэкііл Курцэвіч і Ісая Капінскі з "Пратэстацыяй" на польскай мове, у якой абвінавацілі караля Жыгімонта III Вазу ў парушэнні свабоды веравызнання, уніятаў – у парушэнні згоды у дзяржаве, адвяргалі абвінавачванні ў незаконных дзеяннях праваслаўнага святарства і адначасова заклікалі да барацьбы супраць уціску з боку каталіцтва.[2] М. Сматрыцкі у сваёй працы "Верыфікацыя нявіннасці" таксама выкарыстаў "Пратэстацыю."[3] Заклікі да насельніцтва і запарожскіх казакоў абараняць "веру бацькоў" абвастралі міжканфесійныя адносіны на беларускіх і украінскіх землях.

## 1.2. Сацыякультурныя ўзаемаўплывы на беларускіх і ўкраінскіх землях ў складзе Рэчы Паспалітай

Адным са сродкаў барацьбы з наступам Контррэфармацыі на беларускіх і ўкраінскіх землях была дзейнасць праваслаўных брацтваў амаль ва ўсіх буйных гарадах і мястэчках Беларусі і Украіны. Старэйшым брацтвам было Львоўскае Успенскае, якое атрымала статус стаўрапігіі спачатку ад Антыяхійскага патрыярха Іакіма ў 1586 г. і яго пацвярджэнне ў 1588 г. ад Канстанцінопальскага патрыярха Ієраміі; затым Віленскае. Іх ролю характарызаваў даследчык гісторыі брацкага руху А. Крылоўскі як "ініцыятараў і арганізатараў рэлігійна-асветніцкіх установ."[4] Займаліся

[1] Василенко, Н.П. Очерки истории Западной Руси и Украины. – С. 75.
[2] Україна: хронологія розвітку. Т. 4. – С. 242.
[3] Смотрицкий, М. Verificatia niewinnosci // АрЮЗР. Ч. 1. Т. 7. – С. 279–344.
[4] Крыловский, А. Львовское ставропигиальное братство. Опыт церковно-историчекого исследования / А. Крыловский. – Киев: типография Императорскаго университета Св. Владиміра Акц. общ-ва печ. и издат. дела Н.Т. Корчак-Новицкого. Мерингов. ул. № 6, 1904. – 235 с. – С. 42.



МГПУ им. И.П.Шамякина

школьнай справай, мецэнацтвам, адчынялі друкарні і шпіталі, вялі актыўную рэлігійную паленіку з каталіцкімі і ўніяцкімі аўтарамі.

Львоўскае брацтва вызначалася значным уплывам на грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё, аднак школьная справа знаходзілася на больш нізкім узроўні. Так, А. Крылоўскі адзначаў: "Въ Виленской школе (1619 г.) было пять отделеній; въ Кіевской – братской (до преобразованія ея П. Могилою) – четыре. Сколько было отделеній въ Львовской – неизвестно, но едва-ли, по крайней мере, менее трехъ".[1]

Менавіта Львоўскае і Віленскае брацтвы сталі ўзорамі дзейнасці іншых брацтваў: у Бярэсці, Менску, Магілёве, Кіеве, Гарадку (на Валыні), Перамышлі, Луцку, Шклове, Полацку, Пінску, Оршы.[2]

Кіеўскае Багаяўленскае праваслаўнае брацтва і больш вядомая яго школа пры ім былі заснаваны на зямельным уладанні, падараваным Багаяўленскаму манастыру жонкай мазырскага маршалка Стэфана Лозкі Лізаветай 14 кастрычніка 1615 г.[3] Кіеўская брацкая школа была заснавана былым рэктарам Львоўскай школы Іовам Барэцкім, які пазней стаў Кіеўскім мітрапалітам. Войска Запарожскае на чале з гетманам Пятром Канашэвічам Сагайдачным у 1620 г. запісалася ў брацтва, што разглядалася як неабходны сродак абароны праваслаўя ад рэпрэсій ўладаў. Гэтая падзея занатавана ў вершах другога рэктара школы Касіяна Саковіча, надрукаваных у 1622 г. у лаўрскай друкарні.[4] На думку ўкраінскага даследчыка Я. Д. Ісаевіча, Кіеўскае брацтва мела больш магчымасцей, чым Львоўскае ці Луцкае, таму што знаходзілася пад абаронай казакоў. У 1620 г. брацтва стала стаўрапігіяльным (незалежным ад мясцовай іерархіі, падпарадкоўвалася толькі Канстанцінопальскаму патрыярху). Увогуле дзейнасць гэтай брацкай школы з'яўляецца адной з самых цікавых культурных з'яў на беларускіх і ўкраінскіх землях. Кіраўнікамі школы былі беларусы Спірыдон Собаль, Фама Іеўлевіч і інш.[5]

Спадкаемніцай Кіеўскай брацкай школы лічыцца Кіева-Магілянская калегія, навучанне ў якой давала добрую падрыхтоўку для працягу адукацыі ў лепшых еўрапейскіх універсітэтах. Першапачаткова

---

[1] Крыловский, А. Львовское ставропигиальное братство. – С. 243.

[2] Голубев, С.Т. История Киевской духовной академии. Вып. 1: Период до-Могилянский / С.Т. Голубев. – Киев: Унивеситет. тип., 1886. – С. 153.

[3] Хижняк З. І., Маньківський, В. К. Історія Києво-Могилянської академії. – К.: Вид. дім "КМ Академія", 2003. – С. 11.

[4] Українська поезія. Кінець XVI – початок XVII ст. – Київ, 1978. – С. 322–338.

[5] Ісаевич, Я. Джерела з історії української культури / Я. Ісаевич. – Київ, 1972. – С. 62–64.



МГПУ им. И.П.Шамякина

пераважнай мовай выкладання была лацінская, па формах і асноўным змесце навучання ўстанова мала адрознівалася ад каталіцкіх і пратэстанцкіх школ падобнага ўзроўню, але ў ім падтрымлівалася грэка-славянская традыцыя. Іерусалімскі патрыярх Паісій, які наведаў Кіеў у 1649 г. адзначаў, што тут дзейнічае школа "славянскай мовы", у якой ёсць "настаўнікі высокога мастацтва". Яны навучаюць набожных юнакоў "славянскай мове як уласнай і лацінскай, як неабходнай тым, што жывуць паміж лацінянамі".[1]

У верасні 1627 г. Жытомірскі соймік, скліканы Пячорскім капітулам, прызначыў архімандрытам Кіева-Пячорскай лаўры Пятра Магілу. Ён заснаваў лаўрскую школу з мэтай стварэння вышэйшай навучальнай установы, яе рэктарам і прафесам філасофіі стаў Ісая Трафімовіч-Казлоўскі, а прэфектам – Сільвестр Косаў, запрошаныя з Львоўскай школы. П. Магіла належаў да прыхільнікаў "лацінства" ці засваення плёну заходнеўрапейскай культуры, па выразе С.А. Падокшына, да дзеячаў "на мяжы культур". Яго дзейнасць і магчымая канкурэнцыя брацкай школе выклікала незадаволенасць казацтва, часткі святарства і насельніцтва Кіева[2], што належалі да нігілістычнай антызаходніцкай плыні.

Каб захаваць школу, П. Магіла 11 сакавіка 1631 г. уступіў у Кіеўскае брацтва.[3] Архімандрыт пад ціскам запарожскіх казакоў вымушаны быў пагадзіцца на аб'яднанне лаўрскай школы з брацкай і яе размяшчэнне на месцы Багаяўленскай школы. Ён прызнаваўся старшым братчыкам і пажыццёвым заступнікам школы. 17 сакавіка 1632 г. да Пятра Магілы звярнуўся казацкі гетман Іван Кулага-Перыжыцкі з усім Войскам Запарожскім з абяцаннем абараняць "цэркві, школу і шпіталь до горл сваіх".[4] У 30-я гг. XVII ст. асноўным культурна-асветніцкім цэнтрам становіцца Кіеўскі калегіум, які пазней атрымаў назву Кіева-Магілянскі. Навучанне ў ім давала добрую падрыхтоўку каб працягваць адукацыю ў лепшых універсітэтах Еўропы. У калегіуме пры Пятру Магіле была створана новая рэдакцыя Бібліі на царкоўнаславянскай мове на аснове грэчаскага кананічнага тэксту.[5]

[1] Исаевич Я. Преемники первопечатника. Москва, 1981. – С. 80.
[2] Памятники изданные Временною комиссиею для разбора древних актов. – Киев, 1846. – Т. 2. – С. 407.
[3] Памятники… – Т. 2. – С. 410–411.
[4] Украіна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 285.
[5] Исаевич, Я.Д. Преемники первопечатника / Я.Д. Исаевич. – Москва: Наука, 1981. – С. 80.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Пасля смерці П. Магілы ў сане мітрапаліта Кіеўскі Богаяўленскі манастыр і калегіум фактычна падпарадкоўваліся пераемнікам Магілы на мітрапаліцкай кафедры.

Наяўныя ў крыніцах назвы "Кіева-брацкі калегіум", "Кіева-брацкі манастыр" сталі падставай для таго, што некаторыя даследчыкі лічылі Кіеўскую школу (калегіум, акадэмію) другой паловы XVII–XVIII стст. брацкай навучальнай установай, але на самай справе назва "брацкі" традыцыйна далучалася да назвы Багаяўленскага манастыра і школы, з-за таго, што пачаткам акадэміі лічылася брацкая школа.[1] На самай справе, у гэты час брацтва ўжо не існавала, а П. Магіла заснаваў не брацкую школу, а лаўрскую і перанёс яе ў будынак Кіеўскага брацтва.



*Канстанцінопальскі патрыярх Ірамія*

Пінскае брацтва было арганізавана ў 1633 г. на узор Кіеўскага. Яно таксама карысталася правам стаўрапігіі, атрыманым ад Канстанцінопальскага патрыярха. Паводле ўласнага статута члены брацтва павінны былі рэгулярна наведваць богаслужэнні, утрымліваць прытулак для хворых і састарэлых, школу, клапаціцца аб дзецях і ўдовах памерлых братчыкаў. Казна брацтва папаўнялася за кошт унёскаў яго членаў. У склад брацтва ўваходзілі ўсе прадстаўнікі гарадскога самакіравання, значная частка пінскіх купцоў і багатых рамеснікаў, мясцовай шляхты[2].

Большасць праваслаўных брацтваў у канцы 30-х гг. XVII – пачатку XVIII стст. паступова страчвала свой уплыў. Па выразе Крылоўскага, "религіозно-просветительное значеніе умаляется и ... отъ нихъ остаются слабые, едва заметные, следы".[3]

[1] Медынский, Е.Н. Братские школы Украины и Белоруссии в XVI–XVII вв. и их роль в воссоединении Украины с Россией / Е.Н. Медынский. – Москва, 1954. – С. 102.
[2] Дзянісава, А. Манастыры Турава-Пінскай епархіі ва умовах антыўніяцкай барацьбы праваслаўнага насельніцтва ў канцы XVI–XVII ст. // БГЧ, 2012. – №2. – С. 31.
[3] Крыловский, А. Введение / Львовское ставропигиальное братство. – С. XVIII.



МГПУ им. И.П.Шамякина



*Друкарня. Гравюра А. фон Вердта*

Безвыніковасць рэлігійнага супрацьстаяння, на думку даследчыка В.У. Старасценкі, садзейнічала фарміраванню ў канцы XVI–XVII стст. "стратэгіі сацыяльна-рэлігійнага кампрамісу", заснаванай на адмове ад сілавых метадаў рашэння канфесійных спрэчак, яе выразнікамі былі Фама і Ігна Іяўлевічы, Сільвестр Косаў, Пётр Магіла і інш.[1] Аб гэтым сведчаць спробы праваслаўных іерархаў наладзіць Саборы аб аб'яднанні уніяцтва і праваслаўя. Так, у жніўні 1627 г. М. Сматрыцкі звярнуўся да Канстанцінопальскага патрыярха Кірыла Лукарыса за благаслаўленнем на прымірэнне "Русі з Руссю", праваслаўных і ўніятаў.[2] 8 верасня царкоўны Сабор у Кіеве "ўхваліў" рашэнне Сматрыцкага падрыхтаваць агульны Катэхізіс, які павінен быць узгоднены на саборы. У лістападзе 1627 г. на вальным сойме па ініцыятыве валынскага пасла Лявонція Дравінскага павятовымі пасламі, якія прадстаўлялі Кіеўскую мітраполію, абмяркоўвалася пытанне аб магчымым аб'яднанні канфесій. На Валыні, у мястэчку Гарадок, Сматрыцкі прадставіў праваслаўным іерархам – мітрапаліту І. Барэцкаму, архімандрыту Кіева-

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 3. Рэфармацыя. Контррэфармацыя, Барока / аўт. тома: В.Б. Евароўскі [і інш.]; рэдкал. тома: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск, 2013. – С. 71.

[2] Смотрицкий, М. Письмо Патриарху К. Лукарісу от 21.08.1627 г. // Кирилло-Мефодьевский сборник. – Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Пячорскаму П. Магілу, епіскапам П. Іпалітовічу і І. Барыскавічу – пералік разыходжанняў у веравызнанні.[1] Аднак у 1628 г. Кіеўскі праваслаўны сабор асудзіў працу Мялецій Сматрыцкага "Апалогія", у якой пісьменнік рэзка крытыкаваў дзейнасць праваслаўнага святарства, якое перашкаджае усталяваць канфесійны мір у дзяржаве.[2]

На Варшаўскім вальным сойме ў лютым 1629 г. праваслаўныя паслы Міхаіл Крапіўніцкі і Лявонцій Дрэвінскі і уніяцкі пасол Іосіф Яковецкі дамагліся склікання праваслаўна-ўніяцкага сабора ў Львове ў наступным годзе. Так, універсалам Жыгімонта ІІІ Вазы ў ліпені 1629 г. быў скліканы праваслаўны сабор у Кіеве і уніяцкі ва Уладзіміры з мэтай падрыхтоўкі супольнага сабора. Аднак на праваслаўным саборы прадстаўнікі Войска Запарожскага выступілі супраць аб'яднання канфесій і нават прад'явілі ультыматум Іову Барэцкаму.[3]

Няўдалая спроба дамовіцца з праваслаўнымі вызначыла неабходнасць зацвярджэння "Артыкулаў заспакаення народу грэчаскай рэлігіі" і афыцыйнага аднаўлення праваслаўнай іерархіі. У 1633 г. Уладзіслаў IV зацвердзіў на мітрапаліцкую праваслаўную кафедру Пятра Магілу. На сойме 1635 г. былі пацверджаны каралеўскія прывілеі праваслаўнай і ўніяцкай канфесіям. У складзе Кіеўскай мітраполіі уніяты атрымалі Уладзімірскую, Холмскую, Смаленскую, Пінскую і Полацкае архіепіскапства, праваслаўныя – чатыры епархіі: Львоўскую, Луцкую, Перамышльскую, Мсціслаўскую (Аршанскую і Магілёўскую), Епіскапам апошняй быў прызначаны Сільвестр Косаў.[4] У жніўні – верасні 1637 г. кароль Уладзіслаў IV па ініцыятыве Адама Аляксандра Сангушкі звярнуўся з універсаламі спачатку да ўніяцкага мітрапаліта І. Вельяміна Руцкага, затым праваслаўнага Пятра Магілы з прапановай абраць адзінага вышэйшага іерарха Кіеўскага, Галіцкага і Усея Русі. Умовы аб'яднання канфесій і стварэння адзінай аўтакефальнай царквы планавалася абмеркаваць на Вальным сойме 1637 г. Аднак перамовы былі сарваны забаронай Ватыкана абмяркоўваць пытанні дагматыкі і патрабаваннем безумоўнага падпарадкавання праваслаўных Рыму. З мэтай атрымаць згоду рымскага папы на стварэнне ўласнага патрыярхата ўніяцкі мітрапаліт

[1] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 264–267, 269.
[2] Смотрицкий, М. Апология моему странствованию на Восток. Сочинение Мелетия Смотрицкого, архиепископа полоцкого, епископа витебского и мстиславского, архимандрита виленского и дерманского // Кирилло-Мефодиевский сборник. Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1.
[3] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 275–276.
[4] Макарий. История русской церкви. – М., 1996. – Т. 6. – С. 508–510.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Рафаіл Корсак у 1640 г. знаходзіўся з візітам у Ватыкане, падчас якога памёр, не дасягнуўшы мэты.[1]

Рэлігійнае пытанне набыло небывалую вастрыню ў Рэчы Паспалітай падчас падзей 1648–1667 г., калі казацтва выкарыстоўвала праваслаўе ў якасці баявога сцяга. Мноства дакументаў, надрукаваных у шматлікіх археаграфічных зборніках, яскрава адлюстроўваюць гэты факт.[2] Дастаткова прывесці прыклады пакутніцкай смерці праваслаўнага святара, Берасцейскага ігумена Афанасія Філіповіча і ксяндза Андрэя Баболі на Піншчыне.

На думку М. Каяловіча, праваслаўе садзейнічала росту прарускіх настрояў, што ўрадавымі коламі разглядалася як пагроза дзяржаве.[3] На пачатак XVII ст. у Рэчы Паспалітай засталася адзіная праваслаўная епархія – Магілёўская (Беларуская).

Так, у выніку абвастрэння міжканфесійнай барацьбы ў Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII стст. узрасло значэнне канфесійнага фактару у сацыяльна-палітычным і культурным жыцці дзяржавы. Склалася агульная праваслаўная апазіцыя на беларускіх і ўкраінскіх землях, што было абумоўлена таксама адзінай іерархічнай структурай праваслаунай, каталіцкай і уніяцкай і адпаведна агульнымі мэтамі ў абароне ўласных інтарэсаў.

Да канца XVI ст. праваслаўныя вернікі паўднёва-ўсходняй Беларусі падпарадкоўваліся Кіеўскай мітраполіі пад юрысдыкцыяй Канстанцінопальскага патрыярха ў складзе 10 пратапопій Турава-Пінскай епархіі. Пасля заключэння Берасцейскай уніі ў 1596 г. епархія стала ўніяцкай. Турава-Пінская ўніяцкая дыяцэзія (самая малая з усіх 9 епархій) уваходзіла ў склад Кіеўскай мітраполіі і налічвала на пачатак XVIII ст. 3 дэканаты і 49 цэркваў: Мазырскі дэканат (26 цэркваў), Петрыкаўскі (12) і Тураўскі (11).[4]

Каталіцкі Мазырскі дэканат уваходзіў у склад Віленскага біскупства, Пінскі – Луцкага. У адрозненне ад Пінскага Палесся, дзе каталіцтва (францысканцы) з'явілася ў канцы XIV ст., на Мазыршчыне з’явіліся езуіты ў пачатку XVII ст.

---

[1] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 301–303.

[2] Заборовский, Л.В. Католики, православные, униаты: проблемы религии в русско-польско-украинских отношениях в 40–80-х гг. ХУН ст. Документы. Исследования. Ч. 1: Источники времен гетманства Б.М. Хмельницкого. – М., 1998; АВАК. Вильно, 1908. Т. 33; АЮЗР. СПб., 1861. – Т. 2: 1599–1637 / под ред. Н.И. Костомарова; Архив ЮЗР. – Киев, 1883. – Ч. 1. Т. 6.

[3] Коялович, М.О. Литовская церковная уния: в 2 т. – СПб., 1861. – Т. 2. – С. 218–220.

[4] Лісейчыкаў, Д.В. Уніяцкія парафіі «Тураўскай епархіі» ў XVI–XVIII стст. [Электронны рэсурс] // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Рэжым доступу: http://niab.by/stat/lisejczyk_turaw/ – Дата доступу: 07.09.2013.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Значнымі накірункамі дзейнасці беларуска-ўкраінскай праваслаўнай апазіцыі былі рэлігійная палеміка і выдавецкая дзейнасць, якой пераважна займаліся брацтвы і манастыры. Большасць твораў рэлігійна-палемічнай літаратуры XVII ст. з’яўляецца агульным беларуска-ўкраінскім здабыткам культуры. У творах Герасіма і Мялеція Сматрыцкіх, Захарыя Капысценскага, Лявонція Карповіча, Андрэя Мужылоўскага, Стэфана Зізанія, Сільвестра Косава, Афанасія Філіповіча і іншых абмяркоўваліся пытанні не толькі рэлігійна-царкоўнага, але і грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы і чалавека.[1]



*“Граматыка” Ужэвіча, 1645*

*Тытульная старонка.*

*Аррас (Францыя)*

Адной з самых цікавых старонак беларуска-ўкраінскага культурнага ўзаемадзеяння з’яўляюцца два рукапісы “Граматыкі”, напісанай у Парыжы ў 1643 г. студэнтам Сарбоны Іванам Ужэвічам, якія захоўваюцца ў Францыі. «Граматыка» была першым прыкладам граматыкі ўкраінска-беларускай літаратурнай мовы пачатку XVII ст., у якой зафіксаваны формы паўночна-заходніх украінскіх гаворак і фанетычныя адметнасці беларускай мовы. Таму даследчыкі робяць выснову, што аўтар нарадзіўся на беларуска-ўкраінскім памежжы.[2]

Такім чынам, працяглае суіснаванне беларускіх і ўкраінскіх зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай вызначала гістарычныя ўмовы ўзаемаадносін і ўзаемаўплываў амаль ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства – сацыяльнай, палітычнай, культурнай. Узаемадзеянне ў пэўнай грамадскай сферы вызначала іх формы і сродкі. Калі ваенна-палітычныя дачыненні на беларускіх і ўкраінскіх землях уплывалі больш значна на беларуска-ўкраінскае памежжа, то сацыякультурнае ўзаемадзеянне мела агульнадзяржаўнае значэнне. што было абумоўлена неабходнасцю абароны агульнай культурнай спадчыны і гістарычнай памяці.

[1] Майхровіч, С.К. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV–XVIII стст. / С.К. Майхрович. – Мінск, 1980. – С. 156.
[2] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 327.

МГПУ им. И.П. Шамякина

# Раздзел 2. АРХЕАГРАФІЧНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ УЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Вывучэнне і выданне крыніц пра рэлігійную палітыку ў Рэчы Паспалітай, узаемаадносіны хрысціянскіх канфесій, уплыў канфесійных фактараў на ўнутраную і знешнюю палітыку не толькі Рэчы Паспалітай, але і іншых краін Еўропы дазваляе вызначыць стасункі вернікаў той ці іншай канфесіі, іх кансалідацыю ў барацьбе за ўласныя інтарэсы.

Цікавасць да гісторыі Паўднёва-Заходняй і Заходняй Русі (далучаных да Расійскай дзяржавы ўкраінскіх і беларускіх зямель) не толькі расійскіх гісторыкаў вызначыла пэўныя захады да збору, сістэматызацыі і друку дакументаў яшчэ ў XIX ст. Аднымі з першых выданняў крыніц па гісторыі Беларусі і Украіны XVI–XVIII стст. стала публікацыя матэрыялаў Дзяржаўнай калегіі замежных спраў у 3 тамах (Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегии иностранных дел). Да серыйных археаграфічных публікацый, выдадзеных у Санкт-Пецярбургу, належаць "Акты, относящиеся к истории Западной России" ў 5-ці тамах (1846–1853 гг.) (далей АЗР), "Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России" ў 15 тамах (1861–1897 гг.) – далей АЮЗР.




*Акты Віленскай археаграфічнай камісіі.Тытульная старонка. Том 1.*

Дзейнасць Кіеўскай археаграфічнай камісіі, заснаванай у 1843 г., звязана з выданнем "Памятников полемической литературы в Западной Руси, изданных временной комиссией для разбора древних актов" у 3 тамах у складзе 39 тамоў "Русской исторической библиотеки, издаваемой Археографической Комиссией" у 1872–1915 гг. (далей РИБ) і "Архива Южной и Западной России" у 35 тамах (далей АрЮЗР). Цэнтрам выдання крыніц па гісторыі Рэчы Паспалітай была таксама Вільня. У выніку

МГПУ им. И.П.Шамякина

дзейнасці Віленскай археаграфічнай камісіі выйшлі “Акты, издаваемые Комиссиею, высочайше утвержденною для разбора древних актов в Вильне” (далей АВАК). “Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси”.

Выключна міжканфесійным адносінам у “Паўднёва-Заходняй Русі” у XIV–XVIII стст. прысвечаны матэрыялы I часткі (у 12 т.) “Архива Юго-Западной России”. Найбольшую цікавасць выклікаюць дакументы, выдадзеныя ў I т. збору, у які ўвайшлі акты 1481–1596 гг.

Яго складальнікам і аўтарам прадмовы быў прафесар Іванішчаў, які на падставе выдадзеных дакументаў характарызаваў крызісны стан праваслаўнай царквы, вызначаў прычыны і мэты злучэння канфесій, аналізаваў падзеі напярэдадні афіцыйнага зацвярджэння уніі, падрабязна апавядаў пра падзеі 6–9 кастрычніка 1596 г. падчас праваслаўнага і ўніяцкага Сабораў у Бярэсці. Ён зрабіў высновы, што пашырэнне уніі не прынесла жаданых вынікаў: разлікі на ўмацаванне Рэчы Паспалітай у барацьбе з Асманскай імперыяй і знішчэнне “маральнай сувязі” Паўднёва-Заходняй Русі з Маскоўскай дзяржавай не спраўдзіліся. Наадварот гэты “рэлігійны пераварот” падзяліў грамадства на два варожыя станы, пасяліў бясконцы разлад. Зацвярджэнне уніі адміністрацыйнымі сродкамі выклікала імкненне шукаць шляхі уз’яднання “з адзінаверным народам”. На думку Іванішчава, дваранства, выхаванае езуітамі, адмаўлялася ад сваёй веры і роднай мовы, таму разрывалася ўнутраная сувязь паміж арыстакратыяй і народам, заставалася толькі вонкавая сувязь, заснаваная на законах. Паўстанне Б. Хмяльніцкага ліквідавала гэту сувязь.[1]


АРХИВЪ
ЮГОЗАПАДНОЙ РОССІИ,
издаваемый
ВРЕМЕННОЮ КОММИССІЕЮ
для
РАЗБОРА ДРЕВНИХЪ АКТОВЪ,
высочайше учрежденною
при
Кіевскомъ Военномъ, Подольскомъ и Волынскомъ
ГЕНЕРАЛЪ-ГУБЕРНАТОРѢ.
ЧАСТЬ ПЕРВАЯ.
Акты, относящіеся къ исторіи православной церкви въ Югозападной Россіи.
Томъ первый.
КІЕВЪ.
Въ университетской типографіи.
1859.

*Акты Кіеўскай археаграфічнай камісіі. Тытульная старонка. Том 1.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

1 АрЮЗР. – Ч. 1: Т. 1: Акты, относящиеся к истории православной церкви в Юго-западной России. – Киев: Унив. тип., 1859. – LXXXVII, 555 с. – С. LXXXVI –

Даследчык вызначаў прычыны пашырэння уніі: заняпад праваслаўнай іерархіі ў выніку злоўжывання правам патранату і недахоп асветы.[1]

У выданні прадстаўлены некаторыя прывілеі праваслаўнаму духавенству на царкоўную пасаду і валоданне пэўнымі маёмасцямі (Пацвярджальны прывілей караля Аляксандра праваслаўнаму духавенству ад 6 сакавіка 1504 г., дараваны каралём Уладзіславам 22 сакавіка 1443 г.,[2] Прывілей Жыгімонта І князю Фёдару Чартарыйскаму на Перасопніцкі манастыр,[3] Даравальная грамата караля Стэфана Баторыя епіскапу Меглінскаму Феафану Грэку на Жыдычынскі манастыр,[4] Грамата Канстанцінопальскага патрыярха Іераміі на зацвярджэнне К. Тарлецкага патрыяршым экзархам,[5] Пацвярджальная даравальная грамата Жыгімонта ІІІ Кірылу Тарлецкаму на Луцкую і Астрожскую епархію.[6]

Значную частку дакументаў складаюць асабістыя скаргі праваслаўнага святарства на рабаўніцтва царкоўнай маёмасці, гвалт і ўціск з боку дзяржаўныхураднікаў (войтаў, старостаў і інш.) ці судовыя цяжбы. Напрыклад, Скарга Уладзімірскага духавенства на войта Міхаіла Дубніцкага пра раскраданне царкоўнай уласнасці[7]; Скарга архімандрыта Кіева-Пячорскага Нічыпара Тура пра раскраданне манастырскай маёмасці пасля смерці епіскапа Мялеція Храбтовіча[8]; Скарга архімандрыта Дарагабужскага манастыра Феафана на крыўды ад пана Ладзінскага[9] і інш., судовая справа паміж епіскапам Луцкім Кірылам Тарлецкім і старостам Луцкім Аляксандрам Сямашкам.[10]

Толькі дзве крыніцы, змешчаныя ў першым томе, маюць дачыненне да каталіцкага святарства. Гэта скарга ксяндзоў вікарыяў галоўнага Луцкага касцёла на мяшчан, якія "лаялі каталіцкае духавенства і пагражалі касцёлу" ад 4 студзеня 1584 г.[11] і скарга мяшчан луцкіх ад 25 красавіка

LXXXVII.

1 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – С. XV.
2 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 105. – С. 440.
3 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 2. – С. 3–5.
4 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 26. – С. 140–141.
5 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 60. – С. 230.
6 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 119. – С. 499–500.
7 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 57. – С. 242–243.
8 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 92. – С. 389–390.
9 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 93. – С. 391–393.
10 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 70–79. – С. 290–333.
11 АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 37. – С. 185.

МГПУ им. И.П.Шамякина

1586 г. на дзеянні ксяндза Грэгара, вікарыя галоўнага Луцкага касцёла, які ў п’яным выглядзе разам з натоўпам узброеных людзей “напаў на гарадскі рынак, збіў і параніў мяшчан, шкоды нарабіў,”[1]

Асобную каштоўнасць ўяўляюць дакументы, што маюць непасрэднае дачыненне да падзей напярэдадні і падчас Берасцейскага сабору 1596 г. Ліст Луцкага і Уладзімірскага епіскапаў К. Тарлецкага і І. Пацея ад 29 снежня 1595 г. да Львоўскага ўладыкі Гедэона Балабана падрабязна распавядае пра іх вандроўку ў Рым і цырымонію зацвярджэння царкоўнай еднасці Рымскім папам,[2] Саборны універсал праваслаўнага духавенства і шляхты пра падзеі на Берасцейскім саборы ад 9 кастрычніка 1596 г. быў складзены для павятовых соймікаў, абвяшчаў пратэст супраць зацвярджэння “Артыкулаў уніі” на ўніяцкім саборы без згоды ўсходніх патрыярхаў, прапанаваў не прызнаваць юрысдыкцыю мітрапаліта і епіскапаў-уніятаў як пазбаўленых духоўнага сану за парушэнне канонаў веры і самавольны пераход у унію, абавязваў абараняць веру праваслаўную.[3] Інструкцыя дэпутатам, накіраваным да караля 9 кастрычніка 1596 г., складзеная праваслаўным Берасцейскім саборам, удакладняе звесткі вышэйзгаданых крыніц.[4]

Частка дакументаў па гісторыі праваслаўнай царквы (Акты о церковно-религиозных отношениях) да часоў вайны пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага (1322–1648 гг.) у Паўднёва-Заходняй Русі былі выдадзены пад рэдакцый Арэста Лявіцкага ў першай частцы, 6 томе археаграфічнага збора, што выдаваўся ў Кіеве (АрЮЗР).[5] Гісторыі праваслаўя на беларускіх і ўкраінскіх землях у другой палове XVII ст.–канцы XVIII ст. прысвечаны 4 том першай часткі “Архива Юго-Западной России” пад рэдакцыяй У.Б. Антановіча.[6]

Значная колькасць матэрыялаў па гісторыі з’яўлення і зацвярджэння ўніяцтва, якія дазваляюць больш дакладна ўявіць працэсы пашырэння уніі ў Рэчы Паспалітай, змешчана ў IV т. “Актов, относящихся к истории Западной России”, прысвечанага падзеям 1588–1632 гг. Граматы Канстанцінопальскага патрыярха Іераміі, змешчаныя ў IV т., (Адлучэнне

[1] АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 48. – С. 217–218.
[2] АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 116. – С. 482–485.
[3] АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 123. – С. 518–532.
[4] АрЮЗР. Ч. 1: Т. 1. – № 122. – С. 509–517.
[5] АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 6: Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-Западной Руси (1322–1648).
[6] АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 4: Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-Западной Руси (1648–1798). – 938 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Львоўскага епіскапа Г. Балабана, калі ён не памірыцца з епіскапам Мігленскім і не верне яму Жыдычынскі манастыр; Звяржэнне сана святароў "дваяжонцаў і траяжонцаў"; Пасвячэнне Луцкага епіскапа К. Тарлецкага ў сан экзарха Кіеўскай мітраполіі, акрэсліваюць характар узаемаадносін паміж праваслаўнымі іерархамі і патрыярхатам у 1588–1590 гг., які страціў аўтарытэт і ўплыў з-за падпарадкавання яго Асманам.[1] Патрыярхат умешваўся ва ўнутраныя справы Кіеўскай мітраполіі, чым выклікаў незадаволенасць літоўска-рускіх епіскапаў.



*Кірыл Тарлецкі*

Стан праваслаўнай царквы характарызуецца ў Лісце Канстанціна Астрожскага ад 21 чэрвеня 1593 г. да І. Пацея.[2] Крыніца дазваляе вызначыць пункт гледжання князя Астрожскага да ідэі царкоўнай еднасці. Адмоўнае стаўленне "стаўпа праваслаўя" да уніі назіраецца ў Лістах І. Пацея да князя ад 25 сакавіка і 16 чэрвеня 1595 г.,[3] Звароце ("Окружной грамоте") Астрожскага да духавенства і жыхароў Каралеўства і Княства абараняць праваслаўную веру ад 24 чэрвеня 1595 г.,[4] Грамаце Жыгімонта III князю з мэтай пераканаць яго далучыцца да ўніі.[5] Апазіцыя К. Астрожскага і яго зварот за падтрымкай да патрыяршага пратасінкела (кіраўніка спраў) Нічыпара, які меў значны аўтарытэт ў праваслаўным асяроддзі, выклікала заклапочанасць кіруючых колаў Рэчы Паспалітай. Пра гэтыя абставіны сведчыць "Следчыцкая" справа экзарха Нічыпара ад 1 сакавіка 1597 г.[6]

Умовы аб'яднання канфесій, ці "Артыкулы уніі" (Пункты) выкладзены ў Саборнай грамаце Кіеўскага мітрапаліта і епіскапаў пра жаданне падпарадкавацца Рымскаму папу ад 2 снежня 1594 г., Наказе

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Акты, относящіеся к исторіи Западной Россіи, собр. и изд. археогр. Комиссіею: в 5 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1846–1853. – Т. 4: 1588–1632. – 1851. – № 5. – С. 6; № 17. – С. 21; № 21. – С. 28–29.
[2] АЗР. – Т. 4. – № 45. – С. 65–66.
[3] АЗР. – Т. 4. – № 63. – С. 88–90; № 70. – С. 91–99.
[4] АЗР. – Т. 4. – № 71. – С. 99–104.
[5] АЗР. – Т. 4. – № 76. – С. 106–108.
[6] АЗР. – Т. 4. – № 117. – С. 162.

епіскапаў паслу, накіраванаму да караля, “Дзеяннях” Львоўскага Сабора 28 студзеня 1595 г., Саборнай грамаце, накіраванай папу Кліменту VIII ад 12 чэрвеня 1595 г.[1] Афіцыйны Акт уніі, абвешчаны на Берасцейскім саборы (уніяцкім), знайшоў адлюстраванне ў Саборнай грамаце Кіеўскага мітрапаліта М. Рагазы і епіскапаў ад 8 кастрычніка 1596 г.[2]

Падзеі, якія адбыліся ў Бярэсці 6–9 кастрычніка 1596 г., адбіліся ў наступных крыніцах: “Вестовые отписки” невядомых асоб пра падзеі на Берасцейскім саборы ад 8–9 кастрычніка 1596 г.;[3] Ліст М. Рагозы да Навагрудскага ваяводы Ф. Скуміна пра падзеі на Берасцейскім саборы;[4] “Перестрога”, палемічны твор пра пачатак і распаўсюджанне уніі, дзеянні яе прыхільнікаў, складзены нейкім львоўскім святаром, што быў на Берасцейскім саборы ў перасцярогу праваслаўным.[5] Дакументы даводзяць, што фактычна ў Бярэсці адбылося два Саборы: уніяцкі і праваслаўны. Пастановы кожнага з іх не прызнаў супрацьлеглы бок і адпаведна пазбавіў сану прыхільнікаў ці праціўнікаў уніі (Саборная грамата праваслаўных духоўных улад пра пазбаўленне сану мітрапаліта і епіскапаў за прыняцце ўніі ад 8 кастрычніка 1596 г.; Саборныя граматы пра пазбаўленне сану епіскапаў Г. Балабана, М. Капысценскага, архімандрыта Нічыпара Тура, ад 9 кастрычніка 1596 г.[6]

Большасць палемічных твораў, што датычыліся прапаганды ідэй царкоўнага адзінства і іх рэалізацыі ў выніку ажыццяўлення рашэнняў Берасцейскага сабора, таксама былі выдадзены ў розных археаграфічных зборах XIX ст. Шырока вядомы твор Пятра Скаргі “Аб адзінстве Царквы Божай” (1577 г., другое выданне 1590 г.), аб’ёмісты і грунтоўны (303 калонкі), у якім даволі пераканаўча выкладалася тэалагічнае, грамадска-палітычнае і культурнае абгрунтаванне царкоўнай уніі, быў выдадзены на польскай мове ў шматтомным археаграфічным зборы “Русская историческая библиотека” ў складзе “Памятников полемической литературы в Западной Руси” (1882 г.).[7] Тамсама (кніга 2) выдаецца яго праца “Берасцейскі сінод і абарона Берасцейскага сіноду” (1597 г.)

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] АЗР. – Т. 4. – № 53. – С. 77–78; № 55. – С. 79–81; №58. – С. 8485; № 68. – С. 94–95.
[2] АЗР. – Т. 4. – № 103. – С. 139–141.
[3] АЗР. – Т. 4. – № 106. – С. 144–149.
[4] АЗР. – Т. 4. – № 110. – С. 149–151.
[5] АЗР. – Т. 4. – № 149. – С. 203–236.
[6] АЗР. – Т. 4. – № 104. – С. 142; № 107–109. – С. 146–149.
[7] Скарга, П. О единстве церкви / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А.М. Котомина, 1882. – Кн. 2. – Стб. 223–526. – РИБ.– Т. 7.

на польскай мове і ў перакладзе І. Пацея на “рускую мову”[1] і ў супрацьвагу іх творам побач друкуецца палемічны твор пратэстанцкага аўтара, які выступіў на баку праваслаўных пад псеўданімам Хрыстафор Філалет (Праўдалюбец) “Апокрисис, албо отповедь на книжкы о съборе Берестейском”, які па аб’ёму перавышае працу Скаргі “Аб адзінстве…” амаль у 3 разы (817 слупкоў).[2] Тамсама (кніга 3 “Помнікаў палемічнай літаратуры”) надрукаваны “Антырызіс” (Антиризис или Апологіа против Христофора Филалета), напісаны Іпаціем Пацеем у адказ на “Апокрысіс” у дасціпнай і іранічнай манеры.[3]




*Канстанцін Астрожскі*

Да выдання былі далучаны ліст уніяцкага епіскапа да князя Канстанціна Астрожскага ад 3 чэрвеня 1598 г. і адказ Пацея клірыку Астрожскаму (Лист Ипатіа Потея к князю Острожскому[4]. Отпис на лист неякога Клирика Острожского безъименного).[5]

Погляды І. Пацея аб неабходнасці міжканфесійнай уніі выкладзены ў яго працах “Гармония альбо согласие веры, сакраментов и церемоней святое Восточное церкви с костелом Рымским”, “Уния греков с Костелом Римским 1595 г.”, “Духовное завещание. Апология унии. 19 ноября 1609 г.”[6] Сярод паплечнікаў І. Пацея вызначаліся І. Вельямін Руцкі, А. Сялява. Іх працы як

[1] Скарга, П. Берестейский собор и оборона его / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А.М. Котомина, 1882. – Т. 7. – Кн. 2. – Стб. 939–1002. – РИБ; Т. 19. – Кн. 3. – Стб. 183–328. – РИБ. – СПб.: Тип. А. М. Котомина, 1903.

[2] Филалет, Х. Апокрисис албо отповедь на книжкы о соборе Берестейском / Х. Филалет // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 1003–1820. – Русская историческая библиотека. – Т. 7.

[3] Потей, И. Антиризис или Апология против Христофора Филалета / И. Потей // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – РИБ. – Т. 19.– Стб. 477–982.

[4] Тамсама. – Кн. 3. – Стб. 983–1040.

[5] Тамсама. – Кн. 3. – Стб. 1041–1122.

[6] Потей, И. Гармония альбо согласие веры, сакраментов и церемоней святое Восточное церкви с костелом Рымским // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 169–222; Потей, И. Уния греков с Костелом Римским 1595 г. // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 111–168; Потей, И. Духовное

МГПУ им. И.П.Шамякина

прыхільнікаў царкоўнай еднасці таксама былі выдадзены збіральнікамі старажытных актаў па гісторыі Паўднёва-Заходняй і Заходняй Расіі.[1]

У межах працы археаграфічных камісій у Кіеве і Санкт-Пецярбургу выдаваліся палемічныя творы вядомых праваслаўных дзеячаў. У першую чаргу, гэта літаратурная спадчына Мялеція Сматрыцкага.[2] Творы славутага царкоўнага дзеяча пасля яго пераходу ва ўніяцтва не выдаваліся ў Расіі, а ў гістарыяграфіі пашырылася думка аб здрадзе “веры продкаў”. Шырокую вядомасць атрымалі творы З. Капысценскага, П. Магілы, А. Філіповіча як абаронцаў праваслаўя[3] і інш.

На жаль, у археаграфічных выданнях і гістарыяграфіі XIX ст. прозвішча К. Саковіча, неардынарнарнай асобы свайго часу, узгадваецца ў сувязі з пашырэннем яго з’едлівай палемікі супраць і праваслаўных, і ўніятаў, падрыхтоўкай у Кіева-Магілянскім асяродку і выданнем трактата “Ліфас”, накіраванага супраць твораў Саковіча “Кіеўскі сабор схізматычны”[4] і “Перспектыва”. Размова пра творчасць К. Саковіча пойдзе далей.

---

завещание. Апология унии. 19 ноября 1609 г. // АрЮЗР, 1883. – Ч. 1.– Т. 6. – С. 391–395.

[1] «Sowita wina», сочинение, изданное латино-униатами в 1621 году // АрЮЗР. – Ч. I. т. 7. – С. 454–461; Кревза, Л. Оборона унии /Л. Кревза //Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – Стб. 157–312. – РИБ. – Т. 4.; Sielawa, A. Antelenchus, to iest Odpis na skrypt uszczypliwy zakonnikow cerkwie odstępnej S. Ducha, Elenchus nazwany, napisany przez ojca Anastazego Sielawę, przełożonego monastyra Wileńskiego S. Trojce zakonu S. Basilego. W Wilnie, roku Pańskiego 1622 // АрЮЗР. – Киев, 1914. – Ч.1, т. 8. – С. 674–731.

[2] Smotrycki, M. Verificatia niewinności (...) //АрЮЗР. – Ч. 1, т. 6: Памятники литературной полемики православных южно-руссцев с латино-униатами. – Кiев, 1883. – С. 279–344; Смотрицкий, M. Obrona Verificacey // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 7. – С. 345–442; Smotrzyski, M. Justificacia niewinności. Wilnia, 1622 // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 7. С. 511–532; Smotrycki, M. Elenchus pism uszczupliwych, przez zakonniki zgromadzenia Wileńskiego Św. Troyce wydanych (...) w Wilnie r. P. 1622 // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 8, вып. 1: Памятники литературной полемики православных с протестантами и латино-униатами в Югозападной Руси за XVI и XVII стол. – 1914. – С. 597–673.

[3] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А. Траншеля, 1878. – Кн. 1. – РИБ. – Т. 4. – Стб. 313–1200; Филиппович, А. Диариуш албо список деев правдивых, в справе помноженя и объясненя веры православное голошеный // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. – РИБ. – Т. 4. – Стб. 49–156; Лифос, полемическое произведение, вышедшее из Киево-печерской типографии в 1644 г.//АрЮЗР. – Киев: Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, Михайловская ул., дом № 4, 1893. – Ч. 1. Т. 9. – 599 с.

[4] Сакович, К. Киевский, схизматический собор, созванный отцом Петром Могилой и происходивший с 8 по 18 сентября 1640 г. // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Сенатская тип., 1903. – Кн. 1. – Стб. 21–48.



МГПУ им. И.П.Шамякина


АКТЫ,
ОТНОСЯЩІЕСЯ КЪ ИСТОРІИ
ЗАПАДНОЙ РОССІИ,
СОБРАННЫЕ И ИЗДАННЫЕ
АРХЕОГРАФИЧЕСКОЮ КОММИССІЕЮ.
ТОМЪ ЧЕТВЕРТЫЙ.
1588 — 1632.
САНКТПЕТЕРБУРГЪ.
Въ типографіи Эдуарда Праца.
1851.

*Акты Санкт-Пецярбургскай Археаграфічнай камісіі Т. 4. Тытульная старонка*

Такім чынам, выданні дзяржаўных археаграфічных камісій XIX ст. у Расіі на мэце мелі неабходнасць абрунтавання тэзісу заняпаду праваслаўнай царквы на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспалітай пад ціскам каталіцтва і стойкасць змагароў за веру продкаў.

У савецкі час першае археаграфічнае выданне па гісторыі Беларусі было падрыхтавана ў 1936 г. – "Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах", якое ўтрымлівала большасць дакументаў XVIII–XIX стст. і да сённяшняга дня захавала навуковую каштоўнасць. Шмат дакументаў зборніка ў больш познія выданні не трапіла, напрыклад, у зборнік дакументаў і матэрыялаў у 3-х тамах "Белоруссия в эпоху феодализма" (1959–1960).

Значнай падзеяй ва ўкраінскай археаграфіі было выданне ў 1946 г. зборніка дакументаў "Україна перед візвольною війною 1648–1654 рр.: збірка документів (1639–1648)".

Археаграфічны аналіз азначаных выданняў зроблены у працах М.П. Кавальскага, А.П. Ігнаценкі, М.М. Улашчыка.[1]

У постсавецкі перыяд праца па выданні крыніц працягваецца. Так, сярод сучасных археаграфічных прац увагі заслугоўвае выданне расійскага гісторыка Л.В. Забароўскага, якое ўтрымлівае дакументы з фондаў Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў, як раней надрукаваныя, так і ўпершыню ўведзеныя ў навуковы ўжытак.[2] Выданне мае заўвагі,

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Ковальский, Н.П. Источниковедение и археография истории Украины XVI – первой половины XVII вв.: в 4 ч. Ч. 2. Анализ дореволюционных отечественных публикаций источников / Н.П. Ковальский. Днепропетровск: ДГУ, 1978. – 114 с.; Игнатенко, А.П. Введение в историю БССР: периодизация, источники, историография / А.П. Игнатенко. – Минск: Высш. школа, 1965; Улащик, Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1973. – 303 с.

[2] Заборовский, Л.В. Католики, православные, униаты: проблемы религии в русско-польско-украинских отношениях в конце 40-х–80-е гг. XVII в. Документы.

імянны спіс, геаграфічны паказальнік, паказальнік цэркваў і манастыроў, спіс 26 аўтараў і выдаўцоў дакументаў, збіральнікаў рукапісаў. На кожным дакуменце пазначана, з якой крыніцы цытуецца і дзе, калі і кім ён надрукаваны. Гэта, у першую чаргу, дакументы перамоў казацтва з кіруючымі коламі Рэчы Паспалітай на рускай мове ці ў перакладзе на русскую мову. Сярод іх “Инструкции посланцам войска Запорожского к Владиславу IV о положении православного духовенства в Речи Посполитой” (чэрвень 1648 г.), “Дневник посольства во главе с А. Киселем от Речи Посполитой к Б. М. Хмельницкому и войску Запорожскому о обсуждении условий мирного урегулирования” (люты 1649 г.), “Прошения войска Запорожского королю Яну Казимиру и властям Речи Посполитой об урегулировании религиозных проблем на Украине” (люты 1649 г. і лістапад 1650 г.), “Статьи о запросах войска запорожского, переданных королю Яну Казимиру” (жнівень 1649 г.), “Декларация благосклонности его королевской милости урожденному гетману и войску Запорожскому” (жнівень 1649 г.), “Наказ посольству от войска Запорожского во главе с М. Нестеренко и И. Переяславцем на Варшавский сейм” (лістапад 1649 г.), “Дневник поездки делегации украинского духовенства во главе с митрополитом киевским С. Косовым на Варшавский сейм” (снежань 1649 г. – люты 1650 г.), “Универсал короля Яна Казимира о закреплении на сейме мирного соглашения с войском Запорожским” (студзень 1650 г.), “Письма Б. М. Хмельницкого королю Яну Казимиру об урегулировании противоречий с униатами” (сакавік 1650 г. і студзень 1651 г.).[1] Пэўная колькасць дакументаў гэтай катэгорыі сведчыць, што ўлады Рэчы Паспалітай не спяшаліся задаволіць патрабаванні казацтва і праваслаўнага духавенства не толькі Украіны, але і беларускіх зямель. Нават калі бакі прыходзілі да згоды і заключаліся пэўныя дамовы, іх не зацвярджалі соймы ці абмяжоўвалася іх дзеянне на месцах. Значная частка дакументаў згадвае беларускія гарады і мястэчкі: Ашмяны, Бабруйск, Бярэсце, Віцебск, Гародня, Ігумен, Крычаў, Ліда, Лагішын, Мінск, Магілёў, Мазыр, Навагрудак, Орша, Пінск, Полацк, Рэчыца, Слуцк, Стары Быхаў, Чачэрск, Шклоў. У большасці выпадкаў размова ідзе аб дыскрымінацыі праваслаўных і неабходнасці аднаўлення храмаў. Некаторыя дакументы

Исследования / Л.В. Заборовский. – Ч. 1. Источники времени гетманства Б.М. Хмельницкого – М.: Памятники исторической мысли, 1998. – 374 с.

[1] Заборовский, Л.В. Католики, православные, униаты…– С. 20; 31;32, 93; 40; 41; 47; 71; 76; 95.

МГПУ им. И.П.Шамякина

лакалізуюцца ў Слуцку (Ліст Б. Радзівіла Б. Хмяльніцкаму), Мінску (Наказ Я. Радзівіла падчашаму старадубскаму Г. Куніцкаму), Магілёве (Царская грамата з прапановай здацца абаронцам Старога Быхава).[1]

Зразумела, што для вывучэння канфесійных супярэчнасцей і іх ролі ў палітыцы Б. Хмяльніцкага неабходна ведаць дакументы дыпламатычных кантактаў гетмана, у першую чаргу, з "адзінавернай" Рускай дзяржавай. Змястоўнымі з'яўляюцца лісты Хмяльніцкага цару Аляксею Міхайлавічу (чэрвень 1648 г., люты 1649 г., май 1649 г., чэрвень 1656 г., ліпень 1656 г.).[2] Гетман імкнуўся пераканаць рускі ўрад, што казацкія хваляванні – гэта барацьба "за праваслаўную веру", выкліканая парушэннем правоў духавенства і вернікаў. Не адразу, але гэты погляд знайшоў адлюстраванне ў маскоўскіх дакументах, напрыклад, "Материалах посольства Речи Посполитой во главе с С. Виговским" (чэрвень 1651 г.).[3]

Аб пэўным недаверы да казацтва сведчыць вялікая колькасць дакументаў, асноўнай мэтай якіх быў збор інфармацыі з розных крыніц. Гэта так званыя "Распроссные речи" чернцов Бизюковского монастыря Дорогобужского повета старца Исайи (жнівень 1648 г), могилевских купцов Алексея и Алфима Максимовых, Т. Афанасьева с товарищами (красавік 1650 г.), подъячего Д. Мордасова о его поездке в Речь Посполитую со сведениями об украинском посольстве (чэрвень 1650 г.), старца Григория дорогобужского Бизюковского монастыря о польско-украинских противоречиях по поводу ликвидации унии (сакавік 1651 г.), монаха Оршанского Кутеинского монастыря Григория (сакавік 1651 г.), игумена Воскресенского монастыря в Дисне А. Крыжановского (красавік 1651 г. і студзень 1652 г.), Г.К. Богданова (жнівень 1651 г.), выходца Новгород-Северского Никольского Макашевской пустыни игумена Ефрема" (лістапад 1652 г.).[4] Частка крыніц зборніка апавядае аб поглядах розных груп праваслаўнага беларускага і ўкраінскага кліру, якія не заўсёды былі станоўчымі ў адносінах да Рускай дзяржавы, асабліва пасля пачатку руска-польскай вайны: "Переписка в связи с бегством архимандрита слуцкого Ф. Василевича из Киева и о позиции части высшего украинского духовенства" (сакавік-чэрвень 1655 г.), "Материалы о позиции высшего украинского духовенства, в связи с перехватом его представителей,

[1] Заборовский, Л. В. Католики, православные, униаты. – С. 223; 222; 238.
[2] Тамсама. – С. 21; 30; 38; 253–254; 263.
[3] Тамсама. – С. 99.
[4] Тамсама. – С. 25; 86; 88; 95; 96; 97; 110; 106; 115.



МГПУ им. И.П.Шамякина

ездивших в Польшу" (Кіеў, лістапад 1655 г.), "Переписка по жалобе о. М. Билы на притеснения в духовных и других делах со стороны местных властей" (Магілёў – Масква, сакавік 1656 г.).[1]

Яшчэ адна даволі значная катэгорыя крыніц, размешчаных у зборніку Забароўскага, –"Отписки" ваяводаў рускіх гарадоў, памежных з Украінай аб поглядах і настрої розных сацыяльных груп насельніцтва: хотмышского воеводы С.Н. Болховского в связи с контактами с представителями Речи Посполитой, воевод в Севске З.Ф. Леонтьева и И.С. Кобыльского о положении на Украине, вольновского воеводы Ф.Ю. Арсеньева о настроених на Украине, вяземского воеводы И.В. Бутурлина с расспросными речами келаря Акакия и старца Езекии Кутеинского монастыря в Орше о решениях сейма по религиозным вопросам, путивльских воевод С.В. Прозоровского, И.И. Чемоданова и дъяка М. Грязева об утверждении польско-украинского соглашения по вопросам религии, белогородских воевод.[2] Для больш поўнага ўяўлення пра ўзаемаадносіны неабходна звярнуцца і да дакументаў папскай курыі і ўніяцкай іерархіі. Адна з такіх спроб зроблена ўкраінскім навукоўцам С. М. Плохіем.[3] Рэлігійныя супярэчнасці ў канцы XVI–XVII стст. знайшлі адлюстраванне не толькі ў прававых і дыпламатычных дакументах па праблемах уніяцтва і ўзаемадачыненнях каталіцтва і праваслаўя ў дзяржаве, але і ў палемічнай літаратуры.

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Заборовский, Л. В. Католики, православные, униаты. – С. 226; 240; 248.
[2] Тамсама. – С. 21; 27; 39; 75; 85; 89.
[3] Плохій, С.М. Від Якова суші до Анастасия Великого (Огляд видань римськіх джерел з історіі украінскоі церкви) // Украінський археографічний щорічник. Нова серия. Вип. 2 (Украінський археографічний збірнік. Т. 5). Київ, 1993. – С. 6–14.

# Раздзел 3. РЭЛІГІЙНА-ПАЛЕМІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII стст.

## 3.1. Перадумовы разгортвання рэлігійнай палемікі ў XVI ст.

У палеміцы знайшлі адлюстраванне гістарычныя ўмовы прыняцця і пашырэння ўніяцтва ў канцы XVI–XVII стст. Калі ў XVI ст. пераважала палеміка паміж каталіцкім духавенствам, кальвіністамі і арыянамі, то ў пачатку XVII ст. найбольшыя памеры набывае публіцыстыка прыхільнікаў і праціўнікаў уніяцтва, што было абумоўлена палітычнымі мэтамі царкоўнай уніі. Так, у палеміцы пратэстанты адстойвалі прынцыпы рэлігійнай талерантнасці, праваслаўныя брацтвы часта выкарыстоўвалі ідэю рускага адзінства для пашырэння беларуска-ўкраінскай апазіцыі з мэтай забеспячэння роўнасці праваслаўнага насельніцтва. У спрэчках аб уніі бралі удзел не толькі святарства, але і казацтва, мяшчане.


*Пётр Скарга*

Першапачаткова прапаноўвалася ідэя аб'яднання хрысціянскіх канфесій з улікам свабоды міжкультурнага і міжканфесійнага дыялогу, талерантнасці і ўзаемнай павагі да духоўных каштоўнасцей Усходу і Захаду.

На думку беларускага даследчыка С.А. Падокшына, ідэя уніі "арганічна вынікала з гісторыі беларуска-ўкраінскага грамадства, была знітавана з яго менталітэтам", што было абумоўлена канкрэтна-гістарычнымі ўмовамі развіцця і складваннем асобнага тыпу свецкага і царкоўнага дзеяча ў ВКЛ "на мяжы культур" – усходне- і заходнееўрапейскай, грэка-візантыйскай і лацінскай[1]. Многія дзяржаўныя і культурныя дзеячы, прадстаўнікі праваслаўнага святарства вучыліся ў пратэстанцкіх і каталіцкіх школах, універсітэтах Заходняй Еўропы. Да іх ліку можна аднесці Францыска Скарыну, Васіля Цяпінскага, Астафея Валовіча, Льва Сапегу, Сымона Буднага, Іпація Пацея, Мялеція

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. – Т. 3. – С. 233.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Сматрыцкага, Кірылу Транквіліён-Стаўравецкага, Касіяна Саковіча, Пятра Магілу, Сімяона Полацкага.

Аднак канкрэтнае ўвасабленне уніі значна адрознівалася ад першапачатковай ідэі, а прыхільнікі па-рознаму бачылі сродкі і вынікі царкоўнага адзінства. Гэта абумовіла рэлігійную палеміку сярод не толькі праціўнікаў уніі, але і аднадумцаў і, у сваю чаргу, высветліла як тэалагічныя непаразуменні, так і паказала грамадска-палітычныя і сацыяльныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай. Для адных прыхільнікаў царкоўная унія была сродкам інтэграцыі ВКЛ у Заходнюю Еўропу, для другіх – вызначала згоду паміж каталіцтвам і праваслаўем і тым самым вырашала складаную знешнепалітычную праблему супрацьстаяння Рэчы Паспалітай і Рускай дзяржавы, для трэціх – акрэслівала імкненне да стварэння самастойнай беларуска-ўкраінскай праваслаўнай мітраполіі і шлях захавання дзяржаўнай і духоўна-культурнай незалежнасці. Існавалі таксама пэўныя колы, якія імкнуліся да рэалізацыі канкрэтных палітычных мэт: барацьба з Рэфармацыяй і пашырэнне ўплыву каталіцтва на Усход, у першую чаргу на беларускія і ўкраінскія землі. Відавочна, што канкрэтна-гістарычныя ўмовы вызначылі шляхі рэалізацыі ідэі уніі, якая ва ўмовах Контррэфармацыі трансфармавалася на вырашэнне пераважна палітычных мэт: наступ не толькі на пратэстантызм, але і праваслаўе, вызначэнне яго залежнага становішча. Адсюль вынікаюць прымусовыя метады пашырэння уніі. Пэўную ролю ў прызнанні уніі праваслаўнымі іерархамі Рэчы Паспалітай адыгралі абяцанні атрымаць новыя эканамічныя і палітычныя прывілеі, а таксама знешнепалітычная небяспека з боку Маскоўскай дзяржавы.

Вынікі уніі не супалі з надзеямі кіруючых колаў ВКЛ – замест кансалідацыі насельніцтва па культурна-рэлігійнай прыкмеце, атрымаўся велізарны ўнутраны сацыяльна-палітычны канфлікт і абвастрэнне адносін з Рускай дзяржавай, а міжканфесійныя супярэчнасці ператварыліся ў знешнепалітычны фактар. Прымусовае насаджэнне рэлігійна-культурнага адзінства выклікала абурэнне не толькі інтэлектуальнай эліты, але і шырокіх колаў беларускага і ўкраінскага праваслаўнага насельніцтва, у тым ліку і казацтва. Грамадства ў адносінах да Берасцейскай уніі фактычна раскалолася на супрацьлеглыя станы: уніяцкі (каталіцкія і ўніяцкія аўтары) і антыўніяцкі (праваслаўныя і пратэстанцкія аўтары), вызначыўшы прынцыпова рознае разуменне сутнасці уніі.

МГПУ им. И.П.Шамякина

## 3.2. Каталіцка-ўніяцкая літаратура ў Рэчы Паспалітай ў канцы XVII–XVIII стст.

Тэарэтычныя высновы міжканфесійнай уніі былі выкладзены езуітам П. Скаргам у трактаце “O iedności Kościoła Bożego pod iednym pasterzem y o greckim od tey iedności odstąpieniu z przestrogą y upominaniem do narodów ruskich przy Grekach stoiących” (выдадзенага ў 1882 г. Імператарскай археаграфічнай камісіяй Міністэрства народнай асветы ў серыі “Русская историческая библиотека” пад назвай “О единстве церкви”).[1] Сутнасць прапаноў аднаго з натхняльнікаў уніі вызначалася разуменнем адзінства Царквы ў заходняй традыцыі як Сусветнай царквы з прынцыпамі адзінаўладдзя Рымскага папы, жорсткай іерархіі ў арганізацыі Царквы, адсутнасці ерасяў і іншадумства. Адсюль вынікала выснова аб прыярытэце інтарэсаў духоўнай улады над свецкай, якія лічацца вечнымі, а інтарэсы дзяржавы часовымі.



*Прамова П. Скаргі. Мастак Я. Мацейка*

Шамякина

[1] Скарга, П. О единстве церкви / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. –Кн. 2. – Стб. 223–526.

Ва ўсходняй традыцыі Сусветная царква разумелася як Саборная (у сэнсе прыняцця рашэнняў на царкоўных Саборах) і адсутнічала жорсткая іерархія. Розніца ў трактоўках выклікала шырокую палеміку каталіцкіх, праваслаўных і ўніяцкіх аўтараў.

Скарга нібыта выказваў спачуванне “да братоў нашых, суседствам і мовай, і адзінай Рэччу Паспалітай з намі з’яднанага рускага народа”, таму што праваслаўныя ніколі не дасягнуць сапраўднай духоўнай навукі з-за залежнасці духавенства ад свецкіх асоб і шлюбу святарства, выкарыстання царкоўнаславянскай мовы: “яе і зараз амаль ніхто не разумее... Таму папы вашы, калі хочуць што-небудзь у мове славянскай зразумець, да польскай звяртаюцца за перакладам і іншай школы, акрамя як для чытання, не маюць. Адсюль уся цемната і памылкі вынікаюць”. Пётр Скарга заклікаў праваслаўных вярнуцца да рашэнняў Фларэнтыйскага сабору, пагадзіцца з «нязначнымі» ўмовамі і прыйсці да згоды. На яго думку, прыхільнікам уніі патрэбна растлумачваць неабходнасць рэлігійнай уніі і шкоднасць “схізмы”, апекаваць школы і друкарні, перакладаць на польскую або “рускую” мову карысныя кнігі і інш.

Праца выклікала абурэнне праваслаўных, і першае выданне кнігі 1577 г. было выкуплена “багатай Руссю” і знішчана. Наступныя выданні выйшлі ў 1590 г. і 1610 г. Асноўныя тэзісы гэтага твора неаднаразова выкарыстоўваліся ў каталіцка-ўніяцкай палеміцы.

Стваральнікам і непасрэдным удзельнікам падпісання акта уніі ў Ватыкане быў праваслаўны епіскап, пазней уніяцкі мітрапаліт Іпацій Пацей, першапачаткова прыхільнік рэфармавання праваслаўнай царквы. У Вільні ў 1595 г. быў выдадзены яго твор “Уния, алъбо Выклад преднейшых артыкулов, ку зъодноченью греков с Костелом Рымским належащых”. Ён бачыў прычыны крызісу праваслаўя ў адсутнасці жорсткай іерархіі: “Люд посполитый, простый, ремесный, который, покинувши ремесло свое, а привлащивши собе врад пастырский, писмом Божим ширмует, выворочает и на свое... хвалсивые потвары оборочают, пастырей власных своих соромотят, безчестят...”.[1] Падкрэсліваў агульныя каштоўнасці Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла і магчымасць іх аб'яднання, паколькі разыходжанні ў веравызнанні каталікоў і праваслаўных зводзяцца да некалькіх значных “артыкулаў”: зыходжанне святога Духа ад Бога-айца і Бога-сына (у праваслаўных толькі ад Бога-айца);

[1] Потей, И. Уния греков с Костелом Римским 1595 г. / Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 111–168. – РИБ – Т. 7. – Стб. 117.



МГПУ им. И.П. Шамякина

першынства Рымскага папы як галавы хрысціянскай царквы (на думку праваслаўных, чалавек не можа быць намеснікам Бога на зямлі); чысцец (лат. “purgatorium”, рус. “чистилище”, пасмяротнае ачышчэнне душы людзей, якія не зрабілі цяжкіх грахоў, пасля пэўных выпрабаванняў); каляндар (пэўныя адрозненні ў літургічным годзе, розніца паміж новым грыгарыянскім календаром у каталікоў, уведзеным толькі ў 1582 г. папам Грыгорыем XIII і звыклым юліянскім – у праваслаўных); тэзіс аб Антыхрысце, шырока скарыстаны ў пратэстанцкай літаратуры і запазычаны праваслаўнымі аўтарамі.



*Мікалаеўская царка ў Бярэсці, дзе адбываўся Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г.*

І. Пацей у уніі бачыў выйсце з крызісу і натуральнае вяртанне да першапачатковага адзінства, пераадоленне схізмы: “До оное стародавней згоды, которая первей, за единоцтва, была в Церкви Божой, своих ведемо!”[1]

Падзеям у пачатку кастрычніка 1596 г. у Бярэсці, дзе фактычна адбыліся два царкоўныя саборы – уніяцкі і праваслаўны, прысвечаны трактат Пятра Скаргі “Берестейский собор и оборона его” і яго пераклад з польскай на беларускую мову Пацея[2], уласная праца І. Пацея “Справедливое описанье поступку и справы сынодовое и оборона згоды и едности съвершенное, которая се стала на сыноде Берестейском в року 1596”.

Справа ў тым, што частка праваслаўнага святарства ў Бярэсці правяла асобны сабор пад кіраўніцтвам патрыяршага экзарха Нікіфара, не пагадзіўшыся прызнаць першынства Рымскага папы. 8 кастрычніка 1596 г. альтэрнатыўны сабор асудзіў дзеянні

[1] Потей, И. Уния греков с Костелом Римским 1595 г. / Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 115.
[2] Скарга, П. Берестейский собор и оборона его / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А. М. Котомина, 1903. – Кн. 3. – Стб. 183–328.



МГПУ им. И.П.Шамякина

іерархаў, якія падпісалі акт аб уніі, прыняў грамату аб непадпарадкаванні ўніяцкаму мітрапаліту і пазбаўленні сану епіскапаў. Пацей сцвярджаў законнасць прынятых рашэнняў у выніку шырокага абмеркавання духоўнымі і свецкімі асобамі на Берасцейскім саборы згодна з даўнімі традыцыямі, царкоўным правам і ўсталяванымі нормамі ВКЛ. Абвінавачванні ў змове епіскапаў, якія таемна прызналі міжцаркоўную еднасць, адвяргаў, і адсутнасць інфармацыі ў ніжэйшага святарства тлумачыў кананічнай традыцыяй, згодна з якой святары павінны выконваць пастановы вышэйшых іерархаў.[1] У якасці доказу законнасці уніі прыводзіў звесткі пра паездку мітрапаліта Ісідара на Фларэнтыйскі сабор 1439 г., яго ўрачыстую сустрэчу па вяртанні кардыналам і біскупам кракаўскім.

І. Пацей у сваіх палемічных творах выкарыстоўваў сеймавыя канстытуцыі, прывілеі вялікіх князёў, пастановы сусветных і мясцовых сабораў з дакладным вызначэннем даты і месца выдання, прыклады з старазапаветнай і рымскай гісторыі, палітычных і грамадскіх падзей краін Заходняй Еўропы (Англіі, Германіі, Італіі), жыцця асоб Хрысціянскай царквы з перакладам іх на старабеларускую мову з моў арыгінала – грэчаскай, старaславянскай, лацінскай, устойлівыя выслоўі, прыказкі і прымаўкі, а таксама сарказм і з'едлівыя кпіны.



*Іпацій Пацей*

Да абгрунтавання ідэі царкоўнай еднасці, адпаведна неабходнасці міжканфесійнай уніі, Пацей звяртаецца ў сваіх самых вядомых палемічных творах – "Антырызіс" (Антикризис или Апологіа против Христофора Филалета), напісанага ў адказ на "Апокрысіс" Х. Філалета і "Гармония, албо согласие веры, сакраментов и церемонией светое Восточное церкви с костелом Римским" (Вільня, 1608). У першай працы аўтар у дасціпнай і

[1] Пацей, І. Справедливое описанье поступку и справы сынодовое и оборона згоды и едности съвершенное, которая се стала на сыноде Берестейском в року 1596. / Памятники полемической литературы в Западной Руси.– Кн. 2. – Стб. 939–1002.

МГПУ им. И.П. Шамякина

іранічнай манеры сцвярджае, што выйсце з крызісу праваслаўнай царквы, мір і згода – у далучэнні да ўніі, “где бы до власное и правоверное Руси геретикове не примешвалися и оных не зводили, и на рымлян не подбуряли, давно бы тая светлая згода конец свой взела”.[1] Да выдання былі далучаны ліст уніяцкага епіскапа да князя Канстанціна Астрожскага ад 3 чэрвеня 1598 г. і адказ Пацея клірыку Астрожскаму, (Отпис на лист неякога Клирика Острожского безъименного).[2] У якасці аргументаў царкоўнага адзінства ўніяцкі мітрапаліт друкуе вытрымкі з прывілея Уладзіслава 1443 г. і прыклады з жыцця легендарных святароў Усходняй царквы – Афанасія Вялікага і Іаана Златавуста, якія таксама прызнавалі над сабой уладу Папы Рымскага. На мове арыгінала і ва ўласным перакладзе ў працы прыведзены ліст Папы Рымскага Клімента да праваслаўных іерархаў ВКЛ ад 1596 г.



*Іосіф Вельямін Руцкі*

У “Гармонии...” праводзіцца ідэя блізкасці, гармоніі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў: “Изали вера Латинская не таяж, што и Греческая, которая вызнаваеть Бога во Тройцы единого”.[3]

У межах ідэі царкоўнага адзінства І. Пацеем разглядалася таксама праблема маральнага аднаўлення царквы як аднаго са сродкаў выйсця з крызісу праваслаўнай царквы. Яго прыкметамі ён лічыў “нядбаласць і нячуйнасць пастыраў нашых галоўных”, заняпад “стану чарнецкага – у

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Потей, И. Антиризис или Апология против Христофора Филалета /Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – Стб. 477–982.

[2] Пацей, І. «Ліст да князя К. Астрожскага» (3 чэрвеня 1598) / Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – Стб. 983–1040; Пацей, І. Отпис на Лист ниякого Клирика Острозъского безъименъного, который писал до владыки володымерского и берестейского [каля 1598] // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – Стб. 1041–1122.

[3] Потей, И. Гармония альбо согласие веры, сакраментов и церемоней святое Восточное церкви с костелом Рымским // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 169–222.

манастырах не жывуць, па людзях бегаюць".[1] Рэформы ладу манаскага жыцця таксама займалі вядучае месца ў дзейнасці І. Вельяміна-Руцкага.

Канцэпцыя монацаркоўнай дзяржавы абумовіла дыскусіі не толькі пра нормы царкоўнага жыцця, суадносіны свецкай і духоўнай улады, але і пра атрыбуты суверэннасці. Дыскусійная праблема царкоўнай незалежнасці ператварылася ў фактар барацьбы за палітычную незалежнасць. Пасля захопу Канстанцінопаля асманамі ў 1453 г. канстанцінопальскі патрыярх павінен падпарадкоўвацца турэцкім уладам і не можа паўнацэнна выконваць функцыі кіраўніка царквы. У выніку падзення культурнага і палітычнага ўплыву Візантыі праваслаўная царква Рэчы Паспалітай не атрымлівала пэўнай дапамогі ў барацьбе за ўласныя інтарэсы. А заснаванне Маскоўскага Патрыярхату ў 1589 г. вызначыла прэтэнзіі Рускай дзяржавы на ўзмацненне пазіцый праваслаўя і адпаведна Масквы на тэрыторыях былой юрысдыкцыі Канстанцінопаля. У сувязі з гэтым на пачатку XVII ст. абвастраецца барацьба за царкоўны прыярытэт паміж Масквой, з аднаго боку, Кіевам і Вільняй – з другога. Казацтва ператварылася ў знешнепалітычны фактар і адыгрывала значную ролю ў міжнародных канфліктах Рэчы Паспалітай і Турцыі і за свае ваенныя паслугі патрабавала абароны свабод праваслаўнага насельніцтва. Менавіта абвастрэнне знешнепалітычнай сітуацыі стымулявала адмову ад ідэі монацаркоўнасці. Акрамя таго, фактычнае аднаўленне праваслаўнай іерархіі ў 1620 г. Іерусалімскім патрыярхам Феафанам без згоды афіцыйных улад і пры падтрымцы казацтва канчаткова вызначыла немагчымасць адзінства ўніятаў і праваслаўных.

І. Пацей з мэтай абгрунтавання высокага грамадскага і прававога статусу ўніяцтва вылучыў ідэю аўтаноміі Царквы. Яго пераемнік Іосіф Вельямін-Руцкі ў 20-я гг. XVII ст. распрацаваў канцэпцыю рэфармавання уніі і яе аўтакефаліі, якую таксама падтрымаў М. Сматрыцкі пасля пераходу ва ўніяцтва. Так, ідэя царкоўнага адзінства і адпаведна монацаркоўнай дзяржавы, распрацаваная ў канцы XVI ст. – 1610-я гг., у якой свецкая ўлада падпарадкавана духоўнай уладзе Рымскага папы, змяняецца ў 20-я гг. XVII ст. прызнаннем магчымасці царкоўнай незалежнасці і суверэнітэту грамадскіх інстытутаў. На думку І. Вельяміна-Руцкага, кароль абавязаны зацвярджаць іерархаў пры іх пасвячэнні, у іншым выпадку манарх увогуле не меў правоў у сваёй дзяржаве. Яго

[1] Пацей, І. Ліст да князя К. Астрожскага (3 чэрвеня 1598) / І. Пацей // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Стб. 1023.



МГПУ им. И.П.Шамякина

апаненты – каталіцкія і праваслаўныя аўтары настойвалі на пасвячэнні іерархаў толькі рымскім папам або патрыярхам. Так, каталіцкія і ўніяцкія аўтары, будучы прыхільнікамі ідэі царкоўнага адзінства, па-рознаму бачылі паўнамоцтвы свецкай і царкоўнай улады, іх стасункі і мадэлі дзяржаўнай будовы. Каталікі прызнавалі вяршэнства папы пры даволі моцнай каралеўскай уладзе, а ўніяты вызначалі прыярытэт свецкай улады як асновы дзяржаўнасці і імкнуліся да адміністрацыйнай незалежнасці царквы.

І. Вельямін-Руцкі шляхам стварэння ўласнага патрыярхату дамагаўся адміністрацыйнай незалежнасці ад Рыма, Канстанцінопаля і Масквы. Ён разлічваў змяніць сістэму духоўнай адукацыі, арганізаваць уніяцкае манаства ў Базыльянскі ордэн, актыўна ўдзельнічаў у літаратурнай палеміцы і ўвогуле прыклаў шмат намаганняў для ўмацавання уніі. Трэці ўніяцкі мітрапаліт сцвярджаў, што ўніяты з павагай ставяцца да славянскіх кніг, карыстаюцца іх аргументамі і рускай мовай у пропаведзях. Усё насельніцтва ВКЛ ён лічыў адным народам – ліцвінскім, які мае агульныя палітычныя, этнічныя і культурныя, моўныя і рэлігійныя прыкметы, а пераемнасць яго нацыянальных традыцый адлічваецца не ад Грэцыі і Рыма, як даказвалі праваслаўныя і каталікі, а ад згубленай дзяржаўнасці ВКЛ.[1] Рэформы Руцкага здолелі больш адаптаваць уніяцкую царкву да сацыяльна-палітычных умоў Рэчы Паспалітай, што выклікала цікавасць уніяцкіх публіцыстаў да грамадска-палітычных праблем, у тым ліку да пытання пра структуру грамадства і паўнамоцтвы ўлады.

### 3.3. Касіян Саковіч – праваслаўны, уніят, католік і яго творы

Асоба Касіяна Саковіча (каля 1580–1641 гг.), вядомага ў свой час рэлігійнага дзеяча, пісьменніка, палеміста, педагога і філосафа, была і застаецца адной з самых супярэчлівых постацей XVII ст. Сын праваслаўнага святара з Падтэліча (Podteliczu) на Львоўшчыне атрымаў добрую адукацыю ў Замойскай акадэміі, слухаў лекцыі па багаслоўі ў Любліне і Кракаве. У 1620–1624 гг. ён выконваў абавязкі рэктара брацкай школы Кіеўскага Багаяўленскага манастыра, змяніўшы на гэтай пасадзе Мялеція Сматрыцкага.

[1] «Sowita wina», сочинение, изданное латино-униатами в 1621 году // АрЮЗР. – Ч. I, т. VII. – С. 454–461.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Пасля пераходу Саковіча з праваслаўя ў унію, затым у каталіцтва ў праваслаўнай літаратуры распаўсюдзілася гісторыя пра яго “распутнае жыццё” пры двары ўніяцкага епіскапа Афанасія Крупецкага ў Перамышлі і забойства “мужа з-за жонкі”. Паводле яе, ад смяротнага пакарання аўтара вядомых літаратурных твораў выратавалі ўцёкі ў Кіеў і прынясце манаства. Аб гэтым неаднаразова ўзгадваў аўтар шырока вядомага праваслаўнага палемічнага твора 1644 г. “Ліфас” (“Літос альбо камень”)[1].

Аднак чамусьці патрабавальнае кіеўскае манаства, якое старанна ахоўвала мараль вернікаў, дазволіла “злачынцу” і амаральнаму чалавеку адразу без іспытаў прыняць пострыг, змяніць свецкае імя Каліст на манаскае Касіян і пагадзілася на прызначэнне Саковіча спачатку брацкім прапаведнікам, затым рэктарам вядомай навучальнай установы. На карысць версіі наўмысных плётак з боку праваслаўных на Саковіча сведчыць той факт, што ва ўніяцкай палеміцы няма згадак пра “крымінальнае мінулае” двойчы змяніўшага веру Саковіча. Яго з’едлівыя заўвагі і кпіны супраць уніятаў таксама выклікалі жаданне нашкодзіць апаненту. Негатыўная ацэнка дзейнасці і творчасці вядомага педагога і пісьменніка, які двойчы здрадзіў веры продкаў, пашырылася ў гістарыяграфіі XIX ст. і перашкаджае больш-менш аб’ектыўна вызначыць яго заслугі.



*Пётр Канашэвіч Сагайдачны.*
*Малюнак з выдання Вершаў Касіяна Саковіча*

Адзін з расійскіх даследчыкаў творчасці К. Саковіча С. Голубеў у сваіх працах зазначаў, што ён, прагны да славы, разлічваў у Кіеве заняць

[1] Лифос, полемическое произведение, вышедшее из Киево-Печерской типографии в 1644 г. // Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов. – Киев: Тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, Михайловская ул., дом № 4, 1893. – Ч. 1. Т. 9. – С. 53.

МГПУ им. И.П. Шамякина

значнае месца ў царкоўнай іерархіі, аднак яго мары не спраўдзіліся, а пасада рэктара школы не давала матэрыяльнага дабрабыту і знаходзілася пад непасрэдным кантролем брацтва. Гэтыя ж абставіны датычыліся і Люблінскага брацтва. Рэзкая крытыка Касіянам невуцтва духавенства і ўмяшання свецкіх асоб (братчыкаў) у справы царквы прывяла да канфлікту яшчэ задоўга да пераходу ў каталіцтва. У якасці аргумента Голубеў прыводзіў вытрымку з прадмовы Саковіча да "Desiderosus" 1625 г. аб тым, што якія-небудзь "хлопы – кваснікі, шынкары выдаюць рызы, крыжы, евангелля, трымаюць брыдкімі рукамі тое, на што глядзець нявяртыя."[1]

На час запрашэння ў Кіеў Каліст Саковіч ужо быў вядомы як сябра знакамітага абаронцы праваслаўя валынскага чашніка Лявонція Дравінскага, вострыя прамовы якога на соймах добра ведалі ў Рэчы Паспалітай, знаўца лацінскай і грэчаскай моў, аўтар двух філасофскіх трактатаў (т. зв."Problemata" і "Dezideros polski", 1620 г.), настаўнік. Нават у часы навучання ў Замойскай акадэміі ён быў інспектарам малодшых вучняў, у тым ліку будучага Кіеўскага ваяводы Адама Кісяля. У 1624–1625 гг. па запрашэнні Л. Дравінскага Саковіч выконваў абавязкі прапаведніка Люблінскага праваслаўнага брацтва. Яго філасофскі твор "Aristoteles problemata albo pytania przyrodzeniu czlowiczym" (Аристотелевские проблемы или вопросы о природе человека", вядомы ў літаратуры пад кароткай назвай "Problemata"), выдадзены ў Кракаве ў 1620 г., быў адным з першых падручнікаў па прыродазнаўстве і філасофіі, у якім чалавек разглядаўся як прыродная істота без уплыву трансцэндэнтнасці, а веды і пазнанне людзьмі саміх сябе – найвялікшая мудрасць.[2] Гэты тэзіс не адпавядаў царкоўнай схаластыцы XVII ст., паводле якой, найбольшай каштоўнасцю чалавека лічылася набожнасць. У прадмове, прысвечанай Л. Дравінскаму, аўтар даводзіў неабходнасць адукацыі для "прымнажэння Славы Божай".[3] Ён вызначаў у трактаце стан навакольнага асяроддзя чалавека і фізічны склад чалавека па ўяўленнях тагачаснай думкі, прыводзіў цытаты Арыстоцеля, Платона, Сенекі, Цыцэрона, вытрымкі з Біблії і прац айцоў царквы, параўноўваў чалавечае

---

[1] Голубев, С. Предисловие / Лифос… // АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 9. – С. 15.
[2] Арістотелевські проблеми або Питання про природу людини з додатком передмов до весільних і похоронних обрядів, складених Каллістом Саковичем // Пам'ятки братських шкіл на Україні (кінець XVI – початок XVIII ст.): Тексти і дослідження / АН УРСР. Ін-т філософії, Ін-т сусп. наук; редкол.: В. І. Шинкарук та ін. – К.: Наук. думка, 1988. – С. 434.
[3]. Тамсама. – С. 338.

МГПУ им. И.П.Шамякина

жыццё з "бурбалкамі на вадзе, што хутка ўзнікаюць і хутка знікаюць."[1] Своеасаблівым працягам "Problemata" з'яўляецца "Traktat o duszy" (Трактат аб душы) 1625 г., які, магчыма, быў часткай лекцый па філасофіі, прачытаных Саковічам у Кіеўскай брацкай школе. Твор таксама ўтрымлівае шматлікія спасылкі і вытрымкі з прац антычных мысліцеляў і сярэдневечнай схаластыкі. На думку аўтара, галоўнай катэгорыяй душы з'яўляецца ўчынак, які залежыць ад пачуццяў, фантазіі, памяці, матываў, розуму і волі. Згодна з учынкамі чалавека душу чакае рай ці пекла.[2] Пісьменнік засяроджваў увагу на думцы, што самапазнанне асобы, розум і адукацыя дазваляюць кіраваць уласным жыццём і сваёй душой. Пытанне месцазнаходжання душы пасля смерці чалавека было спрэчным і абмяркоўвалася на праваслаўным Саборы 1640 г. у Кіеве, скліканым мітрапалітам Магілам для зацвярджэння Катэхізіса і вызначэння адзінства ў набажэнствах, таінствах і царкоўных уставах (правілах).

"Dezideros polski" таксама быў перавыдадзены ў 1625 г. пад назвай "Deziderosus abo scieszka do milosci Bozey, y do Doskonalosci zywota Chrzescianskiego. Dialog dziwnie nabozny, y veiesny, s Hispanskiego na Wloski, Francuski, Niemiecki, Niderlandski y Lacinski iezyk, a potym y na Polski prelozony Przez Gaspara Wilgowskiego. Teraz znowu do druku podany Przez oyca Kassiana Sakowicza, Zakonnika Relidiey Greckiey. Smakuycie y spatrzaycie iako slodki iest Pan. Psal: 33. W Krakowie". Трактат узгадваецца ў прадмове да "Problemata". Галоўная думка трактата – неабходнасць пераадолення невуцтва, стварэння праваслаўных школ і пашырэння адукацыі.[3]

Імя Саковіча ўзгадваецца ў сувязі з выданнем у 1622 г. аднаго з лепшых узораў тагачаснай паэзіі, "Вершаў на жалобный погреб зацного рыцера Петра Канашэвіча Сагайдачного" і "Матеріі для учиненя подякованя при погребе якого зацного чловека."[4] Яны ўяўляюць не толькі ўдалыя прыклады мастацкага слова, але і з'яўляюцца гістарычнай крыніцай падзей у пачатку 20-х гг. XVII ст. Гетман войска Запарожскага П. Канашэвіч Сагайдачны запісаўся ў склад Кіеўскага брацтва, што значна ўскладніла пашырэнне ўніяцтва ў Кіеве. Падпарадкаваныя яму казакі

[1] Арістотелевські проблеми або Питання про природу людини. – С. 426.
[2] Трактат про душу, написаний велебным отцем Касіяном Саковичем, ченцем грецькоі релігіі // Пам'ятки братських шкіл на Україні (кінець XVI – початок XVIII ст.): Тексти і дослідження. – К.: Наук. думка, 1988. – С. 498–500.
[3] Арістотелевські проблеми або Питання про природу людини. – С. 340.
[4] Українська поезія. Кінець XVI – початок XVII ст. – Київ, 1978. – С. 322–338.

МГПУ им. И.П. Шамякина

адкрыта выступілі ў абарону праваслаўных вернікаў Кіеўскай мітраполіі. Дзякуючы намаганням казацкага гетмана, у 1620 г. была неафіцыйна адноўлена праваслаўная іерархія на беларускіх і ўкраінскіх землях.

На думку Голубева, прынятце Саковічам уніяцтва было абумоўлена прагай да пашаны і матэрыяльнай зацікаўленасцю. У 1625 г. ён па парадзе Брацлаўскага ваяводы князя Аляксандра Заслаўскага слухаў у"Люблінскіх дамінікан", затым у Кракаўскім універсітэце багаслоўскія навукі і атрымліваў месца архімандрыта заможнага ўніяцкага Дубенскага манастыра пад патранатам Заслаўскага.[1] Пераход Саковіча ў 1641 г. у каталіцтва расійскі дарэвалюцыйны даследчык Голубеў са спасылкай на "Ліфас" і "Zwierciadlo albo zuslona" ўніята Пахомія Войны Аранскага таксама тлумачыць зняважаннем яго самалюбства і адхіленнем ад кіравання манастыром за амаральныя паводзіны ("асабістай споведзі ў келлях манашак і частага наведвання манастырскага фальварка, дзе жыла нейкая панна") і крытыку "абсурдаў" праваслаўнай і ўніяцкай царквы.[2] Асабліва вострая крытыка ўтрымлівалася ў працах К. Саковіча 1640 г. "Kalendarz stary" і "Кіевскі Сабор схізматычны"[3]. Сам Саковіч сцвярджаў пра добраахвотную "ўступку" Дубенскай архімандрыі Пракопію Хмялеўскаму са згоды ўніяцкага мітрапаліта Корсака і епіскапаў з мэтай паехаць у Рым разам з Корсакам, а пераход у каталіцтва на саборы ў Луцку і з дазволу папскай курыі тлумачыў нежаданнем уніяцкага духавенства знішчыць забабоны і "абсурды" ў набажэнствах і пераследам ("опрессіяй") за яго погляды.[4]

Адным з самых вядомых палемічных твораў К. Саковіча з'яўляецца "Epanopthōsis abo Perspectiwa y obiasnienie błędow, y herezyey y zabobonom w Grekoruskiey cerkwi Disunitskiey, tak w artikułach wiary, iako w administrowaniu sakramentów y w inszych obrządkach y ceremoniach znaydniacych się, zebrana y napisana prezez Wiel. X. Kassiana Sakowicza, przed tym archimandritę Dubienskiego unita, a teraz kapłana Rzymskiego Kościoła, per dispensam Sanctae Sedis Apostolikae, dla wielkiego przesladowania od Rusi, ze im te błędy y zabobony y herezye w ich wierze pokazywał, ktore z ich że służebnikow, trebnow, to iest, mszałów, y agend, y

[1] Голубев, С. Предисловие // Лифос… – С. 15.
[2] Тамсама. – 18–20.
[3] Сакович, К. Киевский, схизматический собор, созванный отцом Петром Могилой и происходивший с 8 по 18 сентября 1640 г. // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Сенатская тип., 1903. – Кн. 1. – РИБ. – Т. 4. – С. 21–48.
[4] Тамсама. – 16– 18, 22–24.



МГПУ им. И.П.Шамякина

ustawow, także z skribentow są wybrane, y nie w inszy cel y koniec na świat wydanie, tylko żeby Katholicy Rzymianie, o nich wiedząc, z miłości ku narodowi Ruskiemu, chciali go z tych błędow wywodzić, y do iedności skuteczney z Kościołem Ś.Rzymskim przywozic (“Перспектива заблуждений, ересей и предрассудков русской церкви”), выдадзены ў Кракаве на польскай мове ў 1642 г.[1] Менавіта ў супрацьвагу яму ў друкарні Кіева-Пячорскай лаўры ў свет выйшла ў 1644 г. праца на польскай мове, вядомая пад назвай “λίθος, abo kamień z procy prawdy cerkwie święiey prawosławney Ruskiey na skruszenie falecznociemniey Perspektiwy abo raczey poszkwilu od Kassiana Sakowicza, byłego przedtym Archimandritę Dubenskiego unita, iakoby o błędach, haereszych y zabobonach, cerkwie Ruskiey, w unii nie będącey, tak w artikułach wiary, iako w administrowaniu Sakramentów y inszych obrządkach y ceremoniach znaydniących się, roku P. 1642, w Krakowie wydanego, wypuszczony, przez pokornego oyca Evzebia Pimina”.[2]

Энцыклапедычны слоўнік Бракгаўза і Эфрона адзначаў “Perspektiwy” як галоўны палемічны твор Саковіча, які ўтрымліваў усе “негатыўныя рысы паўднёва-рускага і ўніяцкага духавенства: невуцтва, парушэнне царкоўных правіл і абрадаў” і быў даволі папулярны ў свой час.[3]

М. Кастамараў характарызаваў Саковіча як “руплівага паслядоўніка рымскай царквы, які імкнецца ганіць усё ў праваслаўі, што непадобна з ёй”. На думку гісторыка, аўтар “Перспектывы” трымаўся “способу, уведзенага езуітамі ў спрэчках і нападках на рускую царкву”. Ён складаўся з выкладу ўсіх выпадкаў злоўжыванняў, невуцтва, заганаў святароў як звычайнай справы праваслаўнай царквы.[4]

С. Голубеў адзначаў, што з’едлівая крытыка Саковіча ў пэўнай ступені мела рацыянальнае зерне і “некаторы матэрыял для палемікі існаваў”, згаджаецца з тым, што праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай у

---

[1] Epanopthōsis abo perspectiwa, y obiasnienie błędow, herezyey, y zabobonow, w Grekoruskiey Cerkwi Disunitskiey tak w Artykułach Wiary, iako w Administrowaniu Sakramentów, y w inszych Obrzędach y Ceremoniach znayduiących się. Zebrana y napisana przez Wiel. X. Kassiana Sakowicza. [Электронный ресурс] http://www.wbc.poznan.pl/ Дата доступа 22.09.2017.

[2] Лифос… / АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 9. – 599 с.

[3] Энциклопедическій словарь Брокгауза и Ефрона. – СПб., 1890–1907. Томъ XXVIIIA. Саварни – Сахаронъ. – СПб.: Типографія Акц. Общ. «Издат. дѣло, бывшее Брокгаузъ-Ефронъ», 1900. – С. 83.

[4] Костомаров, Н.И. Русская история в жизнеописаниях ее главнейших деятелей: В 3 книгах.– М.: Олма-Пресс, ОАО ПФ «Красный пролетарий», 2004. Книга 2. – С. 223.



МГПУ им. И.П.Шамякина

першай палове XVII ст. знаходзілася ў заняпадзе, але прычыны такога стану даследчык традыцыйна для расійскай гістарыяграфіі XIX ст. бачыў у выніках дыскрымінацыйнай дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да праваслаўных.[1] Значнымі заганамі рэлігійнага жыцця вернікаў грэчаскага абраду на той час былі адсутнасць аднастайнасці набажэнстваў і абрадаў, іх тлумачэнняў у царкоўных кнігах, пасвячэнне нявартых асоб у духоўны сан, што выклікала свавольства і невуцтва святарства. Аднак Голубеў лічыў, што Саковіч не бачыў розніцы паміж уніятамі і праваслаўнымі, адзінкавыя выпадкі і недахопы пашыраў на ўсё духавенства.[2] Сам палеміст лічыў, што адзінства ўніятаў з каталіцтвам вонкавае, на самой справы яны "схізматыкі і не жадаюць выпраўляць хібы і забабоны праваслаўных згодна з дагматамі святога Апостальскага Седалішча" (Рыма), таму яны заслугоўваюць большай вымовы, чым праваслаўныя.[3]



*Кіева-Пячорская лаўра. Літаграфія з малюнка А. Ждахі (канец. XIX – пачатак XX стст.)*

С. Голубеў сцвярджаў, што "Перспектыва" ў свой час карысталася значным поспехам у Рэчы Паспалітай, мела добрыя публіцыстычныя вартасці і дасціпнасць, выклікала "сильное волнение" ў працаўнікаў

[1] Голубев, С. Предисловие // Лифос… – С. 27.
[2] Тамсама. – С. 34.
[3] Тамсама. – С. 27.

МГУ им. А.А. Шамякина

Саковіча, датычылася “животрепещих” пытанняў, вызначала хворыя месцы. “бередила их раны жолчью пропитанным лезвием”.[1] Праца Касіяна Саковіча складалася з Прадмовы з прысвячэннем яе князю Станіславу Любамірскаму і Звароту да чытача (Do czytelnika), Пераліку (Regestr) аблудаў, ерасей, забабонаў падчас набажэнстваў, асноўнай часткі, Напаміну аб еднасці царквы (Parenesis).[2] Старонкі кожнага раздзелу нумараваліся асобна. Асноўная частка падзялялася на два раздзелы: вызначэнне нядобрапрыстойнага выканання sakramentów (царкоўных таінстваў хрышчэння, мірапамазання, прычасця (Еўхарыстыі), пакаяння, елеясвячэння, святарства, шлюбу) і абсурдаў некаторых абрадаў і цырымоній падчас набажэнстваў (o wielkich absurdach … niepodobnych do zachowania napisanych w ustawach Graekoruskich).[3] Да недарэчнасцей аўтар прылічваў святкаванне Масленіцы, вельмі строгі пост, пашырэнне ўставу манахаў (правіл унутранага распарадку) на жыццё звычайных вернікаў, забарона кашляць падчас набажэнства і забарона ўжываць садавіну раней Святога Спаса, захаванне асвечаных прадуктаў у царкве, выкананне многіх іншых звычаяў падчас царкоўных святаў.

Галоўнымі заганамі дызуніцкага і ўніяцкага святарства лічыў коснаязыкасць, невуцтва, карысталюбства патронаў царквы, іерархаў і ніжэйшага святарства, малую колькасць богаслужэбных кніг і недастатковую распрацаванасць царкоўнага чыну (парадку набажэнстваў падчас тых ці іншых святаў і таінстваў) і малітваў на розныя выпадкі, адсутнасць школ у многіх мясцінах, адпаведна з-за адсутнасці ведаў у прыходскіх святароў немагчымасць растлумачыць значэнне тых ці іншых таінстваў ці абрадаў, невялікае пашырэнне пропаведзяў.

Нягледзячы на рэзка адмоўнае стаўленне да Саковіча П. Магілы, ён з павагай адзначаў станоўчыя вынікі дзейнасці мітрапаліта па ўмацаванні стану царквы, выданні кніг, заснаванні Кіева-Магілянскага калегіума, пашырэнні асветы ўвогуле, які мог быць годны патрыяршага сану ў выпадку адмовы ад “схізмы” (праваслаўя, утворанага ў выніку расколу хрысціянства).[4]

У канцы свайго твора Саковіч заклікаў праваслаўных пераадолець супярэчнасці паміж канфесіямі, якіх значна менш, чым агульных рыс у

---

[1] Голубев, С. Предисловие // Лифос… – С. 35.
[2] Epanopthōsis abo perspectiwa …– С. 1–15, 1–113, 114–119.
[3] Тамсама . – С. 1–70, 71–113.
[4] Тамсама. – С. 103– 104, 111–113.



МГПУ им. И.П. Шамякина

набажэнствах і таінствах, трыманні пастоў і шанаванні святых і рэліквій і далучыцца да адзінства з касцёлам. Толькі два істотныя разыходжанні: дагмат пра зыходжанне Святога Духа ад Айца і Сына, і вяршэнства папы рымскага патрабуюць вырашэння.[1]

Такім чынам, разнастайная і шматгранная творчасць Касіяна Саковіча, настаўніка і філосафа, пісьменніка і паэта, святара і палеміста, з'яўляецца яскравым сведчаннем бурлівага і супярэчлівага часу, калі ў межах рэлігійнага светаўспрымання нараджалася прага да асветы, канфесійныя супярэчнасці вызначаліся не толькі багаслоўскімі спрэчкамі, але і ператвараліся ў фактар сацыякультурнага развіцця, часам пераважалі ў вырашэнні знешне- і ўнутрыпалітычных пытанняў дзяржавы. Яго творчая спадчына патрабуе далейшага вывучэння, вызначэння сапраўднай ролі і месца ў развіцці тагачаснай грамадскай думкі і адукацыі, літаратуры і філасофіі.

## 3.4. Пачатак антыўніяцкай палемікі

У гісторыі антыўніяцкай палемікі вызначаецца два асноўныя перыяды: 1580–1630-я гг. (ад палемікі выкліканай трактатам П. Скаргі "O iedności Kościoła Bożego…" да афіцыйнага аднаўлення праваслаўнай іерархіі, скасаванай па ўмовах Берасцейскай уніі) і 1640-я гг. – канец XVII ст. Пераважная большасць твораў першага перыяду выдавалася ў Вільні, другога перыяду – у Кіеве (Кіева-Пячорскай лаўры).

Антыўніяцкі накірунак у рэлігійнай палеміцы прадстаўлялі пратэстанцкія і праваслаўныя аўтары.

Каб супрацьстаяць маштабнай уніяцкай прапагандзе неабходна было падрыхтаваць таленавітых праваслаўных палемістаў і разгарнуць шырокую культурна-асветніцую дзейнасць. Брацтвы ў XVI–XVII стст., перш за усё Віленскае, Львоўскае, Кіеўскае, якія атрымалі статус стаўрапігіі, адыгралі вядучую ролю ў кансалідацыі беларуска-украінскай праваслаўнай супольнасці, абароне свабоды веравызнання, развіцці адукацыі, культуры і кнігадруку.

У брацкіх школах па ўзору заходнееўрапейскіх школ выкладаліся "сем вольных мастацтваў" – граматыка, рыторыка, логіка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка і мовы царкоўнаславянская, грэчаская, латынь, польская, беларуская ці ўкраінская на прыкладзе рэлігійных, літаратурных ці юрыдычных твораў.

---

[1] Epanopthōsis abo perspectiwa … – С. 114–119.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Менавіта з гэтага асяродка выйшлі выдатныя настаўнікі і публіцысты Герасім і Мялецій Сматрыцкія, Стэфан і Лаўрэнцій Зізаніі, Захарыя Капысценскі, Сімеон Полацкі, Кірыл Транквіліён-Стаўравецкі, Лявонцій Карповіч, Фама і Ігнат Іяўлевічы. Праваслаўныя аўтары пісалі на беларускай, царкоўнаславянскай, грэчаскай і польскай мовах, латыні, цытавалі храністаў (М. Стрыйкоўскага. М. Кромера, Я. Длугаша), антычных аўтараў (Платона, Арыстоцеля, Вергілія, Гарацыя).



*Абраз Жыроцкай Маці Божай (уніяцкі).*
*Сярэдзіна XVIII ст. Беларуская школа*

Амерыканскі даследчык украінскага паходжання Ігар Шаўчэнка лічыць, што менавіта пашырэнне твораў каталіцкіх аўтараў у 80–90-я гг. XVI ст. разварушылі праваслаўны асяродак. Каб супрацьстаяць маштабнай уніяцкай прапагандзе неабходна было падрыхтаваць таленавітых праваслаўных палемістаў і разгарнуць шырокую культурна-асветніцую дзейнасць. Сярод праваслаўных манастыроў сваёй асветніцкай дзейнасцю вызначаліся ў Вільні Святога Духа, Кіеўскі Багаяўленскі, Пачаеўская і Кіева-Пячорская лаўры.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Першымі палемічнымі творамі праваслаўных былі “Ключъ царства небесного” Герасіма Сматрыцкага 1587 г., “История о разбойничем или Флорентийском соборе”, твор Васіля Суражскага, выдадзеныя ў Астрогу ў 1588 г. і вядомы пад назвай першага раздзелу “О єдиной истинной православной вѢрѢ u о святой соборной апостолской церкви, откуду начало приняла u како повсюду распространеся.”[1]

Адной з самых першых і аргументаваных прац у абарону праваслаўя, як гэта ні парадаксальна, па меркаванні многіх даследчыкаў, быў твор “Апокрисис, альбо отповедь на книжкы о съборе Берестейском” валынскага пратэстанта Марціна Бранеўскага, надрукаваны пад псеўданімам Хрыстафор Філалет (Праўдалюбец). Ён выкрываў карысталюбства каталіцкай іерархіі, адзначаў нераўнапраўнае становішча праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай і неправамоцнасць прэтэнзій каталікоў на духоўнае першынства ў Літве і Беларусі: “каб уладыка грэчаскай рэлігіі ў Сенаце месца меў, таго ў Польшчы не дачакаешся”, абараняў праваслаўных вернікаў, узгадваючы акт Варшаўскай канфедэрацыі і адвяргаючы абвінавачванні аб выступленні супраць вярхоўнай улады на Берасцейскім праваслаўным саборы. Аўтар перасцерагаў ад гвалтоўнага ўвядзення уніі (“у веры никому не трэба гвалту чыниць”), бо гэта можа прывесці да ўнутранай вайны, а “такая война над иные внутрние войны як ядовитшая быти, так и должей трваси мусит”, а “сенатары і доблеснае рыцарства” могуць страціць і сваю ўласную свабоду.[2] Філалет адказаў на ўсе аргументы Пятра Скаргі, прыведзеныя ў яго творы “Берестейский собор и оборона его”.

Пункт гледжання аўтара каталіка, уніята ці праваслаўнага сцвярджаўся абавязкова спасылкай на Біблію або гістарычныя падзеі. У дачыненні да царкоўнага права і разыходжання ў разуменні дагматаў размова ішла пра першынства папы, зыходжанне Святога Духа (filioque), чысцец, ужыванне прэснага хлеба для прычасця, святарскі целібат.

У адпаведнасці з канфесійнай прыналежнасцю палеміста праведным лічылася зыходжанне Святога Духа праз Айца і Сына (каталік), ці толькі праз Айца (праваслаўны). Чысцец існаваў або не, адпаведна грэшнікі траплялі ў пекла амаль адразу пасля смерці (каталіцтва) ці чакалі другога

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 308.

[2] Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В.В. Дубровский [и др.]; АН БССР, Ин-т философии и права; редкол.: А.С. Майхрович [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – С. 34–42.

МГПУ им. И.П.Шамякина

прышэсця Хрыста (праваслаўе). Каталіцкі бок лічыў, што шлюб святароў не дазваляе ім займацца духоўнымі справамі, мірскія клопапы займаюць шмат часу. праваслаўныя заўважалі, што сямейныя абавязкі стрымліваюць распусту, а іх адсутнасць вядзе да пралюбадзейства.

Спрэчкі вяліся і пра гістарычнае абгрунтаванне спрадвечнасці веры, яе вытокаў і праведнасці, правамоцнасці ўсяленскіх царкоўных сабораў і Берасцейскага сабору 1596 г. Адно з самых цікавых пытанняў: падчас хрышчэння Русі вера была каталіцкая ці праваслаўная? Каталікі адказвалі на сваю карысць таму што, па-першае, гэтая падзея адбылася да "вялікага расколу" 1054 г., па-другое, увогуле хрысціянства да славян прыйшло з Рыму праз дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Контраргументам праваслаўных быў факт пашырэння веры на Русі менавіта з Візантыі (Царграду), таму павінна захавацца юрысдыкцыя Канстанцінопальскага патрыярха. Другое вельмі спрэчнае пытанне пра законнаць Фларэнтыйскага сабору, які праваслаўныя называлі разбойніцкім па прыкладу Эфескага сабору 449 г. Трэцяе пытанне пра правамоцнасць Берасцейскага сабору было вельмі балючае, бо закранала перш за ўсе сацыяльна-палітычную сферу дзейнасці грамадства.

Моцным аргументам каталіцка-ўніяцкай прапаганды было сцвярджэнне перавагі лацінскай мовы ў тагачасным багаслоўі і адукацыі. Да гэтага часу XVII ст. грэчаская мова страціла статус сучаснай мовы навукі ў Еўропе, а царкоўнаславянская яго не мела. Гэты тэзіс шырока скарысталі Пётр Скарга і Бенядыкт Гербест. У супрацьвагу ім З. Капысценскі даводзіў, што грунтам еўрапейскіх ведаў з'яўляецца грэчаская філасофія: "Вся наука, которой гордятся латинники...грецкие то суть мудрости, Платонова и Аристотелева и иных философов грецких мудрость."[1]

Праваслаўныя-артадоксы Іван Вішанскі, Васіль Суражскі лічылі неабходным захаванне самабытнай культуры і шкодным пашырэнне еўрапейскай асветы, у тым ліку на польскай і лацінскай мовах. Тэксты на грэчаскай мове разглядаліся як першакрыніцы праваслаўных кніг і ўзор для іх выпраўлення.

Насаджэнне уніі выклікала не толькі міжканфесійную барацьбу, але і грамадска-палітычную і сацыяльную канфрантацыю. Рэлігійнае супрацьстаяннеператварылася ў фактар як унутранай, так і знешняй

[1] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви / З. Копыстенский // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – СПб.: Тип. А. Траншеля, 1878. – Кн. 1. – Русская историческая библиотека. – Т. 4. – С. 313–1200. – С. 900–901.



МГПУ им. И.П.Шамякина

палітыкі. Пасля забойства полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іясафата а ў 1623 г. праваслаўе апынулася на мяжы абсалютнай забароны, аднак казацтва паўстала на абарону "веры продкаў".

Канфесійныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай садзейнічалі фарміраванню ідэі звярнуцца за дапамогай да адзінаверцаў у Маскоўскай дзяржаве. У праваслаўнай публіцыстыцы актыўна пачынае прапагандавацца тэзіс славянскага адзінства на беларускіх і ўкраінскіх землях для забеспячэння роўнасці праваслаўных. У другой палове XVII ст. ён пашыраецца і на Маскву.



*Захарыя Капысценскі*

Палеміка пра тое, якая вера з'яўляецца сапраўднай, чые традыцыі больш старажытныя, а Царква – пераемніца апостальская, абумовілі вывучэнне гістарычнай спадчыны і духоўных традыцый. Іх вытокі беларускія і ўкраінскія праваслаўныя публіцысты бачылі ў грэка-візантыйскай спадчыне. Таму, на думку З. Капысценскага, "мы, Россове, для наук в краи Немецкие удаемося, не по латинский, але по Грецкий розум удаемося, где як власное заходним от греков на час короткий повиреное, отбираемо."[1]

Праваслаўныя брацтвы ўстанавілі цесныя культурныя, рэлігійныя і грамадска-палітычныя сувязі на беларускіх і украінскіх землях і праваслаўная літаратура карысталася выключным попытам сярод насельніцтва ўсёй Русі. Праваслаўе, сцвярджаў Кіеўскі мітрапаліт Пётр Магіла, выстаяла перад націскам каталіцтва і ўніі ў значнай ступені дзякуючы брацтвам.[2]

У 1593 г. Віленскае Святатроіцкае (пазней Святадухаўскае) праваслаўнае брацтва запрасіла да сябе Стэфана Зізанія, на жаль, яго

[1] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – С. 313–1200. – С. 900–901. – РИБ. – Т. 4.

[2] Ничик, В. М. Образ идеального властителя в сочинениях Петра Могилы. – С. 71.



МГПУ им. И.П.Шамякина

палемічныя творы не захаваліся. Аб іх папулярнасці можна меркаваць па выказваннях І. Пацея: “новы тэолаг, а стары баламут Стэфан Зізаній… так сваю Русь адурманіў, што яго кніжкам баламутным лепей, ніж Евангеллю верацьˮ[1] М. Сматрыцкі, ужо пасля пераходу ва ўніяцтва, назваў яго невукам, які “ў ерась упаў і нас аб’ерэтычыў.ˮ[2] З крытыкай поглядаў С. Зізанія выступіў езуіт Шчасны Жабpоўскі ў палемічных брашурах “Куколь, які рассявае Стэфан Зізаній у рускіх цэрквах у Вільні” і “Пустазелле Стэфана Зізанія, ерэтыка з царквы рускай выклятага”, дзе праваслаўны дзеяч абвінавачаны ў 10 ерэтычных памылках па пытаннях царкоўнай дагматыкі і ўзаемаадносін духоўнага і свецкага станаў, распаўсюджанні ерэтычнай думкі, што “чловечая натура з бозкою ровно ест”. На думку Жабpоўскага, Зізаній “з небам і зямлей ваюе, ані Богу, ані людзям не спускае. Святых з неба выштурхівае. Д’яблаў у пекла не пушчае… Караля, пана нашага, ганебна ў казаннях згадвае, мітрапалітаў лае, лацінніка ў праклінае. Русь да бунтаў і нязгоды падпальвае, займае ўладу д’ябла на зямлі”. Праваслаўныя іерархі таксама асудзілі ідэі С. Зізанія. На Навагрудскім саборы ў 1596 г. ён быў пазбаўлены духоўнага сану, таму што ў сваёй святарскай і кнігавыдавецкай дзейнасці “запусціўся ў вялікае ерэтыцтва.ˮ[3]

Грамадскі рэзананс атрымаў выдадзены ў Вільні манахамі Свята-Духава манастыра ў 1632 г. “Сінопсіс”, падрыхтаваны спецыяльна для Сената і паслоў Вальнага Сойма ў абарону праваслаўя, дзе былі абгрунтаваны спрадвечныя правы праваслаўных на свабоду веравызнання, існавання ўласнай іерархіі і святарства, узгаданы прывілеі, універсалы і соймавыя канстытуцыі з 946 г. па 1632 г. Вынікам дыскусій сталі “Артыкулы для заспакаення праваслаўных”, якія аднаўлялі юрыдычны статус праваслаўнай царквы.

МГПУ им И.П.Шамякина

---

[1] Потей, И. Гармония альбо согласие веры, сакраментов и церемоней святое Восточное церкви с костелом Рымским // Памятники полемической литературы в Западной Руси.– Кн. 2. – РІБ. – Т. 7. – Стб. 181.

[2] Гісторыя Беларусі: У 6 т. / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык і інш.; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2004. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) – С. 59

[3] Гісторыя Беларусі. Т. 3. – С. 59.

## 3.5. Творчасць Мялеція Сматрыцкага: ад абаронцы праваслаўя да ўніята

Вядучае месца сярод палемістаў займаў Мялецій Сматрыцкі, аўтар шматлікіх антыўніяцкіх і ўніяцкіх твораў, жыццё і дзейнасць якога таксама з’яўляецца адбіткам гістарычных абставін і грамадскіх супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай.

Будучы вядомы публіцыст нарадзіўся на Украіне, вучыўся спачатку ў Астрожскай гімназіі, затым у Віленскай езуіцкай Акадэміі, наведваў лекцыі ў Нюрнбергскім, Лейпцыгскім і Вітэнбергскім універсітэтах. Пазней уступіў у Віленскае праваслаўнае брацтва, у 1617 г. стаў манахам Святадухава манастыра ў Вільні, у 1620 г. – архіепіскапам Полацкім, а ў 1628 г. з'явіліся яго ўніяцкія творы “Пратэстацыя” (1628), “Паранезіс” (1629), “Экзатэзіс” (1629) і інш.

М. Сматрыцкаму належыць выдатны помнік палемічнай літаратуры пачатку XVII ст. – “Трэнас (Фрынас) або Плач Усходняй царквы” (1610). Ён канстатаваў пад псеўданімам Тэафіл Арталог (Багалюб Златавуст) ад імя маці-царквы ў алегарычнай форме той факт, што ў выніку крызісу царквы і наступу Контррэфармацыі большасць радавітай беларускай і частка ўкраінскай магнатэрыі пакінула праваслаўе: “Дзе зараз той вельмі каштоўны каменьчык-карбункул, бліскучы, як свет, які насіў у сваёй кароне паміж іншымі перламі, як сонца паміж зорамі, – дом князёў Астрожскіх, які вылучаўся сярод іншых бляскам святла сваёй старажытнай веры? Дзе і іншыя дарагія і вельмі каштоўныя камені той самай кароны, слаўныя дамы рускіх князёў, неацэнныя сапфіры, надзвычай каштоўныя дыяменты: князі Слуцкія, Заслаўскія, Збаражскія, Вішнявецкія, Сангушкі, Чартарыйскія, Пронскія, Ружынскія, Саламярэцкія, Галаўчынскія, Крошынскія, Масальскія, Горскія, Сакалінскія, Лукомскія, Пузаны і іншыя многія… Дзе і другія вельмі каштоўныя мае скарбы, радавітыя, паўтараю, слаўныя, высакадумныя і даўно па ўсяму свету праслаўленыя добрай славай, магутнасцю і мужнасцю народа рускага дамы: Хадкевічаў, Глебавічаў, Кішак, Сапег, Дарагастайскіх, Войнаў, Валовічаў, Зяновічаў, Пацаў, Халецкіх, Тышкевічаў, Корсакаў, Храбтовічаў, Трызнаў, Гарнастайскіх, Бокіх, Мышкаў, Гойскіх, Сямашак, Гулевічаў, Ярмалінскіх,

МГПУ им. И.П.Шамякина

Чалганскіх, Каліноўскіх, Кірдзяяў, Загароўскіх, Мялешкаў, Богавіцінаў, Паўловічаў, Сасноўскіх, Скумных, Пацеяў і іншых.”[1]

Аўтар выступаў супраць вяршэнства папы рымскага, параўноўваў яго ўладу з турэцкай тыраніяй: “Турчын у свецкай палітыцы, а папеж у царкве Божай тыран. Турчын у Азіі толькі, а папеж усяго свету Кесарам над Кесарамі і Панам над Панамі быць хоча”. Ён сцвярджаў, што зберагчы «душу вольную» лягчэй у турэцкай няволі, чым пад уладай папы. Менавіта гэты тэзіс быў падставай для абвінавачванняў праваслаўных у сувязях з Турцыяй і Масквой. П. Скарга ў творы “Перасцярога на Трэны і Лямант Тэафіла Арталога” адзначаў: “…асабліва цяпер, калі наш богабаязненны кароль ваюе з Масквой, …яна з-за чытання тых кніг будзе больш упартай, баючыся ўшчамлення свайго грэчаскага набажэнства”.[2]


*Мялецій Сматрыцкі*

“Плач усяленскай усходняй царквы” выклікаў вострую занепакоенасць кіруючых колаў: “Кожнае слова – ёсць жорсткая рана, кожная думка – смяротная атрута для уніі і папства, а таму не адны схізматыкі, але і ерэтыкі-пратэстанты з радасцю набывалі і перачытвалі гэтую кнігу. Іншыя захоўвалі яе нібы скарб і завяшчалі сваім дзецям як каштоўнейшую спадчыну; а з праваслаўнага духавенства некаторыя лічылі твор Сматрыцкага роўным з творам святых айцоў і гатовыя былі праліць за яго кроў”.[3] Жыгімонт Ваза загадаў знішчыць тыраж выдання, друкарню зачыніць, а яе кіраўніка, Лявонція Карповіча, зняволіць.

Новая хваля палемікі распачалася з публікацыі Мялеціем Сматрыцкім 5 красавіка 1621 г. працы “Верыфікацыя нявіннасці” ў сувязі з аднаўленнем праваслаўнай мітраполіі і прызначэннем на пасады праваслаўных епіскапаў Канстанцінопальскім патрыярхам без дазволу караля Рэчы Паспалітай. Сутнасць палемікі акрэслівалі рознагалоссі ў

[1] Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / склад. А. Ф. Коршунаў, пераклад А. Ф. Коршунаў. – Мінск, 1959. – С. 268–269.
[2] Гісторыя Беларусі. Т. 3. – С. 63.
[3] Тамсама. – С. 63.



МГПУ им. И.П.Шамякина

вызначэнні права прызначэння праваслаўных іерархаў у Рэчы Паспалітай. На думку Полацкага архіепіскапа, “духоўны сан, згодна з царкоўным і свецкім правам, можа быць атрыманы толькі з рук Канстанцінопальскага патрыярха”. Гэта пацвярджаецца Прывілеямі 1600, 1607 і 1609 гг., сеймавай Канстытуцыяй 1607 г. і трыбунальскімі дэкрэтамі 1605 і 1609 гг., царкоўнымі пастановамі: 6-м канонам Першага Сусветнага сабора, 2-м і 4-м канонамі Другога сабора, 8-м канонам Трэцяга сабора, 28-м канонам Чацвёртага сабора. М. Сматрыцкі распавядаў аб духоўным праве канстанцінопальскіх патрыярхаў на вялікакняжацкія землі, аб прыняцці русінамі хрысціянства з Усходу. “Што да Літвы, дык няма аніякага сумневу: напачатку Хрыстова вера была тут прынятая з Усходу. Першая жонка літоўскага князя Альгерда Ульяна (дачка віцебскага князя) і другая Марыя (дачка цвярскога князя) належалі да праваслаўнага веравызнання. Пад іх уплывам і Альгерд схіліўся да Праваслаўя. У Віцебску ён змураваў дзве багатыя бажніцы: адну ў Ніжнім замку, а другую за Ручаём. Дзяцей, якіх меў ад Ульяны і Марыі, Альгерд ахрысціў паводле праваслаўнага абраду”. Сматрыцкі сцвярджаў, што ў Каталіцкім касцёле біскупы прызначаюцца без манархавай згоды. Гэты тэзіс і публікацыя некаторых лістоў караля Жыгімонта III Вазы і сенатара Станіслава Жалкоўскага, кароннага канцлера і гетмана, да Іерусалімскага патрыярха Феафана (“таго грэчына – здрайцы”), а таксама абвінавачанні манарха ў парушэнні законаў сталі аб'ектам вострай крытыкі. Публікацыю ў “Верыфікацыі нявіннасці” Пратэстацыі Іова Барэцкага, дзе гучаў заклік да бунту, змагання са зброяй у руках “за веру бацькоў” і ўласныя заклікі М. Сматрыцкага да запарожскіх казакоў, людзей рыцарскага стану абараняць праваслаўе апаненты расцанілі як “найвялікшае дзяржаўнае злачынства”.[1]

У адказ на працу Сматрыцкага ўніяцкі мітрапаліт І. Вельямін-Руцкі выступіў з трактатам “Падвойная віна” (1621 г.). М. Сматрыцкі ў сваю чаргу неадкладна надрукаваў “Абарону Верыфікацыі” (1621 г.), дзе падкрэсліваў шкоднасць міжканфесійных канфліктаў, якія “спрычыняюцца да глыбокага заняпаду нашага славутага народа”.[2] І. Вельямін-Руцкі ў тым жа годзе выдаў “Экзамен Абароны” (1621 г.).

Супраць трактатаў Сматрыцкага выступілі аўтары “Ліста да законнікаў манастыра Святога Духа” браслаўскі стараста і вышэйшы пісар

[1] Смотрицкий, М. Verificatia niewinnosci / М. Смотрицкий // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 7. – С. 279–344.
[2] Смотрицкий, М. Obrona Verificacey / М. Смотрицкий // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 7. – С. 345–442.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Януш Скумін-Тышкевіч, слонімскі падкаморы Мікалай Трызна, пан Адам Храптовіч, слонімскі харужы Юры Мялешка. Яны пагражалі публіцысту прыцягнуць яго да суда за абразу духоўных Айцоў уніяцкай царквы і шляхты, якая прымала ўніяцтва не для новых прывілеяў і не за веру, а за службу Айчыне. На  іх думку, учынкі царкоўнікаў і шляхты “не належаць да тваёй дурной чарнецкай прэзумпцыі”. Таксама абвінавачвалі Сматрыцкага і яго паплечнікаў у “празе духоўных сталіц”, чым тлумачыцца “самачыннае” абвяшчэнне сябе духоўнымі пастырамі.[1]

У адказ на працу І. Вельяміна-Руцкага “Экзамен Абароны” ў 1622 г. у Вільні выйшаў твор “Апендыкс на Экзамен Абароны Верыфікацыі”, у якім М. Сматрыцкі абараняў праваслаўную царкву ад націску ўніятаў: “Вы нашу святую, старажытную веру з грудзей вырываеце! Мандатамі, баніцыямі, інквізіцыямі, камісіямі ды дэкрэтамі задворнымі малога кола тэрарызуеце нас, няславіце і ганьбіце... Гвалтам пазбаўляеце нас права вольна здзяйсняць набажэнства, зачыняеце цэрквы, хапаеце прэсвітараў ды без усялякіх падстаў пазбаўляеце духоўных пасад”. Пісьменнік вызначаў неабходнасць захавання юліянскага календара, падкрэсліваў правамоцнасць незалежных ад Рыма патрыярхаў і законнасць дзейнасці Віленскага праваслаўнага брацтва па заснаванні школ, шпіталяў і друкарняў.[2] Працягам антыўніяцкіх настрояў М. Сматрыцкага стаў “Эленхус”, дзе ён абвінавачваў уніятаў у распальванні сацыяльнай напружанасці – “нацкоўваюць падданых на паноў, а паноў на падданых” і “абвастраюць сэрцы ўсіх жыхароў Вялікага Княства”, праваслаўныя вымушаны абараняцца і іх ваяўнічыя паводзіны тлумачацца абвінавачаннямі ў “здрадзе і схізме”.[3] Супраць яго негатыўных ацэнак уніяцтва выступіў у 1622 г. Анастасій Сялява ў творы “Антыэленхус”.

У сваіх працах Мялецій Сматрыцкі палемізуе не толькі на багаслоўскія тэмы, але і абмяркоўвае філасофскія і грамадска-палітычныя пытанні. У гэтым сэнсе лепшымі ўзорамі публіцыстыкі Сматрыцкага-праваслаўнага лічацца “Юстыфікацыя нявіннасці” (адрасаваная Жыгімонту ІІІ Вазе і надрукаваная 6 снежня 1622 г.) і “Суплікацыя” (зварот да Сената і паслоў Вальнага сейма ў 1623 г.).

Так, у “Юстыфікацыі нявіннасці” М. Сматрыцкі сцвярджае, што адна з галоўных каштоўнасцей чалавека – свабода і ў тым ліку свабода выбару

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 322.
[2] Тамсама. – С. 321.
[3] Тамсама. – С. 323.

МГПУ им. И.П. Шамякина

канфесійнай прыналежнасці: "Салодкая, вельмі салодкая Воля! Дзеля яе можна ахвяравацца не толькі маёмасцю, але і самім жыццём!.. Воля – гэта жыццё паводле агульнапрынятых законаў, а не паводле капрызаў валадароў", з-за чаго адбываецца несправядлівасць – страта праваслаўнымі "адвечных правоў, свабод і вольнасцей."[1] Сваю думку мысліцель падмацоўвае цытатамі старажытнагрэчаскіх філосафаў – Дыягена, Плутарха і інш. Парушэнне законаў можа прывесці да разладу ў дзяржаве: "Дзе фундамент бурыцца, там і сцены мусяць упасці."[2] Праваслаўныя страцілі магчымасць мець сваіх духоўных пастыраў, таму пасвячэнне патрыярхам на духоўныя пасады адбылося без згоды манарха, але гэта нельга расцэньваць як абразу каралю, бо "патрыярх не меў ні ў думках, ні на сэрцы, каб нейкім чынам зняважыць Жыгімонтаву ўладу" і іерархі не шукалі карысці, а "дбалі пра вечныя рэчы."[3]

У "Суплікацыі" парушэннем закону М. Сматрыцкі назваў абвінавачанні праваслаўнага святарства ў падбухторванні казацтва да супраціву і Іерусалімскага патрыярха Феафана ў дзейнасці на карысць турэцкіх улад, а таксама загад Жыгімонта III Вазы аб яго арышце. Заклікаў шляхту не парушаць закон і «працягнуць руку дапамогі пакрыўджаным і зганьбаваным» праваслаўным вернікам, якім ніколі не забаранялася мець сваіх іерархаў, падпарадкаваных Канстанцінопалю, а вялікія князі і каралі – Казімір, Ян Альбрэхт, Аляксандр, Жыгімонт I Стары, Жыгімонт II Аўгуст, Генрых Валуа і Стэфан Баторый – ацанілі і адзначалі заслугі праваслаўных дзеячаў перад дзяржавай.

У пачатку 1620-х гг. склаліся новыя грамадска-палітычныя ўмовы: нарастанне сацыяльных супярэчнасцей і паглыбленне крызісу праваслаўнай царквы, наступ Контррэфармацыі, курс на замірэнне канфесій, рэформы ўніяцкай царквы І. Вельямінам-Руцкім, і яго спробы схіліць да супрацоўніцтва вядучых дзеячаў праваслаўя, якія вызначылі прызнанне уніі часткай праваслаўнага святарства (Касіян Саковіч, К. Транквіліён-Стаўравецкі і інш.). Сярод іх быў і М. Сматрыцкі, які ў больш позніх сваіх творах – "Апалогіі" (1628 г.), "Аб шасці адрозненнях у вучэнні Усходняй і Заходняй цэркваў" (1628 г.) і "Катэхізісе" (каля 1628 г.)

[1] Smotrzyski, M. Justificacia niewinności. Wilnia, 1622 / M. Smotrzyski // АрЮЗР. – Ч. 1, т. 7. – С. 514.
[2] Тамсама. – С. 523.
[3] Smotrzyski, M. Justificacia niewinności. – С. 522.



МГПУ им. И.П.Шамякина

выклаў тэалагічныя асновы царкоўнай еднасці і пераконваў праваслаўных прыняць унію і адшукаць агульны мір.

М. Сматрыцкі пасля падарожжа па святых мясцінах Бліжняга Усходу, у тым ліку і ў Канстанцінопаль, ператварыўся ў абаронцу уніі, паплечніка і сябра Вельяміна-Руцкага, падтрымаў яго ідэю стварэння ўласнай Патрыярхіі: “Каб яна была ўфундаваная ў нашых краях накшталт Маскоўскай, і мы не ехалі кожны раз некуды за добраславеннем” і аб’ядноўвала хрысціянскіх вернікаў Вялікага Княства Літоўскага.[1] 21 жніўня 1627 г. М. Сматрыцкі адкрыта заявіў аб сабе як уніят, калі звярнуўся з “Лістом да Канстанцінопальскага патрыярха”, у якім заклікаў яго садзейнічаць аб'яднанню вернікаў усходняга абраду Вялікага Княства Літоўскага.[2]



*Дзерманскі Троіцкі манастыр. Сучасны выгляд*

Пасля публікацый 1627–1629 гг. на М. Сматрыцкага абрынуліся шматлікія паклёпы і абвінавачанні ў здрадзе. Погляды Сматрыцкага ў гэты час амаль радыкальна змяніліся. Калі ў творах у абарону праваслаўя ён выступаў за мірнае суіснаванне канфесій і народаў у адной дзяржаве, даказваючы пераемнасць праваслаўнай культуры ад грэчаскай, то

[1] АЗР.– Т. 4: 1588–1632. – 1851. – С. 513–514.

[2] Смотрицкий, М. Письмо Патриарху К. Лукарису от 21.08.1627 г. /М. Смотрицкий // Кирилло-Мефодиевский сборник. – Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Сматрыцкі-ўніят лічыў, што неабходна накіраваць праваслаўных на шлях сілай: “Язвы нашага народа такой уласцівасці, што, калі не ўжывеш сіл жалеза для ачышчэння іх, ён ніколі не ачуняе і, распалены пякельным агнём, будзе з дня на дзень чэзнуць болей і болей і, нарэшце, зусім загіне”.[1] Ён сцвярджаў, што міжканфесійная барацьба вядзе да разладу ў дзяржаве, аднак сродкі вырашэння гэтай праблемы для Сматрыцкага-праваслаўнага і Сматрыцкага-ўніята розныя. У першым выпадку ён выступаў за міжканфесійны мір шляхам гарантавання праваслаўным свабоды веравызнання, у другім – за адзіную царкву, для стварэння якой трэба прымяніць усе магчымыя сродкі, у тым ліку і прымусовыя.

У трактаце “Парэнезіс” М. Сматрыцкі даказваў, што праваслаўе – вера халопская, безнадзейная, а праваслаўная царква не мае добрай адукацыі і царкоўнага парадку. Падтрымаў праект стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы і ідэю царкоўнага адзінства, якую ён разглядаў як адзін з асноўных фактараў захавання самастойнасці дзяржавы. Удакладніў думку былых працўнікаў, уніяцкіх палемістаў Л. Крэўзы і А. Сялявы аб тым, што хрышчэнне Русі адбылося ў час адзінства Царквы, адпаведна царкоўнае адзінства з'яўляецца старажытным і гістарычна абумоўленым, а гісторыя Праваслаўнай царквы ў ВКЛ – імкненне да еднасці царквы. Першым этапам хрысціянізацыі, на думку Сматрыцкага, было хрышчэнне Русі Галіцкай у 872 г. патрыярхам Ігнаціем, які быў у адзінстве з Рымскім папам. Другі этап – хрышчэнне Русі Кіеўскай у 980 г. і ўзвядзенне на кіеўскі пасад мітрапаліта Іларыёна без санкцыі патрыярха. Першай спробай выйсці з-пад юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярха стала пасвячэнне мітрапаліта Клімента (1046 г.). Князь Вітаўт таксама імкнуўся да стварэння аўтакефаліі і з гэтай мэтай стварыў Кіеўскую мітраполію. Доказамі імкнення да уніі былі пасвячэнне папам Кіеўскага мітрапаліта Грыгорыя Балгарына (1458 г.), пасланне Кіеўскага мітрапаліта Місаіла Папе Сіксту IV (1476 г.), прызначэнне без згоды патрыярха мітрапалітам Макарыя (1595 г.). М. Сматрыцкі падкрэсліваў, што размова ідзе пра аб’яднанне канфесій, а не знішчэнне адной з іх.[2]

Такім чынам, багаслоўскія спрэчкі абісціннасці той ці іншай рэлігіі выйшлі за межы тэалогіі і прывялі да дыскусіі аб грамадзянскай выгодзе і праблемах міжнацыянальных зносін унутры адной дзяржавы,

[1] АЗР. – Т. 4. – С. 88.
[2] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 274.



МГПУ им. И.П.Шамякина

міждзяржаўных і ўнутрыдзяржаўных адносін, што знайшло адлюстраванне ў ідэі царкоўнай еднасці (ідэі монацаркоўнай дзяржавы, незалежнай ад знешніх абставін, у дадзеным выпадку – Маскоўскай дзяржавы і Турцыі), адпаведна ў абмеркаванні стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы, паўнамоцтваў царкоўнай і свецкай улады, суадносін паняццяў "суверэнітэт" і "нацыянальныя" традыцыі, грамадзянскае права і права народаў. Аднак паплечнікі Іосіф Вельямін-Руцкі і Мялецій Сматрыцкі глядзелі па-рознаму на прыкметы народнасці і адпаведна на дзяржаўнае будаўніцтва. На думку ўніяцкага мітрапаліта, атрыбутамі народнасці з'яўляецца палітычная, этнічная, культурная і рэлігійная агульнасць для ліцвінаў. Ён меркаваў, што змена веравызнання не будзе хваравітая, таму што ўсе абрады і мова застануцца старымі, а унія – гэта вяртанне да "праўдзіва народнай рэлігіі."[1]

У той жа час Сматрыцкі вызначаў у паняцці "народнасць" пераменную і нязменную часткі. Ён выкарыстоўваў паняцці "старое" (праваслаўныя традыцыі і звычаі народа, эстэтычныя і маральныя нормы, якія не адпавядаюць новым умовам жыцця і шкодзяць будучыні) і "новае" (пануючае становішча Каталіцкай і Уніяцкай царквы, замацаванае дзяржаўным правам, вера і культура якіх значна вышэй, таму неабходна адмовіцца ад "старога" на карысць "новага". Дзяржава можа змяняць заканадаўства, уводзіць новыя правілы і змяняць звычкі народаў.[2] Разважанні пісьменніка выйшлі за рамкі канцэпцыі адзінства і набылі свецкі, а больш дакладна, культурна-палітычны характар, паклалі пачатак сучасным ідэям экуменізму.

Такім чынам, палемічныя творы М. Сматрыцкага выходзяць за межы тэалагічных дыскусій, адлюстроўваюць умовы міжканфесійнай барацьбы ў Рэчы Паспалітай, вызначаюць грамадскія і сацыяльна-палітычныя супярэчнасці. Творчасць знакамітага палеміста падзяляецца на два перыяды: праваслаўны і ўніяцкі. Да сярэдзіны 1620-х гг. галоўнай тэмай твораў пісьменніка было абгрунтаванне старажытнасці і ісціннасці праваслаўнай веры, неабходнасці захавання свабоды веравызнання і сацыяльнай стабільнасці, аднаўлення праваслаўнай іерархіі. М. Сматрыцкі-

[1] «Sowita wina», сочинение, изданное латино-униатами в 1621 году // АрЮЗР. – Ч. I, т. 7. – С. 454–461

[2] Smotrycki, M. Elenchus pism uszczupliwych, przez zakonniki zgromadzenia Wileńskiego Św. Troyce wydanych (...) w Wilnie r. P. 1622 / M. Smotrycki // АрЮЗР. – Т. 8. Ч. 1, вып. 1: Памятники литературной полемики православных с протестантами и латино-униатами в Югозападной Руси за XVI и XVII стол. – 1914. – С. 597–673.



МГПУ им. И.П.Шамякина

ўніят далучаецца да ідэі царкоўнай еднасці і монацаркоўнай дзяржавы, стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы, вызначэння паўнамоцтваў царкоўнай і свецкай улады як сродкаў вырашэння ўнутры-і знешнепалітычных праблем дзяржавы.

## 3.6. Аскетычна-нігілістычны накірунак праваслаўнай літаратуры (І. Вішанскі, А. Філіповіч)

Сярод антыўніяцкай апазіцыі можна вызначыць два асноўныя накірункі: аскетычна-нігілістычны і кампрамісны. Яскравым прадстаўніком першага быў Іван Вішанскі, манах Афонскага манастыра, таленавіты ўкраінскі пісьменнік, які ў сваіх працах адвяргаў не толькі унію, але і наогул заходнюю асвету, філасофію, "лацінства" і раіў праваслаўным вернікам абмяжоўвацца толькі богаслужэбнымі кнігамі і Святым Пісаннем.

Ён звяртаўся да ініцыятараў уніі М. Рагозы, К. Тарлецкага, І. Пацея з абвінавачваннямі ў тым, што яны не трымаліся запаветаў Бібліі: "ці не ваша мосць веру справамі злымі наперад яшчэ разбурылі? Каторы з вас, у свецкім жыцці будучы, шэсць запаветаў Хрыстовых сам па сабе выканаў? Ці не ваша міласць гэтыя шэсць запаветаў не толькі ў свецкім чыне разарылі, але і зараз у духоўным бясконца разараеце? Дзе вы хворым паслужылі? Ці не ваша мосць хворых са здаровых робіце, б'яце, катуеце, забіваеце?" Самі як ідалы на адным месце сядзіце, а калі і здарыцца гэты труп абалванатвораны на іншае месца перанесці, дык на калясніцы без журбы пераносіце, а бедныя падданыя і ўдзень і ўначы на вас працуюць і пакутуюць". Верагодна, меўся на ўвазе раздзел 25, п. 35–36 Евангелля ад Матфея: "алкал Я, и вы дали Мне есть, жаждал и вы напоили Меня, был странником и вы приняли Меня; был наг и вы одели Меня; был болен и вы посетили Меня; в темнице был и вы пришли ко Мне". Далей письменнік працягвае: "Спытаў бы я вас, што такое праца ачышчэння? Але вам і не снілася пра гэта; не толькі вы таго не ведаеце, але і вашы папы ісусалаяльнікі, так званыя езуіты, аб тым не турбуюцца і адказу даць не могуць… Каторы з вас прайшоў першую ступень падзвіжніцтва?" Іван Вішанскі асабіста звяртаецца да К. Тарлецкага: "пастукай па лысай галаве, біскуп луцкі! Колькі ты падчас свайго святарства чалавечых душ да бога паслаў?". Адносіны аўтара да Пацея і Рагозы вызначаюцца наступнымі радкамі: "Яго мосць кашталян Пацей, хоць і кашталянам быў, але толькі

МГПУ им. И.П.Шамякина

чатыры слугі за сабой валачыў, а зараз, калі біскупам стаў, дык больш дзесяці налічыш; таксама і яго мосць мітрапаліт, калі простай рагозінай быў, дык не ведаю, ці мог трымаць двух слуг, а цяпер больш дзесяці мае". Да першых уніяцкіх іерархаў адносяцца з'едлівыя радкі – абвінавачванні ў карысталюбстве: "ці не ваша мосць выхавалі ў сабе юр ліхвярства і свецкага здабыцця? Насыціцца ніяк не можаце, а усё большай скwапнасцю і прагай свецкіх рэчаў хварэеце".[1]

Назва вядомай працы абаронцы праваслаўя Захарыя Капысценскага – "Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви" – вызначала асноўную мэту аўтара. Па перакананні З. Капысценскага, праваслаўе – крыніца "стародавних отцовских звычаев и канонов", а унія – адступніцтва ад веры, дзяржаўная шкода – "шаленство и невзгода", інтрыгі Сатаны – "неприятель многих прельстил и прелщает", даніна "папежови" вядзе да таго, каб "Русі не было ў Русі".[2]

Катэгарычным праціўнікам пашырэння уніяцтва быў Афанасій Філіповіч, аўтар "Диариуша албо списка деев правдивых, в справе помноженя и объясненя веры православное голошеный" – выдатнага помніка грамадскай думкі Рэчы Паспалітай. Гэты твор быў складзены з ранейшых публіцыстычных прац "Навіны", "Фундамент непарадку касцёла рымскага", "Супліка трэцяя", "Прыгатаванне на суд", "Парада пабожная" і багаслоўскі трактат "Аб фундаменце царкоўным".

Дзейнасць Афанасія Філіповіча цалкам была скіравана на абарону праваслаўя, захаванне "великого народа христианского" ад прымусу ўрадавых колаў, крытыку канфесійнай палітыкі ў дзяржаве "вынищити тут в панстве христианском веру православную Грецкую".[3]

Філіповіч аргументаваў свае думкі, абапіраючыся на аўтарытэт Бібліі, цытаваў працы не толькі візантыйскіх айцоў царквы Аўгусціна, Іаана Златавуста і Іаана Метафраста, Псеўда-Дыянісія Арэапагіта, Феафілакта, але і іспанскага прапаведніка і багаслова XVI ст. А. дэ Костра, галандскага філосафа і гісторыка XVI – пачатку XVII ст. Ю. Ліпсіуса, польскага гісторыка XV ст. Я. Длугаша.

[1] Вишенский, Иван. Сочинения / Иван Вишенский. – М., Л, 1955. – С. 23.
[2] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. РИБ. – Т. 4. – С. 683, 320, 957, 315–316, 1069, 1129, 503, 1125, 1128, 1111.
[3] Филиппович, А. Диариуш албо список деев правдивых, в справе помноженя и объясненя веры православное голошеный // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. Т. 4. – С. 49–156. – С. 117; 89.



МГПУ им. И.П.Шамякина

У дачыненні да Берасцейскай царкоўнай уніі ён выкарыстоўваў выключна словазлучэнне “унея проклятая”, якая павінна быць “згублена на веки”, таму што выклікала “розделене Руси” і “непотребные колотни”, парушала грамадзянскую згоду: “похлебства, лакомства, заздрости, здрады, нецноты, а найбарзей пыха ся проклятая замножила; для тоей, и порядок духовный и светский южь-южь загинул”.[1] Аб катэгарычным непрыняцці ўніяцтва сведчыць перадсмяротны запавет – эпітафія на надмагіллі святога Афанасія*:* “Абы не была унея проклятая.., только ты, одна Церкви святая!”[2]

Афанасій Філіповіч са спасылкай на Длугаша сцвярджаў, што Русь спачатку падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярху. Унія, праклятая, таму што ўніяты пакінулі свайго пастыра і перайшлі ў падначаленне да Папы Рымскага, у той час як усім пяці хрысціянскім сталіцам: Канстанцінопальскай, Антыёхскай, Рымскай, Александрыйскай, Іерусалімскай – Богам была дадзена роўная духоўная ўлада. Праклён заслужылі былыя праваслаўныя іерархі – Пацей, Рагоза, Тарлецкі, якія сталі ўніятамі з карыслівых разлікаў. Унія спарадзіла крывавыя канфлікты паміж хрысціянамі, жорсткі пераслед праваслаўных з боку ўніятаў і нават унутрыдзяржаўную вайну з казакамі. Аднак цяпер “час наступил розделенья благословенных од проклятых”. І чыніць суд і аднавіць справядлівасць у дзяржаве павінен кароль як зямны выканаўца Боскага Промыслу. Ён разглядаў “барзо мудрых” езуітаў галоўнымі натхняльнікамі “проклятой унеи” і пераследу праваслаўных.[3]

У сваіх працах “Навіны”, “Супліка трэцяя” праваслаўны святы сведчыў аб дыскрымінацыі вернікаў “усходняй царквы” і сцвярджаў неабходнасць знішчэння уніі і даравання “успокоене грунтовное веры православной Грецкой”.[4] Менавіта з гэтай прапановай ён неаднаразова звяртаецца да караля Рэчы Паспалітай і Сейма.

Выступаючы на сейме 1643 г., Філіповіч патрабаваў неадкладна абараніць інтарэсы праваслаўных, у іншым выпадку гаспадару і сейму пагражае “страшны суд”: “Хотей же, ваша королевская милость, абы вера правдивая Грецкая грунтовне была успокоена, а унея проклятая вынищена и вниवечь обернена; бо если унею проклятую выкорените, а всходнюю

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Филиппович, А. Диариуш. – С. 74, 88, 104.
[2] Тамсама. – С. 154.
[3] Тамсама. – С. 85, 90, 92, 99–104, 128–130, 134.
[4] Тамсама. – С. 88–89, 96–97, 103–105, 106.

правдивую церковь успокоите, то щастливые лета ваши поживете. А если не успокоите веры правдивое Грецкое и не знесете унеи проклятой, то дознаете запевне гневу Божого… В воли то человечей есть. Обирай же собе, што хочь, поки час маешь…”.[1]

Да “Навін” далучаецца кароткая развага Афанасія Філіповіча “Падмурак непарадку касцёла Рымскага”. Асноўнымі прычынамі “няладу” ў каталіцкай царкве, на яго думку, з’яўляліся парушэнне канонаў, прадпісаных апосталам Паўлам – аддзяленне Рымскага Папы ад чатырох усходніх патрыярхаў і абранне галавы каталіцтва ніжэйшымі святарамі. У Праваслаўнай царкве па смерці аднаго з патрыярхаў яго месца займае новы выбраннік, пасвечаны ў гэты сан іншымі ўсходнімі патрыярхамі, што валодаюць роўнай духоўнай уладай. Такі духоўны парадак завешчаны самім Ісусам Хрыстом як правадыром зямной Хрысціянскай царквы. А цяжар грахоўных дзей заходняга кліру стаў такі вялікі, што “ваги несправедливости … аж до самого центрум пекелного упали”. Таму будзе Страшны суд Божы, па выніках якога ім забяспечаны вечныя пякельныя пакуты.

Падрыхтаваўшы некалькі асобнікаў мемарыяла “Навіны”, Афанасій Філіповіч адправіў яго каралю. Не атрымаўшы адказу, ён напісаў “Супліку трэцюю”, дзе паўтарыў сведчанні аб праведнасці Праваслаўнай царквы, пра беды, прынесеныя уніяй, пра хуткі канец свету. Аднак Бог, на думку праваслаўнага святара, можа змяніць свой справядлівы гнеў на міласць польскаму каралю і яго дзяржаве, калі той зробіць ласку даць “пожаданое успокоене Церкве Всходнеи правдиве кафолицкои”. Кароль не толькі мае права, але і абавязаны ўдзельнічаць ва ўрэгуляванні рэлігійных спрэчак. Так паступалі і першы хрысціянскі валадар Канстанцін, і іншыя хрысціянскія правіцелі Захаду і Усходу. Таму “ўбогі законнік” (Афанасій Філіповіч) звярнуўся непасрэдна да караля з заклікам “пилно вейзрити в тые справы церковные”. Скасаванне уніі немагчыма без выпраўлення духоўнай арганізацыі Рымскага касцёла. Правадыру каталікоў варта неадкладна злучыцца з патрыярхамі Усходу. Роскві каталіцтва часовы; толькі літасць Боская і дух вечнасці захоўвае Рымскі касцёл ад справядлівай кары. Высылка з Рэчы Паспалітай папскага нунцыя – знак таго, што кароль недалёкі ад здабыцця Царства Нябеснага. Скасаванне ж уніі прынясе каралю не толькі нябесную славу, але і поспех у зямных справах: “Посол вашой кролевской милости, пана мне милостивого, до

[1] Филиппович, А. Диариуш. – С. 74–75.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Москвы посланый, як в светлых променях воли Бозскои з дару Его святого внутрным оком вижу, заровнивается в одправе зо мною, послом Бозским. Як я, нендзный, выслухан и усправедливен буду в справах так великих и поважных Его святых, успокоеню, мовлю, веры православнои Грецкои, то так и там волею Бозской ехо паде".[1]

І на гэтую сваю адозву подзвіжнік не атрымаў адказу. Наступнай яго працай стала прамова "Прыгатаванне на суд", напісаная на выпадак выкліку ў суд. Яна пачынаецца з кароткіх звестах пра гісторыю хрысціянства, прынятага Руссю з Канстанцінопаля, а Польшчай з Рыма – абодва народы Рэчы Паспалітай "двоякую якобы веру чинили, и двояко ся тут здавна Русь и Поляки, звлаща в набоженстве, заховали". Каралі паважалі правы і прывілеі праваслаўя, а Канстанцінопальскія патрыярхі з руплівасцю выконвалі свае пастырскія абавязкі.

Уніяты сталі самымі жорсткімі ганіцелямі Праваслаўнай царквы. На думку Філіповіча, прынцыповыя рознагалоссі паміж вернікамі Саборнай Апостальскай і уніяцкай цэрквамі былі ў наступным:

1. замест адзінага пастыра Ісуса Хрыста прызналі яго намесніка на зямлі – чалавека: "же одопхнули мизерне правдивого, единого пастыра Иисуса Христа од Церкве, Его власною кровию пренайдорожшою набытой, и одтяли голову сполне Бозскую и чловечую од тела Его (аж з уруганем пышным), а приняли собе на тое местце чловека едного за пастыра и голову";

2. парушэнне прывілеяў і нормаў свецкага і духоўнага права Рэчы Паспалітай і замена іх пастановамі Фларэнційскага і Трыдэцкага сабораў: "же взрушили право посполитое духовное и светское, публичное и приватное, то ест: каноны, статуты и конституции, фундуши и привилея, также значне и явне чинячи умнейшене и затлумене веры правдивой Грецкой, бо доложоно того в листи, от отца папежа Клементиа им даным, абы вже толко, ведлуг сенодов Флиоренского и Триденского, заховывалися, то есть: щоколвек вже други Костёл Рымский, Заходний, хвалит, абы и они хвалили 2;

3. розніца ў разуменні хрысціянскіх дагматаў: "похожение Святого Духа так и од Сына, як и од Отца, сакромент святый в оприсноку под единою особою, чистец душам по смерти огнистый, пост соботный и иншии посты розерваны, безженство капланом светским, календару

[1] Филиппович, А. Диариуш. – С. 74–75.



МГПУ им. И.П.Шамякина

отмена, юбилеуши на непопелныи грехи, отпущениа грехов, и все ведлуг наук вымышленых, новых, папежских, що рок одменных, а не ведлуг Христовых, апостолских сенодов седми и канонов Отцев Святых”;

4. раскол адзінай сапраўднай праваслаўнай веры: “же целость двом тылко релиам, мяновите Рымской и Грецкой з давных часов тут правом наданую и змоцненую, отняли и поторгали”.

У сваім творы – “Пра падмурак царкоўны” – Афанасій Філіповіч закрануў пытанне пра аўтарытэт папы і рымскага біскупа, адно з самых вострых рознагалоссяў праваслаўя і каталіцтва. Філіповіч сцвярджаў, што ў Новым Запавеце няма згадак пра асабістыя правы апостала Пятра, адпаведна іх няма ў нібыта яго духоўнага пераемніка, Папы Рымскага.

Яму таксама належыць “Порада побожная, именем Иисуса Христа, Откупителя нашего, кролю Полскому Владиславови Четвертому, пану а пану мне милостивому”. Афанасій Брэсцкі прапанаваў каралю знішчыць ерэтычныя, іўдзейскія і язычніцкія сачыненні; выгнаць з дзяржавы езуітаў, “бо значнии то суть предотечи антихристовы”. Далей ідзе размова пра слабасці ўлады Гаспадара: “Що то за лиос – быти господарем в нерядным дому и паном в своволном панстве? Добре ся то стало, же десятину з плебаний дают каплани вашой кролевской милости, пану мне милостивому. Значит то понижене гордости Римского панства, и юж упала”.

Аб шанаванні імя Афанасія Філіповіча праваслаўнай царквой сведчаць паданне “О смерти славнои памяти небожчика отца Афанасиа Филиповича, игумена Берестейского православного (повесть през послушников его списана), року 1648 сталой, под час безкрулевя”, складзенага пасля пакарання смерцю ігумена яго вучнямі і прыхільнікамі, а таксама іншых “жыццяў” і шматлікіх спісаў “Дыярыуша”.

Такім чынам, дзейнасць Афанасія Філіповіча з’яўляецца адбіткам гістарычных абставін сярэдзіны XVII ст., напружанай міжканфесійнай барацьбы і сацыяльна-палітычных супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай. Ён быў прыхільнікам ісіхазму (этычна-аскетычнага вучэння, пашыранага сярод праваслаўнага манаства), што абумовіла розныя ацэнкі яго дзейнасці ад рэлігійнага фанатызму (Кастамараў) да дзеяча “хрысціянскага гуманізму”, аскета-апостала і актыўнага грамадскага дзеяча.[1]

[1] Коршунов, А.Ф. Афанасий Филиппович: Жизнь и творчество / А.Ф. Коршунов. – Минск: Наука и техника, 1965. – С. 93; Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С.А. Падокшын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – С. 247.



МГПУ им. И.П.Шамякина



*Кіева-Магілянская калегія, галоўны корпус. Сучасны выгляд*

Для яго твораў характэрна выкарыстанне сакральна-містычных элементаў з апісаннем "чудесных видений" Прачыстай Багародзіцы ў вобразе Купяціцкай Божай маці, якая вызначала матывы і сродкі дзейнасці Берасцейскага ігумена для дасягнення галоўнай мэты – сусветнага сцвярджэння праваслаўя. Гэтымі абставінамі тлумачыліся некаторыя эпатажныя ўчынкі Філіповіча, накіраваныя супраць афіцыйных колаў дзяржавы ў барацьбе супраць пашырэння уніі і дыскрымінацыі праваслаўнага насельніцтва. Яго творы ўвасаблялі радыкальна-антыўніяцкі накірунак у праваслаўнай рэлігійнай палеміцы таго часу і значна паўплывалі на фарміраванне антыўніяцкіх настрояў у Рэчы Паспалітай.

Ва ўмовах пашырэння дыскрымінацыі праваслаўя сярод прадстаўнікоў гэтага накірунку пашыраецца тэзіс звярнуцца за падтрымкай да Маскоўскай дзяржавы. Афанасій Філіповіч падчас яго візіту ў Маскву атрымаў пэўную матэрыяльную дапамогу. Кіеўскі мітрапаліт Іоў Барэцкі (1619–1631 гг.) у 1625 г. са згоды пэўнай часткі запарожскага войска тайна прапанаваў маскоўскаму ўраду прыняць Украіну пад уладу рускага цара. Яго пераемнік мітрапаліт Ісая Капінскі (1631–1633 гг.) заклікаў да ўзброенай барацьбы з уніяй, лічыў неабходным звярнуцца да маскоўскага цара з чалабітнай, каб той абвясціў праваслаўных Рэчы Паспалітай сваімі падданымі.[1]

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 317.



МГПУ им. И.П.Шамякина

## 3.7. Пошукі кампрамісу ў праваслаўным асяродку (С. Косаў, П. Магіла, І. Трызна)

Аскетычна-нігілістычнай тэндэнцыі ў праваслаўі супрацьстаялі святары і “дыдаскалы” (выкладчыкі) брацкіх школ, якія негатыўна ставіліся да уніі, але не адмаўлялі дасягненняў заходнеўрапейскай культуры і адукацыі (“лацінства”). Яны патрабавалі легалізацыі праваслаўнай царквы, вяртання належнай ёй маёмасці і прывілеяў, захавання роўных правоў за ўсімі хрысціянскімі веравызнаннямі ў адпаведнасці з нормамі Статута ВКЛ 1588 г. (раздзел ІІІ, арт. 3). Лічылі сябе грамадзянамі Рэчы Паспалітай і лаяльна ставіліся да ўрада. Адпаведна не прытрымліваліся прамаскоўскай арыентацыі ў адрозненне ад прадстаўнікоў нігілістычнай лініі, але імкнуліся таксама захаваць добрыя адносіны з маскоўскім праваслаўем.



*Мітрапаліт праваслаўны Кіеўскі, Галіцкі і ўсея Русі Пётр Магіла*

Пашырэнне кампраміснай тэндэнцыі сярод праваслаўных было абумоўлена канкрэтна-гістарычнымі ўмовамі развіцця Рэчы Паспалітай у XVI–XVII стст. Многія прадстаўнікі праваслаўнага святарства вучыліся ў пратэстанцкіх і каталіцкіх школах, універсітэтах Заходняй Еўропы. На думку Старасценкі В. У., менавіта складванне асобнага тыпу свецкага і царкоўнага дзеяча ў ВКЛ “на мяжы культур” – усходне- і заходнееўрапейскай, грэка-візантыйскай і лацінскай – садзейнічала фарміраванню “стратэгіі сацыяльна-рэлігійнага кампрамісу”, заснаванай на “адмове ад сілавых метадаў рашэння канфесійных спрэчак.”[1]

Менавіта да ўмерана-кампраміснага накірунку праваслаўнай іерархіі можна аднесці Пятра Магілу, які шмат зрабіў для ўмацавання легальнага становішча Царквы ў 20–30 гг. XVII ст. Адміністрацыйныя сродкі ўсталявання ў краіне канфесійнай згоды станоўчых вынікаў не прынеслі. Царкоўная унія абвастрыла існуючыя не толькі рэлігійныя, але і

[1] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. – Т. 3. – С. 233.

МГПУ им. И.П.Шамякина

сацыяльна-палітычныя супярэчнасці. Рэлігійнае супрацьстаянне абумовіла неабходнасць пошуку выйсця з бясконцых канфесійных сварак. Ініцыятывы стварыць аўтакефальную царкву таксама не знайшлі паразумення ў Ватыкане, не было адзінства і сярод праваслаўнага святарства ў справе прымірэння ўніятаў і праваслаўных. Спробы вырашыць дагматычныя рознагалоссі большасць праваслаўнага святарства разглядала як здраду (Кіеўскі праваслаўны сабор у 1628 г. абвясціў анафему апошніх прац М. Сматрыцкага, які прапанаваў вырашэнне гэтай праблемы)[1]. Спробы склікаць агульныя Саборы ўніятаў і праваслаўных у 1629 г. з мэтай аб'яднання выклікалі пратэст з боку часткі праваслаўнай шляхты, казацтва даслала ультыматум Кіеўскаму мітрапаліту Іову Барэцкаму з патрабаваннем захаваць старажытныя традыцыі.[2]

Каб знізіць вострыню грамадскіх супярэчнасцей і атрымаць падтрымку казацтва, неабходнага для барацьбы з асманскай небяспекай, новы кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV знайшоў выйсце ў зацвярджэнні вядомых "Артыкулаў заспакаення народа грэчаскай рэлігі" і афіцыйным аднаўленні праваслаўнай іерархіі ў 1632 г.

Неардынарны лёс П. Магілы таксама сведчыць пра складаную канфесійную сітуацыю ў Рэчы Паспалітай і спробы знайсці кампраміс. Выдатны царкоўны дзеяч, дыпламат, пісьменнік, будучы Кіева-Пячорскі архімандрыт, пазней Кіеўскі мітрапаліт, заснавальнік Кіеўскай калегіі паходзіў з праваслаўнага роду малдаўскіх князёў, меў сваяцкія адносіны праз шлюб сваёй сястры з магнацкім родам Вішнявецкіх. Атрымаў адукацыю ў Львоўскай брацкай школе, затым у Замойскай акадэміі, знаходзіўся пад апекай канцлера і вялікага гетмана Рэчы Паспалітай Станіслава Жалкеўскага падчас вайсковай службы. Удзельнічаў у баях супраць турэцкіх войск у 1620 г. пад Цяцорай і Хоцінам у 1621 г. Вядома, што П. Магіла часта наведваў Кіеў, у 1627 г. прыняў манаскі пострыг і амаль адразу быў абраны архімандрытам Кіева-Пячорскай лаўры, вызначаўся як знаўца багасloўя і здольны арганізатар, дыпламат.[3]

Адным з галоўных накірункаў яго дзейнасці была асветніцкая. Пра заснаванне ім лаўрскай школы і яе аб'яднанне з брацкай размова ішла

[1] Смотрицкий, М. Апология моему странствованию на Восток. Сочинение Мелетия Смотрицкого, архиепископа полоцкого, епископа витебского и мстиславского, архимандрита виленского и дерманского // Кирилло-Мефодиевский сборник. – Leipzig; Paris, 1863. – Вып. 1.

[2] Україна: хронологія розвітку. Т. 4. – С. 275–276.

[3] Тамсама. – Т. 4. – С. 105, 289.

МГПУ им. И.П.Шамякина

вышэй. Магіла здолеў заручыцца падтрымкай казацтва. Ён добра ўсведамляў, што ўмацаваць грамадска-палітычнае становішча праваслаўнай царквы магчыма толькі шляхам яе рэфармавання, умацавання арганізацыйнай структуры і дысцыпліны, атрымання святарамі неабходнай адукацыі.

Частка праваслаўных дзеячаў таксама разумела, што брацкія школы не здолеюць супрацьстаяць адукацыі еўрапейскіх універсітэтаў і акадэмій, дзе навучанне вялося на лаціне. Навучанне на царкоўнаславянскай ці грэчаскай мовах ізалявала навучэнцаў ад дасягненняў еўрапейскай культуры і было недастатковым для паспяховай кар'еры ў Рэчы Паспалітай, дзе польская мова і лаціна былі неабходнымі ўмовамі зносін. П. Магіла лічыў неабходным пашырэнне адукацыі па еўрапейскім ўзоры, збіраў аднадумцаў, запрашаў лепшых выкладчыкаў і багасловаў у Кіева-Магілянскую калегію. У палемічнай працы, выдадзенай у друкарні Кіеўскай лаўры ў 1644 г. пад яго рэдакцыяй (магчыма, ён быў аўтарам), "Λίθος, abo kamień" даводзілася, што грэчаская і царкоўнаславянская мовы неабходны русінам у рэлігійных справах, у грамадскім і палітычным жыцці трэба валодаць не толькі польскай мовай, але і лацінай, якой карыстаюцца ў Кароне як другой роднай мовай, калі русін не жадае праславіцца невукам ці іншаземцам, які размаўляе праз перакладчыка[1].

Спалучэнне праваслаўнага зместу адукацыі з формамі і сродкамі навучання па ўзоры езуіцкіх устаноў ў Кіева-Магілянскім калегіуме дазволіла не толькі скласці канкурэнцыю лепшым установам адукацыі ў Рэчы Паспалітай, але і спрыяла захаванню самой калегіі.

На думку І. Шаўчэнкі, спалучэнне здабыткаў заходнееўрапейскай культуры праз форму і змест "лаціна-польскай" адукацыі і праваслаўных традыцый у Кіева-Магілянскай калегіі вырашала да канца XVII ст. адразу дзве складаныя задачы: вызначала пэўную альтэрнатыву паланізацыі для беларуска-ўкраінскай праваслаўнай шляхты і стрымлівала русіфікацыю пасля Вечнага міру 1686 г., калі канчаткова быў вырашаны лёс Кіева, які застаўся ў складзе Рускай дзяржавы. Тым самым вызначаліся ўмовы для захавання самабытнасці народаў і развіцця нацыянальнай самасвядомасці.[2]

1 Лифос // Ар ЮЗР. – Ч. 1, т. 9. – Киев, 1893. – С. 375–377.
2 Шевченко, Ігор. Україна між Сходом і Заходом. Нариси з історії культури до початку XVIII століття / Ігор Шевченко; авторизований переклад з англійської Марії Габлевич, під редакцією Андрія Ясіновського. – Львів: Інститут Історії Церкви Львівської Богословської Академії, 2001. – С. 142.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Абранне П. Магілы мітрапалітам Кіеўскім, Галіцкім і ўсея Русі і званне экзарха Канстанцінопальскага патрыярхату ў 1633 г. дазволіла яму сканцэнтраваць царкоўную ўладу, падпарадкаваць стаўрапігіяльныя брацтвы і пачаць рэфармаванне царквы. Новы мітрапаліт патрабаваў ад святарства абавязковага атрымання агульнай і багаслоўскай адукацыі, стараннага выканання кананічных правіл падчас набажэнстваў і ў паўсядзённым жыцці, пазбягаць правін і клапаціцца пра паству. З мэтай кантролю за дзейнасцю духавенства была створана кансісторыя.

Ён здолеў умацаваць матэрыяльнае становішча мітраполіі. Былі адноўлены Кіеўскі Сафійскі сабор, цэрквы Трох святцеляў і св. Міхаіла ў Выдубіцкім манастыры, Спаская царква ў Берастове. Ва ўласнасць праваслаўных перайшлі таксама Выдубіцкі, Міхайлаўскі, Пустынна-Нікольскі манастыры і інш.[1] Пад рэшткамі Дзесяціннай царквы ў Кіеве былі знойдзены мошчы князя Уладзіміра. Іх ушанаванне, аднаўленне старажытных храмаў, кананізацыя пячорскіх старцаў павінны былі сведчыць аб сакральнай спадчыне праваслаўя, пераемнасці старажытных візантыйскіх традыцый. У гэтым выпадку можна сцвярджаць пра ўмацаванне традыцыі вызначэння Кіева як духоўнага цэнтра праваслаўя. Гэтая тэндэнцыя назіраецца ў большасці літаратурных твораў на беларускіх і ўкраінскіх землях у XVII ст., асабліва выдадзеных у друкарні Кіева-Пячорскага манастыра.

Пра пашырэнне ідэі пераемнасці Кіева старажытнага (слаўных часоў) і сучаснага можна гаварыць ужо на пачатку 1620-х гг. Войска Запарожскае на чале з гетманам Сагайдачным адкрыта выступіла ў абарону праваслаўя і запісалася ў Кіеўскае брацтва ў 1620 г. Іоў Барэцкі, прысвечаны ў сан Кіеўскага мітрапаліта Іерусалімскім патрыярхам Феафанам пры падтрымцы Запарожскага казацтва, у “Пратэстацыі” 1621 г. аб законнасці аднаўлення праваслаўнай іерархіі, што пазней скарыстаў М. Сматрыцкі, сцвярджаў пераемнасць традыцый Русі ад славянскага родапачынальніка Яфета і яго нашчадкаў, якія разам з князямі Алегам і Уладзімірам хадзілі на Царград, хрысціліся і зараз вызнаюць веру продкаў[2].

Сродкамі мастацкага слова гэта ідэя знайшла ўвасабленне ў “Вершах на жалобный погреб зацного рыцера Петра Канашэвіча Сагайдачного”

[1] Хижняк, З. І. Історія Києво-Могилянської академії / З. І. Хижняк, В. К. Маньківський. – К.: Вид. дім “КМ Академія”, 2003. – 184 с. – С. 44.
[2] Возняк, М. Історія української літератури / М. Возняк. – Т. 2, ч. 1. – Львів, 1992. – С. 259.

МГПУ им. И.П.Шамякина

1622 г. другога рэктара Кіеўскай брацкай школы Касіяна Саковіча. Ён параўноўваў казацтва з легендарнымі героямі і вызначаў паходжанне казакоў ад племені Яфета, які разам з Алегам ваяваў Царград. Іх нашчадкі разам з князем Уладзімірам прынялі хрысціянскую веру ад Царграда і сёння выступаюць у абарону веры продкаў. Саковіч заклікаў надалей ахоўваць інтарэсы дзяржавы і служыць каралю Рэчы Паспалітай.[1]

Найбольш вядомыя творы, выдадзеныя пры падтрымцы ці непасрэдным удзеле Пятра Магілы ў Кіева-Пячорскай друкарні ў XVII ст., былі “Patericon” Сільвестра Косава 1635 г., “Ліфас” 1644 г., “Кіева-Пячорскі патэрык“ І. Трызны 1661 г. Яны працягвалі летапісную традыцыю (Кіеўскі пачатковы летапіс) радаводу кіеўскіх князёў ад біблейскага Яфета, сына Ноя. Найважнейшай падзеяй з’яўлялася хрышчэнне Русі князем Уладзімірам, у некаторых выпадках узгадваўся апостал Андрэй і княгіня Вольга, затым размова ішла пра талерантную канфесійную палітыку ў часы ВКЛ і дыскрымінацыю праваслаўных у Рэчы Паспалітай.

Ва ўмовах міжканфесійнай барацьбы зараджаецца і пашыраецца ідэя праваслаўнага ўсходнеславянскага адзінства як аднаго са сродкаў узмацнення царквы. Прыхільнікамі гэтага напрамку былі Іоў Барэцкі, Пётр Магіла, Сільвестр Косаў, Фама і Ігнат Іяўлевічы, і інш. Мітрапаліты І. Барэцкі, П. Магіла звярталіся да маскоўскага праваслаўя за матэрыяльнай дапамогай, размова пра падпарадкаванне Маскоўскаму патрыярхату не ішла.

Прафесар Кіева-Магілянскага калегіума, затым ігумен Полацкага Багаяўленскага манастыра, узведзенага ў сан Кіеўскім мітрапалітам П. Магілам, Ігнат Іяўлевіч у 1656 г. сцвярджаў: “Православию Белороссийскому имети по тме свет, по власти, зело враждующей на благочестие, видети царя Великаго Государем не токмо Малыя и Белыя России, но всего победами прежде повсюду славнаго Королевства Польскаго и Великаго княжения Литовскаго, ревнующим по благоверии вельми велико дело есть, и благодарственных всяких молитв достойно.”[2] Неабходна таксама ўлічыць, што падчас прывітальнага слова І. Іяўлевіча Аляксею Міхайлавічу ў 1656 г. адбывалася вайна Рэчы Паспалітай з рускай

[1] Українська поезія. Кінець XVI – початок XVII ст. – Київ, 1978. –С. 322–338.

[2] Древняя Российская библиофика, содержащая в себе собрание древностей российских, до истории, географии и генеалогии российския касающихся / изд. Н. Новиков. – 2-е изд. – М.: Тип. Компании типографической, 1788. – Ч. III. – С. 320–321.



МГПУ им. И.П. Шамякина

дзяржавай і значная частка беларускіх зямель была занята рускімі войскамі, таму задачы ў духавенства былі іншыя – захаваць існуючы маёмасны і прававы стан.

Аднак нявырашаныя сацыяльна-палітычныя і канфесійныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай, вайна з Рускай дзяржавай выклікалі неадназначныя адносіны да яе нават саміх стваральнікаў гэтай канцэпцыі. Аб чым сведчыць характарыстыка, дадзеная П. Магілу расійскім даследчыкам К. В. Харламповічам: “Вопрос о характере отношений Петра Могилы к Москве мы бы так решили: не отдавая безусловного предпочтения польскому политическому и общественному строю перед Московским государством с его жестокостми, неограниченным самодержавием и невежеством, поскольку проявления последнего были и в Польше, Могила только тогда и настолько полностью был на стороне польско-литовской, когда правительство обеспечивало гражданские и религиозные свободы своим подданым православным, и чем больше они притеснялись, тем сильнее он своими симпатиями стремился к Москве, которая для него и для многих других была последним убежищем.”[1]

Адной з задач Кіеўскага мітрапаліта ў справе ўмацавання Царквы была таксама літургічная рэформа (упарадкаванне богаслужэбнай практыкі). Гэта быў самы дзейсны адказ на крытыку ў каталіцкай палеміцы. Пад непасрэдным кіраўніцтвам Пятра Магілы Ісаем Трафімовічам-Казлоўскім, Ігнатам Аксеновічам-Старушычам, Іосіфам Канановічам-Гарбацкім быў складзены першы праваслаўны Катэхісіс – “Праваслаўнае вызнанне веры” (1639). Для яго абмеркавання быў скліканы праваслаўны царкоўны Сабор у Кіеве (9 – 15 верасня 1640 г.). Пасля яго зацвярджэння не толькі духавенствам Кіеўскай мітраполіі, але і патрыярхамі Канстанцінопальскім, Александрыйскім, Антыяхійскім, Іерусалімскім праца атрымала сусветнае прызнанне і стала асновай веравучэння, была перакладзена на царкоўнаславянскую, румынскую, грэчаскую, польскую, лацінскую мовы і вытрымала на працягу XVII – XVIII стст. не менш 25 выданняў.[2]

[1] Харлампович, К. В. Малороссийское влияние на великорусскую церковную жизнь / К. В. Харлампович. – Казань: Изд. книжного магазина М. А. Голубева, 1914. – Т. I. – С. 50.
[2] Хіжняк, З. І., Маньківський, В. К. Історія Києво-Могилянської академії. – С. 45.



МГПУ им. И.П.Шамякина

У 1646 г. у Кіева-Пячорскай друкарні быў выдадзены яшчэ адзін багаслоўскі твор, вядомы і пашыраны па усёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропе, "Трэбнік" ("Евхалогион", або Малітваслоў), збор апісанняў набажэнстваў з царкоўнаславянскіх, грэчаскіх, лацінскіх тэкстаў у асобнай рэдакцыі. Ён вызначаў парадак чытання маліваў і правядзення таінств (хрышчэння, прычасця, вянчання і інш) ці трэб і налічваў 127 набажэнстваў (чынаў), з якіх 37 былі раней невядомымі, 20 з іх не знойдзены ў грэчаскай ці славянскай традыцыі.[1] Гэта была сваеасаблівая вялікая энцыклапедыя праваслаўных набажэнстваў на 1760 старонках з малюнкамі вядомага майстра гравёра Іллі, дзе тлумачыліся царкоўныя дагматы. Каноны, вызначаліся малітвы і абрады.[2] Іншыя менш вядомыя багаслоўскія творы: "Евангелие Учительное", "Антология". "Слово про Христа Спасителя и хрест кожной людины". Вядомы палемічны твор "Ліфас (Літос), або камень", напісаны ў адказ на твор К. Саковіча "Перспэктыва" на польскай мове, дзе тлумацца ці адвяргаюцца ўсе крытычныя заўвагі аўтара. Заслугі Пятра Магілы ў справе ўмацавання аўтарытэту праваслаўнай царквы прызнаюцца як яго прыхільнікамі, так і яго супернікамі.




*Трэбнік П. Магілы, !646 г. Друкарня Кіева-Пячорскай лаўры*

На думку мітрапаліта Макарыя (Булгакава), даследчыка і знаўцы царкоўнай гісторыі "імя Пятра Магілы – адно з лепшых упрыгожванняў нашай царкоўнай гісторыі, ён перасягаў усіх сучасных яму іерархаў не толькі Маларускай, але і Вялікарускай царквы і нават усёй царквы Усходняй, перасягаў сваёй адукаванасцю, яшчэ больш сваёй любоўю да адукацыі. сваеім подзвігамі на карысць асветы і Царквы…абараніў яе правы, зняважаныя лацінянамі і ўніятамі, заснаваў калегіюі паклапаціўся скласці "праваслаўнае веравызнанне.[3]

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Україна. Хронологія розвітку. Т. 4. – С. 334.
[2] Хіжняк, З. І., Маньківський, В. К. Історія Києво-Могилянської академії. – С. 45.
[3] Макарий (Булгаков, М. П.). История русской церкви: в 9 т. – М.: Изд-во Спасо-Преображенского Валаамского монастыря, 1994–1997. – Т. 9: История Западно-русской церкви. – 1997. – Т. 9. – С. 72.

Іншы даследчык гісторыі рускай царквы пачатку XX ст. А.В. Карташоў лічыў, што галоўныя багаслужэбныя кнігі, выдадзеныя пад рэдакцыяй П. Магілы, “Катэхісіс” і “Трэбнік” не адпавядаюць праваслаўных канонам і прасякнуты “духам лацінства”, частка набажэнстваў і малітваў запазычана з “Rituale” папы Паўла V, выдадзенага ў 1637 г. На яго думку, мітрапаліт марыў наблізіць усходняе і заходняе хрысцыянства, быў лаяльным стаўленікам караля Рэчы Паспалітай Уладзіслава IV.[1]

Палемічны твор 1644 г., вядомы пад скарочанай назвай “Ліфас (ад грэчаскага літас, у перакладзе камень), або камень” меў вялізную назву, вытрыманую ў літаратурных традыцыях XVII ст., Ліфас. або камень, кінуты з прашчы праўды царквы святой праваслаўнай Рускай на скрушэнне фальшыва-чорнай Перспектывы або хутчэй пасквілю ад Касіяна Саковіча, які быў раней архімандрытам Дубенскага ўніяцкага манастыра, нібы аб памылках, ерасях і забабонах царквы Рускай не ўніяцкай, у артыкулах веры, выкананні Сакраментаў і іншых абрадах і цырымоніях знойдзеных, годзе 1642 у Кракаве выданага, дазволенага праз пакорнага айца Яўсевія Піміна (kamień z procy prawdy cerkwie święiey prawosławney Ruskiey na skruszenie faleczznociemniey Perspektiwy abo raczey poszkwilu od Kassiana Sakowicza, byłego przedtym Archimandritę Dubenskiego unita, iakoby o błędach, haereszych y zabobonach, cerkwie Ruskiey, w unii nie będącey, tak w artikułach wiary, iako w administrowaniu Sakramentów y inszych obrządkach y ceremoniach znaydniących się, roku P. 1642, w Krakowie wydanego, wypuszczony, przez pokornego oyca Evzebia Pimina”).[2]

Аўтарства твора не вызначана, але даследчыкі сцвярджаюць, што найбольш верагодным з’яўляецца калектыўнае аўтарства пад непасрэдным кіраўніцтвам П. Магілы і яго рэдакцыяй пад агульным псеўданімам. Гэта аб’ёмісты трактат (выданне Кіеўскай археаграфічнай камісіі налічвала 355 старонак і 147 старонак С. Голубева), які ўтрымлівае шмат сведчанняў, спасылак і даведак напісаць за кароткі час (ад выдання “Перспектывы” ў 1642 г. да друку “Ліфаса” ў 1644 г.) немагчыма.

У дачыненні да “Ліфаса” даследчык царкоўнай гісторыі Макарый (Булгакаў) сцвярджаў, праца ўяўляла адначасова “апалагетыку праваслаўю

[1] Карташев, А. В. Очерки по истории русской церкви: в 2 т. / А. В. Карташев. – М., 1991. – Т. 2. – С. 287.
[2] Лифос… // АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 9. – 599 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

і літургіку з тлумачэннем набажэнстваў і таінств, абрадаў, будовы храмаў, пастоў і святаў”.[1]

Па структуры і змесце “Ліфас, альбо Камень” адпавядае “Перспектыве”, падзяляецца на такія ж часткі. Аўтар ці аўтары адказваюць на ўсе заўвагі Саковіча, растлумачваюць парадак выканання Сакраментаў (таінстваў хрышчэння, мірапамазання, прычасця (Еўхарыстыі), пакаяння, елеясвячэння, святарства, шлюбу) і парадак набажэнстваў са спасылкамі на аўтарытэты айцоў Царквы Васілія Вялікага, Іаана Златавуста, Баронія, Фамы Аквінскага і інш. Непрыстойныя паводзіны некаторых праваслаўных святароў тлумачаць толькі асобнымі выпадкамі, прычыняй якіх з’яўляецца унія, адсутнасць царкоўнай іерархіі працяглы час. Падрабязна выкладаюць дагмат зыходжання святаго Духа ад Айца і адвяргаюць абвінавачанні Саковіча ў тым, што праваслаўныя падзяляюць пратэстанцкія ерасі лютэран і кадьвіністаў.

Як і “Перспектыва” “Ліфас” вытрыманы ў такой жа з’едлівай і саркастычнай манеры ў адносінах да апанента, часам з абразлівымі кпінамі ў дачыненні да К. Саковіча. Яго называюць “бязглуздым паклёпнікам”, “дурнем”, “невукам”, “баламутам”, “крывадушнікам”, “рабом пуза”, “дударом” і “нястрыманым на язык, як бессаромная гандлярка”, бязбожнікам, ерэтыком і інш.[2] Неаднаразова згадваюць пра яго фізічны недахоп (у дзяцінстве страціў вуха), таму Саковічу “лепш разважаць пра свінняў, які з’елі яго вуха, чым вызначаць таінствы”.[3] У прадмове да “Ліфаса” С. Голубеў, нягледзячы на адмоўнае стаўленне да Саковіча “як двойчы здрадніка”, тым не менш заўважыў, што яго крытычныя заўвагі на “памылкі і забабоны” ў багаслужэбніых кнігах, або ўвогуле іх адсутнасць, нераспрацаванасць практыкі набажэнстваў садзейнічалі распрацоўцы і выданню “Трэбніка” і іншых кніг.[4] “Ліфас” быў перакладзены на царкоўнаславянскую мову і быў пашыраны ў Рускай дзяржаве.

Асобнае месца сярод прыхільнікаў рэфармавання праваслаўнай царквы належыць Сільвестру Косаву (каля 1597–1600 – 13.04.1657). Сільвестр Косаў, выкладчык рыторыкі і філасофіі, прэфект Кіеўскай калегіі, аднадумца і пераемнік П. Магілы, прыхільнік пашырэння асветы па

[1] Макарий (Булгаков, М. П.). История русской церкви. – Т. 9: История Западно-русской церкви. – С. 71.
[2] АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 9. – С. 30, 355, 332, 25, 47, 52, 32, 155, 112, 105, 309, 47, 82.
[3] АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 9. – С. 41, 24, 114, 127, 144, 188.
[4] Голубев, С.Т. Предисловие // Лифос… – С. 136.

МГПУ им. И.П.Шамякина

заходнееўрапейскім ўзоры, нарадзіўся ў в. Жыровіцы (суч. Слонімскі раён Гродзенскай вобл.), вучыўся ў Віленскай і Кіеўскай брацкіх школах, атрымаў адукацыю ў Люблінскім езуіцкім калегіуме і Замойскай акадэміі. У 1634 г. ён быў абраны епіскапам Мсціслаўскім, Аршанскім і Магілёўскім, а пасля смерці П. Магілы ў 1647 – мітрапалітам Кіеўскім, Галіцкім і всея Русі. Яму належыць даволі значная гісторыка-публіцыстычная спадчына.


ΠΑΤΕΡΙΚΟΝ
ABO
ZYWOTY SS
OYCOW PIECZAR-
SKICH
Obszyrnie Słowieńskim ięzykiem przez Swiętego
NESTORA ZAKONNIKA
y Látopiscá Ruskiego przedtym nápisány.
PRZEZ
KOSSOWA, Episkopá Mścisławskiego,
Orszáńskiego, y Mohilewskiego.
W KIIOWIE,
W DRVKARNI S. LAWRY PIECZARSKIEY
ROKV, 1635.

*Жыццяапісанні святых айцоў Пячорскіх (Patericon) Сільвестра Косава,1635 г. Тытульная старонка.*

Самая вядомая праца С. Косава – “Patericon, abo Zywoty svetych ojcow pieczarskich”, выдадзеная ў 1635 г. у лаўрскай друкарні. Гэта аўтарская перапрацоўка розных рэдакцый Кіева-Пячорскага патэрыка на польскай мове, што ўтрымлівала не толькі аповеды пра вядомых іканаў, святых старцаў Пячорскага манастыра (узнік у сярэдзіне XI ст.), але і гістарычныя звесткі пра хрышчэнне Русі (5 этапаў ад апостала Андрэя да кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча), храналагічны пералік усіх кіеўскіх мітрапалітаў да Пятра Магілы. Польскамоўнае выданне Патэрыка з далучэннем гістарычных звестак са спасылкамі на вядомыя ў Еўропе аўтарытэты Баронія, Зонары, Гваньіні, Марціна Бельскага, Мацея Стрыйкоўскага, Яна Длугаша і інш. да агіяграфічных тэкстаў дазваляла не толькі азнаёміць шырокія колы Рэчы Паспалітай з гісторыяй Кіеўскай лаўры, але і вызначыць выключную ролю і значэнне святыні для ўсяго хрысціянскага свету. Выкарыстанне гістарычных крыніц у “Patericone” павінна было засведчыць чытачам, нават нядобразычліўцам, сапраўднасць жыцій пячорскіх святых і ўнікальнасць не толькі Кіева-Пячорскай лаўры, але і ўсёй “рэлігіі грэчаскай народу рускага.”

Так, з’яўленне хрысціянства ў славян Косаў звязваў з імем апостала Андрэя, які з Херсанеса па Дняпры ўзняўся да Вялікага Ноўгарада і Падзвіння. Наступныя спробы ажыццяўляліся братамі Мяфоддзіем і Кірылам у 863 г., княгіняй Вольгай у 958 г., князем Уладзімірам Святаславічам ажыццяўлялася пятая спроба пашырэння хрысціянскай

МГПУ им. И.П. Шамякина

веры з Усходу, а не з Захаду, што сцвярджалі яго апаненты. Адвяргаў аргументы ўніяцкага аўтара Л. Крэўзы аб шкоднасці для Царквы дачыненняў Кіеўскіх мітрапалітаў з Канстанцінопальскімі патрыярхамі на працягу XI–XVI стст., падкрэсліваў плённыя вынікі стасункаў з візантыйскай царквой.

Яго творы, асабліва "Патэрыкон" і "Экзэгезіс", увогуле ўяўляюць сабой даволі цікавыя нарысы гісторыі праваслаўя на Беларусі і Украіне. Ім таксама быў падрыхтаваны і выдадзены дапаможнік у форме катэхізіса для беларускага і ўкраінскага праваслаўнага святарства: "Дідаскаліа, альбо Наука, которая ся первей из уст священником подавала – о седми сакраментах, алболи тайнах, на Сіноде поместном в Богоспасаемом граде Могилеве, року Божего 1637, месяца октобра 19 дня, отправованым от превелебнаго его милости господина отца Сільвестра Косова, на тот час епископа мстиславскаго, оршанскаго и могилевскаго, теперешнего милостью Божею митрополита киевского, галицкого и всея Россіи. Потом през того ж в друк подана. По-трете, в тіпографіи монастыра общежителнаго Кутеенского тіпом издася року 1653, месяца мая 30 дня".[1]

Ва ўмовах канфесійнага супрацьстаяння, паглыблення сацыяльна-палітычных супярэчнасцей, абвастрэння знешнепалітычных абставін у Рэчы Паспалітай у XVII ст. сродкі дасягнення мэты Кіева-Магілянскага асяродку захаваць юрысдыкцыю Канстанцінопальскага патрыярхату, ролю Кіева як духоўнага цэнтра праваслаўя знайшлі ўвасабленне ў далейшай распрацоўцы ідэі пераемнасці візантыйскіх традыцый і старажытнай Русі і пэўнай адаптацыі дасягненняў заходнееўрапейскай культуры.

"Patericon" быў даволі вядомы, і розныя яго фрагменты перакладаліся на царкоўнаславянскую мову.

У 1638 г. у лаўрскай друкарні выдаецца іншая вядомая кніга пра славу і цудатворнасць Кіева-Пячорскага манастыра на польскай мове. Гэта "Тератоургнма lubo cuda" Афанасія Кальнафойскага, таксама паплечніка П. Магілы. Праца ўяўляла сабой гістарычны нарыс пра Кіеўскую лаўру ад старажытных часоў да сучаснасці. Аўтар сцвярджаў сакральную ролю праваслаўнага прытулку.

[1] Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / Уклад., прадм., камент. І. Саверчанкі. – Мінск: Кніга збор, 2007. – С. 517.



МГПУ им. И.П.Шамякина


ΤΕΡΑΤΟΥΡΓΗΜΑ
LVBO
CVDA
KTORE BYŁY TAK W SAMYM
SWIETOCVDOTWORNYM
MONASTYRV PIECZARSKIM
KIIOWSKIM,
iáko y w obudwu
SWIETYCH PIECZARACH,
w ktorych po woli Bożey Błogosłáwieni Oy-
cowie Pieczárscy pożywszy, y ćiężary Ciał
swoich złożyli:
Wiernie y pilnie teraz pirwszy raz zebráne/
y świátu podáne.
PRZEZ
W. Oyca ATHANASIVSA KALNOFOYSKIEGO,
Zakonniká tegoż S. Monástyrá Pieczárskiego.
Z DRVKARNI KIIOWOPIECZARSKIEY,
ROKV P. 1638.

*ТЕРАТОУРГНМА.*
*Тытульная старонка. 1638 г.*

Сільвестр Косаў прытрымліваўся антымаскоўскай арыентацыі, выступаў супраць магчымага падпарадкавання Кіеўскай мітраполіі Маскве. У сувязі з пачаткам вайны Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай (1654–1667 гг.) у Кіеве знаходзіўся рускі гарнізон і адпаведна час ад часу ўзнікала пытанне падпарадкавання Кіеўскай мітраполіі Маскоўскаму патрыярхату. Магчыма, праца над царкоўнаславянскім варыянтам Патэрыка на чале з Кіева-Пячорскім архімандрытам Іосіфам Трызнам у сярэдзіне 50-х гг. XVII ст. была абумоўлена пазіцыяй Сільвестра Косава захаваць юрысдыкцыю Канстанцінопаля і адпаведна фактычную незалежнасць праваслаўнай беларуска-ўкраінскай іерархіі, неабходнасцю аргументавана засведчыць сакральную ролю Кіева і яго святынь у хрысціянскім свеце. Друкаваны Кіева-Пячорскі патэрык на царкоўнаславянскай мове, адаптаванай да разумення шырокімі коламі насельніцтва, ілюстраваны спецыяльна створанымі ўнікальнымі гравюрамі і планамі кіеўскіх пячор, убачыў свет у 1661 г.

Пачыналася выданне з прадмовы “Да чытата праваслаўнага супраць ганьбы святых Пячорскіх”, якая амаль поўнасцю цытуецца з польскамоўнага выдання “Patericonа” 1635 г. Кніга ўтрымлівала змест, прадметны і імянны паказальнікі, дадатак (“Пристяжание” – жыція складальнікаў Патэрыка, “Сказание о чудеси бывшем в пещере в время пасхи и о мироточивых главах.”[1] На думку Л. Шчавінскай і Ю. Лабынцава, менавіта ўкладальнікі Патэрыка 1661 г. упершыню вызначылі ролю пячорскага манаха Нестара ў старажытнарускім летапісанні.

[1] Лабынцев Ю., Щавинская Л. «В лЪто… 1661» / Департамент культуры г. Москвы, Управ. культуры ЦАО г. Москвы, ГУК г. Москвы «Библиотека украинской литературы», Отд. ист. укр. книги. – М., 2011. – С. 15.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Гістарычная інфармацыя ў выданні С. Косава размешчана ў якасці дадаткаў-каментарыяў да адпаведных жыцій старцаў. Так, пасля агіяграфічнага тэксту, прысвечанага св. Феадосію (заснавальніку Пячорскага манастыра, другая палова XI ст.) ёсць звесткі пра кіеўскіх князёў Яраславічаў, напады печанегаў і полаўцаў на ўсходнеславянскія землі. І. Трызна распавядае пра жыццё пячорскіх старцаў у выглядзе пераказу старажытных тэкстаў і суадносіць іх з гістарычнымі падзеямі эпохі. Агіяграфія святых, дзе выкладаюцца толькі подзвігі герояў аповеду, ператвараецца ў гістарычныя біяграфіі з дакладным сведчаннем сучаснікаў героя і гістарычным нарысам эпохі.[1] Падобным чынам складаліся еўрапейскія творы такога кшталту, напрыклад трактат П. Скаргі аб жыцці святых 1577 г. Можна сцвярджаць, што выданні Косава і Трызны разлічваліся на вельмі шырокую аўдыторыю, не толькі на праваслаўнае насельніцтва, але і на адукаваныя колы Рэчы Паспалітай, знаёмыя з гістарыяграфічнай традыцыяй Еўропы.

Тыраж выдання 1661 г. вельмі хутка разышоўся, і другое выданне Кіева-Пячорскага патэрыка выйшла ў 1678 г. са згоды Інакенція Гізеля. Сярод чытачоў быў заўважаны расійскі цар Аляксей Міхайлавіч, які купіў 12 кніг. Да пачатку XX ст. Патэрык перавыдаваўся яшчэ каля 30 разоў, аднак у іншай рэдакцыі, прыстасаванай да патрэб новай дзяржавы. Своеасаблівым пераказам на лаціне Кіева-Пячорскага патэрыка, экзэмпляр якога падараваў аўтару І. Гізель, з'яўляўся трактат пратэстанцкага пастара Іагана Гербінія "Religiosae Kijovienses cryptae", выдадзены ў Іене ў 1675 г.

Неабходнасць аргументавана засведчыць канфесійную ідэнтычнасць праваслаўных, старажытнасць і каштоўнасць традыцый садзейнічала развіццю гістарычнай памяці, зафіксаванай у пісьмовых крыніцах, фарміраванню гістарыяграфічнай традыцыі, у дадзеным выпадку праваслаўнай.

***

Такім чынам, праваслаўная апазіцыя ўніяцтву на беларускіх і ўкраінскіх землях не мела адзінства, вызначалася рознымі накірункамі і сродкамі барацьбы, што ў пэўнай ступені садзейнічала пашырэнню уніі.

[1] Patericon albo Żywoty śś. Ojców Pieczarskich... Silwestra Kossowa. – W Kijowie w drukami Ś. Lawry Pieczarskiey Roku 1635 / Syl'vestr Kosov // Рэпр. вид. Harvard Library of Early Ukrainian Literature. – Volume IV. – Cambridge, Mass., 1987. – P. 3–119.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Вызначаліся (аскетычна-нігілістычны, Васіль Суражскі, Іван Вішанскі, Афанасій Філіповіч і інш., умерана-кампрамісны накірункі, П. Магіла, С. Косаў, І. Трызна і інш.) Супрацьстаянне праваслаўных канцэпцый вызначалася ўнутрыцаркоўнай палемікай і ўзаемнай крытыкай, а таксама барацьбой за статус афіцыйнага царкоўнага пункту гледжання.


*Кіева-Пячорскі патэрык. 1661 г. Гравюра св. Антонія Пячорскага. Майстар Ілія*

У 40-я гг. XVII ст. асаблівую папулярнасць набылі палемічныя творы Касіяна Саковіча, размова пра якога ішла вышэй. Яго палемічныя творы выклікалі хвалю абурэння не толькі з боку праваслаўных, але і ўніятаў.

Частка праваслаўнага святарства па тых ці іншых прычынах прызнала унію (М. Сматрыцкі, Касіян Саковіч, К. Транквіліён-Стаўравецкі і інш.). Гэта было абумоўлена шэрагам згаданых вышэй абставін: сувязямі царкоўных дзеячаў і вучоных з заходняй культурай, менталітэтам "на мяжы культур Захаду і Усходу", нарастаннем сацыяльных супярэчнасцей і паглыбленнем крызісу праваслаўнай царквы, курсам урадавых колаў на замірэнне канфесій.

## 3.8. Этнаканфесійнае вызначэнне беларусаў і ўкраінцаў у літаратуры XVI–XVII стст.

У другой палове XVI ст. – пачатку XVII ст. у краінах Еўропы назіраецца рост нацыянальнай самасвядомасці і як вынік узмацненне барацьбы за адпаведную самаідэнтыфікацыю. Гэтыя працэсы, безумоўна, закранулі і поліэтнічную Рэч Паспалітую. Творы рэлігійнай палемікі, асабліва пашыранай пасля Берасцейскага сабору 1596 г., вызначалі не

МГПУ им. И.П. Шамякина

толькі ідэалагічныя спрэчкі і царкоўна-рэлігійныя супярэчнасці католікаў, праваслаўных і ўніятаў, але мелі сацыяльна-палітычны і нацыянальны характар. Так, праваслаўныя брацтвы часта выкарыстоўвалі ідэю рускага адзінства для пашырэння беларуска-ўкраінскай апазіцыі з мэтай забеспячэння роўнасці праваслаўнага насельніцтва, маючы на ўвазе канфесійнае адзінства. Спробы нацыянальнай ідэнтыфікацыі насельніцтва дзяржавы знайшлі сваё адлюстраванне ва ўжыванні саманазваў у палемічнай літаратуры. Тэрміны "Русь", "рускі народ" маюць дачыненне пераважна да беларускага і ўкраінскага этнасаў, якія амаль не адрозніваюцца ад канфесіёнімаў і адначасова звязваюцца з уяўленнем пра агульнае грамадзянства ў межах Рэчы Паспалітай незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці. Зыходзячы з тэкстаў найбольш вядомых палемічных твораў, беларусы і ўкраінцы ўсведамляюць сябе праваслаўнымі "русінамі" і адначасова грамадзянамі Рэчы Паспалітай, якую лічаць сваёй дзяржавай.

Так, у самаідэнтыфікацыі Хрыстафора Філалета, аўтара "Апокрисиса, албо отповеди на книжкы о съборе Берестейском": "Мы, народу Руского и Литовского обыватели", "Мы, Короны Полской и панств до ней належачих обывателей" выяўляецца канфесійная прыналежнасць: "нас Греческой релеи людей", "мы, Греческой релеи люде", "мы, Грецкого набоженства люди".[1] Х. Філалет падкрэслівае неправамоцтва прэтэнзій каталіцкай царквы на першынства ў Літве і Беларусі, дзе праваслаўных больш, чым каталікоў, і вызначае нераўнапраўнае палітычнае становішча праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Захарыя Капысценскі таксама выкарыстоўвае паняцці "россы", "Русь", "Россия", "русские": "нас Россов православных", "роду Руского", "мы.., православная Русь". Ён акрэслівае межы праваслаўнай Русі: "все Белой, и Чорной, Всходной, Полночной и на полдне лежачей Руси народове... под зверхностью патриархи Константинополского, стале и статечне трвают".[2] У выкарыстаных ім паняццях выразна назіраецца змешванне этнічнай і канфесійнай прыкмет. Так, на думку Капысценскага праваслаўе – крыніца "стародавних отцовских звычаев и канонов", а унія вядзе да таго, каб "Русі не было ў Русі".[3] Зразумела, што у першым выпадку размова ідзе аб праваслаўнай

[1] Филалет, Х. Апокрисис албо отповедь на книжкы о соборе Берестейском // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 1750, 1564, 1194, 1030, 1570, 1008.

[2] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви / Памятники полемической литературы в Западной Руси. Кн. 1.– Стб. 321, 503, 731, 774, 869, 894, 904, 913, 1040, 1055.

[3] Тамсама. – Стб. 683, 957.

МГПУ им. И.П.Шамякина

веры, у другім – пра землі з праваслаўным насельніцтвам. Аднак згаданыя ім ў “Палинодии” паняцці “Русь Литовская” і “Русь Московская” адрозніваюцца: “весь народ Русский в Литве”, “в Москве и в России”, “Москва з Росью нашею”.[1]

Паняцці “русская земля”, “наш русский народ”, “мы, Русь”, “русская церковь” прысутнічаюць у працах аднаго з лепшых палемістаў свайго часу М. Сматрыцкага, спачатку прыхільніка праваслаўя, затым уніята.[2] Ён значна ўдакладняе іх змест. Так, беларускія гарады Менск, Гародня, Слонім, Брэст аднесены Сматрыцкім да “Литвы”, Пінск, Мазыр – да “Полесья”, Гомель, Рэчыца – да “Понизовья”.[3] На яго думку, “русский народ” падзяляецца на “Русь греческого вероисповедания” і “Русь римского вероисповедания”, да якой адносіцца і новая “униатская Русь”. У лісце Віленскаму праваслаўнаму брацтву 1629 г. ён называе праваслаўе і ўніяцтва “всей руской нашей церковью”.[4] А ў пасланні 1630 г. Папе Урбану VIII уніят Сматрыцкі вызнае сябе “русином” і разважае пра сродкі звароту “русинов-схизматиков” ва унію.[5] Абаронца праваслаўя А. Мужылоўскі таксама называў уніятаў “часткай Русі”, нягледзячы на супрацьпастаўленне “нашай рускай праваслаўнай царквы” большасці “рускага народа” і ўніяцкага “крываславія”.[6]

І ў працах ініцыятара і стваральніка уніі І. Пацея “Русь” – гэта беларуска-ўкраінскія землі і народы, як праваслаўныя, так і ўніяты. На тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы назва “Русь” Пацеем, як і большасцю іншых аўтараў, не распаўсюджвалася. Ужываліся паняцці “Масква”, “панства Маскоўскае”, “народ Москоўскі”.[7] Уніяцкія архірэі тытулаваліся, падобна праваслаўным, мітрапалітамі “рускімі” (“усей Русі”, “усея Русіі”).[8] У творах віленскага

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Копыстенский, З. Палинодия или Книга Обороны кафолической святой апостолской Всходней Церкви. – Стб. 947, 1032.
[2] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 163, 174–175, 177–185.
[3] Тамсама. – С. 183–184.
[4] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси. – Вильна: Печатня губ. правл., 1867. – Т. 2. – С. 605–607.
[5] Смотрицкий, М. Ліст Мялеція Сматрыцкага, русіна, архіепіскапа Полацкага, да святога Пана нашага Папы Урбана VIII... 5 жніўня 1630 г. // Крыніца. – 1994. – № 11. – С. 10, 13–15.
[6] Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. – С. 57–58, 61.
[7] Потей, И. Антиризис или Апология против Христофора Филалета / И. Потей // Памятники полемической литературы в Западной Руси. –Кн. 3. – Стб. 1079, 286
[8] Потей, И. Духовное завещание. Апология унии. 19 ноября 1609 г. / И. Потей // АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 391, 392.

ўніяцкага архімандрыта Л. Крэўзы мы сустракаем: “наша Русь”, “к нашему Русскому благочестию”, “Русія”, “народу Русскага”, “родом Русин”, “в панствах Рускіх”, “в краінах Рускіх”.[1] Аўтар лічыць праваслаўных і ўніятаў “исповедующими Греческую религию, но разъединенными в ней”.[2] Пра “в релии розрозненых руских” пісаў і І. Вельямін Руцкі. Ён зыходзіў з існавання адзінага народа ВКЛ з уласнымі дзяржаўнымі і царкоўнымі (уніяцкімі) традыцыямі, на якіх абгрунтоўваў ідэю аўтакефальнай уніяцкай царквы.[3] Назвы “край рускі”, “Русь”, “рускі народ”, “рускія” і т. п. ужываліся І. Кунцэвічам і ў пазнейшай уніяцкай публіцыстыцы.[4]

На думку многіх даследчыкаў (М. Каяловіч, В. Ластоўскі, С. Марозава, С. Палуцкая, Г. Сагановіч, У. Старасценка) беларуска-ўкраінская нацыянальная самаідэнтыфікацыя ўніяцкіх аўтараў і іх жаданне абгрунтаваць этнічнае адзінства “русінаў” праваслаўных і ўніятаў з’яўлялася выражэннем прэтэнзій грэка-каталіцкай царквы на ўяўленне інтарэсаў усёй усходнеславянскай этнічнай агульнасці Рэчы Паспалітай.[5]

Праваслаўна-ўніяцкае насельніцтва Рэчы Паспалітай вызначалася “русінамі”, “руссю” афіцыйнымі ўладамі і Ватыканам. Уніяты (“которыи суть в унии костела светого Римского”) і праваслаўныя (“которые в той унии не суть”) лічыліся адзіным “народом Руским” у каралеўскіх прывілеях 1633 г. мітрапаліту П. Магілу і епіскапу І. Бабрыковічу.[6] Да “народа руского” звяртаўся П. Скарга.[7]

Такім чынам, палемічна-рэлігійная літаратура канца XVI–XVII стст. не вызначала пэўныя межы паміж выкарыстаннем канфесіёнімаў “Русь” і этнонімаў “Русь”. Асноўнай этнавызначальнай прыкметай беларусаў і украінцаў была канфесійная прыналежнасць, якая з цягам часу набывае яшчэ большае значэнне і паступова трансфарміруецца ў ідэю праваслаўнага ўсходнеславянскага адзінства.

---

[1] Кревза, Л. Оборона унии /Л. Кревза //Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – Стб. 162, 164, 225, 227–231, 242, 246.
[2] Тамсама. – С. 158.
[3] Рутский, И. Sowita wina / И. Рутский // АрЮЗР. – Ч. I. – Т. 7. – С. 454–461.
[4] Кунцевич, И. Письмо архиепископа Иосафата Кунцевича к митрополиту Иосифу Рутскому / И. Кунцевич // Вестник Юго-Западной и Западной России. – Киев: Тип. И. и А. Давиденко, 1862. – Август, год первый, т. 2, кн. 3. – С. 82.
[5] Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3. – С. 62.
[6] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси. – Вильна: Печатня губ. правл., 1867. – Т. 2. – С. 48.
[7] Скарга, П. О единстве церкви / П. Скарга // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 2. – Стб. 228, 485, 488.

***

Палемічна-рэлігійныя творы канца XVI–XVII стст. вызначаліся па канфесійнай прыкмеце і не абмяжоўваліся багаслоўскімі спрэчкамі і рознагалоссямі ў разуменні дагматаў і вучэнняў святых айцоў. Пункт гледжання аўтара каталіка, уніята ці праваслаўнага сцвярджаўся абавязковай спасылкай на Біблію або гістарычныя падзеі. У дачыненні да царкоўнага права і разыходжання ў разуменні дагматаў размова ішла пра першынства папы, зыходжанне Святога Духа (filioque), чысцец, ужыванне прэснага хлеба для прычасця, святарскі цэлібат.

Асноўнымі дыскусійнымі пытаннямі былі: крызіс Царквы і неабходнасць маральнага аднаўлення святарства (праваслаўнага, уніяцкага і каталіцкага), суадносіны паўнамоцтваў духоўнай і свецкай улады, увядзенне грыгарыянскага календара, агульнае і асобнае ў пытаннях веры і ролі чалавека ў ёй. Палеміка XVII ст. пра пытанні веры каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных аўтараў садзейнічала абмеркаванню праблем месца чалавека ў свеце і вызначыла два асноўныя шляхі "праўдзівага быцця": першы – у манаскай пакоры і аскезе, другі – у актыўным грамадскім жыцці чалавека.

Розніца ў разуменні сутнасці уніі, яе мэт і сродкаў рэалізацыі ў творах палемістаў каталіцка-ўніяцкай і праваслаўнай плыняў абумовіла таксама супрацьлеглыя падыходы да вывучэння міжканфесійных адносін у Рэчы Паспалітай, у тым ліку месца і ролі ўніяцтва ў грамадстве і дзяржаве. У расійскай гістарыяграфіі XIX ст. склалася праваслаўная традыцыя, заснаваная на археаграфічных крыніцах, значную частку якіх складала рэлігійна-палемічная літаратура XVI–XVII стст., і менавіта антыўніяцкая палеміка. Гэтыя абставіны абумовілі выключна негатыўную ацэнку Берасцейскай міжканфесійнай уніі ў расійскай гістарыяграфіі XIX ст. і неадназначную ацэнку ў сучаснай гістарычнай навуцы.

МГПУ им. И.П.Шамякина

## Раздзел 4. ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАСЛАЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII–XVIII стст.

Пэўным ідэалагічным грунтам праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі з'явілася рэлігійна-палемічная літаратура, пашыраная ў Рэчы Паспалітай у канцы XVI–XVII стст., што абумовіла дыскусіі пра ролю і месца каталіцтва, праваслаўя і ўніяцтва, вызначыўшы тым самым два процілеглыя падыходы да Берасцейскай царкоўнай уніі.

Аб складванні гістарыяграфічнай традыцыі, якая станоўча ацэньвала ролю праваслаўнай царквы ў гісторыі беларускіх і ўкраінскіх земляў і адмоўна ставілася да наступстваў прыняцця Берасцейскай царкоўнай уніі і пашырэння каталіцтва, можна гаварыць з другой паловы XVII ст.

Неабходнасць абгрунтавання самабытнасці "рускіх земляў" у Рэчы Паспалітай вызначыла з'яўленне гістарычных трактатаў у Кіева-Пячорскай лаўры. У большасці літаратурных твораў на беларускіх і ўкраінскіх землях у XVII ст. Кіеў вызначаецца як сакральны цэнтр праваслаўя. Гэтыя творы закладваюць пачатак праваслаўнай традыцыі, якая пашыраецца ў XVIII ст. і канчаткова складваецца ў XIX ст. Звычайна гісторыя Кіева пачыналася з хрышчэння Русі князем Уладзімірам, у некаторых выпадках узгадваецца апостал Андрэй і княгіня Вольга, затым размова ідзе пра талерантную канфесійную палітыку ў часы ВКЛ і дыскрымінацыю праваслаўных у Рэчы Паспалітай.

З 70-х гг. XVII ст. ідэя гістарычнай пераемнасці сучаснага Кіева ад часоў Уладзіміра Хрысціцеля пашыраецца на карысць новых уладальнікаў Кіева (дынастыі Раманавых). У 1686 г. Кіеўская мітраполія перайшла пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхату са згоды Канстанцінопальскага патрыярха. Тэрмін "расійскі", які раней у творах Кіева-Магілянскага асяродку ўжываўся толькі ў дачыненні да беларускіх і ўкраінскіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай, вызначаў таксама і землі Рускай дзяржавы. Найбольш яскравым сведчаннем гэтай тэндэнцыі з'яўляецца кіеўскі "Сінопсіс" 1674 г. і больш познія яго рэдакцыі. Так, у канцы XVII ст. – пачатку XVIII ст. дзеячы Магілянскай калегіі, з 1701 г. Акадэміі, з дапамогай гістарычных ведаў пра старажытную спадчыну Кіева сцвярджалі ідэю ўсерасійскага адзінства, спадчыннасці царскай улады ад князёў Уладзіміра Святаслававіча, Яраслава Мудрага, Усевалада, абаранялі мясцовы патрыятызм, каб захаваць пэўны статус навучальнай установы і кіеўскага духавенства.



МГПУ им. И.П.Шамякина

## 4.1. Творчасць Сафановіча



*Хроніка з летапісцаў старадаўніх. 1674 г. Ф.Сафановіч. Тытульная старонка.*

Феадосій Сафановіч – царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай, ігумен Кіеўскага Багаяўленскага манастыра ў1653 – 1655 гг., які па традыцыі яшчэ называлі брацкім, адпаведна рэктар Кіева-Магілянскай калегіі ў гэты час, затым ігумен Міхайлаўскага Залатаверхага манастыра ў Кіеве, здольны дыпламат, мовазнаўца і пісьменнік. Паходзіў з кіеўскага мяшчанства. У 30-я гг. XVII ст. ён атрымаў адукацыю ў Кіева-Магілянскай калегіі, магчыма, пэўны час вучыўся ў адным з еўрапейскіх універсітэтаў для паглыбленага засваення моў (лацінскай, польскай, грэчаскай), у 1640-я гг. выкладаў у калегіі, выконваў абавязкі рэктара ў 1553–1655 гг. Быў запрошаны ў 1649 г. рускім царом ў Маскву для перакладу Бібліі з грэчаскай мовы. У даволі складаны час "Хмяльніччыны" (барацьбы за стварэнне самастойнага Гетманату, 1648–1657 гг.) і "Руіны" (барацьбы за ўладу пасля смерці Б. Хмяльніцкага, палітычнага крызісу і замежнай інтэрвенцыі, 1657–1687 гг.) Сафановіч карыстаўся аўтарытэтам у праваслаўнага духавенства не толькі Кіеўскай мітраполіі, але і Масквы, ведаў Антыяхійскага патрыярха Макарыя, падтрымліваў зносіны з казацкімі гетманамі Багданам Хмяльніцкім, Іванам Выгоўскім, Паўлам Цяцерай, Іванам Самайловічам, адначасова меў лаяльнае стаўленне ўрадавых колаў[1].

Нашчадкам Феадосій Сафановіч найбольш вядомы як пісьменнік, аўтар гістарычнай працы "Хроніка з летапісцаў старадаўніх", богаслужэбных і царкоўна-гістарычных твораў. Найбольш пашыранай сярод праваслаўных колаў, нават за межамі Украіны, была кніга "Выклад аб царкве святой", у якой вызначаўся парадак набажэнстваў, выкладаліся царкоўныя дагматы і растлумачваліся асноўныя тэрміны.

[1] Україна: хронологія розвітку. – Т. 4. – С. 517–519.



МГПУ им. И.П.Шамякина

“Хроніка з летапісцаў старадаўніх” з’яўляецца адным з першых абагульняльных твораў па гісторыі Украіны. Поўная яго назва “Кроиника з лѣтописцов стародавних, з святого Нестора Печерского Киевского, А также зъ кроиник полскихъ ω Русіи, ωтколъ Русъ почалася, и о первых кн҃зехъ руских, и по нихъ далшихъ наступуючихь князех, и ω их делах, собраная працою иеромонаха Феодосия Софоновича, игумена монастыря Михаиловского Золотоверхого Киевского, Року ωт сотвореня свѣта 7180, а от рождества Хрства 1672”.[1]

У назве адразу вызначаецца мэта працы аўтара: “сказати… ωтколь Русъ почалася и якъ панство Руское, за початку ставши, до сего часу идетъ, бо своего роду не знаючих людеи за глупыхъ почитаютъ” і крыніцы ведаў (“з розныхъ лѢтописцов руских и кроиникъ полскихъ”).

Традыцыйна вытокі славянскіх народаў Сафановіч вызначаў ад часоў вавілонскага стоўпатварэння, калі нашчадкі Яфета, сына Ноя, пачалі рассяляцца па зямлі і атрымалі ад Бога славянскую мову. Ён сцвярджаў, што назва славяне атрымалі ад назвы Славянскага мора ці ад “от славы и от славныхь своихь дѢлъ рицерскихъ, которыми по всемъ свѢтѢ славными были и не так во скарбахъ, якъ во славѢ кахалися. Для того княземъ своимъ и ихъ потомкомъ… имяна, злученыї зь славою, давали: Св҃тослав, Всеслав, Вышеслав, Станислав, Ярослав, Доброслав, Изяслав, Премыслав, Вячеслав, Мечислав, Мъстислав, Владислав, Болеслав” і інш.[2] Ва ўяўленні Сафановіча, славяне – легендарныя героі-волаты, якім нават Аляксандр Македонскі “далъ славеномъ привилеї на паргамѢнѢ, золотом писаныи. вь Алеѯандриї”. Сваю думку аўтар пацвярджае спасылкамі на тагачасныя аўтарытэты храністаў Я. Длугаша і М. Стрыйкоўскага, якія ўзгадваюць, што “ижь панство Руское ажь до Рыму заходило”. З летапісу Нестара ў “Кроинику” ўвайшло паведамленне пра запрашэнне варажскіх князёў Рурыка, Сінявуса і Трувора. Першымі рускімі князямі Сафановіч называў нашчадкаў сына Яфета Мосаха легендарных братоў і сястру, старэйшы з якіх Кій заснаваў “град стольны Кіеў”, узгадваў пра суседнія плямёны, хазараў, полаўцаў і інш. Амаль 2\3 зместу яго працы займае гісторыя часоў Старажытнай Русі (аповед пра княжанне Аскольда і Дзіра, Алега, Ігара, Вольгі, Святаслава, Уладзіміра, Святаполка, Яраслава

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Софонович, Феодосій. Хроніка з літописців стародавніх / Ф. Софоновіч, АН України, Археограф, коміс., Ін-т укр. археографії, Ін-т історії України. Підготовка тексту до друку, передмова, комент. Ю. А. Мицика, В. М. Кравченка. – К.: Наук. думка, 1992. – 336 с.
[2] Тамсама. – С. 3.

Мудрага, Уладзіміра Манамаха і яго нашчадкаў). Цэнтральная падзея – прынясце хрысціянства, спачатку Вольгай, затым "слаўная" дзейнасць князя Уладзіміра па выборы праваслаўнай веры і яе замацаванні ў Русі.

У якасці крыніц у "Хроніцы" Сафановіча скарыстаны акрамя "Аповесці мінулых часоў" таксама Кіеўскі, Галіцка-Валынскі летапісы і інш. у аўтарскай рэдакцыі (усё, што не адпавядала поглядам і мэтам не ўзгадвалася ці скарачалася). Калі ўлічыць, што Хроніка складзена ў 1672 г., падчас складаных знешнепалітычных абставін і канфесійных супярэчнасцей, можна зразумець такое стаўленне аўтара да крыніц. Галоўная мэта ігумена Міхайлаўскага Залатаверхага манастыра ў Кіеве Феадосія Сафановіча – засведчыць старажытнасць веры продкаў і значнасць гістарычнай спадчыны Русі. У гэтым пункце гледжання ён падзяляў погляды большасці тагачасных праваслаўных палемістаў т.зв. кампраміснага накірунку.

На думку аўтара "Хронікі з летапісцаў старадаўніх", спадкаемніцай Кіеўскай Русі стала Галіцка-Валынская Русь, затым Вялікае княства Літоўскае і супольная дзяржава абодвух народаў Рэч Паспалітая. Галоўнай гістарычнай асобай часоў Галіцка-Валынскага княства ён лічыў Данілу Раманавіча, які падпарадкаваў рускіх князёў, палавецкую, лядскую і літоўскую землі, яго радавод выводзіў да нашчадкаў славутых князёў Астрожскіх[1]

У другой частцы Хронікі Сафановіч апавядае пра легендарных князёў Літвы (ад Палемона да Міндоўга) і вядомых князёў ВКЛ (Трайдэн, Віцень, Гедымін, Альгерд, Ягайла, Скіргайла, Вітаўт, Свідрыгайла, Жыгімонт, Казімір, Аляксандр). Найбольш разгорнутай характарыстыкай княжання адрозніваецца вялікі князь Вітаўт. Падобная ўвага ўдзяляецца толькі маскоўскаму князю Івану III, які пазбавіў дзяржаву ад мангола-татарскага ярма і здолеў аб'яднаць землі вакол Масквы. Сафановіч негатыўна ставіўся да князя Ягайлы, які прыняў "веру лацінскую".

Калі ў першай частцы галоўнымі крыніцамі былі старажытнарускія летапісы, у другой – Хроніка М. Стрыйкоўскага, летапіс Вялікага княства Літоўскага, то ў трэцяй пераважнымі крыніцамі былі "Гісторыя Еўрапейскай Сарматыі" Гваньіні і "Хроніка Польшчы" Марціна і Яўхіма Бельскіх.

У трэцяй частцы Хронікі размова ідзе пра падзеі польскай гісторыі таксама ад легендарных польскіх каралёў да сучаснага аўтару манарха. Сафановіч як прадстаўнік вышэйшай праваслаўнай іерархіі Кіеўскай мітраполіі быў носьбітам негатыўнага стаўлення да царкоўнай уніі.

[1] Софонович Феодосій. Хроніка з літописців стародавніх. – С. 233.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Пашырэнне ўніяцтва вызначае амаль галоўнай прычынай паўстання С. Налівайкі. Найбольш увагі аўтар надаваў падзеям падчас казацкага паўстання пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Аднак ацэнкі дзейнасці славутага гетмана даволі стрыманыя. Сафановіч даваў станоўчую ацэнку падзеям Пераяслаўскай рады, ён прыхільнік палітычнага і культурнага адзінства з Рускай дзяржавай, таму крытычна ставіўся да спроб Б. Хмяльніцкага дамовіцца з Крымскім ханам, асуджаў асуджаў наступных гетманаў І. Выгоўскага, Ю. Хмяльніцкага, І. Брухавецкага дамовіцца з урадам Рэчы Паспалітай, ці асманскімі ўладамі. Даследчыкі сцвярджаюць, што ў апошняй частцы выкарыстаны таксама асабістыя звесткі, якімі аўтар валодаў як прадстаўнік праваслаўнай іерархіі, напрыклад пра выбранне кіеўскіх мітрапалітаў Пятра Магілы. Сільвестра Косава, Дыянісія Балабана і інш., наведванне Кіева Іерусалімскімі патрярхамі Феафанам у 1620 г. і Паісіям ў 1649 г., смерць Багдана Хмяльніцкага 2 ліпеня 1657 г., уцёкі яго сына Юрыя Хмяльніцкага на правы бераг Дняпра пасля паражэння ад войскаў рускага ваяводы Рамаданоўскага і левабярэжнага гетмана Я. Сомкі ў 1662 г. і пострыг у манахі ў 1663 г., афіцыйны візіт І. Брухавецкага ў Маскву ў 165 г. і інш.


КНИГА
О побоищи Цмамая Царя Татарского, от Князя Владимирского и Московского Димитріа
Глава I

*Старонка з Хроніка Ф. Сафановіча.*

"Хроніка" Сафановіча была выдадзена ў 1674 і стала даволі папулярным творам. Зрабіла значны ўплыў на развіццё гістарыяграфіі, асабліва на т. зв. "Летапісец" Дварэцкіх (1673), Кіеўскі "Сінопсіс" (2 і 3 яго выданні, 1678, 1680), "Хранограф" П. Каханоўскага (1681), "Летапіс Грабянкі" (1710), "Ядро расійскай гісторыі" Манкіева.

## 4.2. Кіеўскі "Сінопсіс" І. Гізеля

Значны ўплыў на фарміраванне праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі зрабілі "Сінопсіс" І. Гізеля, выдадзены ў 1674 г.

Звесткі пра "Синопсис, или Краткое описание от различных летописцев о начале славяно-российского народа, о первоначальных

МГПУ им. И.П.Шамякина

князях богоспасаемого града Киева, о житии святого благоверного великого князя Киевского и всея России первого самодержца Владимира, и о наследниках благочестивыя державы его российския, даже до пресветлого и благочестивого государя нашего царя и великого князя Федора Михайловича, всея Великия, и Малыя, и Белыя России самодержца", утрымліваюцца ў шматлікіх энцыклапедычных выданнях і падручніках па крыніцазнаўству і гістарыяграфіі Беларусі, Украіны, Расіі. Ён перавыдаваўся ў Расіі больш 30 разоў з дапаўненнямі на працягу XVII–XIX стст. у адпаведнасці з мэтамі рэдактара ці выдаўца. Вядомы таксама пераклады "Сінопсіса" на грэчаскую і лацінскую мовы ў канцы XVII ст. Першае выданне было зроблена ў Кіева-Пячорскай лаўры ў 1674 г., другое – выйшла ў 1680 г. тамсама з невялікімі дапаўненнямі пра цудоўную дапамогу Цудатворнай Пячорскай іконы Прачыстай Багародзіцы і святых у перамозе над турэцкім войскам пад Чыгірынам у 1677 г.[1]

У 1823 г. праца выйшла з каментарыямі вядомага расійскага даследчыка гісторыі праваслаўнай царквы ў XIX ст. Е. Балхавіцінава. Ён тлумачыў папулярнасць трактата наступным чынам: "Но поелику до издания Ломоносова Краткого Российского Летописца не было никакой другой печатной Русской Истории, то сей единственный Синопсис многократно был печатан и при С.-Петербургской академии наук".[2]

Сучасная гістарычная навука не можа адназначна адказаць на пытанні: калі і ў якіх гістарычных абставінах, з якой мэтай быў створаны Кіеўскі Сінопсіс, хто аўтар і якіх поглядаў ён прытрымліваўся? Аўтэнтычны твор ці рэдагаваўся? Некаторыя даследчыкі аддаюць перавагу гіпотэзам пра калектыў аўтараў, якія перапрацавалі Хроніку Сафановіча, ці Сінопсіс 1632 г., выдадзены Віленскім праваслаўным брацтвам, або стварылі новы кампілятэўны трактат з вядомых крыніц. Іншыя мяркуюць аднаасобнае аўтарства Інакенція Гізеля ці ігумена Феадосія Сафановіча, магчыма пячорскага эканома П. Каханоўскага, архімандрыта Іосіфа Трызны ці друкара Івана Армашэнкі.[3]

МГПУ им. И.П.Шамякина

---

[1] Жиленко, І.В. Синопсис Київський. Лаврський альманах / Ред. рада: В.М. Колпакова (відп. ред.) та ін. – К.: ВІПОЛ, – Спецвип. 2: Синопсис Київський / І.В. Жиленко. – 2002. – 194 с.

[2] Болховитинов, Евгений. Иннокентий Гизель // Словарь исторический о бывших в России писателях духовного чина греко-российской церкви / Е. Болховитинов. – М., 1995. – С. 116.

[3] Жиленко, І.В. Синопсис Київський. Лаврський альманах.

Час стварэння "Сінопсіса" невядомы, можна ўпэўнена казаць толькі пра час выдання – 1674 г. На думку ўкраінскай даследчыцы І. Жыленка, асноўны тэкст Кіеўскага Сінопсіса быў створаны ў якасці энцыклапедычнага даведніка пры чытанні Кіева-Пячорскага Пацерыка і іншых агіяграфічных і палемічных прац ў час з 1651 г. па 1653 г., таму што не ўтрымлівае згадак аб смерці кіеўскага ваяводы Адама Кіселя. Гэтымі абставінамі тлумачыцца засяроджанасць аўтара ці аўтараў на царкоўнай гісторыі Кіева і гісторыі Лаўры. У асноўны тэкст былі ўнесены больш позднія ўстаўкі выразна вызначанай прамаскоўскай накіраванасці, магчыма, самім Гізелям. Гэта стала падставай для фарміравання т. зв. ідэі рускага адзінства, якая замацавалася ў расійскай гістарыяграфіі.

Яскравым адлюстраваннем гэтай канцэпцыі, якая існуе і сёння, з'яўляецца выданне ў 2006 г. працы "Мечта о русском единстве. Киевский синопсис (1674)", прадмова і падрыхтоўка тэксту О.Я. Сапожнікава і І. Ю. Сапожнікавай. Яны адзначаюць: "Синопсис доказывает: идея объединения единого русского народа под властью единого государства была рождена не в Москве, а в юго-западных землях и оформлена в Киеве... Особенно сильно звучит древний текст, в котором есть "Россия", "Русь", "Земля Российская", "государство Русское", "все княжения Российские". В последних главах появляются "Великая и Малая, и Белая Россия".[1] Рэдактары не звярнулі ўвагу на тыя абставіны, што пералічаныя тэрміны выкарыстоўваліся ў XVII ст. у канфесійным і тэрытарыяльным сэнсе, таму размова не можа ісці пра этнанацыянальнае вызначэнне.

Традыцыйна "Сінопсіс" разглядаўся як грунт фарміравання расійскай гістарыяграфіі, вызначыўшы яго адназначную прамаскоўскую палітычную накіраванасць. Ён абвяшчаў адзінства Вялікай і Малой Расіі, агульнасць "праваслаўнарасійскага" народа, паведамляў пра раздел "рускай мітраполіі". Нават поўная назва твора кіеўскага архімандрыта Гізеля вызначала галоўную ідэю: Кіеў – "богоспасаемый град, начало славяно-российского народа".

Большасць даследчыкаў адзначала пэўныя асаблівасці зместу працы. А. Лапо-Данілеўскі вызначаў увагу аўтара да гісторыі Кіеўскага княства і адначасовага жадання звязаць яе з гісторыяй Масквы.[2] На думку

[1] Мечта о русском единстве. Киевский синопсис (1674) / предисловие и подготовка текста О. Я. Сапожникова, И. Ю. Сапожниковой. – М.: издательство «Европа», 2006.

[2] Лаппо-Данилевский, А. С. Очерк развития русской историографии / А.С. Лаппо-Данилевский // Русский исторический журнал. – 1920. – Кн. 6. – С. 19.



МГПУ им И.П.Шамякина

М. Каяловіча, “Сінопсіс” – “обширнейшее исследование о происхождении славян, где помещена и басня о происхождении славян от библейского Мосоха, для более удобного объяснения Москвы, москалей, очевидно для большей славы их... главное внимание автора сосредотачивается на Киеве... Синопсис поражает своей зависимостью от польских хроникеров, … но по направлению – это чисто русская, патриотическая книга, … но слава и честь России были очень дороги и для авторов Синопсиса, чем и объясняется то, что Синопсис стал надолго учебною книгою российской истории.”[1] М. Сумцоў ў Энцыклапедычным слоўніку Бракгауза і Эфрона называў Кіева-Пячорскага архімандрыта Інакенція Гізеля “прыхільнікам Масквы”, які падтрымліваў “сношения с московским правительством по монастырско-хозяйственным и политическим вопросам, по временам брался отстаивать вольности малороссийские, но его политические ходатайства оставляли без удовлетворения”. Сумцоў падзяляў думку Каяловіча, што асновай працы стала Хроніка Сафановіча, адрэдагаваная Гізелем.




*Сінопсіс Кіеўскі. 1674 г. Тытульная старонка.*

Савецкія гісторыкі таксама падтрымалі канцэпцыю “рускага адзінства”. Так, Е. Яромін сцвярждаў, што аўтар “Сінопсіса” канцэнтраваў сваю ўвагу на станаўленні расійскага самаўладдзя. Але Яромін не звярнуў ўвагу на тыя абставіны, што большая частка тэксту прысвечана толькі гісторыі Кіева і ўкраінскіх земляў.[2] С. Пештыч лічыў галоўнай думкай трактата гістарычнае абгрунтаванне неабходнасці уз’яднання беларускіх і украінскіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы.[3] Ю. Мыцык тлумачыў адсутнасць звестак у трактаце аб дзвюх значных падзеях у канцы XVI – сярэдзіне XVII стст.: пра Берасцейскую унію і пра т. зв. Хмельнііччыну феадальнай

[1] Коялович, М.О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям / М.О. Коялович. – Изд. 3-е. – СПб.: Типография Суворина, Эртелев пер., д. 13. – С. 86–87.

[2] Еремин, Е.П. К истории общественной мысли на Украине второй половины XVII в. / Е.П. Еремин // Труды отдела русской литературы. – 1959. – Т. 10. – С. 214.

[3] Пештич, С.Л. «Синопсис» как историческое произведение // Труды отдела древнерусской литературы. – 1959. – Т. 15. – С. 286



МГПУ им. И.П.Шамякина

абмежаванасцю светапогляду аўтара, якая выявілася ў нежаданні ўзгадваць казацка-сялянскія паўстанні.[1]

Аналіз тэксту "Сінопсіса" сведчыць, што аўтар прытрымліваўся ідэі праваслаўнага панславізма і адзінага паходжання ўсіх славянскіх народаў, цэнтрам якіх быў Кіеў[2]. Кіева-Пячорская лаўра і адпаведна Кіеўская мітраполія прэтэндуюць на падтрымку суседніх праваслаўных народаў, у тым ліку і Маскоўкай манархіі, пачатак якой закладзены ў Кіеве. Пазіцыю рэдактара і ўзгадванне расійскіх самаўладцаў можна растлумачыць жаданнем захаваць ці ўмацаваць стан царкоўнай іерархіі пасля Пераяслаўскай Рады.

Такім чынам, можна гаварыць пра абвяшчэнне ідэі канфесійнага адзінства праваслаўных у "Сінопсісе". Размова не ідзе пра этнанацыянальную супольнасць. Гэты тэзіс пацвярджаецца даследаваннямі П. Бушковіча, М. Дзмітрыева, Д. Сцяпанава і інш. На думку І. Крып'якевіча і К. Ерусалімскага ў "маскоўскай кніжнасці" XVI–XVII стст. тэрмін "народ" выкарыстоўваўся ў сэнсе натоўпу людзей, што прысутнічалі пры вызначанай падзеі.[3] П. Бушковіч пераканаўча даводзіў, што ў маскоўскай афіцыйнай дакументацыі і літаратуры адсутнічалі этнічныя крытэрыі ідэнтычнасці, у абгрунтаванні прэтэнзій на "спрадвеку рускія землі", у тым ліку і ў рашэннях Земскага Сабору 1653 г. аб далучэнні Левабярэжнай Украіны выкарыстоўваліся толькі канфесійныя і дынастычныя аргументы.[4]

М. Дзмітрыеў вызначае, што да сярэдзіны XVII ст. паняцце "рускія" складалася з палітычных, тэрытарыяльных і канфесійных кампанентаў. Аднак пад уплывам заходнееўрапейскай гістарыяграфіі ў Кіева-Магілянскім калегіуме фарміруецца этнагістарычная канцэпцыя (легенды пра паходжанне народа ад першапродка, гераічным мінулым народа і ўяўленні пра суседнія і чужыя народы), якая знайшла адлюстраванне ў Кіеўскім Сінопсісе і Хронiцы Сафановіча і значна паўплывала на расійскую гістарыяграфію ў працэсе «этницизации исторической памяти

МГПУ им. И.П.Шамякина

---

[1] Мыцык, Ю.А. Украинские летописи XVII века / Ю.А. Мыцык. – Днепропетровск, 1978. – С. 24

[2] Жленко І.В. Синопсис Київський. Лаврський альманах.

[3] Крип'якевич І.П. До питання про національну самосвідомість украінского народу в кінці XVI – на початку XVII ст. // Украінскій історичний журнал. – 1966. – № 2. – С. 82.

[4] Бушкович П. Православная церковь и русское национальное самосознание XVI–XVII вв. // Ab Imperio – 2003. – № 3. – С. 114.

восточных славян».[1] Расійскі даследчык Д. Сцяпанаў сцвярджае, што паленіка на беларускіх і ўкраінскіх землях, выкліканая Берасцейская царкоўнай уніяй 1596 г., садзейнічала фарміраванню этнагенетычнага міфа, пазычанага і адаптаванага маскоўскай элітай у сувязі з неабходнасцю падпарадкавання далучаных зямель.[2]

## 4.3. Казацкія летапісы як прыклад замацавання праваслаўнай традыцыі ў гістарыяграфіі ў пачатку XVIII ст.

Казацкія летапісы – гэта ўмоўная агульная назва летапісных твораў, створаных прадстаўнікамі казацтва ў другой палове XVII – першай палове XVIII стст. і прысвечаных падзеям т. зв. Хмельніччыны (ва ўкраінскай гістарыяграфіі – Вызваленчай вайны і Руіны). Да іх звычайна прылічваюць “Краткое Описаніе Малороссіи”, “Летапіс Самавідца”, “Летапіс Г. Грабянкі”, “Летапіс Вялічкі”.

У “Летапісе Самавідца” скарыстаны звесткі асабістых дзённікаў, дакументаў, народных пераказаў. Гэтая назва таксама ўмоўная, таму што аўтарства твора дакладна не вызначана і належыць украінскаму пісьменніку XIX ст. П. Кулішу, які лічыў, што “летапіс не мае роўных сабе крыніц”.[3] Першапачаткова летапіс меў назву “Пра пачатак і прычыны вайны Хмяльніцкага” і быў надрукаваны ў 1846 г. выдаўцом Бадзянскім. У 1878 г. твор быў выдадзены Кіеўскай археаграфічнай камісіяй з крыніцазнаўчай прадмовай А. Лявіцкага, які лічыў крыніцу адным з самых выдатных помнікаў маларасійскага летапісання, галоўная каштоўнасць якога – у высокай ступені дакладнасці і аўтэнтычнасці.[4]

Аналіз зместу крыніцы і яго характару дазваляе сцвярджаць, што аўтар летапісу быў удзельнікам і сведкам падзей, ведаў сітуацыю. А. Лявіцкі, пад рэдакцыяй якога быў выдадзены гэты летапіс, слушна даводзіў, што аўтар належаў да праваслаўнага шляхецкага роду і далучыўся да казацкага руху, не быў прафесійным ваенным, хутчэй за ўсё

МГПУ им. И.П.Шамякина

---

[1] Дмитриев М. В. Киево-Могилянская академия и этницизация исторической памяти восточных славян (Иннокентий Гизель и Феодосий Софонович) // Київська Академія. Вип. 2-3. Київ, 2006. – С. 30.

[2] Степанов Д.Ю. Этногенетический миф в формировании этнических представлений московской элиты в последней четверти XVII – начале XVIII в. // Русский сборник. Вып. 14. – С. 88–92.

[3] Україна: хронологія розвітку. – С. 542.

[4] Левицкий, О. Опыт исследования о Летописи Самовидца. – С. 3.

служыў у гетманскай канцылярыі,[1] таму быў дасведчаны ў міжнародных падзеях, напрыклад, ведаў пра стралецкі бунт у Маскве, рэформу патрыярха Нікана і пераслед стараабрадцаў (“много людей в земле московской помордавано”), падзеі ў Швецыі, Аўстрыі, Турцыі.[2] “Самавідзец” (відавочца) быў сведкам і ўдзельнікам ваенных падзей падчас вайны Рускай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., прысутнічаў асабіста на пахаванні палкоўніка Івана Залатарэнкі, добра ведаў пра абставіны смерці Багдана Хмяльніцкага і ўмовы прызначэння гетманам Івана Выгоўскага, барацьбу паміж казацкімі старшынамі Сомкам і В. Залатарэнкам, валодаў сітуацыяй падчас гетманства І. Брухавецкага і П. Дарашэнкі.[3] Верагодна, з 1676 г. летапісец жыў у Старадубе і займаўся справамі вайсковай канцылярыі, аб чым сведчыць характар яго паведамленняў, напрыклад, шматлікія падрабязнасці з жыцця Старадубшчыны. А. Лявіцкі вельмі аргументавана даводзіў, што твор складзены на тэрыторыі Левабярэжнай Украіны. Па-першае, падзеі, што датычыліся гэтай часткі, выкладзены больш падрабязна, па-другое, выкарыстанне летапісцам слоў “тут” і “там”, “той і сей бераг” і іх геаграфічнае вызначэнне. На “том” беразе казацтва “слухалася караля”, на “сем беразе – Яго Царскую Вялікасць”, “там” акрэслівалася Валынню, гарадамі Гродна і Бярэсцем Літоўскім, “тут” – на Украіне, коло Нежына, Чарнігава.[4]


ЛѢТОПИСЬ
САМОВИДЦА
О
ВОЙНАХЪ БОГДАНА ХМЕЛЬНИЦКАГО
И
О МЕЖДОУСОБІЯХЪ, БЫВШИХЪ ВЪ МАЛОЙ РОССІИ
ПО ЕГО СМЕРТИ.
МОСКВА.
Въ Университетской Типографіи.
1846.

*Летапіс Самавідца*
*Тытульная старонка першага выдання.*
*1846 г.*

Многія даследчыкі лічаць, што аўтарам летапісу мог быць сын праваслаўнага шляхціца, казацкі сотнік, наказны нежынскі палкоўнік, генеральны падскарбій урада гетмана І. Брухавецкага, затым брацлаўскі і старадубскі святар Раман Ракушка-Раманоўскі (1623–1703). Ён удзельнічаў у восень 1654 г. у паходах казакоў на Беларусь і выконваў дыпламатычныя даручэнні. У верасні 1656 г. на чале дэлегацыі вёў перамовы

[1] Левицкий, О. Опыт исследования о Летописи Самовидца. – С. 38.

[2] Летопись Самовидца о войнах Богдана Хмельницкого и о междоусобицах, бывших в Малой России по его смерти. – М.: Университетская типография, 1846. – 165 с. – С. 59.

[3] Тамсама. – С. 24–25, 28, 39–40, 42–53.

[4] Левицкий, О. Опыт исследования о Летописи Самовидца. – С. 23–24.



МГПУ им. И.П.Шамякина

з расійскім урадам аб уладкаванні канфлікту ў сувязі з дзейнасцю "беларускага палкоўніка" І. Нячая, які часам накіроўваў зброю супроць "рускіх ратных людзей". У 1660 г. Ракушка-Раманоўскі ў складзе камісіі для выпрацоўкі ўмоў перамір'я і дэмаркацыі мяжы быў накіраваны ў Барысаў. Згодна з летапісам, перамовы станоўчых вынікаў не мелі, бо "Магілёў і Вільня ваяводу забілі і ляхам паддаліся."[1] Пасля адхілення Брухавецкага ад улады з'ехаў у Брацлаў (Правабярэжная Украіна) і прыняў духоўны сан пратапопа. У 1670 г. як брацлаўскі пратапоп ездзіў да Канстанцінопальскага патрыярха Мяфодзія III у якасці пасла мітрапаліта Кіеўскага і Галіцкага І. Нелюбовіча-Тукальскага з прашэннем пацвердзіць паўнамоцтвы мітрапаліта Кіеўскага.[2] У 1675 г. вярнуўся ў Старадуб (Левабярэжжа).

Паводле меркаванняў даследчыкаў, "Летапіс Самавідца" быў створаны ў 1676–1702 гг. На думку Лявіцкага, крыніца пачала складацца не раней 1672 г. у сувязі з тым, што да гэтага часу падзеі выкладаюцца коратка і сістэматычна з іх высновамі і наступствамі. Верагодна іх аснову склалі запісы аўтара на працягу апошніх дваццаці год.[3] Запісы падзей з 1672 г. сталі фрагментарнымі і адпавядалі тачасным падзеям, наступствы якіх былі занатаваны значна пазней. Аўтарам змест крыніцы падзяляецца на раздзелы: "Аб пачатку вайны Хмяльніцкага", "Вайна самая року 1648", "Вайна Збаражская", "Вайна Яго Царскай Вялікасці". У выніку руплівай крыніцазнаўчай крытыкі вызначылася, што непасрэдна "Летапіс Самавідца" складаецца менавіта з падзей 1648–1702 гг. на Украіне. У выданне 1846 г. ўключаны вытрымкі з "Краткого Описанія Малороссіи" пад назвай раздзела "Летописец в Малой России прежде Хмелницкого" і больш позніх ўставкі перапісчыкаў пра падзеі 1703–1734 гг. Мова, стыль і характар апісання падзей пасля 1702 г. значна адрозніваюцца ад папярэдняга перыяду.[4]

У тэксце "Летапісу" не адчуваецца сімпатыя аўтара да казацтва, захапленне ім ці павага да яго поспехаў і адвагі. Наадварот, выказвалася абурэнне гвалтам і спачуванне шляхце і "знатным людзям", якіх рабавала і збівала "казацкая чернь" і якія "ишли з двора, покидали свои уряды, бороды голили и до того войска ишли…так діавол учинил себе смех с

[1] Летопись Самовидца. – С. 33.
[2] Тамсама. – С. 56.
[3] Левицкий, О. Опыт исследования о Летописи Самовидца. – С. 30.
[4] Тамсама. – С. 32.



МГПУ им. И.П.Шамякина

людей статечных” (знатных).[1] Для аўтара войны Хмяльніцкага і яго паслядоўнікаў – “лютасць свавольнай чэрні” і пакаранне Божае за грахі. Прычыны казацкіх хваляванняў летапісец вызначаў як “на православіе гоненіе і казакомъ отмщеніе” ў выніку ўзмацнення пазіцый каталіцтва і пашырэння ўніяцтва, узмацнення феадальнага прыгнёту і “отягощения казаков реестровых”.[2] Рабункі казакоў часта тлумачыліся барацьбой супроць свавольства паноў, насаджэння каталіцтва і царкоўнай уніі: “у веры руской помешка великая была от унеят и ксенсіов, не тилко Унея у Літве, на Волыне, але и на Украине почала гору брати…церкви православные запечатовали, що город, то костел был”.[3] Станоўча ацэньвалася далучэнне Левабярэжнай Украіны да Рускай дзяржавы: “не малая радость стала”.[4]

У дачыненні да падзей на Беларусі Самавідзец дакладна вызначаў вынікі казацка-сялянскай вайны: “на той стороне Днепра по самый Днестр – спустошення замков, костелов, дворов шляхетских”, а таксама вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, у выніку якой гарады Гомель, Віцебск, Полацк, Дуброўна, Орша, Шклоў, Копысь, Магілёў былі падпарадканы рускімі войскамі ў 1654 г., а да 1655 г. амаль “всю Литву звоевали”. Узгадвае пра міжусобную магнацкую барацьбу Сапегаў – Агінскіх і Вішнявецкіх, у якой казацтва ўдзельнічала ў якасці “спискового войска” па абодва бакі. У выніку чаго былі разрабаваны маёнткі Сапегаў (Дуброўна) і Агінскіх (Галоўчын) у 1701 г. на Беларусі. Падчас Паўночнай вайны (1700–1721) казацкія войскі ў 1702 г. былі накіраваны гетманам І. Мазепам пад Быхаў для дапамогі рускім войскам.[5]

Згаданы вышэй твор “Краткое Описаніе Малороссіи” ўяўляе сабой больш сістэматызаваны гістарычны нарыс – кампіляцыю з Летапісаў Грабянкі і Самавідца, складзеную прыблізна ў 30-х гг. XVIII ст. Невядомы аўтар дакладна вызначаў мэту працы: “какъ оная, послѣ самодержавія великаго князя Владиміра, была подъ польскимъ владѣніемъ и какъ нескоро послѣ того, по изгнаніи изъ оной ляховъ гетманомъ Зиновіемъ Богданомъ Хмельницкимъ, приведена подъ высокодержавную руку

[1] Летопись Самовидца. – С. 14.
[2] Тамсама. – С. 6–7; Левицкий, О. Опыт исследования о Летописи Самовидца. – С. 65.
[3] Летопись Самовидца. – С. 10.
[4] Тамсама. – С. 22.
[5] Тамсама. – С. 11, 22–24, 91.



МГПУ им. И.П.Шамякина

государя, царя и великаго князя АлексѢя Михайловича, самодержца всероссійскаго” і акрэсліваў прамаскоўскую арыентацыю.[1]

Летапіс Грабянкі (1710 г.) таксама ўяўляе вытрымкі з розных крыніц, пераважна з Кіеўскага Сінопсісу 1674 г. і Летапісу Самавідца, прац М. Кромера, М. Стрыйкоўскага, М. і І. Бельскіх, А. Гваньіні, мастацкіх твораў, народных паданняў і інш. Ён складаецца з трох раздзелаў. Першы прысвечаны легендарнаму паходжанню казацтва ад старажытнасці і часу Кіеўскага княства да перыяду Рэчы Паспалітай і з’яўленню асобы Б. Хмяльніцкага і да 1649 г. Другі – непасрэдна вайне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага і яго слаўным перамогам, міжнародным стасункам. Хмяльніцкі вызначаецца як значная гістарычная асоба, славуты правадыр і герой. Галоўная заслуга гетмана, на думку Рыгора Грабянкі, – вызваленне ад “польскага ярма”. Трэці – звесткам пра падзеі 1657–1709 гг. і характарыстыцы гетманстваў Юрыя Хмяльніцкага, Івана Выгоўскага, Івана Брухавецкага. Аўтар – прыхільнік аўтаноміі Украіны ў складзе Расіі, таму якасці гетманаў вызначаюцца ў залежнасці ад гэтай ідэі. Васіль Залатарэнка, Якім Сомка, Іван Самойлавіч, Дзям’ян Мнагагрэшны маюць рысы станоўчых герояў, а Іван Выгоўскі, Іван Брухавецкі, Пётр Дарашэнка – рысы адмоўных асоб.[2]

Сучасныя даследчыкі разглядаюць Летапіс Грабянкі як высокамастацкі літаратурна-публіцыстычны твор, дзе прапанавана пэўная гераізацыя мінулага. Гэта прыклад аднаго з самых пашыраных летапісных твораў (вядома 50 розных спісаў).[3]

Самая манументальная гістарыяграфічная праца XVIII ст. – гэта т. зв. Летапіс Самуіла Вялічкі ў двух тамах – “Сказаніє о войнѢ козацкой з поляками” (1648–1659 гг.) і “Повествованіе летопісне о малоросійскіх і іных повіденіях” (1660–1700 гг.), – складзеная па правілах тагачаснай рыторыкі. Сваю назву летапіс атрымаў падчас выдання ў XIX ст. Аўтар казацкага паходжання, атрымаў добрую адукацыю ў Кіева-Магілянскай калегіі. На жаль, аб’ёмісты рукапісны твор захаваўся не поўнасцю. Матэрыял не заўсёды апрацаваны, не вызначаны даты і спасылкі на

[1] Краткое опісаніе Малороссіі / Летопись Самовидца по новооткрытым спискам / под ред. О. И. Левицкого. – Київ: Типография К. Н. Милевского, Крещатик, дом Биска, 1878. – С. 211–319.

[2] Літопис гадяцького полковника Григорія Грабянки / пер. із староукр. Р.Г. Іванченка. – Київ: Знання України, 1992. – 192 с.

[3] Луценко, Ю. Григорій Грабянка і його літопис / Літопис гадяцького полковника Григорія Грабянки / пер. із староукр. Р.Г. Іванченка. – Київ: Знання України, 1992.



МГПУ им. И.П.Шамякина

крыніцы, магчыма, таму што на час завяршэння працы аўтар страціў зрок (1720 г.). Сучасныя даследчыкі твора сцвярджаюць, што яго можна назваць летапісам умоўна. Ён ўяўляе літаратурную апрацоўку шматлікага крыніцавага, гістарыяграфічнага матэрыялу і ўласных думак Вялічкі, але і ўтрымлівае першыя спробы крытычнага стаўлення да інфармацыі.[1] Аўтар шырока скарыстаў вытрымкі з розных мастацкіх (вершы, панегірыкі, эпітафіі) і гістарычных твораў Еўропы, сапрадных дакументаў казацкай канцылярыі і казацкіх летапісаў. Гэта працы М. Стрыйкоўскага, М. Кромера, нямецкага гісторыка С. Пуфендорда, Кіеўскі Сінопсіс І. Гізеля, Дз. Туптала (Растоўскага), невядомы дыярыуш С. Зоркі, дыярыуш Акольскага, паэтычныя творы С. Твардоўскага, І. Галятоўскага, І. Велічкоўскага, Лазара Бараноўскага, Бучынскага-Асколда, Ясінскага.


О ВОИНѢ
КОZАЦКОИ ZПОЛЯКАМИ
ЧРЕZЪ
ЅѢНОВИЯ БОГДАНА ХМЕЛНИЦКОГО
ГЕТМАНА ВОИСКЪ ЗАПОРОЖСКИХЪ
ВОСМИ ЛѢТЕХЪ ТОЧИВШОЙСЯ. А ПО ДВАНАДЦАТИ
ЛѢТЪ У ПОЛЯКОВЪ ZИНШИМИ ВЛАСТЬМИ ПРОВЛЕКШОЙСЯ
ЯКОЮ ОНЪ ХМЕЛНИЦКИИ
ПРИ ВСЕСИЛНОЙ ПОМОЩИ БЖЕСТВЕННОЙ, ZКОZАКАМИ И
ТАТАРМИ, ОТ ТАКАГО ИГА ЛЯДСКАГО ВИБИЛСЯ И ПОД
ВИСОКОДЕРЖАВНОЕ ПРЕСВѢТЛѢЙШАГО МНРХИ РОССИИСК
АЛЕѮИЯ МИХАИЛОВИЧА
ВЛАДѢНИЕ ДОБРОВОЛНѢ ПОДДАЛСЯ.
ОТ АВТОРОВЪ
НѢМЕЦКОГО САМУИЛА ПУФЕНДОРФИЯ. КОZАЦКОГО
САМУИЛА ЗОРКИ. И ПОЛСКОГО САМУИЛА ТВАРДОВСКОГО
ВОИНУ ТУЮ ВКНИЗѢ СВОЕИ, ВОИНА ДОМОВАЯ НАЗВ[illegible]
ВѢРШОМЪ ПОЛСКИМЪ ОПИСАВШАГО. НИНѢ ЖЕ ВКРАТ[illegible]
СТИЛЕМЪ ГИСТОРИЧНИМЪ И НАРѢЧИЕМЪ МАЛОРОССИЙСКИМЪ
СПРАВЛЕНОЕ, И НАПИСАНОЕ ТЩАНИЕМЪ САМОИЛА ВЕЛИЧКА К[illegible]
ЦЕЛЯРИИ [illegible] ВОИСКА ЗАПОРОЖСКОГО ВСЕЛѢ ЖУК[illegible]
ОУЕЗДУ ПОЛТАВСКОГО, РОКУ 1720.

*Летапіс Вялічкі 1720 г.*
*Тытульная старонка*

Пэўную каштоўнасць уяўляюць сістэматызаныя біяграфічныя апісанні з малюнкамі дзесяці казацкіх гетманаў – Б. Хмяльніцкага, І. Выгоўскага, Ю. Хмяльніцкага, І. Брухавецкага, П. Цяцеры, П. Дарашэнкі, Д. Мнагагрэшнага, М. Ханенкі, І. Самойлавіча, І. Мазепы. У цэнтры ўвагі аўтара – Багдан Хмяльніцкі, славуты гетман, правадыр і барацьбіт, які ператвараецца ў эпічнага героя-барацьбіта.[2]

Летапіс Вялічкі з'яўляецца каштоўнай гістарыяграфічнай крыніцай, якая дазваляе вызначыць узровень грамадска-палітычнай, этычнай і эстэтычнай тагачаснай думкі, уявіць стан развіцця самасвядомасці, на што дзейсны ўплыў аказвала гістарыяграфічная традыцыя. Менавіта казацкія летапісы вызначалі развіццё ўяўленняў пра гераічнае мінулае і казацтва як абаронцаў старажытных традыцый, праваслаўнай веры і прывілеяў жыхарства Малоросіі. Пашырэнне розных

[1] Марченко, М. Українська історіографія / М. Марченко. – Київ, 1959. – 159 с. – С. 72; Шевчук, В. О. Самійло Величко та його літопис / В. О. Шевчук // Літопис : в 2 т. / С. В. Величко. – Київ : Дніпро, 1991. – Т. 1. – С. 5–21.

[2] Величко, С. В. Літопис : в 2 т. / пер. з книжної української мови, вст. стаття, комент. В. О. Шевчука ; відп. ред. О. В. Мишанич. – Київ : Дніпро, 1991. – Т. 1. – 371 с. ; Т. 2. – 642 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина

спісаў і рэдакцый казацкіх летапісаў у XVIII ст. сведчыла аб фарміраванні праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі, а іх выданне ў XIX ст. сцвярждала яе панаванне.

Самая манументальная гістарыяграфічная праца XVIII ст. – гэта т. зв. Летапіс Самуіла Вялічкі ў двух тамах – "Сказаніє о войнѢ козацкой з поляками" (1648–1659 гг.) і "Повествованіе летопісне о малоросійскіх і іных повіденіях" (1660–1700 гг.), – складзеная па правілах тагачаснай рыторыкі. Сваю назву летапіс атрымаў падчас выдання ў XIX ст. Аўтар казацкага паходжання, атрымаў добрую адукацыю ў Кіева-Магілянскай калегіі. На жаль, аб'ёмісты рукапісны твор захаваўся не поўнасцю. Матэрыял не заўсёды апрацаваны, не вызначаны даты і спасылкі на крыніцы, магчыма, таму што на час завяршэння працы аўтар страціў зрок (1720 г.). Сучасныя даследчыкі твора сцвярджаюць, што яго можна назваць летапісам умоўна. Ён ўяўляе літаратурную апрацоўку шматлікага крыніцавага, гістарыяграфічнага матэрыялу і ўласных думак Вялічкі, але і ўтрымлівае першыя спробы крытычнага стаўлення да інфармацыі.[1] Аўтар шырока скарыстаў вытрымкі з розных мастацкіх (вершы, панегірыкі, эпітафіі) і гістарычных твораў Еўропы, сапрадных дакументаў казацкай канцылярыі і казацкіх летапісаў. Гэта працы М. Стрыйкоўскага, М. Кромера, нямецкага гісторыка С. Пуфендорда, Кіеўскі Сінопсіс І. Гізеля, Дз. Туптала (Растоўскага), невядомы дыярыуш С. Зоркі, дыярыуш Акольскага, паэтычныя творы С. Твардоўскага, І. Галятоўскага, І. Велічкоўскага, Лазаря Бараноўскага, Бучынскага-Асколда, Ясінскага. [2]

Пэўную каштоўнасць уяўляюць сістэматызаныя біяграфічныя апісанні з малюнкамі дзесяці казацкіх гетманаў Б. Хмяльніцкага, І. Выгоўскага, Ю. Хмяльніцкага, І. Брухавецкага, П. Цяцеры, П. Дарашэнкі, Д. Многагрэшнага, М. Ханенкі, І. Самойлавіча, І. Мазепы. У цэнтры ўвагі аўтара – Багдан Хмяльніцкі, славуты гетман, правадыр і барацьбіт, які ператвараецца ў эпічнага героя-барацьбіта.

Летапіс Вялічкі з'яўляецца каштоўнай гістарыяграфічнай крыніцай, якая дазваляе вызначыць узровень грамадска-палітычнай, этычнай і эстэтычнай тагачаснай думкі, уявіць стан развіцця самасвядомасці, на што дзейсны ўплыў аказвала гістарыяграфічная традыцыя. Менавіта казацкія летапісы вызначалі развіццё ўяўленняў пра гераічнае мінулае і казацтва як

[1] Марченко М. Українська історіографія. – К., 1959. – С. 72; Шевчук, В.О. Самійло Величко та його літопис / Величко, С.В. Літопис. Т. 1. – К.: Дніпро, 1991.

[2] Величко, С.В. Літопис. – В 2 т. – Т. 1. – 371 с.; Т. 2. – 642 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина

абаронцаў старажытных традыцый, праваслаўнай веры і прывілеяў жыхарства Малоросіі. Пашырэнне розных спісаў і рэдакцый казацкіх летапісаў у XVIII ст. сведчыла аб фарміраванні праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі, а іх выданне ў XIX ст. сцвярджала яе панаванне.

### 4.4. Каніскі і яго творы



*Епіскап Магілёўскай праваслаўнай епархіі Г. Каніскі*

Кіеўская тэндэнцыя панславізма знайшла сваё ўвасабленне ў працах беларускага архіепіскапа Георгія Каніскага. У прадмове да выдання 1746 г. "Истории русов или Малой России" падкрэслівалася: "История Малой России до времен нашествия на нее татар с ханом их Батыем соединена с историей всей России или она и есть единственная история Российская, ибо всем известно начало сея истории вместе с началом правления Российского берется от князей и Княжеств Киевских..."

Дзейнасць Г. Каніскага як праваслаўнага іерарха, у першую чаргу, была накіравана на абарону правоў вернікаў і агітацыю сярод уніятаў пра магчымасць пераходу ў веру продкаў. Працы Магілёўскага архіепіскапа адзінай праваслаўнай епархіі на беларускіх землях таксама мелі практычныя мэты. У 1765 г. ён перадаў новаму каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму "Мемориал об обидах православным", дзе пералічваў "случаи угнетения православных в Речи Посполитой, которые имели место за время его епископства с приложением списка церквей, отнятых в унию".

У 1767 г. Каніскі ў Варшаве выдаў кнігу "Права и вольности исповедующих греко-восточную веру в Польше и Литве", якую Свяшчэнны Сінод Расійскай імперыі прызнаў карыснай: "Оную книгу для случающихся впредь справок взнесть в список и хранить в канцелярии Св. Синода с Указными книгами, а для удобнейшего чтения перевесть … на российский язык".

МГПУ им. И.П. Шамякина

Праца Каніскага “Историческое известие о епархии Могилевской, в Белой России состоящей, и о епархиях, в Польше бывших, благочестивых, т.е. греко-восточного исповедания, кои римлянами обращены на унию или соединены с Римскою церковию” з дадаткам “Каталога православных епископов Могилевских”, выдадзеная пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, была спробай сістэматычнага выкладу гісторыі заходнерускіх праваслаўных епархій ад “начала их возникновения до недавних лет” з кароткімі біяграфічнымі звесткамі пра яе іерархаў.[1]

Аснову праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі склалі працы Геогія Каніскага “Записки преосвященного Георгия Конисского о том, что в России до конца XVI века не было никакой унии с Римской церковью”, “История русов или Малой России”. Па форме выкладання “Запіскі” працягвалі традыцыі рэлігійнай палемікі, пашыранай на беларускіх і ўкраінскіх землях у XVII ст. Па словах аўтара крыніцамі яго работ былі “летописи и записки белорусские, яко из страны единоплеменной, соседствующей и от руин Малороссийских удаленной” і менавіта “Летопись, что ведена с давних лет в Могилевском искусными людьми, сносившись о нужных сведениях с учеными мужами Киевской Академии и разных знатнейших Малороссийских монастырей, паче тех, в коих проживал монахом Юрий Хмельницкий... оставивший в них многия записки и бумаги отца своего Зиновия Хмельницкого и самые журналы достопамятностей и деяний национальных”, працы антычных аўтараў, заходнееўрапейскія і польскія хронікі, палемічныя і багаслоўскія творы.[2]

Магілёўскі архіепіскап даводзіў пра спрадвечныя правы беларускага праваслаўя і неабходнасць злучэння велікаросаў, маларосаў і беларусаў у складзе Расіі. Ён скарыстаў праваслаўную гістарыяграфічную традыцыю ў сваёй “Гісторыі”, якая пачынаецца, як і Кіеўскі Сінопсіс, з радавода кіеўскіх князёў і Хрышчэння Русі, узгадак пра апостала Андрэя, княгіню Вольгу і князя Уладзіміра. Вызначаў рэлігійную талерантнасць у Вялікім княстве Літоўскім да канца XVI ст.: “религия русская греческого или иерусалимского исповедания уравнена с римской католической на равные права и преимущества, яко свободная и союзница, утверждена привилегиями

---

[1] Теплова, В.А. Церковная история Беларуси в трудах отечественных историков XIX – начала XX века. [Электронный ресурс] http://hramvsr.by/teplova.htm – Дата доступа: 20.07.2015.

[2] История русов или Малой России. Сочинение Георгия Конисского, архиепископа белорусского / репринтное воспроизведение издания 1846. – Киев: РИФ «Дзвін», 1991. – С. 1–2.



МГПУ им. И.П.Шамякина

королевскими и сеймовыми конституциями". рэзка негатыўна і эмацыянальна вызначаў Берасцейскай уніі: "народу Русскому давши испить самую горестную чашу, каковую и во дни Нерона и Калигулы не все христиане вкушали... Уния явилась здесь в лисьей коже, но с волчьим горлом."[1] Каніскі ацэньваў дзейнасць Пятра Магілы як аднаго з самых дзесных дзеячаў праваслаўя.[2] Шмат увагі надаваў гісторыі казацтва, вызначаў яго пазітыўную ролю ў абароне праваслаўя. Аповед вёў у храналагічнай паслядоўнасці гетманства ад Ленцкаронскага і Дз. Вішневецкага да Мазепы і Скарападскага. Працы Каніскага выкарыстоўвалі амаль усе даследчыкі гісторыі праваслаўя ў заходнерускіх землях у XIX ст., у тым ліку М. Бантыш-Каменскі, Я. Балхавіцінаў, Макарый Булгакаў, Філарэт Гумілёўскі, С. Голубеў і інш. Тым самым можна казаць аб афармленні праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі, якая канчаткова склалася ў расійскай гістарыяграфіі ў XIX ст.

***

На працягу XVII–XVIII стст. паступова склалася пэўная гістарыяграфічная традыцыя, якую можна акрэсліць як праваслаўную. Вядучае месца ў большасці царкоўна-гістарычных і літаратурна-публіцыстычных твораў, пашыраных на беларускіх і ўкраінскіх землях, займалі пытанні гісторыі праваслаўнай царквы, вызначэння Кіева як сакральнага цэнтра праваслаўя, старажытнасці і пераемнасці візантыйскіх традыцый, барацьбы вернікаў супраць царкоўнай уніі 1596 г., гісторыі казацтва як абаронцы веры продкаў. Фарміруецца ідэя панславянскага праваслаўнага адзінства і вызначаецца этнагістарычная канцэпцыя (легенды пра паходжанне народа ад першапродка, геаічным мінулым народа і ўяўленні пра суседнія і чужыя народы), якія знайшлі адлюстраванне ў Хроніцы Сафановіча і Кіеўскім Сінопсісе, казацкіх летапісах і значна паўплывала на расійскую гістарыяграфію XIX ст.

[1] История русов или Малой России. – С. 8; 32.
[2] Тамсама. – С. 48.



МГПУ им. И.П. Шамякина

# Раздзел 5. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ XIX – ПАЧАТКУ XX стст. КАНФЕСІЙНЫХ АДНОСІН У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

## 5.1 Міжканфесійная барацьба ў расійскай гістарыяграфіі першай паловы XIX ст.

Цікавасць да міжканфесійных пытанняў узрастае ў канцы XVIII–пачатку XIX стст. у сувязі з падзеламі Рэчы Паспалітай і жаданнем абгрунтаваць неабходнасць “вяртання зямель”. У расійскай гістарыяграфіі яна вызначалася, перш за ўсё, у крытыцы каталіцтва і уніі. Адназначна адмоўныя ацэнкі Берасцейскай уніі, пашыраныя ў палемічнай літаратуры, зрабілі вялізарны ўплыў на расійскую гістарыяграфію. Гэта знайшло адлюстраванне ў працах прадстаўнікоў заходнерусізму, якія набывалі ў першай палове XIX ст. сістэмны выгляд і характар і абапіраліся на шырокую дакументальную базу.

Гістарычнай асновай негатыўных ацэнак канфесійнага жыцця ў Рэчы Паспалітай стала рэлігійна-палемічная літаратура другой паловы XVI–XVII стст., пад уплывам якой міжканфесійная барацьба ператварылася ў палітычны сродак барацьбы.



*Д. М. Бантыш-Каменскі*

Адной з першых такіх работ было даследаванне М. Бантыш-Каменскага «Историческое известие о возникшей в Польше унии, с показанием начала и важнейших, в продолжение оной чрез два века, приключений, паче же о бывшем от Римлян и Униятов на благочестивых тамошних жителей гонении”. Нават назва працы вызначае негатыўныя вынікі ўніі для праваслаўнага насельніцтва на далучаных землях. Аўтар прадстаўляў некаторыя звесткі па гісторыі праваслаўя на Беларусі і Украіне, заснаваныя на інфармацыі Г. Каніскага, Магілёўскага архіепіскапа адзінай праваслаўнай епархіі і матэрыялах з архіва Калегіі замежных спраў Расіі. Ён сцвярджаў, што царкоўная унія – ёсць вынік імкнення Рыма падпарадкаваць праваслаўе, а яе наступствы – раскол грамадства, выклаў доказы “притеснения «благочестивых»” каралём Жыгімонтам III і дапамогі

МГПУ им. И.П.Шамякина

"рускім" з боку "грэчаскіх епіскапаў", якія "пастаўлялі святароў пастве, што засталася без іерархіі". Галоўную ўвагу М. Бантыш-Каменскі засяродзіў на скаргах праваслаўнага насельніцтва і маскоўскаму заступніцтву за "единоверных и единоплеменных своих".[1]

Удакладніў канцэпцыю Бантыш-Каменскага мітрапаліт Яўгеній (Балхавіцінаў), які вызначаў ролю праваслаўнага і ўніяцкага духавенства ў пашырэнні уніі і барацьбе супраць яе, асабліва ў гады казацкіх войнаў другой паловы XVII ст.[2]

Іншага пункту гледжання прытрымліваліся прафесары Віленскага ўніверсітэта П. Бабpоўскі, Я. Ярашэвіч і Т. Нарбут, якія разглядалі ўніяцтва як рэлігію, што садзейнічала захаванню самабытнасці народа.[3]

Адным з самых вядомых іх апанентаў быў таксама ўраджэнец Беларусі, прафесар Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта М.І. Каяловіч, яскравы прадстаўнік заходнерусізма. Адна з яго прац нават у назве "Разбор соч. П.И. Бобровского: Русская греко-католическая церковь в царствование императора Александра І. Историческое исследование по архивным документам и указание на основании архивных документов иной постановки всех главных униатских вопросов того времени", выдадзеная ў Санкт-пецярбургу ў 1890 г., вызначала пазіцыю аўтара.

Такім чынам, да сярэдзіны XIX ст. вызначылася два асноўныя падыходы да вывучэння рэлігійнага становішча ў Рэчы Паспалітай: негатыўная і станоўчая ацэнкі ролі ўніяцтва ў захаванні самабытнасці беларусаў і ўкраінцаў.

## 5.2. Расійская дзяржаўная гістарыяграфічная школа (О. Турчыновіч, М. Каяловіч, В. Аскачэнскі, Р. Кіпрыяновіч)

Аднак пануючае месца ў расійскай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX стст. займала афіцыйная канцэпцыя праваслаўнага

[1] Бантыш-Каменский, Н.Н. Историческое известие о возникшей в Польше унии, с показанием начала и важнейших, в продолжение оной чрез два века, приключений, паче же о бывшем от Римлян и Униятов на благочестивых тамошних жителей гонении. – М., 1805. – С. 50; 405.

[2] Евгений (Болховитинов), митр. Описание Киево-Софийского собора и Киевской иерархии. – К., 1825. – С. 180–204

[3] Jaroszewicz, J. Obraz Litwy pod wzglodem jej cywilizacji, od czasow najdawniejszych do konca wieku XVIII. – Wilno, 1844–1845. Cz. I-III.; Narbutt, T. Dziejestarozytne narodu Litewskiego. T. 9: Panowanie Zygmuntew. – Wilno. 1841.

“триединого русского народа” (вялікаросы, маларосы, беларусы), якая супрацьстаяла вялікапольскай канцэпцыі (палякі, ліцвіны, русіны). Ва ўмовах барацьбы гэтых дзвюх канцэпцый нацыянальнага і этнапалітычнага будаўніцтва ўніяты не мелі права на ўласную ідэнтычнасць. У сувязі з гэтым расійская гістарычная навука ў 80–90-я гг. XIX ст. імкнулася сфарміраваць адмоўныя адносіны да ўніятаў, вызначыўшы пракаталіцкі і прапольскі характар іх гісторыі.

Вялізная дакументальная база дазволіла даследчыкам сканцэнтраваць увагу на крытыцы каталіцтва і ўніяцтва на беларускіх і ўкраінскіх землях, абгрунтававаць неабходнасць вяртання гэтых земляў, распрацаваць канцэпцыю заходнерусізму і сфарміраваць праваслаўную гістарыяграфічную традыцыю.



*М.О. Каяловіч*

Гэтую пазіцыю яксрава адзначыў М. Каяловіч: “Давняя историческая борьба между Русскими и Поляками обнаружила ясно различия между ними. К различию этому все привыкли. Но между этими двумя народностями – между Русскою и Польскою – находятся еще Белорусы и Малоросы. Оба эти племена отличаются некоторыми особенностями и от Великоруссов и от Поляков... Людям, близко знающим Россию и Польшу, понятно и ясно как божий день, что оба эти племена – Белорусы и Малоросы – тот же русский народ, что они не могут быть причисляемы к Польскому народу... менее было бы странно, если бы Поляки» старались группировать в одно чисто польский народ в областях чисто польских: но они постоянно бросаются на чужую почву, на почву Русскую – в Западную Россию, на почву, которую русский народ никогда не уступит. Незнание этой истины может повести к неизмеримой трате сил к неисчислимым последствиям как для России, так и для Западной Европы, и все это для того только, чтобы убедиться, что польский вопрос напрасно переносится на чужую почву. Русская наука не может не чувствовать, что на ней особенно лежит эта обязанность. Она

МГПУ им. И.П.Шамякина

ближе к этому делу, и как читатели увидят, обладает не малым запасом материалов для уяснения истории и быта Западной России”.[1]

У сваіх працах (“Документы, объясняющие историю западной России и ея отношение к восточной России и к Польше”, “О Литовской церковной унии”, “История русского самосознания по историческим памятникам и научным исследованиям”) прафесар акрэсліваў асаблівасці канфесійнай сітуацыі на далучаных землях, зазначае, што дзяржаўная рэлігійная палітыка ў Рэчы Паспалітай была даволі паспяховай, асабліва пасля Брэсцкай уніі 1596 г., “сопровождавшейся отторжением от праотеческой веры высших классов литовско-русского общества и даже значительной части народа”. Ён робіць выснову, што “соединение (у выніку Люблінскай уніі) не могло проникнуть вглубь местной русско-народной жизни”.[2]

М. Каяловіч першым зрабіў праваслаўную канцэпцыю Брэсцкай царкоўна-рэлігійнай уніі сістэматызаванай і навуковападобнай, падмацаваў яе вялізным фактычным матэрыялам, прааналізаваў вытокі рэлігійнай уніі і сродкі яе рэалізацыі, сцвярджаў, што казакі абаранялі ўласную веру і царкву ад іншаверцаў, у вайне XVII ст. у Рэчы Паспалітай вінаваты каталікі.

Кіеўская праваслаўная традыцыя знайшла сваё ўвасабленне ў працы Аскачэнскага “Киев с древнейшим его училищем Академией”, прысвечаная выключна гісторыі г. Кіева і навучальных установ у Рэчы Паспалітай, пачынаючы з князя Уладзіміра Святаслававіча, у тым ліку брацкіх, уніяцкіх, каталіцкіх вучыльняў. Аўтар прыводзіць падрабязную характарыстыку праваслаўных вучылішчаў: Астрожскага, Львоўскага, Віленскага, Луцкага і брацкай школы ў Магілёве. На думку аўтара, іх нельга было параўнаць з каталіцкімі ўстановамі, самымі вядомымі з якіх былі Замойская акадэмія, Любранская калегія ў Познані, калегіі Мільгараты ў Ліпцы, Хелмская над Віслай і інш.[3] Цэнтрам адукацыі Аскачэнскі называў Кракаўскую Акадэмію (Ягелонскі ўніверсітэт), па ўзоры якой будавалася адукацыя ў Кіеўскай калегіі. Дзіўна, што

[1] Коялович, М.О. Документы объясняющие историю западно-русского края и его отношения к России и Польше. – СПб.: типография Эдуарда Праца, 1885. – С. 6–8.

[2] Коялович, М.О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным исследованиям. – 3-е изд.– СПб.: типография А.С. Суворина, Эртелев пер., д.13, 1901. – С. 11.

[3] Киев с древнейшим его училищем Академией: Соч. В. Аскоченского. – Киев: университетская тип., 1856. – С. 41–42.

МГПУ им. И.П.Шамякина

падрабязна апісвалася структура навучання і ўнутраны распарадак універсітэта і бурсы (інтэрната), вызначалася першапачатковая верацярпімасць, аднак пасля пашырэння дзейнасці іезуітаў “дети Церкви православной, поступая в это училище, выходили оттуда или открытыми папистами, как Потей или некрепкими в православии, как Смотрицкий”.[1]

Сярод прадстаўнікоў царкоўнай гістарыяграфіі грунтоўнасцю вызначалася праца мітрапаліта Макарыя (Булгакава). Ён упершыню скарыстаў тэрмін “заходнеруская царква” у сваёй шматтомнай працы, імкнуўся прааналізаваць прычыны заняпаду праваслаўнай царквы, выявіць асаблівасці стану праваслаўнай царквы ў XVI – сярэдзіне XVII стст. Макарый упершыню звярнуў увагу на заняпад праваслаўнай царквы ў Кіеўскай мітраполіі, выкліканы, перш за ўсё, магчымасцю свецкай улады ўмешвацца ў справы царквы, што скарыстаі “иезуиты, пользовавшиеся большим влиянием при короле Сигизмунде III”. Аўтар распавядаў пра міжканфесійныя адносіны і барацьбу супраць Берасцейскай уніі, якую ацэньваў негатыўна ў межах афіцыйнага пункту погляду. Прыводзіў звесткі пра збліжэнне духавенства заходнерускай мітраполіі з Маскоўскім патрыярхатам у канцы XVI – XVII стст. і рэформы Пятра Магілы.[2]

Выдатнымі прадстаўнікамі дзяржаўнай школы гістарыяграфіі былі выкладчыкі Санкт-Пецярбургскай і Кіеўскай духоўных акадэмій П. Жуковіч, С. Голубеў, І. Чыстовіч, К. Харламповіч.[3]

Праца Іосіфа Вікенцьевіча Турчыновича “Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен”, выдадзеная ў 1857 г. уяўляе адну з першых спроб абагульнення і сістэматызацыі матэрыялу па гісторыі Беларусі ад рассялення славян і з’яўлення нарманаў, гісторыі Полацкага княства і Вялікага княства Літоўскага да гісторыі Рэчы Паспалітай.

[1] Киев с древнейшим его училищем Академией. – С. 54.

[2] Макарий (Булгаков, М. П.). История русской церкви: в 9 т. / Макарий (М.П. Булгаков). – М.: Изд-во Спасо-Преображенского Валаамского монастыря, 1994–1997. – Т. 5: Период разделения русской церкви на две митрополии. – 1996. – 559 с.

[3] Жукович, П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г. / П. Жукович. – СПб., 1901; Жукович, П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (с 1609 г.) / П. Жукович. – СПб., 1903–1912; Голубев, С.Т. Киевский митрополит Петр (Могила) и его сподвижники: (Опыт исторического исследования) / С.Т. Голубев. – Київ, 1883–1898; Чистович, И. Очерки истории западнорусской церкви / И. Чистович. – СПб., 1882–1884; Харлампович, К.В. Западно-русские православные школы XVI и начала XVII века, отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуги их в деле защиты православной веры и церкви / К.В. Харлампович. – Казань, 1898.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Падзеям XVI–XVIII стст. з дзесяці кніг працы прысвечана дзве, з іх канфесійным адносінам – некалькі разделаў. Сваю пазіцыю ён тлумачыў у прадмове да выдання: "Беларусь мае ўласную гісторыю і падзяляецца на два перыяды: старажытную і новую, якая пачынаецца з XV ст. і цесна злучана з палітычнай гісторыяй Літвы, Польшчы і Расіі."[1]

З гэтага часу Беларусь "па сваім геаграфічным становішчы зрабілася арэнай, дзе вырашаліся зброяй пытанні, што складалі палітычнае жыццё гэтых дзяржаў, наступствы гэтай кровапралітнай барацьбы складаюць лёс і новую гісторыю Беларускага краю". На думку Турчыновіча, гісторыя Беларусі з канца XVII ст. страціла сваю самабытнасць і ўяўляе "бессвязный перечень событий или повторяет историю России и Польши."[2] Пераслед праваслаўных, па словах аўтара, пачаўся з заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі пераважна ўніяцкім святарствам. Унія была справай "немногих лиц, руководимых личными видами, вначале находила приверженцев, которые подобно Рогозе, Тарлецкому и Потею, искали личных выгод, православный народ роптал на такую неслыханную новость".[3]

Супрацьстаянне праваслаўных і ўніятаў спарадзіла "нянавісць абодзвюх партый": уніяты "дзейнічалі ў духу езуітаў, імкнуліся павялічыць колькасць сваіх паслядоўнікаў, нярэдка пераступалі мяжу справядлівасці."[4]

Шмат увагі (каля трох старонак тэксту) Турчыновіч надаў Іясафату Кунцэвічу, рэлігійнаму дзеячу, які адрозніваўся "истинно фанатической приверженностью к унии", забыўся настолькі, што адважыўся пераконваць караля зачыніць праваслаўныя цэрквы, а жыхароў гэтага веравызнання як "злых и неисправимых еретиков топить, резать, вешать, жечь на костре". Насельніцтва, даведзенае да шаленства "безбожными гонениями Иосафата", пачало выяўляць нецярплівасць, затым супраціў. Гэтаму таксама садзейнічала таемнае пасвячэнне Мялеція Сматрыцкага ў сан Полацкага архіепіскапа. Нягледзячы на негатыўныя ацэнкі дзейнасці Кунцэвіча, аўтар не ўхваляе яго забойства: "иступленная чернь позволила себе всякие бесчинства над телом владыки... как бы не был жесток

[1] Турчинович, О. Обозрение истории Белоруссии. / О. Турчинович; изд. А. Исанова. – СПб: типография Эдуарда Праца, 1857. – С. VII.
[2] Тамсама. – С. VIII.
[3] Тамсама. – С. 201.
[4] Тамсама. – С. 202.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Кунцевич, своеволие, бунт и злодеяния не могли быть оставлены без примерного наказания."[1]

Турчыновіч характарызаваў казацтва як абаронцаў веры, "витязей Малороссии", якія не патрабавалі нічога, акрамя свабоды біць няверных і недатыкальнасці статутаў, падараваных Баторыем. Аднак Жыгімонт III лічыў казакоў вінаватымі ў варожасці Польшчы з Крымам, яны сваімі "поисками в Черном море накликали гнев самого султана". Пра падзеі Хмяльніччыны на Беларусі ён справядліва адзначаў: "между Припетью и Днепром – страна, с равной жестокостью, опустошенна казаками и поляками... москвитяне не всегда обходились дружелюбно с жителями, наскучили грабежами некоторым литовским городам."[2]




*Вокладка выдання працы І. В. Турчыновіча. 1857 г.*

Пра стан праваслаўных у XVII ст. аўтар "Обозрения" сцвярджаў, што пераслед працягваўся пад рознымі падставамі, зрэшты на соймах яшчэ казалі пра роўнасць правоў, а каралі абяцалі абарону іншаверцам. На яго думку, менавіта з 1717 г. выдаюцца законы супраць дысідэнтаў: ім забаранялася будаваць новыя цэрквы, рамантаваць лядашчыя, браць удзел у сойміках для абрання паслоў на Сойм. Соймавай пастановай 1773 г. дысідэнты не маглі займаць грамадскія пасады. Узыходжанне на трон Станіслава Аўгуста Панятоўскага "побудило надежду в многочисленных обитателях Литовского княжества православного закона найти в Короле покровителя их прав гражданских и религиозных", што адлюстравалася ў вітальнай прамове Беларускага епіскапа Г. Каніскага. Ён з чуллівым красамоўствам намаляваў увесь цяжар пакут праваслаўнага народа[3].

Характарыстыка канфесійных адносін у Рэчы Паспалітай у канцы XVI –XVIII стст., дадзеная Восіпам Турчыновічам, схематычная і

[1] Турчинович, О. Обозрение истории Белоруссии. – С. 203–206.
[2] Тамсама. – С. 207, 2011, 225
[3] Тамсама. – С. 236]

МГПУ им. И.П.Шамякина

ўрыўкавая, але ў цэлым дае ўяўленне пра агульную тэндэнцыю фарміравання традыцыі ў расійскай гістарыяграфіі.

Найбольш яскрава афіцыйны пункт гледжання на гісторыю канфесійных адносін у Рэчы Паспалітай знайшоў сваё ўвасабленне ў работах выкладчыка Літоўскай духоўнай акадэміі Г. Я. Кіпрыяновіча, яго “Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве”, выдадзены ў 1895 г. выкарыстоўваўся ў якасці вучэбнага дапаможніка ў праваслаўных духоўных школах Літвы і Беларусі[1].

Рыгор Якаўлевіч Кіпрыяновіч, выхадзец з Беларусі, скончыў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію, выкладаў у Літоўскай духоўнай семінарыі. Яго “Исторический очерк”, выдадзены ў 1895 г. і перавыдадзены ў 1899 г. з дапаўненнямі, быў вучэбным дапаможнікам для выхаванцаў праваслаўных духоўных школ Беларусі і Літвы да 1917 г. Задачы сваёй працы Р. Я. Кіпрыяновіч ва ўводзінах вызначаў наступным чынам: паказаць распаўсюджанне праваслаўнай веры ў старажытнай паўночна-заходняй Русі пад уладай рускіх князёў “из дома св. Владимира, а потом – из дома литовских князей из рода Гедимина”, давесці больш позняе пашырэнне каталіцтва і гвалтоўнае ўвядзенне уніі ў Беларусі і Літве, характарызаваць зацятую барацьбу праваслаўных “западноруссов” са здраднікамі “латино-униатами” і знішчэнне уніі пад валадарствам Расіі. Галоўнай мэтай працы аўтар лічыў умацаваць у сэрцы чытача “сознательную любовь к родному православию, которое после долгих и тяжелых испытаний опять воссияло на западно-русской земле с новым блеском и красотою.” Гэта наклала адбітак на манеру і характар аповеду Кіпрыяновіча. Ён даў негатыўныя ацэнкі пашырэнню каталіцтва, пазней – уніяцтва, лічыў, што унія разумелася не ў сэнсе хрысціянскай еднасці і ўзаемнай павагі, а ў сэнсе заняволення “братьями-поляками братьев западно-руссов.”[2]

Разам з тым Кіпрыяновіч прыводзіў цікавыя характарыстыкі каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных дзеячаў: Захарыі Капысценскага, Стэфана Зізаніі, Мялеція Сматрыцкага, Пятра Магілы, Афанасія Філіповіча, Пятра Скаргі, Іпація Пацея, Іясафата Кунцэвіча, Іосіфа Вельяміна Руцкага, Георгія Каніскага. Ён вызначае этапы зацвярджэння

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего времени до настоящего времени. – 2-е изд., доп. – Вильно: тип. И. Блюмовича, 1899. – 288 с.

[2] Тамсама. – С. VIII.

МГПУ им. И.П.Шамякина

праваслаўя і каталіцтва ў Паўночна-Заходнім краі. Прыводзіць звесткі пра колькасць храмаў і вернікаў, дапаўняе працу каштоўным дадаткам “Сводом догматических и главных обрядовых разностей, отличающих западную церковь от восточной”.

Гісторыі праваслаўя, каталіцтва і ўніяцтва ў Літве і Беларусі ў XVI–XVIII стст. прысвечаны тэматычныя раздзелы ў адпаведнасці з двума гістарычнымі перыядамі: да Берасцейскага царкоўнага Сабора і з 1596 г. да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Кароткая характарыстыка этапаў гісторыі праваслаўя, каталіцтва і ўніяцтва фармулюецца ў назвах параграфаў. У гісторыі праваслаўя пасля ўвядзення уніі Кіпрыяновіч выдзяляў наступныя этапы:

1. Падрыхтоўка і прыняцце Берасцейскай царкоўнай уніі пры колкаснай перавазе праваслаўных да канца XVI ст. паколькі ў Літве і Беларусі налічвалася каля 700 парафіяльных касцёлаў, цэркваў праваслаўных не менш 10 тысяч. Аднак “польско-католики” панавалі ў кіраванні дзяржавай, былі дарадцамі вялікага князя і караля, задумалі знішчыць “разноверие”, асцераючыся, каб рускія з часам не вярнуліся пад уладу вялікай Расіі. На думку аўтара нарыса, моц праваслаўнай царквы падрывала і садзейнічала пашырэнню уніі практыка патранату.[1]

2. Высіленне праваслаўнай заходнерускай іерархіі ў пачатку XVII ст. у сувязі з пашырэннем уніі, дзейнасцю уніяцкіх іерархаў І. Пацея, І. Кунцэвіча, І. Вельяміна Руцкага. Захавалася толькі дзве праваслаўныя епархіі: Львоўская і Перамышльская, а пасля смерці Міхаіла Капысценскага ў 1612 г. толькі Львоўская. На варце веры знаходзіліся праваслаўныя брацтвы, іх колькасць павялічылася “в век гонений на православных”. У якасці даказу прыводзіць словы І. Вельяміна Руцкага аб тым, што брацтвы стварылі новы тып дзяржавы, які шмат шкоды прыносіць уніятам. Асобнае значэнне меў Віленскі манастыр Святога Духа, які ніколі не быў адняты ўніятамі. У яго падпарадкаванні знаходзілася 17 мужчынскіх і 2 жаночыя манастыры.[2] Важнейшымі брацтвамі таксама былі Мінскае (1612 г.), Слуцкае (1600 г.) і Магілёўскае (1578 г.).

3. Аднаўленне праваслаўнай іерархіі ў 1620 г. Іерусалімскім патрыярхам Феафанам і “покровительство вельможами и дворянами”, што даводзіцца спісам 18 заснаваных манастыроў у час valадарання Жыгімонта

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 62.
[2] Тамсама. – С. 94–95; 92, 94.



МГПУ им. И.П.Шамякина

III Вазы.[1] У абарону праваслаўя адкрыта выступіла казацтва і Віленскае брацтва Святога духа, якое выдала ў 1632 г. кнігу “Синопсис или краткое описание прав, льгот и вольностей православного древнего русского народа” пры дзейсным дбайным садзейнічанні ігумена Іосіфа Бабрыковіча. “Велико было торжество православных”, калі адбылося афіцыйнае аднаўленне праваслаўнай іерархіі ў 1632 г. каралём Уладзіславам IV паводле “Артыкулаў для заспакаення народа рускага грэчаскай рэлігіі” і Кіеўскім мітрапалітам абраны Пётр Магіла. У гэты часназіраецца ажыўленне праваслаўнага жыцця і будова 12 новых праваслаўных манастыроў у прыватных уладаннях.[2] Аднак, згодна з прывілеям Уладзіслава IV ад 14 сакавіка 1635 г., уніяты атрымалі мітраполію, Полацкае архіепіскапства, 4 епархіі: Пінскую, Уладзімірскую, Холмскую, Смаленскую з 10 манастырамі і маёмасцю, праваслаўным забаронены набажэнствы ў Віцебску, Полацку і Навагрудку.[3] Кіпрыяновіч не гаворыць пра тое, што згодна з гэтым жа прывілеям праваслаўныя таксама атрымалі 4 епархіі: Львоўскую, Перамышльскую, Луцкую, Мсціслаўскую (Магілёўскую), магчыма таму, што іх епіскапы за выключэннем апошняй прызналі ўніяцтва.[4]

4. Народная барацьба супраць “лацінства” і уніі (1648 г. – к. XVII ст.). Кіпрыяновіч называе падзеі гэтага часу рухам у абарону веры, народнасці, свабоды, паведамляе пра далучэнне Маларосіі да Расіі ў 1654 г., аднаўленні праваслаўя і знішчэнні уніі ў 1654–1656 гг., часовыя ільготы і ўступкі праваслаўным пасля вайны цара Аляксея Міхайлавіча да канца XVII ст. Аўтар засяроджвае ўвагу на канфесійным фактары супраціўлення: “белорусские крестьяне, побуждаемые воззваниями Хмельницкого жгли усадьбы панов и истребляли всех неправославных”, а падчас вайны з Рэччу Паспалітай Аляксей Міхайлавіч заклікаў падданых караля паўстаць “на досадителей святой восточной церкви греческого закона”, а на захопленых землях пачалося “повсюдное” вынішчэнне уніі і аднаўленне праваслаўных святыняў. Р.Я. Кіпрыяновіч станоўча ацэньвае

[1] Киприанович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 87–88, 91–92.
[2] Тамсама, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 97–100.
[3] Тамсама. – С. 101.
[4] Макарий (Булгаков, М.П.). История русской церкви: в 9 т. – Т. 5: Период разделения русской церкви на две митрополии. – С. 508–510.

МГПУ им. И.П.Шамякина

вынікі вайны: “Москва перестала бояться Польши, которая успела наделать так много вреда в смутное время самозванцев.”[1]

5. Бядотнае становішча праваслаўных і далейшае пашырэнне ўніяцтва (канец XVII – пачатак XVIII стст.). Аўтар тлумачыць пагаршэнне стану праваслаўных у сувязі з тым, што большая частка шляхты “отпала от православных”, не вытрымала “тяжести гонения и по мирским расчетам”, атрымлівала адукацыю ў езуіцкіх школах. На Соймах прымаюцца “весьма стеснительные” для праваслаўных пастановы, таму што палякі асцерагаліся магчымасці далучэння “рускіх” зямель да “единоверной и единоплеменной” Расіі. Згодна з Соймавай пастановай 1667 г., уніяцкае духавенства вызвалялася ад воінскіх абавязкаў, пастановамі 1676 г., 1678 г. і 1699 г. праваслаўным забараняўся выезд за мяжу з мэтай “зносін па справах веры” з праваслаўнымі краінамі, яны павінны падпарадкоўвацца мясцовым епіскапам. Пастанова Сойма 1699 г. пазбаўляла праваслаўных права абірацца на магістрацкія пасады. Сойм 1712 г. забараняў канцлеру прыкладаць дзяржаўную пячатку да дакументаў на карысць дысідэнтаў. Праект 1717 г. прадугледжваў поўнае вынішчэнне не толькі праваслаўя, але і уніяцтва, якая “все же была русской” верай.[2] Кіпрыяновіч вызначаў, што ў вынікам дзейнасці Базыліянскага Ордэна сталі “страшэнныя спусташэнні праваслаўю.” Ордэн у XVII–XVIII ст. меў 88 кляштараў, з іх 16 “совращены в унию при самом введении”, 15 перададзены ўніятам у другой палове XVII ст., заснавана 57. Пры кляштарах існавалі місіі і школы для святарства і вернікаў. Самыя вядомыя з іх дзейнічалі ў Вільні, Полацку, Жыровічах (мела да 300 вучняў).[3] Нягледзячы на пераход у унію народа, ён, на думку аўтара, “под покровом унии хранил следы православия, древние отеческие предания.”[4]

6. Замойскі Сабор і крокі да зліцця ўніяцтва з каталіцтвам. Менавіта, у 1720 г. на Замойскім Саборы былі зроблены рашучыя крокі да зліцця ўніяцтва з лацінствам, пачалі выпраўляцца кнігі для набажэнстваў, асабліва выдадзеныя ў базыліянскіх кляштарах Віленскім, Супрасльскім,

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 106–108; 110.
[2] Тамсама. – С. 117.
[3] Тамсама. – С. 123–124.
[4] Тамсама. – С. 111.

Пачаеўскім. У 1747 г. уніяцкім святарам загадалі агаліць бароды і абстрыгчы валасы, каб не было падабенства з праваслаўнымі святарамі[1].

Да абаронцаў праваслаўя ва ўмовах пашырэння уніі Кіпрыяновіч адносіў аўтараў рэлігійна-палемічнай і багаслоўскай літаратуры. Пачатую ў канцы XVI ст. паленіку ён вызначаў як барацьбу духоўнай зброяй, у якой "латино-униаты" і праваслаўныя імкнуліся апраўдаць свае дзеянні, дае кароткую характарыстыку палемічных твораў "Эктэзіс", "Апокрысіс" Х. Філалета, "Пытанні і адказы праваслаўнага з папежнікам", "Перастрога", "Палінодыя" З. Капысценскага, апошні адрозніваўся "полнотой и богатой ученостью ее автора". Вызначаў Мялеція Сматрыцкага як дзейснага абаронцу праваслаўя, а пасля яго пераходу ва ўніяцтва сцвярджаў, што ён "с таким же жаром нападал на православных". Заслугамі Пятра Магілы лічыўператварэнне Кіеўскай брацкай школы ў акадэмію, якая выхавала шэраг вучоных і вялікіх змагароў за праваслаўе і рускую народнасць, складанне "Кароткага Катэхізіса" і "Трэбніка", якімі карысталіся падчас набажэнстваў у Расіі.[2] Канстанціна Астрожскага называў "столпом и опорою православной церкви", яго ўплыў і высокае становішча ў дзяржаве тлумачыць яго знатным паходжаннем і вялізнымі ўладаннямі, "35 гарадоў, 60 мястэчак, 700 вёсак". Падкрэсліваў, што сам папа і кароль імкнуліся схіліць яго да уніі. Прысутнічаў на Берасцейскім саборы, "решительно восстал против унии", фундаваў цэрквы, друкаваў і рассылаў кнігі.[3]

Падзвіжніку і "ревнителю православия" Берасцейскаму ігумену Афанасію Філіповічу прысвечаны асобны параграф нарыса. Ён паходзіў з паважанай заможнай сям'і, атрымаў добрую адукацыю, ведаў рускую, польскую, лацінскую мовы, пастрыгся ў манахі ў 1627 г. у Віленскім манастыры Святога Духа, быў манахам у Куцеінскім, Міжгорскім, Дубойскім манастырах, здзейсніў падарожжа ў Маскву па збор міласціны і намаляваў Аляксею Міхайлавічу ўласны сумны лёс і праваслаўя. Кіпрыяновіч распавядаў пра адвагу Афанасія, які звяртаўся да караля і Сойма ў 1641 г. і 1643 г. з прамовай пра аднаўленне Берасцейскага праваслаўнага брацтва, знішчэнне "проклятой унии" ў некалькі экзальтаванай манеры і пагрозамі кары нябеснай, калі яго патрабаванні не будуць выкананы. За яго ўчынкі на Філіповіча была накладзена эпітым'я,

---

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 125–126.
[2] Тамсама – С. 132, 134, 135.
[3] Тамсама. – С. 89.



МГПУ им. И.П.Шамякина

затым ён накіраваны ігуменам у Бярэсце, у 1644 г. арыштаваны па загаду мітрапаліта Пятра Магілы, пасля яго смерці зноў Берасцейскі ігумен, у 1648 г. быў абвінавачаны ў сувязях з казакамі, арыштаваны і пакараны. Па словах Кіпрыяновіча, “Вытерпел новыя огненныя пытки и вкусил мученическую смерть”. Аўтар “Исторического очерка” не згадвае пра публіцыстычную спадчыну Афанасія Філіповіча, яго “Дыярыуш”.[1] Магілёўскага праваслаўнага епіскапа Георгія Каніскага Кіпрыяновіч характарызуе як вельмі разумнага і адукаванага іерарха, які выратаваў нешматлікія рэшткі сваёй паствы ад канчатковага “расхищения латинянами и униатами” (дзейнічала толькі 130 прыходаў), садзейнічаў рускаму ўраду ў злучэнні заходнерускага краю з Расіяй, значнай часткі былых уніятаў з праваслаўнай царквой.[2]

Дзейсным уніяцкім мітрапалітам І. Пацею і І. Вельяміну Руцкаму, полацкаму архіепіскапу Іясафату Кунцэвічу Кіпрыяновіч таксама прысвяціў асобныя параграфы сваёй працы і адзначыў іх заслугі ў пашырэніі ўніі. Іпацій Пацей намаляваны як чалавек палкі, схільны да захаплення, ганарлівы, уласталюбівы і прагны да славы, памылкова перакананы ў праўдзівасці уніі, які “с иезуитской безразборчивостью воспользовался всеми, зависевшими от него, средствами” для пашырэння ўніяцтва, тым самым выратаваў унію, падчас замаху на яго жыццё страціў пальцы рукі, якія яго паплечнікі Руцкі і Кунцэвіч паклалі на прастол Свята-Троіцкага кляштара як пальцы мучаніка. Аднак на думку Кіпрыяновіча, няпраўды, гвалт, перaслед, якімі ён імкнуўся распаўсюдзіць унію накладаюць на імя Пацея незабыўную пляму вечнай ганьбы.[3] Яго стараннямі быў выгнаны з Вільні палымяны і таленавіты прапаведнік Стэфан Зізаній, які выратаваўся ад смерці праз манастырскую дымавую трубу Віленскага Свята-Троіцкага кляштара, у якім утворана ўніяцкае брацтва. У 1609 г. усе 12 віленскіх праваслаўных цэркваў перададзены ўніятам, за выключэннем царквы Святога Духа.[4]

Кіпрыяновіч справядліва адзначаў, што пераемнік Пацея Іосіф Вельямін Руцкі імкнуўся ператварыць і ўзвысіць уніяцкае манаства і вышэйшую іерархію з дапамогай пашырэння адукацыі і заснавання

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Киприанович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 103–105.
[2] Тамсама. – С. 189.
[3] Тамсама – С. 80.
[4] Тамсама – С. 77.

Базыльянскага Ордэна. Вынікам гэтай палітыкі стала передача 18 праваслаўных манастыроў базыліянам. Адмоўныя ацэнкі Руцкага падкрэсліваюцца звесткамі, што ў маладосці ён здрадзіў праваслаўю, захапіўся кальвінізмам, потым езуіты звярнулі яго ў лацінства. Супраць яго прызначэння мітрапалітам выступілі князь Багдан Агінскі і староста Віленскага брацтва Святога Духа і накіравалі пратэст у Трыбунал.[1]

Іясафат Кунцэвіч, сын сапожніка, уніяцкі іераманах Віленскага Свята-Троіцкага кляштара, з 1618 г. Полацкі архіепіскап “неистовствовал”, адбіраў у праваслаўных храмы, не дазваляў набажэнствы ў хатах, за горадам, выганяў праваслаўных святароў з епархіі, “приказал вырывать из могил трупы православных и отдавать их на съедение собакам”. Яго забойства ў 1623 г. даследчык тлумачыў “раздражением” жыхароў Віцебска з-за жорсткасці і гвалту, пацвярджаў сваю думку словамі Льва Сапегі з яго ліста да архіепіскапа: “замест радасці, славутая ваша ўнія нарабіла нам стольку клопату, турбот і разладу і так нам абрыдла, што мы б жадалі застацца без яе.”[2] Пераемнік І. Кунцэвіча А. Сялява таксама чыніў разнастайныя гвалты з праваслаўных, вёў цяжбу з Мсціслаўскім праваслаўным епіскапам сільвестрам Косавым з-за яго наведвання Полацка і звароту ўніятаў у праваслаўе. У 1636 г. Антоній Сялява дамогся забароны ўязджаць Косаву ў Полацк і Віцебск. [3]

Р.Я. Кіпрыяновіч катэгарычна не прызнаваў права ўніятаў на існаванне, хоць і гаварыў, што яны “блізкія да праваслаўя.” Ён разглядаў унію ў рамках традыцыі як часовую меру, неабходную для пераходу праваслаўных у каталіцтва. Лічыў, што каталікі падтрымлівалі унію, таму што давала надзею на паслабленне праваслаўя і неразлучнай з ім рускай народнасці і ўзмацненне каталіцтва, якое пракрадалася ў самае ўнутранае жыццё уніі, уводзіла свае веравызначэнні, змяняла на свой узор і набліжала да польскага каталіцтва. Унія была прынята на Берасцейскім Саборы здрадзіўшымі праваслаўю ўладыкамі і пашыралася, дзякуючы падману рускага духавенства і народа Пацеем і іншымі ўладыкамі-ўніятамі. Яны запэўнівалі, што унія не навязвае нічога новага, застануцца ранейшая вера і абрады святой Усходняй царквы. Розніца ў тым, што ўніяты прызнаюць вярхоўным пастырам папу, а не Царградскага патрыярха. Для паспяховай рэалізацыі задумы “польска-католікаў”, лічыў

[1] Киприанович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 81–82.
[2] Тамсама. – С. 86–87.
[3] Тамсама. – С. 101.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Кіпрыяновіч, неабходна было даць уніі "окрепнуть, развиться, потом приняться за превращение ее в латинство."[1] Ён прыводзіў цікавыя звесткі, што з 1686 г. па 1754 г. у Беларускай епархіі ў унію "совращено" 5–7 манастыроў і 164 цэрквы, у 1765 г. засталося толькі 130 праваслаўных цэркваў, а па ўсёй "России под Польшей" да першага падзелу – 40 манастыроў і каля 200 прыходаў.[2]

Аўтар адмоўна ацэньваў значэнне уніі не толькі для праваслаўных, але і для ўніятаў, таму што унія з рэшткамі праваслаўя і рысамі рускай народнасці "не внушала искреннего доброжелательства и уважения польско-католикам", не здзейсніліся надзеі ўніяцкіх іерархаў зраўнавацца ў правах з каталіцкімі біскупамі, мець разам з імі месца ў Сенаце.[3]

Гісторыі каталіцтва ў Заходнерусскім краі ў сярэдзіне XIII–канцы XIX ст. прысвечаны 2, 4–5 разделы ці 1/5 частка "Исторического очерка".

Згодна з дадзенымі Кіпрыяновіча, у складзе Луцкага біскупства ў канцы XVIII ст. знаходзілася 6 дэканатаў з 79 касцёламі, Віленскага біскупства – 26 дэканатаў з агульнай колькасцю касцёлаў і капліц у 1669 г. – 404, у 1717 г. – 435, у 1744 г. – 364.

Даследчык прыводзіць звесткі пра колькасць новых касцёлаў і кляштараў у Паўночна-Заходнім краі. Яны сістэматызаваны намі ў табліцу і дазваляюць зрабіць выснову пра павелічэнне колькасці касцёлаў з часу Люблінскай уніі да падзелаў Рэчы Паспалітай больш чым у 10 разоў.

| Назва губерніі | 1569 г. – к. XVI ст. | Пачатак XVII ст. – 1655 г. | сяр. XVII – XVIII стст. |
|---|---|---|---|
| Віленская | 11 | 42 | 114 |
| Мінская | 9 | 32 | 55 |
| Гродзенская | 8 | 22 | 43 |
| Магілеўская | 1 | 25 | 24 |
| Віцебская | 1 | 11 | 21 |
| Усяго | 22 | 132 | 257 |

*Колькасць касцёлаў у заходніх губернях Расіі*

Нягледзячы на давалі значнае павялічэнне колькасці касцёлаў, Кіпрыяновіч паведамляў, што на абшарах Віленскай епархіі, губерняў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай існавалі нешматлікія касцёлы, штучна

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 118, VIII, 121.
[2] Тамсама. – С. 188.
[3] Тамсама. – С. 119.



МГПУ им. И.П. Шамякина

злучаныя деканатамі. Некаторыя деканаты “заключали огромное пространство”, напрыклад, Аршанскі з 17 касцёламі аб’ядноўваў 5 паветаў, Бабруйскі з 13 касцёламі займаў больш паловы тагачаснай Мінскай губерні і частку Магілёўскай.[1] На жаль, аўтар не паведамляе пра крыніцы сваіх звестак і не ўдакладняе іх час.

Выклікаюць цікавасць своеасаблівыя высновы Кіпрыяновіча пра багацце каталіцкіх іерархаў, галечу і невуцтва вясковага святарства, самадурства і бязладдзе ва ўнутранай будове “латинян” і ў той жа час пра папскае адзінаўладдзе. У якасці аргументаў прыводзіць наступныя лічбы: вышэйшаму каталіцкаму духавенству ў Рэчы Паспалітай належала 100530 вёсак, парафіяльнаму святарству – 161060 вёсак, каралю і шляхце – 90000, такім чынам 2\3 дзяржавы належала каталіцкай царкве.[2] Пра бязладдзе даводзіць наступнае: шматлікія манаскія Ордэны маюць сваіх кіраўнікоў – генералаў у Рыме, якія не прызнавалі ўладу біскупаў, біскупы спаборнічалі паміж сабой і ўрадам за маёмасць і прыбыткі, парафіяльныя ксяндзы часта не падпарадкоўваліся дэканам.[3] Сцвярджаючы невуцтва святарства, узгадвае пра заснаванне місій, якія пераязджалі з аднаго горада ў другі і вучылі народ правілам веры і маральнасці.[4] Тым не менш Кіпрыяновіч прыводзіць звесткі пра колькасць школ у Паўночна-Заходнім краі ў пачатку XIX ст.: пры каталіцкіх кляштарах каля 40 “польских школ”, за выключэннем езуіцкіх, базыліянскіх свецкіх – 12, піяраў – 10, дамініканцаў – 9, францысканцаў – 2, трынітарыяў – 2, бернардзінцаў – 5, кармелітаў – 3, канонікаў рэгулярных – 4, аўгусцінцаў – 1, місіянераў – 5.[5] Але гэтыя школы неслі небяспеку паланізацыі – “ополячивали западно-русский народ”, таму што касцёл узяў на сябе справу развіцця і пашырэння ўжытку польскай мовы, што ў сваю чаргу дало плён: з сярэдзіны XVII ст. рымска-каталіцкая вера “слилась окончательно с польской народностью”.[6]

Такім чынам, “Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве” Р. Я. Кіпрыяновіча напаўняў пэўным зместам афіцыйную канцэпцыю заходнерускага народа, адданага праваслаўю і процідзейнага каталіцтву на Захадзе. Адпаведна з гэтым, унія разглядалася як мост для пераходу праваслаўных у “чыстае лацінства”. Далучэнне

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. 140.
[2] Тамсама. – С. 145.
[3] Тамсама. – С 146.
[4] Тамсама. – С. 143.
[5] Тамсама. – С. 159.
[6] Тамсама. – С. 147.



МГПУ им. И.П.Шамякина

беларускіх земляў да Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай і знішчэнне ўніяцкай царквы, на думку аўтара, азначала аднаўленне гістарычных правоў праваслаўных у заходнерускіх губернях. Кіпрыяновіч зрабіў слушную заўвагу, што канфесійная прыналежнасць не з'яўляецца этнавызначальнай прыкметай, таму што значная частка беларусаў зрабіліся ахвярамі "лацінства", трымаюцца касцёла, хоць размаўляюць па-руску, і захоўваюць шмат рускіх паданняў і звычаяў, зведзеныя з уніі ў лацінства беларусы прастадушна завуць сябе палякамі, а веру – польскай.[1] Зразумела, што ў рамках афіцыйнай ідэалогіі заходнерусізму ўніятам не было месца ў барацьбе велікарускай і велікапольскай канцэпцый.

Такім чынам, гістарыяграфічная традыцыя XIX ст. аказала моцны ўплыў на далейшае развіццё гістарычнай навукі.

## 5.3. Украінская гісторыяграфія канфесійных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у Рэчы Паспалітай (канец XIX – пачатак XX ст.).

### 5.3.1. Антановіч У.Б.



*У.Б. Антановіч*

Сярод прадстаўнікоў гістарыяграфічнай школы дакументалістаў большай грунтоўнасцю, выкарыстаннем багатага фактычнага матэрыялу і крытычнага да яго стаўлення вызначаецца Удадзімір Антановіч, прафесар Кіеўскага ўніверсітэта. Ён лічыцца адным з заснавальнікам гэтага накірунку.

Гісторыі канфесійных адносін у XVI–XVIII стст. на беларускіх і ўкраінскіх землях прысвечаны яго працы "Очерк отношений польского государства к православию и православной церкви" і "Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России с половины XVII до конца XVIII столетия".

Даследчык спачатку дае агульную характарыстыку канфесійнага становішча, пераважна на ўкраінскіх землях, асобна вызначае гісторыю

[1] Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии. – С. XI.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Кіева і ўплыў праваслаўя на грамадскае жыццё. Так, на думку гісторыка, Кіева-Пячорскі манастыр быў адным з самых магутных землеўладальнікаў ў Вялікім княстве Літоўскім, меў уласнасць “во всех поветах Киевского княжения... получает в дар земли и имения на северном берегу Припяти, в Белой Руси и Литве, в поветах Слуцком, Логойском, Глуском, Бобруйском, Могилевском, Виленском.”[1] У дачыненні да уніі ён вызначаў, што яна неадкладна адбілася на жыцці горада. З 1597 г. сустракаюцца звесткі пра адбіранне Кіева-Пячорскай архімандрыі ў руплівага праваслаўнага змагара архімандрыта Нічыпара Тура, пра перадачу мітрапаліцкіх і манастырскіх уладанняў у валоданне ўніяцкага мітрапаліта Міхаіла Рагазы і яго пераемніка Іпація Пацея, пра перадачу ўніятам кіеўскіх цэркваў і манастыроў. Але кіеўскае святарства і манаства не прызналі уніі, а спробы овалодаць цэрквамі былі адбіты “пры дапамозе насельніцтва.”[2]

Палітыка дыскрымінацыі праваслаўных і пашырэння ўніяцтва, на думку У.Б. Антановіча, мела мэтанакіраваны характар. Пераход праваслаўных у унію меркаваўся толькі ў якасці “першага дзеяння рэлігійна-палітычнай драмы, за якім павінна вынікаць другое дзеянне – пераход уніятаў у лацінства.”[3]

Гісторык вылучыў некалькі этапаў канфесійнай палітыкі дзяржавы ў канцы XVI – XVIII стст., даў іх характарыстыку, вызначыў сродкі і формы рэлігійнай барацьбы.

Першы этап пашырэння уніі (1596–1648 гг.) меў характар “частных насилий и правительственных интриг.”[4] За гэты час не было прынята ніводнай пастановы на шкоду праваслаўю. Шматлікая праваслаўная шляхта сваім уплывам у Сенаце і голасам на Сойме прымушала каралёў пры кожным зручным выпадку гарантаваць свабоду веравызнання.[5] Аднак каралі Рэчы Паспалітай надзялялі чынамі, пасадамі, сенатарскімі месцамі, прыбытковымі староствамі, “усялякімі бенефіцыямі” толькі католікаў, праваслаўныя шляхецкія роды бяднеюць ці не вытрымліваюць і паддаюцца

---

[1] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России с половины XVII до конца XVIII столетия / Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. Т.1. – Киев: типография Е.Я. Федорова, Крещатицкая площ., 1885. – С. 262.

[2] Тамсама. – Т.1 – С. 214.

[3] Тамсама. – С. 338

[4] Антонович, В.Б. Очерк отношений польского государства к православию и православной церкви / Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. – Киев: типография Е.Я. Федорова, Крещатицкая площ., 1885. – С. 271.

[5] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви. – С. 283.



МГПУ им. И.П.Шамякина

прывабнай іезуіцкай прапагандзе, падмацаванай марай на "мирские блага". Па вобразным выразе прафесара, "крутыя" дзеянні ўрада ў першай палове XVII ст. прывялі да таго, што "собралась медленно гроза, которая разразиться через сорок лет страшной катастрофой."[1] Адной з перадумоў правядзення рэпрэсіўнай палітыкі супраць праваслаўя, на думку навукоўца, стала забойства ўніяцкага полацкага архіепіскапа, "гонителя православия" Іясафата Кунцэвіча ў 1623 г. у Віцебску, што выклікала ў каталіцкім грамадстве "страшное раздражение".

У гэты час міжканфесійная барацьба засяродзілася пераважна ў праваслаўных брацтвах. Па словах Антановіча, спачатку іх галоўнай задачай было "попечение о благочестии и сохранении во всей чистоте христианской нравственности сильно пострадавшей от захвата дворянами высших церковных должностей", атрыманне брацтвамі стаўрапігіі вызваліла іх ад залежнасці ад мясцовых іерархаў.[2] Казацтва паўстала ў абарону праваслаўя. Намагаганнямі гетмана Пятра Канашэвіча Сагайдачнага ў 1620 г. неафіцыйна была адноўлена праваслаўная іерархія, якая была зацверджана каралём Уладзіславам у 1632 г. Таму У.Б. Антановіч робіць высновы, што значэнне ўніяцкай іерархіі было "низведено до незавидного положения неудавшейся попытки и насильственного, безуспешного никем не признанного домогательства."[3] Цікавую выснову робіць Антановіч пра падзеі 1648–1667 гг.: "где казачество торжествовало – исчезала возможность установить унию", згодна са Збароўскай і Гадяцкай дамовамі царкоўная ўнія ліквідавалася, а кіруючыя колы Рэчы Паспалітай "отделались от беды уступкой левого берега Днепра, пользуясь мягкостью русского правительства."

На думку даследчыка, каталіцкі і саслоўны фанатызм садзейнічаў аб'яднанню Русі і менавіта, перадумовамі далучэння Левабярэжнай Украіны да Рускай дзяржавы былі рэлігійныя супярэчнасці і сацыяльны прыгнёт.[4]

Наступны этап палітыкі насаджэння ўніяцтва пачаўся пасля заключэння Андросаўскага перамір'я, яе ўзмацнення пасля Люблінскага Сойма 1681 г. і працягваўся да Замойскага Сабору 1720 г. За гэты час унія пашырылася значна болей, чым за папярэднія 100 год, што было

[1] Антонович, В.Б. Очерк отношений польского государства к православию и православной церкви. – С. 214.
[2] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России. – С. 285.
[3] Тамсама. – С. 285–286.
[4] Тамсама. – С. 286.



МГПУ им. И.П.Шамякина

абумоўлена “отклонением от братств наиболее влиятельных членов и неясностью программы.”[1] Соймавай пастановай 1686 г. праваслаўныя брацтвы павінны былі падпарадкавацца епіскапам, праваслаўным вернікам забараняўся ад’езд за мяжу і “зносіны з патрыярхам.”[2] Праваслаўная шляхта складала “ничтожное меньшинство” на павятовых сойміках, а былы абаронца – казацтва засталося на левым беразе Дняпра. Такім чынам, абаронцамі праваслаўнай веры выступілі святарства, мяшчане і сяляне.

Антановіч характарызаваў міжканфесійную барацьбу ў Рэчы Паспалітай як “бесконечный ряд отдельных случаев и отдельных административных преследований и поощрений”, калі ўлады абмінаюць адкрытае супрацьстаянне, прыкрываюць свае дзеянні таямніцаю, недагаворанасцямі, наўмысным неразуменнем тэрмінаў, не патрабуюць агульнай згоды на унію, тым самым не даюць магчымасці для галоснага пратэсту.[3] Зыходзячы з гэтых абставін, Антановіч сцвярджаў, што “православие подвергалось более опасному нападению... Власть как будто забывает отличия между униатами и православными и названия: уния, дизуния, схизма – исчезают из административного лексикона почти до середины XVIII в.” На яго думку, да пачатку XVIII ст. у Рэчы Паспалітай засталася толькі адна сапраўдная праваслаўная епархія – Беларуская, у астатніх трох – Луцкай, Перамышльскай і Львоўскай – улада знаходзілася ў руках “тайных униатов, лжеправославных епископов”. Аднак епіскапы аддаленай Беларускай епархіі не здолелі кіраваць усёй прасторай літоўска-рускіх земляў, таму што сустракалі перашкоды з боку Кіеўскіх мітрапалітаў, якія прызналі ўладу Маскоўскага патрыярха і імкнуліся яе пашырыць на памежныя тэрыторыі.[4] Калі да Замойскага Сабору насаджэнне уніі і праслед праваслаўных меў характар асабістага самадурства, то пасля яго –ператварылася ў агульную паўсюдную з’яву, сваеасаблівы крыжовы паход, які здзяйсняецца з благаслаўлення рымскіх папаў, што здабывалі сабе выратаванне шляхам гвалту над бязбройнымі сялянамі.[5]

Са спасылкамі на дакументы, выдадзеныя ў “Архиве Юго-Западной России” (Ч. I, т. IV), гісторык сцвярджаў, што становішча праваслаўных было цяжкім, калі яны сталі мішэнню для шляхецкага свавольства, “гнет

[1] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России. – С. 311.
[2] Тамсама. – С. 289.
[3] Тамсама. – С. 295.
[4] Тамсама. – С. 295–296.
[5] Тамсама. – С. 326.

МГПУ им. И.П.Шамякина

не вытекал из определенной программы, не был однороден и не давал возможности предугадать опасность”, лёс прыхода залежаў ад капрызу і карысталюбства землеўласніка, падарожных жаўнераў ці шляхціца, ксяндза бліжэйшага касцёла[1]. Робіць высновы, што прычынамі такога становішча былі не толькі рэлігійны фанатызм, але і магчымасць атрымаць матэрыяльныя выгады шляхам рабавання маёмасці і захопу зямель.[2] Праваслаўе не знікла, дзякуючы трываласці сялян, заступніцтву Расіі і разбешчванню шляхецкага грамадства ў XVIII ст.

Такім чынам, па словах даследчыка, у XVIII ст. змяняюцца формы і сродкі барацьбы. Гэта пасіўны супраціў насельніцтва, умяшанне Расіі ў вырашэнне дысідэнцкага пытання на беларускіх і ўкраінскіх землях і адсутнасць адзінай праграмы дзеянняў шляхты ў дачыненні да праваслаўных[3].

Антановіч таксама характарызуе сумнае становішча ўніятаў у Рэчы Паспалітай у XVIII ст., таму што каталіцтва лічылася веравызнаннем пануючым, панскім, а унія – вучэннем невуцкім, мужыцкім, уласцівым невысокароднай пародзе рускіх людзей, хлопскай верай. Уніяцкія святары не падпадалі пад катаванні, ім не пагражала небяспека смерці ці спусташэння, але да ўніятаў ставіліся з кепікамі і пагардай і яны часта ратавіліся пераходам у каталіцтва.[4]

Уяўляюць цікавасць высновы гісторыка, што унія мела мала шанцаў на поспех, па-першае, таму што, згодна з традыцыяй (саборнасці праваслаўнай царквы), прызнанне уніі іерархамі не азначала яе ўхвалы ніжэйшым духавенствам і вернікамі, унія магла быць зацверджана у выпадку галоснага абмеркавання і дабравольнай згоды. Па-другое, не мела “подобно православию ни предания, ни ясно очерченного самостоятельного учения”, не паспела “пустить корней”. Па-трэцяе, была выклікана палітычнай і рэлігійнай “інтрыгай” як палітычная зброя, укладзеная ў рукі шляхецкага саслоўя езуітамі, прыдатная каб схаваць гвалт.[5]

---

[1] АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 4: Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-Западной Руси (1322–164). – 938 с. – С. 397, 407, 95, 153, 232, 243, 275, 304-309; Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России. – С. 300.

[2] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России. – С. 301.

[3] Тамсама. – С. 3–31.

[4] Тамсама. – С. 339–340; АрЮЗР. – Ч. 1; т. 4. – С. 531, 538, 549, 561, 563.

[5] Антонович, В.Б. Очерк состояния православной церкви в Юго-Западной России. – С. 282; 341–342.



МГПУ им. И.П.Шамякина

У пэўнай ступені Антановіч падзяляў афіцыйную канцэпцыю заходнерусізма, сцвярджаючы, што галоўная памылка ініцыятараў уніі ў тым, што яны не звярнулі ўвагі на галоўную рысу будовы праваслаўнай царквы – саборнасць і непрызнанне сляпога падпарадкавання іерархіі ў справах веры, адсутнасць цэнтралізацыі ўнутры іерархіі.

### 5.3.2. А. Лявіцкі



*А.І. Лявіцкі*

Украінскі гісторык канца XIX – пачатку XX стст. Арэст Левіцкі, рэдактар і аўтар прадмовы да шостага тома першай часткі шматтомнага археаграфічнага выдання “Архив Юго-Западной России”, на падставе вывучэння дакументаў па гісторыі канфесійных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у 1322–1648 гг. робіць высновы пра нацыянальны характар канфесійнага супрацьстаяння, параўноўвае яго з ростам нацыянальнай і саслоўнай самасвядомасці і барацьбой за адпаведную ідэнтыфікацыю ў Заходняй Еўропе. Па вобразным выразе А. Левіцкага, праваслаўе было “хранилищем народного духа”, яго абарона атаясамлівалася з абаронай асноў рускай народнасці і была пастаўлена ў жывую арганічную сувязь з надзённымі інтарэсамі палітычнага, грамадскага, эканамічнага жыцця краю.[1]

Берасцейскую рэлігійную унію ён разглядаў як адзін са сродкаў барацьбы за нацыянальную ідэнтыфікацыю, даводзіў, што ўрад Рэчы Паспалітай разлічваў скарыстаць унію для з’яднання народнасці з карэнным (польскім) насельніцтвам і павелічэння яго палітычнай моцы.[2] У той жа час рускае (праваслаўнае) насельніцтва дзяржавы (шляхта, мяшчане, сяляне, казакі) пад сцягам абароны веры бараніла недатыкальнасць эканамічных, нацыянальных, саслоўных, палітычных і

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Левицкий, О. Предисловие // АрЮЗР. – Ч. 1. Т. 6: Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-Западной Руси (1322–1648). – С. 2.
[2] Левицкий, О. Предисловие // АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 6.

іншых правой і інтарэсаў. Гісторык вызначаў пашырэнне ўніяцтва як вялізарны царкоўна-грамадскі пераварот, які не здзяйсняецца жаданнем урада, а з'яўляецца вынікам унутраных арганічных пашкоджанняў, парушэння ладу жыцця грамадства.[1] Берасцейскі Сабор у кастрычніку 1596 г., на думку даследчыка, "небывалое ни пред тем, ни после явление в церкви русской", складаўся з дзвух колаў духоўнага і свецкага, больш шматлікага.[2] Ён не падзяляў негатыўную ацэнку вынікаў уніі і адзначаў, што яна прынесла бедствы і карысць – правяла мяжу паміж сапраўднымі змагарамі праваслаўя і яго ворагамі, стала "очистительным клапаном, открывшим исток для накопившихся веками нечистых соков."[3] Лявіцкі крытыкаваў афіцыйны пункт гледжання праваслаўнай гістарыяграфіі аб прычынах зацвярджэння уніі ў дзейнасці езуітаў, дыскрымінацыі і невуцтве святароў. Здзяйсненне уніі "мелочно приписывать исключительно козням и проискам иезуитов", спасылкі на сітэматычны пераслед праваслаўных не пацвярджаюцца дакументальна, недахоп адукацыі назіраўся да ўніі і пасля яе. Аднак даследчык згаджаўся з думкай расійскіх гісторыкаў, якія адной з прычын прыняцця уніі лічаць "упадок монастырей, узурпацию светскими лицами высших церковных достоинств, их куплю-продажу" ці т.зв. права "подаванья."[4]

Арэст Лявіцкі даводзіў, што прыняцце і распаўсюджанне уніі было абумоўлена гістарычнымі передумовамі ("условиями эпохи") і сістэмным крызісам Царквы (праваслаўнай і каталіцкай), якая страчвала аўтарытэт ў вачах сучаснікаў, хварэла на цяжкі "недуг."[5] У якасці аргумента прыводзіў цытату з ліста 1593 г. Канстанціна Астрожскага да Іпація Пацея: "не заступаются за церковь Божию и за веру свою старожытную. Но еще сами насмехаются над ней и в различные секты убегают", адзначаў, што езуты толькі скарысталі абставіны, актыўная падтрымка уніі ўрадам пачалася пасля згоды праваслаўных іерархаў на унію.[6]

На стан Царквы значна паўплывала Рэфармацыя і пашырэнне пратэстантызму ў Польшчы і Літве, які разладжваў вераванні, выклікаў абыякавасць і вальнадумства, шкодзіў каталіцтву, але "нанёс урон

[1] Левицкий, О. Предисловие / АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6.– С. 3, 8.
[2] Тамсама.– С. 100.
[3] Тамсама. – С.18.
[4] Тамсама. – С. 8–10.
[5] Тамсама. – С. 18, 16.
[6] Тамсама. – С. 11, 17, 15.

МГПУ им. И.П.Шамякина

православию и значительно облегчил задачу иезуитам."[1] У гэтым пункце гледжання Лявіцкі сходзіўся з мітрапалітам Макарыем.

Садзейнічала пашырэнню ўніяцтва таксама "тесное сближение Литвы с Польшей", асабліва пасля Люблінскай уніі, наплыў польска-шляхецкіх звычаяў, умяшанне ўяўленняў і ўзораў чужога нацыянальнага, грамадскага і эканамічнага ладу. Гэтыя запазычанні садзейнічалі засваенню польскай адукаванасці, мовы і звычаяў, тэрміны "русь" і "ляхі" зліваюцца ў адно паняцце "шляхта і рыцарства закону грэчаскага і рымскага" (у сучаснай гістарыяграфіі прыняты тэрмін народ шляхецкі паспаліты). Шляхта змяняла "старую рускую веру" на новую "шляхецкую, каталіцкую."[2]

Прынцып адзінаўладдзя ў іерархічнай структуры каталіцкай царквы адрозніваўся ад саборнага пачатку праваслаўнай царквы, які вызначаў выбранне іерархаў, шырокі ўдзел вернікаў у справах царквы і практыку склікання праваслаўных Сабораў. Менавіта, у Берасцейскім саборы 1596 г. бралі ўдзел паслы ад паветаў, царкоўных брацтваў і гарадоў.[3] Тэзісы ініцыятараў уніі пра бясспрэчнае падпарадкаванне вернікаў сваім пастырам і ніжэйшага святарства – сваім іерархам, безумоўны аўтарытэт уніяцкіх пастыраў і месца ў Сенаце пасля прызнання падданства рымскаму папе, шырока выкарыстоўваліся ва ўніяцкай палеміцы.[4] Абаронцы уніі выступілі супраць рашэнняў праваслаўнага сабора ў Бярэсці ў кастрычніку 1596 г. Яны сцвярджалі, што Сабор – справа толькі епіскапаў і недухоўныя асобы не могуць у ім удзельнічаць.

Лявіцкі робіць высновы, што рэлігійная палеміка таго часу, за выключэннем дагматычных рознагалоссяў, акрэслівалася спрэчкамі пра межы іерархічнай улады і правы прыхаджан удзельнічаць у справах царквы. Ён вызначаў раз'яднанасць антыўніяцкай апазіцыі, нягледзячы на пэўнае збліжэнне праваслаўных з пратэстантамі ў барацьбе супраць "лацінства", што, ў сваю чаргу, выклікала абвінавачванні ў пашырэнні ерасяў. Навуковец сцвярджаў, што розныя плыні ў праваслаўным асяроддзі прыводзілі да крайнасці ("страстности в борьбе") і пераканалі М. Сматрыцкага прыняць унію.[5]

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Левицкий, О. Предисловие / АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 19, 43–44, 9, 47.
[2] Тамсама. – С. 20, 46.
[3] Тамсама. – С. 26–27.
[4] Тамсама. – С. 104, 89–90.
[5] Тамсама. – С. 110.

Лявіцкі са спасылкамі на дакументы па гісторыі заходнерускай праваслаўнай царквы, выдадзеныя ў “Архиве Юго-Западной России” і “Актах Западной России” даводзіць, што асноўныя прычыны пашырэння уніі знаходзіліся ўнутры самой царквы: “в порче коренных основ организации церкви, в внутренних язвах, беспорядках тогдашней церковной иерархии, деморализации большинства ее представителей”.[1] Па словах украінскага гісторыка, дэзарганізацыя царкоўна-іерархічных адносін прывяла да злоўжыванняў у вышэйшай іерархіі, выпадкаў узурпацыі свецкімі асобамі царкоўных пасад, іх куплю-продаж. Усе духоўныя пасады лічыліся прыбытковымі месцамі (“хлебом духовным”), якія можна атрымаць ад караля за розныя заслугі ці купіць за грошы Злоўжыванне правам даравання манастыроў, цэркваў, епіскапскіх кафедр (“подаванья столиц духовных и всех хлебов духовных”) прынесла страшнае зло, супярэчыла выбарнаму пачатку і прывяло да вялікага разладу праваслаўнай царквы.[2]

Менавіта, патранатства, па выразе Левіцкага, двухбаковавострая зброя для абароны і нападу – зброя самавольства, продажу святарскіх пасад, адабрання земляў, зачынення храмаў, стала “благодатной почвой взращения унии”, таму што быў выпрацаваны прынцып: “чыё падаванне, таму і паслушэнства святароў”. З-за гэтага клір раздзяліўся на дзве групы: вышэйшую іерархію, якая адносіла сябе да шляхецтва духоўнага стану і ніжэйшае святарства – паспалітага стану.[3] Царкоўныя іерархі валодалі вялізнымі ўладаннямі і па багацці раўнаваліся з вяльможамі, імкнуліся весці раскошнае і вясёлае жыццё, парушалі царкоўныя каноны, грэбавалі пастырскімі абавязкамі, вялі адкрытую “пагоню за нажывай”.[4] Сярод ніжэйшага духавенства пашырана невуцтва, грубіянства і нядбайнасць, па словах вядомага праваслаўнага палеміста З. Капысценскага, вясковае святарства – “одно сметье людское, голодное и неукове тиснулись”.[5]

Такім чынам, адна з прычын крызісу Царквы – маральная распушчанасць вышэйшага каталіцкага і праваслаўнага духавенства, якое як і ў Еўропе, аддавалася загаданам раскошы і багацця, свецкай марнасці і

[1] Левицкий, О. Предисловие / АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 10.
[2] Тамсама. – С. 30, 68, 32.
[3] Тамсама. – С. 47–48, 50.
[4] Тамсама. – С. 58, 61, 10, 11.
[5] Тамсама. – С. 10, 53.



МГПУ им. И.П.Шамякина

распусты. Даследчык прыводзіць шмат выпадкаў прагнасці, распусты, сібарытства заходнерускіх архіерэяў, якія бралі прыклад з каталікоў.

Вернікі пачалі разглядаць унію як сродак дысцыплінаваць мясцовую іерархію і прывесці да ладу царкоўныя адносіны.У якасці пацвярджэння сваёй думкі Лявіцкі прыводзіць цытату з ліста львоўскіх братчыкаў пра тое, што вера Хрыстова можа вызнавацца і пад рымскай уладай.

Прычынай пашырэння уніі, як гэта ні парадаксальна, на думку навукоўца, была таксама рэарганізацыя дзейнасці праваслаўных брацтваў, атрыманне імі стаўрапігіі ў канцы XVI – пачатку XVII стст., брацтвы дзейнічалі на аснове прынцыпа сабornасці і сталі разглядацца грамадскасцю як сродак выйсця царквы з крызісу. Маючы паўнамоцтвы ўсходніх патрыярхаў назіраць за жыццём і маральнасцю свецкіх і духоўных асоб, кантраляваць дзейнасць архіерэяў, брацтвы імкнуліся ўплываць на вышэйшае кіраўніцтва заходнерускай царквы.[1] Таму незадаволеныя кантролем з боку прыхаджан, епіскапы накіраваліся дамаўляцца наконт уніі. Яны не жадалі “сносить контроль церковных братств, которые в шляхетских глазах были не более, как сборищем «хлопов, шевцов, седельников и кожемяков”, забяспечаных падтрымкай знакамітых апекуноў (Астрожскіх, Вішнявецкіх, Скумінаў, Мсціслаўскіх, Сакалінскіх, Масальскіх і інш. згаданых у рэестры Віленскага праваслаўнага брацтва). Левіцкі адзначаў барацьбу ўнутры праваслаўнай царквы, таму што па ініцыятыве брацтваў і прыхаджан пачалося “церковно-преобразовательное движение”, якое выклікала супрацьдзеянне вышэйшай іерархіі. Вынікам стаў раскол на дзве плыні: іерархічную, што далучылася да лацінства, і саборную.[2] Гэты раскол параўноўваўся з расколам у Рускай дзяржаве і вызначаліся адрозненні. У Паўночна-Усходняй Русі раскол быў выкліканы “грубымі невуцкімі адносінамі народнай масы і ніжэйшага святарства да прадметаў веры і царкоўных абрадаў” падчас рэформаў Нікана. У Паўднёва-Заходняй Русі супраць рэфармавання выступілі вышэйшыя царкоўна-грамадскія колы пад уплывам Рэфармацыі.[3] Берасцейская унія замацавала раскол і стала сімвалам іерархічнага паўнаўладдзя ў царкоўных адносінах, выключыла права на самавызначэнне ў справах веры і самакіравання як рэлігійна-грамадскай арганізацыі. Унія, нягледзячы на нешматлікасць яе

[1] Левицкий, О. Предисловие / АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 12, 14, 76, 80.
[2] Тамсама – С. 100, 102.
[3] Тамсама. – С. 17.



МГПУ им. И.П.Шамякина

прыхільнікаў і агульнае абурэнне яе з’яўленнем, пачала набываць падтрымку ў асяроддзі рускай шляхты. Праваслаўе засталося “сцягам царкоўна-сабornага ладу, заснаванага на евангельскай ідэі ўсеагульнай роўнасці вернікаў як сяброў царквы без адрознення стану і звання.”[1] Сапраўдныя абаронцы праваслаўя, якія ахвяравалі маёмасць, свабоду жыццё, паходзілі з ніжэйшых саслоўяў мяшчан, духавенства і казацтва.[2] Менавіта, саборны прынцып, на думку А. Лявіцкага, захаваў праваслаўную царкву падчас скасавання іерархіі. У гэты час у абарону праваслаўя паўстала казацтва, заснаваны 2 вядомыя брацтвы Луцкае і Кіеўскае Багаяўленскае, затым прыйшла эра “возрождения, украшенная именами Иова Борецкого и Петра Могилы.”[3]

## 5.3.3. Міхаіл Грушэўскі – прадстаўнік нацыянальнай украінскай гістарыграфіі

Міхаіл Сяргеевіч Грушэўскі (1866–1934 гг.) – літаратуразнаўца, вучань Уладзіміра Антановіча, прафесара ўніверсітэта Святога Уладзіміра і прадстаўніка кіеўскай школы гісторыкаў-дакументалістаў, стваральнік уласнай гістарычнай школы.

На думку Грушэўскага, даследчык не толькі павінен абапірацца на крыніцы, але і праводзіць крытычную працу: “нічога не прымаць на веру, пераправяраць факты, ставіцца да крыніц з асцярожным скептыцызмам, аналізаваць іх і знаходзіць зерне праўды.”[4]

Менавіта на прынцыпах пазітывізму заснаваны яго фундаментальныя працы “Історія української літератури” ў 6 тамах і “Історія України – Руси” ў 10 тамах. Погляды вучонага складаюць аснову нацыянальнай украінскай гістарыяграфіі і падзяляюцца большасцю сучасных гісторыкаў.[5]

МГПУ им. И.П.Шамякина

1 Левицкий, О. Предисловие // АрЮЗР. – Ч. 1. – Т. 6. – С. 103.
2 Тамсама. – С. 104.
3 Тамсама. – С. 111, 112.
4 Калакура, Я. С. Українська історіографія: Курс лекцій / Я.С. Калакура. – К.: Генеза, 2004. – 496 с. – С. 213.
5 Україна: хронологія розвитку. – Т. 4. – С. 69–70, 92–93, 101–103.

Гісторыі канфесійных адносін у Рэчы Паспалітай прысвечаны VII раздзел V тома "Історії України – Руси". Аснову даследавання склаў крытычны аналіз шырокага кола крыніц і гістарыяграфіі, выклад падзей напярэдадні і пасля Берасцейскай уніі. Высновы навукоўца пацвярджаюцца шматлікімі спасылкамі на шматтомныя археаграфічныя зборнікі і рэлігійна-палемічную літаратуру XVI–XVII стст. Грушэўскі карыстаўся серыйнымі выданнямі дакументаў: "Акты, относящиеся к истории Западной России" (АЗР) у 5 т. (1846–1853 гг.); "Акты, издаваемые Виленской археографической Комиссией" (АВАК) у 39 т. (1865–1915 г.); "Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов" (АрЮЗР) у 37 т. (1859–1914 гг.); "Памятники полемической литературы в Западной Руси", далей (Помнікі палем. літ.).[1]



*М.С. Грушэўскі. Фота 1905 г.*

Вывучэнню палемічнай літаратуры XVI–XVII стст. прысвечаны V том "Історії української літератури". На думку даследчыка, менавіта, Рэфармацыя прынесла вальнадумства, новае мысленне, выявіла крызіс ідэалогіі і сацыяльныя супярэчнасці, вызначыла неабходнасць рэфармавання Царквы як сацыяльнага інстытута незалежна ад канфесійнай прыналежнасці, спарадзіла грамадскую палеміку не толькі па рэлігійных пытаннях, але і па сацыяльных, палітычных і культурных праблемах, стымулявала развіццё брацкага руху на беларускіх і ўкраінскіх землях.

Рэфармацыйныя і гуманістычныя ідэі пранікалі ў выніку пашырэння міжнародных сувязей у палітыцы, культуры, адукацыі, зрабіўшы вялізарны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай. Шматлікая шляхта атрымлівала адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах.

[1] АЗР – Т. 4: 1588–1632.; АВАК. – Том XIX: Акты, относящиеся к истории бывшей Холмской епархии; АрЮЗ. – Ч. 1: Т. 1: Акты, относящиеся к истории православной церкви в Юго-западной России; Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – РИБ.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Распаўсюджанню вальнадумства, культуры італьянскага Адраджэння і нігілізму спрыяла асяроддзе каралеўскага двара пасля шлюбу Жыгімонта I Старога на італьянскай каралеўне Боне Сфорца. Спаведнік каралевы Боны Франческа Лісманін быў прыхільнікам антытрынітарызму. Капеланы Жыгімонта II Аўгуста Ян Казмінчык і Ваўжынец Пражніцкі адкрыта выступалі з крытыкай каталіцкай дактрыны.[1] Шляхта скарыстала гэтыя настроі для магчымай секулярызацыі маёмасці і ўплыву.

Грушэўскі лічыў, што вывучэнню Рэфармацыі ў Рэчы Паспалітай не ўдзялялася значнай увагі пад уплывам Контррэфармацыі і каталіцкай гістарыяграфічнай традыцыі. Польская гістарыяграфія XVIII–XIX стст. разглядала Рэфармацыю як "сумне збоченне з правой дороги, незвичайно шкідливе з політичного й національного становишча, а католицьку церкву як эдину певну підставу польського національного життя."[2] Ён сцвярджаў, што сапраўды Рэфармацыя не набыла масавага характару ў Польшчы і Літве, засталася "занесеным з Нямеччыны нававерствам", таму што мяшчанства не здолела забяспечыць ёй падтрымку, а шляхта скарыстала яе для абмежавання ўлады і моцы царквы.[3] Найбольшага поспеху рэфармацыйны рух дамогся ў 50–60-я гг. XVI ст., але застаўся, як адзначаў гісторык, "оранжерейною рослиною … під охороною шляхетського імунітету", рэлігійная крытыка і ганьба заганаў духавенства і царкоўнага ладу былі толькі палемічным сродкам барацьбы за абмежаванне духоўнай улады над шляхтай.[4] Гэтыя працэсы непасрэдна закранулі беларускія і ўкраінскія землі ў другой палове XVI ст., аб'яднаныя адзінай юрысдыкцыяй Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў стала дзейнасць Станіслава Арахоўскага, сына земскага пісара Перамышльскага і дачкі праваслаўнага святара Баранецкай, які з дзяцінства быў прадвызначаны для духоўнага сану. Арахоўскі атрымаў добрую еўрапейскую адукацыю (Вітэнберг, Балон'я, Падуя, Венецыя, Рым). У сваім трактаце 1544 г., напісаным ў форме ліста да польскага архіепіскапа Гамраты, "Пра рускае хрышчэнне"

[1] Грушевський, М. С. Історія української літератури / М. С. Грушевський: В 6 т. 9 кн. Т. 5. Кн. 2 / Упоряд. О. В. Дідух; Приміт. С. К. Росовецького. – К.: Либідь, 1995. – С. 12.
[2] Тамсама. – С. 6.
[3] Тамсама. – С. 5, 8.
[4] Тамсама. – Т. 5. – Кн. 2. – С. 22, 20.



МГПУ им. И.П.Шамякина

(“Baptismus Ruthenorum”) вылучыў ідэю аб’яднання Царквы і сцвярджаў, што розніца паміж хрысціянскімі канфесіямі нязначная.[1]

Пазней ідэі царкоўнага адзінства былі падхоплены Бенедыктам Гербестам, літаратурна апрацаваны і папулярызаваны Пятром Скаргам, атрымалі сваё развіццё ў працах яго паслядоўнікаў І. Пацея і І. Руцкага

Другая яго праца “Супраць цэлібату” (“De lege coelibatus”) 1547 г. выклікала моцнае ўражанне. Аўтар даводзіў ненатуральнасць бясшлюбнасці не толькі словам, але і справай, зладзіў змовіны. Яго справы была вынесена на Вальны сойм 1550 г., шляхта падтрымала вальнадумца, выступіўшы супраць прэтэнзій духавенства на ўладу і багацце. Арахоўскі склаў сан, ажаніўся і больш 20 год чакаў пацвярджэння яго шлюбу з Рыма, пагражаў перайсці ў праваслаўе і звярнуцца па дазвол да Царградскага патрыярха.[2] Гэты час грамадства абмяркоўвала пытанні еднасці царквы грэчаскай і лацінскай, хрышчэння і прычасця пад абодвума відамі (хлебам і віном).

Пра Арахоўскага як абаронцу праваслаўя згадвае Захарыя Капысценскі ў “Палінодыі”. Ён называў яго “правый и старый правды мовца Лях!”, сцвярджаў, што не было б ніякай міжканфесійнай барацьбы (“шранки о вѢру”), калі б “нынѢшніи панове Поляцы так чтили, шановали и поважали столицу Константинополскую”, як гэта рабіў праўдалюбец Лях. Выступаючы ў абарону праваслаўных канонаў прычасця хлебам і віном, шлюбу святароў, З. Капысценскі таксама прыводзіць словы Арахоўскага: “свѢдок достовѢрній Станислав ОрѢховскій, каноник перемислскій, который о церкви нашей восточной в книжцѢ своєй, “ДіатрибѢ” названой, так написал: “Абы Грекове з Русью прето иж в них посполъство келиха уживают, а ієрей жены маютъ, на сторонѢ непобожных и в личбѢ непріятелей божих почитани быти мѢли, не здаєт ми ся. И овшем, розумѢю то о них, же суть христіанми, и же суть в церкви.”[3]

На думку Грушэўскага, пазбаўленне Арэхоўскага маёмасці, гонару, імя і палеміка вакол яго трактатаў сталі зручнай нагодай для выказвання шляхтай незадаволенасці ўплывам царквы і сродкам пашырэння саслоўных

[1] Грушевський, М. С. Історія української літератури. – С. 13–14.
[2] Тамсама. – С. 15.
[3] Копыстенский, Захария. Палинодія или книга обороны кафолической // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 1. – Стб. 313–1200. – С. 931–932, 1162–1163.



МГПУ им И.П.Шамякина

прывілеяў, што таксама знайшло ўвасабленне ў распаўсюджанні ідэй Рэфармацыі ў шляхецкім асяроддзі Польскага каралеўства і княства Літоўскага ў 1550-е г.

Пратэстанты таксама скарысталі супярэчнасці паміж каталікамі і праваслаўнымі ў Рэчы Паспалітай для дасягнення сваіх мэт: аспрэчыць прэтэнзіі Рыма на ўніверсальнасць і манаполію на апостальскую традыцыю.[1]

Патрабаванні склікаць праваслаўны Сабор у 1546 г., Прывілей Жыгімонта ІІ Аўгуста 1563 г. пра ўраўнаванне ў правах каталіцкай і праваслаўнай шляхты Грушэўскі тлумачыць пашырэннем вальнадумства, імкненнем рэфармаваць Царкву, жаданнем мяшчанства і шляхты зменшыць уплыў лацінскай іерархіі, імкненнем праваслаўных іерархаў атрымаць месца ў Сенаце.

Шляхта дамаглася выканання сваіх патрабаванняў: каралеўскага дазволу абкладваць дзяржаўнымі падаткамі як свецкія, так і духоўныя ўладанні і прыбыткі, у тым ліку і дзесяціну, прызнання неабавязковымі для выканання старостамі прысудаў духоўнага суда і страціла цікавасць да Рэфармацыі. [2]

Прычынамі хуткага згасання рэфармацыйнага руху ў Рэчы Паспалітай Грушэўскі лічыў наступныя: нежаданне пратэстантаў і праваслаўных аб’яднацца; няздольнасць шляхты далучыцца да мяшчанства ў барацьбе за рэформу царквы, таму што гэта пахіснула б прывілеяванае становішча магнатаў; стрымліванне пратэстантызму на беларускіх і ўкраінскіх землях праваслаўнай традыцыяй дачынення да ўсяго праваслаўнага свету (Балканы, Валахія, Грэцыя, Маскоўская дзяржава пад верхнасцю Канстанцінопальскага патрыярха), гэтае адзінства выгадна адрознівалася ад шматлікіх і раздробленых пратэстанцкіх плыняў у Літве і Польшчы, якія часта супрацьстаялі адзін аднаму.[3]

Неабходнасць пераадолення крызісу праваслаўнай царквы садзейнічала развіццю брацкага руху. Даследчык ацэньвае яго неадназначна, з аднаго боку брацтвы мелі характар нацыянальнай абароны “від чужих замахів”, з другога – алігархічны (“утворення правлячого

[1] Грушевський, М. С. Історія української літератури. – Т. 5. Кн. 2. – С. 13.

[2] Тамсама. – С. 22; Грушевський, М. С. Історія України-Руси / М. С. Грушевський: В 11 т., 12 кн. / Редкол.: П.С.Сохань (голова) та ін. – К.: Наук. думка, 1991. – Т. 5. – 1994. – 462, 457.

[3] Грушевський, М. С. Історія української літератури. – Т. 5. – Кн. 2. – С. 23, 40.



МГПУ им. И.П.Шамякина

осередка”). Ён параўноўваў рэфармаваныя брацтвы ў канцы XVI ст. са шляхецкім патранатам пратэстанцкіх збораў, якія арганізуюцца і знаходзяцца пад кантролем магната, у той жа час вызначаў строгасць і аскетызм брацкіх статутаў.[1]

Грушэўскі вызначаў перадумовы ўтварэння ўніяцкай царквы ў Рэчы Паспалітай: умацаванне пазіцый каталіцтва і пашырэнне ўплыву езуітаў у 1570-я гг.; узгаданне забытай пасля Фларэнтыйскага сабору ідэі пра царкоўную унію; змена знешнепалітычных ўмоў: апрычніна Івана IV адштурхнула праваслаўную арыстакратыю ад Масквы, кампанія Стэфана Баторыя падчас Лівонскай вайны падарвала ваенны прэстыж Маскоўскай дзяржавы; умяшанне ва ўнутраныя справы Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярха Іераміі; рэфармаванне брацкага руху і наданне стаўрапігіі Львоўскаму і Віленскаму брацтвам; адхіленне мітрапаліта Анісідора Дзевачкі ад пасады і прызначэнне на яго месца Міхаіла Рагазы, а упроцівагу яму –Кірыла Тарлецкага патрыяршым экзархам.[2]

Нежаданне праваслаўнай іерархіі прызнаваць іерархію Кантанцінопальскай патрыярхіі, якая страціла свой уплыў у сувязі з падпарадкаваннем яе асманскім уладам, на думку Грушэўскага, выклікала апазіцыю прызначанаму мітрапаліту чатырох епіскапаў Луцкага, Пінскага, Львоўскага, Хелмскага. Гісторык звяртае ўвагу на тое, што менавіта Гедэон Балабан, епіскап галіцкі і Львоўскі, быў ініцыятарам прызнання вяршэнства рымскага папы як сродка вырашэння канфлікту са стаўрапігіяльным Львоўскім брацтвам і мітрапалітам, які падтрымаў брацтва ў 1589–1590 гг.[3] У якасці аргументаў прыводзіць цытату з “Протестации Холмского владыки Дионисия Збируйского против заявления Львовского владыки Гедеона Балабана относительно бланкетов данных епископами Кириллу Терлецкому” ад 7 ліпеня 1595 г., надрукаванай у XIX т. “Актов, издаваемых Виленской археографической Комиссией”, пра тое, што епіскапы, не жадаючы пашырэння юрысдыкцыі мітрапаліта, вырашылі прызнаць падданства папы: “chcac szie poddac pod posluszenstwo oycza swietego papieza rzymskiego”[4], словы І. Пацея з яго палемічнай працы “Антиризис или Апология против Христофора Филалета”, што

[1] Грушевський, М. С. Історія української літератури. – Т. 5. – Кн. 2. – С. 35.
[2] Тамсама. – С. 21; Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 546–549.
[3] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 563–564.
[4] АВАК. – Т. XIX – С. 366.



МГПУ им. И.П.Шамякина

"чыноначальникомъ до одступенья патрыарховъ" быў Львоўскі епіскап[1] і вытрымку з ліста Навагародскага ваяводы, Гарадзенскага старосты Фёдара Скуміна-Тышкевіча да мітрапаліта М. Рагазы: "владыка Львовский, будучи тамъ в остатней томи от братства не только до такого отщепеньства кинутися мусилъ, але, верю, душного неприятеля рад бы собѣ на помочь взял! Чого и доказал и других за собой потянул."[2]

Грушэўскі меркаваў, што ўпершыню Дэкларацыя уніі была складзена на Берасцейскім Саборы 1590 г., уручана каралю ў 1592 г. Кірылам Тарлецкім, і яе ўмовы трымаліся ў тайне да пэўнага часу. І. Пацей далучыўся да прыхільнікаў уніі не пазней 1593 г., пасля прызначэння на епіскапскую кафедру ва Ўладзіміры, таму што ў маі 1594 г. К. Тарлецкі заклаў царкоўную маёмасць у 2000 злотых на вандроўку ў Рым разам І. Пацеем[3]. Міхаіл Капысценскі, які стаў Перамышльскім епіскапам супраць волі патрыярха ў 1594 г., таксама падтрымаў ідэю "зъедночення" царквы).[4] Даследчык зрабіў высновы, што Міхаілу Рагазе стала вядома пра магчымасць прыняцця уніі не раней лістапада 1594 г. і не пазней сакавіка 1595 г. ён далучыўся да уніі, пацвердзіў іх наяўнасцю ліста Пацея да мітрапаліта ў студзені 1595 г., у якім епіскап просіць Рагазу выказаць сваю думку пра ўнію, "Пунктов, данных Киевским митрополитом Михаилом Рогозою Луцкому епископу Кириллу Терлецкому при отправлении его к польскому гетману Замойскому с изъявлением желания приступить к унии"[5] і подпісам пад Дэкларацыяй ад 2 красавіка 1595 г.[6]

Украінскі гісторык далучыўся да вядомага тэзіса праваслаўных палемістаў, які пазней панаваў у праваслаўнай гістарыяграфічнай традыцыі, пра тое, што ўладыкі зыходзілі са сваіх асабістых амбіцый і інтарэсаў: "подумати про потреби церкви... сі пани в рясах ніколи не журились."[7]

---

[1] Потей, И. Антиризис или Апология против Христофора Филалета // Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Кн. 3. – Стб. 617–618.
[2] АЗР. – Ч. IV. – № 65. – С. 91.
[3] Арендный лист, данный епископом Кириллом Терлецким / АрЮЗР. – №101. – С. 426–433.
[4] Потей, И. Антиризис или Апология против Христофора Филалета // Памятники полемической литературы. – Кн. 3. – Стб. 591. – РИБ. – Т. 19.; Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 569–571, 575–576.
[5] АЗР. – Ч. IV. – № 54. – С. 78–79.
[6] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 82.
[7] Тамсама – С. 569–570.

МГПУ им. И.П.Шамякина

М. Грушэўскі аналізуе прапанаваныя ўладыкамі-ўніятамі ўмовы прыняцця уніі, выдадзеныя ў IV частцы “Актов Западной России” пад назвай “Наказ литовских православных епископов посланнику, отправленному к Польскому королю Сигизмунду с изложением договорных статей, на основании коих они соглашаются приступить к унии”[1]. Дэкларацыя (“Артыкулы”), перададзеная каралю, адрознівалася ад Дэкларацыі, падрыхтаванай для рымскага папы.

“Артыкулы” уніі былі падпісаны: І. Пацеем, К. Тарлецкім, Г. Балабанам, Д. Збіруйскім, М. Капысценскім ці Берасцейскім і Уладзімірскім, Луцкім і Астрожскім, Львоўскім і Галіцкім, Холмскім і Бельскім, Перамышльскім епіскапамі і перададзены каралю ў лютым 1595 г. Сваё рашэнне епіскапы абгрунтавалі неабходнасцю ўпарадкавання праваслаўнай царквы і знішчэння магчымасці ўмяшання ўсходніх патрыярхаў у справы царквы. Яны прапанавалі наступныя ўмовы: захаванне ранейшай іерархіі і абрадаў праваслаўнай царквы, старога календара, атрыманне епіскапатам тых жа правоў і прывілеяў, што і каталіцкае духавенства, асобна вызначылі права на месца ў Сенаце і Сойме, прызначэнне епіскапаў каралём і прысвячэнне мітрапалітам, абранне мітрапаліта епіскапамі і зацвярджэнне яго рымскім папам, пазбаўленне юрысдыкцыі грэчаскіх духоўных асоб і адпаведна прызнанне несапраўднымі прывілеяў, выдадзеных патрыярхамі брацтвам і іншым асобам.[2] Кароль Рэчы Паспалітай “Артыкулы” зацвердзіў з умовай, што месцы ў Сенаце вызначаюцца Соймам, забараніць перадачу праваслаўным манастыроў і храмаў кароль можа толькі ў каралеўскіх уладаннях, але забараніў “грэчаскім духоўным” перасякаць мяжу дзяржавы і гарантаваў епіскапам пажыццёвае “трыманне ўрадаў”.[3]

Грамата, адрасаваная рымскаму папе, датуецца 12 чэрвеня, подписы на грамаце сабраны ў тым жа парадку: М.Рагаза, І. Пацей, К. Тарлецкі, Г. Балабан, М. Капысценскі, Г. Загароўскі (Полацкі епіскап), Збіруйскі, Пелчыцкі і Гогаль (Тураўскі епіскап і яго пераемнік, Кобрынскі архімандрыт). На думку Грушэўскага, подпісы на абедзвюх граматах былі сабраныя адначасова.[4] “Артыкулы” уніі былі ўзгоднены з каталіцкім духавенствам: уводзіўся новы (грыгарыянскі) каляндар; цырымоніі і

[1] АЗР. – Ч. IV. – № 55. – С. 79–81.
[2] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 578.
[3] Тамсама. – С. 590; АЗР. – Ч. IV. – № 78. – С. 109–111.
[4] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 586.



МГПУ им. И.П. Шамякина

абрады заставаліся ранейшыя; дазваляліся змешаныя шлюбы; праваслаўнае святарства вызвалялася ад падатку і атрымлівала месца ў Сенаце і права займаць урады (пасады); праваслаўныя прымалі каталіцкія дагматы пра сыходжанне Святога Духа і чысцец, прычасце пад абодвума відамі; дазваляўся шлюб святароў, вызначаўся парадак вылучэння кандыдатаў на вакантную духоўную пасаду: святарства абірала 4-х кандыдатаў "рускай ці грэчаскай" рэлігіі, з якіх адзін зацвярджаўся каралём, у епіскапы прысвячаў мітрапаліт, мітрапаліта выбіралі епіскапы і зацвярджаў Рымскі папа; свецкія чыны не маглі ўмешвацца ў духоўныя справы; забараняўся пераход праваслаўных у каталіцтва; брацтвы заставаліся пры ўмове прыняцця уніі, ліквідавалася юрысдыкцыя патрыярха і забараняўся ўезд ў дзяржаву духоўных асоб як прадстаўнікоў патрыярхату. Папскі нунцый прызнаў, што ўмовы складзены карэктна.[1]

Нягледзячы на тое, што абставіны прыняцця уніі трымаліся ў тайне, паступова нарастала апазіцыя праваслаўным іерархам. Гэта выклікала трывогу ў ініцыятараў царкоўнага адзінства, асабліва пункт гледжання Канстанціна Астрожскага, які называў дзеянні ўладык "інтрыганствам". Дасланыя князю "артыкулы" выклікалі ў яго абурэнне. Ён лічыў неабходным склікание Сабора, які павінен зацвердзіць палажэнні еднасці і прасіў аб гэтым караля праз канцлера Л. Сапегу. Жыгімонт ІІІ адмовіў князю, і Астрожскі звярнуўся за дапамогай да пратэстантаў, накіраваўшы свайго пасла на з'езд у Торуні. На падставе вывучэння перапіскі Астрожскага і Сапегі, палемічных твораў "Антырызіс"і "Апакрызіс", граматы караля да К. Астрожскага з мэтай "пераканаць яго прыступіць да уніі і спрыяць у гэтым духоўным уладам" Грушэўскі даводзіць, што ініцыятары уніі сур'ёзна асцерагаліся апазіцыі, асабліва з боку князя Астрожскага, таму ж Тарлецкі і Пацей былі накіраваны ў Рым без згоды Сабора.[2]

Далейшыя падзеі дазволілі праваслаўным палемістам сцвярджаць, што Г. Балабан і М. Капысценскі не падтрымлівалі планаў увядзення уніі. Грушэўскі пераканаўча даводзіў зваротнае. Даследчык лічыў, што Балабан разлічваў на падтрымку князя Астрожскага ў канфлікце з львоўскімі братчыкамі, таму стаў адмаўляць сваё дачыненне да уніі. Ён заявіў, што не падпісваў Дэкларацыю уніі. Тарлецкаму былі перададзены чыстыя "мамрамы под печатми и подписми рук" Балабана, Пелчыцкага, Збіруйскага для падачы скаргі каралю на ўціск праваслаўных. Тарлецкі

[1] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – С. 586–589.
[2] Тамсама. – С. 582, 591, 596–597.



МГПУ им. И.П.Шамякина

напісаў на гэтых чыстых старонках з подпісам і пячаткай "артыкулы" без дазволу ўладык. У прысутнасці К. Астрожскага і шляхты гэта заява была ўпісана ў кнігі Уладзімірскага грода. Пратэст М. Капысценскага быў ўнесены ў судовыя кнігі Перамышля. Збіруйскі ў вышэй згаданай "Пратэстацыі" зазначаў, што, калі б гэта былі скаргі на ўціск праваслаўных, яны б падаваліся з удзелам мітрапаліта і ўсіх епіскапаў.[1] Байка пра падробленыя Дэкларацыі уніі выкарыстоўвалася праціўнікамі уніі, была папулярызавана аўтарам вядомага палемічнага твора "Пересторога" і замацавалася ў праваслаўнай гістарыяграфіі.

Грушэўскі са спасылкай на звесткі з лістоў Пацея і Тарлецкага Балабану і папскіх пратаколаў, якія апісвалі працэдуру зацвярджэння ўніі, робіць цікавую выснову, што асаблівасці канфесійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай не былі ўлічаны папскай курыяй і цырымонія праходзіла па звычайным сцэнарыі з улікам пастаноў Трыдэнцкага Сабора. Такім чынам, патрабаванні праваслаўнай іерархіі захаваць усе традыцыі і абрады "усходняй" царквы былі праігнараваны.[2]

Ініцыятары царкоўнага адзінства ў Рэчы Паспалітай прыбылі ў Рым 15 лістапада 1595 г. і перадалі папу Кліменту VIII "Артыкулы". Цырымонія прызнання уніі адбылася напярэдадні свята Божага нараджэння, 23 снежня 1595 г., а на пачатку сакавіка І. Пацей і К. Тарлецкі вярнуліся на Радзіму.[3] Лісты Клімента VIII да кіеўскага мітрапаліта датуюцца 7 і 21 лютага 1596 г., якому папа дазволіў склікаць Сабор і надаў права прысвячэння на біскупскую кафедру, у граматах да караля даручыў склікаць Сабор і прасіў надаць уніятам права засядаць у Сенаце.

Рашэнне аб прыняцці уніі без абмеркавання і згоды Сабора на беларускіх і ўкраінскіх землях выклікала апазіцыю "епіскапам-схізматыкам". Каб звергнуць іерархаў, што прызналі унію, згодна з традыцыяй, неабходна было склікаць Сабор (магчыма толькі з дазволу караля) і атрымаць згоду Канстанцінопальскага патрыярха. Грушэўскі звяртае ўвагу на тыя абставіны, што праваслаўныя чамусьці не скарысталі магчымасць абмеркаваць правамоцнасць уніі на Саборы, скліканым у студзені 1596 г. у Навагрудку. Там абмяркоўваліся толькі спрэчкі паміж

[1] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 592–593.
[2] Тамсама. – С. 602–604.
[3] Письмо К. Терлецкого и И. Потея Г. Балабану // АрЮЗР. – Ч. 1: т. 1. – № 116. – С. 480–485.

МГПУ им. И.П.Шамякина

мітрапалітам і Віленскім духавенствам, Балабанам і Львоўскім брацтвам.[1] Сваё незадавальненне праваслаўная шляхта выказвала на Вальным сойме, скліканым на зень Благавешчання 1596 г. Вымогі праваслаўных паслоў пра захаванне рэлігійнай свабоды, нададзенай Варшаўскай канфедэрацыяй 1573 г., былі падтрыманы пратэстантамі. Земскія паслы ад беларускіх і ўкраінскіх земляў, не атрымаўшы жаданага выніку, склалі Дэкларацыю пра непрызнанне ўлады "ўладыкаў-схізматыкаў" над падданымі на ўласных уладаннях, таму што парушаецца свабода веравызнання, без іх згоды галавой царквы прызнаецца рымскі папа, уносяцца змены ў дагматы веры і ўводзіцца новы каляндар. Ад імя князя Астрожскага пратэст быў упісаны ў Варшаўскія гродскія кнігі.[2]

Праваслаўныя спрабавалі знайсці падтрымку ў Канстанцінопалі. Аднак пасля смерці патрыярха Іерэміі ў 1594 г. патрыярхат быў заклапочаны сваім нетрывалым стнановішчам пад уладай Асманаў і частай зменай патрыярхаў. К. Астрожскі звярнуўся за дапамогай да протасінкела (кіраўніка спраў патрыярхату) Нічыпара, які меў пэўны аўтарытэт і ўплыў, але па загаду караля ў Рэчы Паспалітай арыштаваны і праз некалькі месяцаў збег.[3]

На думку Грушэўскага, яшчэ да пачатку працы Сабора адбыўся раскол на два супрацьлеглыя лагеры. Праваслаўныя разглядалі Сабор як сродак легальнага знішчэння уніі, каталікі – як сродак афіцыйнага абвяшчэння ўмоў царкоўнага адзінства.[4]

Сімпатыі аўтара "Історії України – Руси" знаходзіліся на баку праваслаўных. Ён падрабязна апісаў падзеі, што адбываліся ў Бярэсці 6–9 кастрычніка 1596 г., даводзіў правамоцнасць дзеянняў праваслаўных на Саборы на падставе аналізу палемічнай літаратуры каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных аўтараў, грамат уніяцкага і праваслаўных Сабораў, выдадзеных у "Актах Западной России" і "Архиве Юго-западной России", аспрэчваў тэзісы каталіцкіх і ўніяцкіх палемістаў пра незаконнасць Сабора з-за прысутнасці на ім свецкіх асоб і пратэстантаў. Дэлегаты Праваслаўнага сабора былі падзелены на два "колы": свецкае і духоўнае.

[1] Грушевський, М.С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 605; Соборная грамота Киевского митрополита и духовенства / АЗР. – Ч. IV. – № 91. – С. 125–126.
[2] Протест против епископов, подчинившихся папской власти / АрЮЗР. – Ч. 1: т. 1. – С. 533–537.
[3] Следственное дело об экзархе Никифоре…» АЗР. – Ч. IV. – № 117. – С. 162.
[4] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 610.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Рашэнні ў адносінах да духавенства прымала выключна духоўнае кола на чале з Нічыпарам.[1]

Каралеўская грамата вызначала тэрмін склікання Сабора – на свята св. Мікалая, 6 кастрычніка ў Бярэсці, забараняла прымаць у ім удзел іншаземцам і іншаверцам. Каталіцкі епіскапат прадстаўлялі архібіскуп Львоўскі Салікоўскі, Луцкі біскуп Мацяёўскі, біскуп Холмскі Гамаліцкі, іезуіт П. Скарга, каралеўскімі пасламі былі трокскі ваявода Мікалай Радзівіл Сіротка, канцлер Л. Сапега, Берасцейскі староста Халецкі. Праваслаўных прадстаўлялі Канстанцінопальскі патрыяршы протасінкел Нічыпар, Александрыйскі патрыярх Кірыл Лукарыс, епіскапы Львоўскі і Перамышльскі Г. Балабан і М. Капысценскі, каля 200 святароў, Кіеўскі ваявода Канстанцін Астрожскі і яго сын Аляксандр, ваявода Валынскі, каштэлян Наваградскі Палубенскі, павятовыя паслы, шляхта без "мандатаў", прадстаўнікі мяшчан і Віленскага, Львоўскага, Бельскага брацтваў.

Нічыпар і Кірыл Лукарыс даслалі М. Рагозе запрашэнне прыбыць на Сабор. Праваслаўныя дэлегаты, не атрымаўшы звестак, дзе і калі адбудзецца Сабор, вырашылі сабрацца асобна ў маёнтку Астрожскіх. 6 кастрычніка яны даслалі саборную адозву (Парагностик) з запрашэннем прыбыць на Сход. На наступны дзень 7 кастрычніка ў Бярэсце прыехалі каралеўскія паслы, якіх Астрожскі прасіў забяспечыць правядзенне агульнага Сабору. Аднак праваслаўныя іерархі, якія прынялі унію, не жадалі адказваць за свае дзеянні перад прадстаўнікамі патрыярхату, а грэчаскае духавенства не магло прысутнічаць на мітрапаліцкім Саборы з-за каралеўскай забароны уязджаць у дзяржаву. Каралеўскія паслы праігнаравалі заклікі праваслаўных. 8 кастрычніка яны праз князя К. Астрожскага і павятовых паслоў перадалі запрашэнне з'явіцца на мітрапаліцкі Сабор для правядзення рэлігійнага дыспуту. Праваслаўная супольнасць адмовілася ў ім удзельнічаць без патрыярхаў, але запэўніла, што не супраць еднасці Царквы, вызначанай належным чынам. Надзеі на правядзенне адзінага Сабора не здзейсніліся, уніяцкі і праваслаўны з'еды праходзілі асобна.[2]

Духоўнае "кола" (прадстаўнікі духавенства) праваслаўнага Сходу абвясціла пра пазбаўленне духоўнага сану мітрапаліта і епіскапаў за парушэнне канонаў веры, непадпарадкаванне Сабору і самавольны

[1] Грушевський, М. С. Історія України-Руси. – Т. 5. – С. 610–614.
[2] Тамсама. – Т. 5. – С. 612–615 .

пераход у унію. Анафема не пашыралася на духавенства, падпарадкаванае “епіскапам-схізматыкам.”[1]

Свецкае “кола” (дэлегаты шляхты і мяшчан) вырашыла накіраваць каралю паслоў з наказам прасіць яго не парушаць пастанову Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. і склала ўніверсал для павятовых соймікаў пра падзеі на Берасцейскім саборы, непрызнанні юрысдыкцыі ўладыкаў-уніятаў і падтрымцы “старой веры праваслаўнай”[2].

Уніяцкі з’езд распачаўся 8 кастрычніка, зацвердзіў Дэкларацыю уніі за подпісамі мітрапаліта, епіскапаў Уладзімірскага, Луцкага, Пінскага, Полацкага, Холмскага, трох архімандрытаў, забараніў святарству, што не прыняло ўдзелу ў Сходзе, выкананне царкоўных функцый.[3] Пасля святочных набажэнстваў у Саборнай царкве св. Мікалая з удзелам каталікоў уніяцкі Сабор скончыўся.

Праваслаўныя вынеслі пратэст, абвясціўшы Акт уніі несапраўдным, бо ён быў прыняты іерархамі, якія былі пазбаўлены Саборам сану і без яго згоды. Гэты пратэст не быў прызнаны ў Берасцейскім гродскім судзе і пазней запісаны ў кнігі Уладзімірскага грода ад імя князя Друцкага-Горскага.[4] Пастановы праваслаўнага Сабору былі дасланы Канстанцінопальскаму патрыярху Мялецію Пегасу, які іх зацвердзіў, прызначыў патрыяршымі экзархамі Кірыла Лукарыса, К. Астрожскага і Г. Балабана. Кароль не зацвердзіў рашэнняў праваслаўнага Сабору, прызнаў яго незаконным, загадаў вернікам не падпарадкоўвацца епіскапам, якія не прынялі унію, а ўладам – прыцягваць да адказу за супрацьдзеянне пастановам мітрапаліцкага Сабора.

Супрацьлеглыя рашэнні двух Сабораў выклікалі вострую рэлігійна-літаратурную палеміку, раскалолі грамадства і абвастрылі міжканфесійную барацьбу ў Рэчы Паспалітай.

МГПУ им. И.П.Шамякина

[1] Синодальный универсал о событиях на Брестском Соборе / АрЮЗР. – Ч. 1: т. 1. – №123. – С. 518–530; Окружная благословенная грамота Константинопольского патриаршего экзарха Никифора» / АЗР. – Ч. IV – № 111. – С. 151–152.

[2] Предложения, присланных на Собор депутатов от духовенства и дворянства, протест и обязательство противодействовать Унии» / АрЮЗР. – Ч. 1: т. 1. – № 123. – С. 518–530.

[3] АЗР. – Ч. IV. – № 103. – С.139–141.

[4] Протест против епископов… / АрЮЗР. – Ч. 1: т. 1. – № 123. – С. 532.

## 5.4. Беларуская нацыянальная гістарыяграфія сацыякультурных і этнапалітычных працэсаў ўзаемадзеяння ў Рэчы Паспалітай на пачатку XX ст.




Пачатак XX ст. вызначаецца фарміраваннем беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, выданнем першых абагульняльных сістэматызаваных прац па гісторыі Беларусі. Значную ўвагу вывучэнню канфесійных адносін на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Рэчы Паспалітай надавалі Вацлаў Ластоўскі, Усевалад Ігнатоўскі, Уладзімір Пічэта.

Праца актыўнага ўдзельніка беларускага нацыянальнага руху, грамадска-палітычнага дзеяча В. Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі", якая была першым выданнем пра Беларусь для беларусаў на беларускай мове, выйшла ў свет у 1910 г. у Вільні. На думку В. Ластоўскага, канфесійныя адносіны на беларускіх і ўкраінскіх землях у складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай адыгралі значную ролю ў вызначэнні нацыянальнай ідэнтычнасці і ўвогуле ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы. Ён адзначаў моцны ўплыў Рэфармацыі на грамадска-палітычную думку Вялікага княства Літоўскага, якая "парушыла ўсё грамадства і зрабіла поўны пераварот у думках і поглядах", мела асветніцкае значэнне, але, разам з тым, прынесла шмат шкоды.[1]

Гісторык лічыў, што думка пра рэлігійную унію "вырасла на глебе бясконцых сварак за веру": у праваслаўнай царкве адбывалася барацьба паміж брацтвамі і вышэйшым духавенствам за ўплыў у грамадстве, брацтвы заглядалі ў прыватнае жыццё ўладыкаў, публічна выказвалі іх заганы, пісалі даносы патрыярху. У справе пашырэння уніі Ластоўскі вызначаў два накірункі: іерархічны і нацыянальны. Прадстаўнікі першага, вышэйшае духавенства, жадалі атрымаць незалежнасць ад свецкіх уладаў і дасягнення асабістай карысці. Прадстаўнікі другога ў асобе князя

[1] Ластоўскі, В. Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – С. 43–44.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Канстанціна Астрожскага імкнуліся стварыць моцную нацыянальную царкву. Аўтар "Кароткай гісторыі Беларусі" разглядаў абарону праваслаўя як народную справу. Меркаванні езуітаў стварыць унію як пераходную ступень з праваслаўя ў каталіцтва выклікалі апазіцыю з боку Астрожскага і народа, што абумовіла немагчымасць правядзення супольнага Сабора ў Бярэсці ў 1596 г. і, у сваю чаргу, акрэсліла раскол праваслаўнай царквы. Праваслаўныя страцілі іерархію, але з дапамогай брацтваў пачаўся народны рух, які ўзняў грамадства на "небывалую маральную і культурную вышыню".[1] Дзякуючы езуіцкай адукацыі, шляхта "пакідае беларускае, забывае аб справе нацыянальнай, зліваецца з польскай". На варце нацыянальнай справы засталіся толькі "худыя і няслаўныя" з шляхты, якія, аднак, мелі права "veto", таму Сойм не мог прыняць пастанову супраць праваслаўя. Ластоўскі зрабіў важную выснову, што калі быў "здзек" (дыскрымінацыя праваслаўных), дык "з пазіцыі сілы, а не права".[2] Берасцейская унія адбылася пры поўным разладзе ў грамадстве і не мела нічога "супольнага з нацыянальнай справай", не абапіралася на нацыянальныя жаданні, што было вялікай памылкай, прывяло да казацкіх войнаў у XVII ст.[3]



*У.М. Ігнатоўскі*

Беларускае духавенства, падзеленае на варожыя станы, вяло паміж сабой "нешта падобнае на вайну": адны адбіралі ў другіх цэрквы і маёмасць і наадварот. У гэтым змаганні часта здараліся з абодвух бакоў "крыўды і няпраўды", напрыклад, забойства ўніяцкага біскупа І. Кунцэвіча. Дызуніты (праваслаўныя) уцякаюць на Украіну да казацкіх дружын, якія пачынаюць выступаць як абаронцы праваслаўнай веры.[4] Казакі складаліся з вольнага народу, "жылі з вайны", нападалі на туркаў і выклікалі гэтым войны паміж Рэччу Паспалітай і Асманскай імперыяй. Каб не дапусціць вайны, польскі ўрад пастанавіў "прыціснуць казакоў" і пашырыць унію сярод іх. Толькі

[1] Ластоўскі, В. Кароткая гісторыя Беларусі. – С. 62–63.
[2] Тамсама. – С. 64–65.
[3] Тамсама. – С. 68–69, 71.
[4] Тамсама. – С. 70–71.



МГПУ им. И.П.Шамякина

Палуцкая, С. Уніяцкая царква ў кантэксце культурна-гіста- рычнага развіцця Вялікага княства Літоўскага / С. Палуцкая // Наш Радавод: материалы Междунар. науч. конф. по региональной истории Восточной Европы «Культура народов Великого княжества Литовского и Белоруссии». Гродно, 22–24.10.1991 / под ред. Д. В. Карева. – Гродно, 1991. – Кн. 3, ч. 2. – С. 218–226.

Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В. В. Дубровский [и др.]; АН БССР, Ин-т философии и права; редкол.: А. С. Майхрович [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 318 с.

Пештич, С. Л. «Синопсис» как историческое произведение / С. Л. Пештич // Труды отдела древнерусской литературы. – 1959. – Т. 15.

Пичета В. И. История белорусского народа / В. И. Пичета – Минск: Изд. центр БГУ, 2003. – 184 с.

Плохій, С. М. Від Якова суші до Анастасия Великого (Огляд видань римськіх джерел з історіі украінскоі церкви) // Український археографічний щорічник. Нова серия. Вип. 2 (Український археографічний збірнік. Т. 5). – Київ, 1993. – С. 6–14.

Степанов, Д. Ю. Этногенетический миф в формировании этнических представлений московской элиты в последней четверти XVII – начале XVIII в. / Д. Ю. Степанов // Русский сборник. Вып. 14. – С. 88–92.

Теплова, В. А. Церковная история Беларуси в трудах отечественных историков XIX – начала XX века. [Электронный ресурс] http://hramvsr.by/teplova.htm Дата доступа 20.07.2015

Турчинович, О. Обозрение истории Белоруссии / О. Турчинович; Изд. А. Исанова. – СПб.: типография Эдуарда Праца, 1857.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1973. – 303 с.

Україна: хронологія розвітку. Т. 4: На порозі Нового часу. Від Люблінськоі уніі до кінця XVIII століття / рэдкал. В. А. Смолій (гал. рэд) [і інш.]. Інститут історіі Украіни НАН Украіни. – Киів: ТОВ «Кріон», 2009. – 863 с.

Чистович, И. А. Очерк истории западнорусской церкви: в 2 ч. / И. А. Чистович. – СПб.: Тип. Департамента уделов, 1882–1884. – Ч. 1. – 1882. – 220 с.

Чистович, И. А. Очерк истории Западнорусской Церкви / И. А. Чистович. – СПб.: Типография Департамента уделов, 1884. – Ч. 2. – 419 с.

Харлампович, К. В. Западнорусские православные школы XVI в. и начала XVII в., отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуги их в деле защиты веры и церкви / К. В. Харлампович. – Казань: Типо-литография Императорского ун-та, 1898. – 525, 54 с.

Харлампович, К. В. Малороссийское влияние на велико-русскую церковную жизнь / К. В. Харлампович. – Казань: Изд. книжного магазина М. А. Голубева, 1914. – Т. I. – xxiv, 878.

Филарет (Гумилевский, Д. Г.). История Русской церкви: в 5 т. / Филарет (Д. Г. Гумилевский). – Харьков: Универ. тип., 1853. – Т. 4: Период патриаршества (1589–1720). – 1853. – 326 с.

Флоря, Б. Н. Отношения государства и церкви у восточных и западных славян: эпоха средневековья / Б. Н. Флоря. – М.: Наука, 1992. – 246 с.

Шевченко, І. Україна між Сходом і Заходом. Нариси з історії культури до початку XVIII століття / І. Шевченко; пер. з англ. М. Габлевич. – Львів: Ін-т Історії Церкви Львівської Богословської Академії, 2001. – 250 с.

Шевчук, В. О. Самійло Велічко та його літопіс / В. О. Шевчук, С. В. Величко // Літопис. Т. 1. – К.: Дніпро, 1991. – С. 5–21.

Хижняк, З. І. Історія Києво-Могилянської академії / З. І. Хижняк, В. К. Маньківський. – К.: Вид. дім «КМ Академія», 2003. – 184 с

Энциклопедическій словарь Брокгауза и Ефрона. – СПб., 1890–1907. Томъ XXVIIIА. Саварни – Сахаронъ. – СПб.: Типографія Акц. Общ. «Издат. дѣло, бывшее Брокгаузъ-Ефронъ», 1900. – 4, II, 25–496, II с., 15 л. ил., карт.

Kotlubaj E. Zycie Januszsa Radziwilla. – Wilno i Witebsk, 1859.

Jaroszewicz, J. Obraz Litwy pod wzglodem jej cywilizacji, od czasow najdawniejszych do konca wieku XVIII / J. Jaroszewicz– Wilno, 1844–1845. Cz. I-III.

Narbutt, T. Dziejestarozytne narodu Litewskiego. T. 9: Panowanie Zygmuntew / T. Narbutt. – Wilno, 1841.

МГПУ им. И.П. Шамякина

# ПАКАЗАЛЬНІК ГІСТАРЫЧНЫХ АСОБ


| | | |
|---|---|---|
| **Абуховіч Піліп Казімір**, ваявода Віцебскі і Смаленскі | Аўтар “Дыярыуша” (Дзённіка), дзе апісаў падзеі грамадска-палітычнага жыцця ў 1630-1654 гг. у Рэчы Паспалітай. | 13 |
| **Арахоўскі Станіслаў. Перамышльскі** шляхціц, ксёндз, сцвярджаў неабходнасць уніі і перагляду царкоўных дагматаў. | Вакол яго трактатаў “Пра рускае хрышчэнне”(1544) “Супраць цэлібату” (1547) “ДіатрибЂ” разгарнулася вострая грамадская палеміка, нават на Вальным сойме 1550 г. Склаў сан, ажаніўся, быў пазбаўлены маёмасці і гонару. | 143 |
| **Астрожскі Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч** (1526–1608), прадстаўнік багацейшага праваслаўнага роду, мецэнат. | Староста Уладзімірскі, маршалак Валынскі, ваявода Кіеўскі, адкрыта выступіў супраць заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі. Малодшы сын гетмана ВКЛ князя Канстанціна Іванавіча (пераможцы ў бітве пад Оршай). | 32, 34, 98, 125, 136, 148, 150, 151, 152, 154 |
| **Балабан Гедэон,** Львоўскі і Галіцкі праваслаўны епіскап Кіеўскай мітраполіі (1569–607), адзін з ініцыятараў царкоўнай еднасці ў 1590 г. | Падчас барацьбы з Львоўскім праваслаўным брацтвам (1587–1594), удзельнічаў у абмеркаванні умоў уніі на Саборы ў 1590 г., падпісаў “Артыкулы уніі” ў 1595 г. але на Берасцейскім саборы 1596 г. адмовіўся іх падпісваць і прымаў удзел з боку праваслаўных. | 31, 33, 145–152 |
| **Баболя Андрэй**, святы каталіцкай царквы, ксёндз, езуіт, місіянер, выдатны прамоўца, галоўны апякун Пінскай дыяцэзіі. | 16 мая 1657 (падчас вайны Рускай дзяржавы з Рэччу Паспалітай) схоплены і закатаваны ў в. Янаў Палескі (цяпер г. Іванава_Брэсцкай вобл.) атрадам казакоў палкоўніка А. Здановіча. Кананізаваны, мошчы перавезены ў езуіцкі сабор “Іль-Джэзу” ў Рыме. | 26 |
| **Барэцкі Іоў**, выкладчык, рэктар брацкай школы ў Львове (1604). Першы рэктар Багаяўленскай школы ў Кіеве (брацкай), 1615 г. Кіеўскі праваслаўны мітрапаліт (1620–1631). | Аўтар публіцыстычных твораў, перакладчык з грэчаскага богаслужэбных кніг. Найбольш вядомыя палемічныя творы ў абарону праваслаўя – “Пратэстацыя” (1621), “Юстыфікацыя” (1622). У 1624 г. звяртаўся за падтрымкай да рускага цара Фёдара Міхайлавіча. | 19–21, 24, 25, 76, 78, 80, 81 |
| **Бельскі Марцін** (1495–1575), аўтар “Хронікі ўсяго свету”, першага падручніка па ўсеагульнай гісторыі ў Польшчы, тры выданні (1551, 1554, 1564 гг.). | Упершыню пісаў свае творы па-польску (афіцыйнай мовай навукі лічылася лаціна), “Хроніка свету” складалася з 10 кніг. Кнігі “Аб маскоўскім альбо рускім народзе”, “Аб пасольстве Васіля да папы рымскага”, “Аб Літве”, “Аб Ліфлянцкай зямлі”, “Аб Татарах” закранаюць гісторыю ВКЛ. | 86, 98, 108 |
| **Бельскі Яўхім**, сын Марціна Бельскага, аўтар “Хронікі польскай” 1597 г. | Аўтар “Польскай хронікі” ад старажытнасці да 1586 г., скарыстаў звесткі бацькі, Длугаша, Стрыйкоўскага, Кромэра і інш., нататкі з уласнага вопыту і архіўныя дакументы. | 86, 98, 108 |


МГПУ им И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| **Брухавецкі Іван**, гетман Левабярэжнай Украіны (у складзе Рускай дзяржавы) у 1663–1668 гг., асабісты пасланец Багдана Хмяльніцкага, выхавальнік яго сына. Дыпламат і красамоўны прамоўца, падчас афіцыйнага візіту ў Маскву ў 1665 г. атрымаў баярскі тытул і маёмасць, заключыў Маскоўскі дагавор . | Падчас барацьбы за гетманскую булаву паміж ім, наказным палкоўнікам Якімам Сомкам, нежынскім палкоўнікам Васілём Залатарэнкам) быў абраны “Чорнай радай” (казацкімі старшынамі) ў Нежыне ў 1663 г. пры падтрымцы Масквы. Умовы Маскоўскага дагавора (абмяжоўвалася вольная элекцыя гетмана, кіеўскі мітрапаліт прызначаўся з Масквы, неказацкае насельніцва перадавалася пад юрысдыкцыю рускіх ваявод) выклікалі абурэнне. У 1668 г. прапанаваў аб’яднацца з гетманам Правабярэжнай Украіны П. Дарашэнкам і ўзняць паўстанне супраць рускіх улад, быў забіты левабярэжнымі казакамі. | 99, 105, 106, 108–110, 177 |
| **Выгоўскі Іван**, гетман Войска Запарожскага (1657–1659), дыпламат, палітык, стваральнік Генеральнай вайсковай канцылярыі (вайсковыя справы, адміністрацыйныя функцыі, міжнародныя зносіны) Гетманату, пераемнік Багдана Хмяльніцкага, імкнуўся да захавання незалежнасці Гетманату. | Атрымаў перамогу над рускімі войскамі ў Канатопскай бітве (1659), заключыў Гадзяцкую дамову (не была ратыфікавана) з Рэччу Паспалітай (1659) аб утварэнні федэрацыі трох народаў (далучалася Вялікае княства Рускае ў складзе Кіеўскага, Чарнігаўскага і Брацлаўскага ваяводстваў з уласным скарбам, войскам, судом) касавалася ўніяцтва, свабодны дазвол на заснаванне школ, калегій, друканяў). Ва ўмовах росту апазіцыі і барацьбы за гетманства адмовіўся ад улады на карысць Юрыя Хмяльніцкага. У 1664 г. спрабаваў узняць паўстанне супраць польскіх улад, быў пакараны смерцю. | 96, 99, 105, 108–110 |
| **Вішанскі Іван** (другая палова XVI ст. – пачатак XVII ст.), царкоўны дзеяч, пісьменнік-палеміст. Манах Афонскага манастыра, прыхільнік ісіхазму (містычна-аскетычны накірунак хрысціянства, адмаўленне ад людскай марнасці, спасціжэнне свету праз малітву). | Аўтар рэлігійна-палемічных твораў “Краткословный ответ” (адрасаваны П. Скаргу); "Послание Домникии"; ”Зачапка мудраго латынника з глупым русином”; “Позорище мысленное”; “К утекшим от православное вЪры епископом”; “Извещение краткое”, “Писание до всех обще, в Лядской земли живущих”, “Обличение диавола-миродержца”, “Порада”, Пасланні Львоўскаму брацтву, князю Канстанціну Астрожскаму. Адмоўна ставіўся да Берасцейскай уніі і яе прыхільнікаў, выкрываў заганы праваслаўных іерархаў, негатыўна выказваўся пра пашырэнне асветы. | 3, 9, 59, 70, 90 |
| **Вялічка Самуіл** (1670 – пасля 1728), казацкага паходжання. Аўтар гістарычна- | Меў добрую адукацыю, ведаў нямецкую, польскую, лацінскую мовы, служыў старшым канцылярыстам Генеральнай канцылярыі Войска Запарожскага. | 15, 104, 108 – 110 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| літаратурнага твора пра падзеі 1648–1700 гг., вядомага як Летапіс Самуіла Вялічкі (1720), выдадзенага ў 1848–1864 гг. | Выконваў дыпламатычныя даручэнні гетмана І. Мазепы, быў зняволены ў 1709 г., выйшаў з турмы ў 1715 г. Працаваў над творам у 2 частках каля 10 год, скарыстаў вядомыя гістарычныя творы тагачаснай Еўропы, ВКЛ і Польшчы, дакументы гетманскай канцылярыі. | |
| **Гваньіні Аляксандр** (1534–1614), гісторык італьянскага паходжання, вайсковец. Амаль усё жыццё пражыў у Кракаве. | Аўтар "Апісання еўрапейскай Сарматыі" (1578 г.), дзе змешчана гісторыя і геаграфія Польшчы, Літвы, Інфлянтаў, Прусіі, Масковіі і татар да часоў караля Генрыха Валуа (1574 г). | 86, 98, 108 |
| **Гізель Інакенцій**, выкладчык, з 1646 г. рэктар Кіева-Магілянскай калегіі, вядомы публічнымі дыспутамі з каталіцкімі багасловамі, архімандрыт Кіева-Пячорскай лаўры (1656 г.). | Аўтар філасофскіх трактатаў "Сачыненне аб усёй філасофіі", "Мір з Богам чалавека", рэдактар, магчымы аўтар Сінопсіса Кіеўскага (1674), дзе абгрунтаваў ідэю панславянскага праваслаўнага адзінства, запазычаную расійскай гістарыяграфіяй, меў супярэчлівыя адносіны да падпарадкавання мітраполіі Маскоўскаму патрыярхату. | 3, 89, 99, 100–102, 109, 110 |
| **Гладкі Максім**, казацкі палкоўнік, атрад якога адным з першых быў накіраваны Б. Хмяльніцкім на Беларусь у чэрвені 1648 г. | Яго атрад захапіў г. Пінск у 1648 г., разбіў шляхецкае апалчэнне пад Кобрынам. У выніку баявых дзеянняў супраць казакоў у 1648–1649 гг. Пінск і Пінскае староства былі спустошаны. | 12 |
| **Грабянка Рыгор**, казацкага паходжання. Гаддзяцкі палкавы суддзя, удзельні-чаў у баявых дзеяннях супраць татар. | Аўтар літаратурна-публіцыстычнай працы, вядомай пад назвай Летапіс Грабянкі (1710), кампіляцыі з розных крыніц, гістарычных, мастацкіх, фальклорных пра падзеі 1648–1708 гг., вызначалася гераізацыяй казацтва, выдадзена ў 1854 г. | 99, 104, 107, 108, 165, 174 |
| **Дарашэнка Пётр**, гетман Войска Запарожскага (1665–1676) на Правабярэжжы. У 1668 г. аб'яднаў Украіну пад адзінай гетманскай булавой. Імкнуўся право-дзіць незалежную ад Польшчы і Рускай дзяржавы палітыку, запрасіў дапамогі ў турэцкага султана Мехмеда IV, Правабярэжжа перайшло пад пратэктарат Асманаў (1669). Вёў перамовы з польскім урадам аб вяртанні Гадзяцкай дамовы. | У снежні 1668 г. левабярэжныя казакі абралі гетманам Дзям'яна Ігнатовіча (Мнагагрэшнага), якога ў 1672 г. вывезлі ў Маскву як здрадніка ў выніку казацкай змовы і запрасілі дапамогі ў Масквы. Супраць Дарашэкі выступіў абраны гетманам часткай правабярэжнага казацтва Міхаіл Ханенка, зацверджаны каралём Рэчы Паспалітай Міхаілам Карыбут-Вішнявецкім (1670–1672). У выніку вайны з туркамі Рэч Паспалітая адмовілася ад Правабярэжнай Украіны. Самайловіч (новы левабярэжны гетман), на карысць якога Ханенка адмовіўся ад гетманства, аб'яднаў амаль усю Украіну, за выключэннем рэзідэнцыі Дарашэнкі. У 1676 г. Дарашэнка прыняў рускае падданства. | 105. 108–110, 178 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| | З 1677 г. жыў у Маскве, у 1679–1682 гг. ваявода ў Вятцы, памёр ў 1698 г у Маскве. | |
| **Длугаш Ян** (1415–1480), аўтар “Гісторыі Польшчы” (у 12 кн.), 60–80-я гады XV ст. | Заклаў гістарыяграфічную традыцыю разумення “Русі” (Галіцка-Валынская і Чырвоная Русь, паўночна-ўсходняя і паўднёвая часткі ВКЛ, Смаленшчына, Віцебшчына і Полаччына), паўночна-ўсходняя Русь – “зямля масквічоў, маскавітаў, Масковія”. | 57, 71, 72, 86, 97 |
| **Дравінскі Лявонцій** (?–пасля 1639), пасол ад валынскай шляхты на Вальных соймах (1615–1632), прамоўца (найбольш вядомая яго прамова на Сойме 1620 г. у абарону праваслаўных), валынскі чашнік, мецэнат і абаронца праваслаўных. | Удзельнічаў у праваслаўным Берасцейскім саборы 1596 г., падтрымліваў праваслаўныя брацтвы (Люблінскае, Львоўскае, Луцкае, Віленскае), быў адным з ініцыятараў склікання агульнага царкоўнага сабора ўніятаў і правалаўных у 1629 г. з мэтай іх аб’яднання. Прымаў удзел у рабоце соймавай камісіі па выпрацоўцы “Артыкулаў заспакаення народу рэлігіі грэчаскай” 1632 г. Яму прысвячаліся творы царкоўных дзеячаў і пісьменнікаў (Кірылы Транквіліён-Стаўравецкага, Касіяна Саковіча і інш.) | 50 |
| **Збіруйскі Дыянісій**, праваслаўны епіскап Холмскай епархіі Кіеўскай мітрапаліі, удзельнік уніяцкага сабора ў Бярэсці. | Далучыўся да ініцыятывы праваслаўных іерархаў у 1590 г. прызнаць верхнасць рымскага папы, фактычна захаваць самастойнасць мітрапаліі. Падпісаў Артыкулы уніі ў 1595 г. абвяргаў словы Г. Балабана аб тым, што той не падпісваў умовы уніі. | 147, 148, 149 |
| **Зізаній Стэфан** (1550–1634), праваслаўны прапаведнік, палеміст, выкладчык (дыдаскал) Віленскай брацкай школы, падзяляў некаторыя погляды пратэстанцкіх аўтараў. | Аўтар кніг “Изложение веры” “Защита православия”, зрабіў пераклад з грэчаскай мовы з каментарыямі “Казанье святого Кирилла об антихристе и знаках его, с расширением науки против ересей розных (пра 11 прыкмет з’яўлення Антыхрыста і Другое прышэсце Хрыста), Яго высновы пра сутнасць Троіцы, адзінства душы і цела прызналі ерэтычнымі каталікі і праваслаўныя | 27, 57, 60, 61, 121, 126 |
| **Зізаній Лаўрэнцій** (1570 – пасля 1633), царкоўны дзеяч, педагог, мовазнаўца, пісьменнік, перакладчык, багаслоў. | Выкладчык брацкіх школ (Львоў, Бярэсце, Вільня), аўтар “Лексиса” (1596), першага слоўніка царкоўнаславянскай мовы, прац “Грамматика словенска” (1596), “Наука ку читаню и розуменю писма словенскаго”, “Большой катехизис” (1627). | 57 |
| **Іаан Златавуст** (344–354 –407), прапаведнік хрысціянскай маралі, багаслоў, адзін з вялікіх грэчаскіх святых | Карыстаўся павагай сярод насельніцтва Антыяхіі і Канстанцінопаля, шырока вядомы, дзякуючы красамоўным пропаведзям. Выступаў супраць чалавечых заганаў, раскошы. Найбольш вядомы | 46, 71, 85 |



МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| айцоў царквы, архіепіскап Канстанцінопальскі. | каментарыямі да Бібліі, у тым ліку Старога Запавету, Евангелля ад Матфея, Пасланняў апостала Паўла і інш. | |
| **Іерамія II**, Канстанціно-пальскі патрыярх (1572–1579; 1580 –1584; 1584; 1587 – 1595 гг), заснаваў Маскоўскі патрыярхат у 1589 г. | Веў актыўную палеміку пра хрысціянскія дагматы з пратэстантамі і каталікамі, па яго ініцыятыве быў скліканы правалаўны Сабор, які забараніў прымаць грыгарыянскі каляндар і дагматы каталіцкай царквы, умешваўся ва ўнутраныя справы Кіеўскай мітраполіі, надаў статус стаўрапігіі буйным праваслаўным брацтвам. | 20, 23, 30, 31, 145, 150 |
| **Іяўлевіч Ігнат** (26.09.1619, Магілёў 1664, Масква), рэлігійны дзеяч. Педагог. Архімандрыт Полацкага Барысаглебскага манастыра (1660), пляменнік Фамы Іяўлевіча. | Быў выкладчыкам у Кіева-Магілянскай калегіі, працаваў у школах Львова, Оршы, Кракава, Камянца. Адзін з арганізатараў Славяна-грэка-лацінскай акдэміі ў Ясах (Малдаўскае княства). Удзельнічаў у Маскоўскім саборы па справе патрыярха Нікана, сярод твораў захаваліся аўтабія-графічныя запісы, лісты, дэкламацыі, пропаведзі. | 24, 57, 81, 82 |
| **Іяўлевіч Фама** (Тамаш), нарадзіўся ў Магілёве, рэлігійны дзеяч, паэт, гуманіст, рэктар Кіеўскай брацкай школы (1628–1632). Захаваўся адзіны яго твор. | Аўтар філасофска-публіцыстычнай паэмы “Лабірынт, або Заблытаная дарога” (1625, Кракаў) мела дыдактычную накіраванасць, уздымала праблему адукацыі і выхавання, мастацтваў і навук ў жыцці чалавека, прапа-навала ідэальныя нормы паводзін ад імя паэтычнага вобраза Мудрасці. | 24, 57, 81 |
| **Казлоўскі Ісая Трафімавіч** (?–1651), доктар багаслоўя, выкладчык Львоўскай брацкай школы, першы рэктар Кіева-Магілянскай калегіі, ігумен. | Паплечнік Пятра Магілы. У 1640 г. на Кіеўскім Саборы 1640 г. прадставіў вынік працы Кіева-Магілянскага асяродку пад рэдакцыяй П. Магілы “Православное исповедание веры”, які ўтрымліваў дагматы і каноны праваслаўных набажэнстваў, выдадзена ў 1645 г., перакладзена на іншыя мовы і вытрымала шмат перавыданняў. | 22, 82 |
| **Кальнафойскі Афанасій**, манах Кіева-Пячорскай лаўры, аўтар працы пра святы прытулак (1638) як сакральны цэнтр праваслаўя. | “Тератургима, или чудеса, совершившиеся, как в самом Печерском монастыре, так в обеих его пещерах» – апісанне манастыра і пячор, нарыс пра святых старцаў, выдадзена ў Кіева-Пячорскай друкарні на польскай мове. | 87, 88 |
| **Канашэвіч Сагайдачны Пётр** (1570–1622), гетман Войска Запарожскага, адкрыта абвясціў казацтва абаронцамі праваслаўя. | Паспяхова ўдзельнічаў у баявых дзеяннях супраць Асманскай імперыі і Рускай дзяржавы, уступіў разам з войскам ў Кіеўскае брацтва. Па яго запрашэнні і вайсковай падтрымцы аднаўляецца праваслаўная іерархія (прызначаюцца епіскапы і мірапаліт Іерусалімскім патрыярхам Феафанам). | 19, 49, 21, 51, 80, 81, 132, 155 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| **Каніскі Георгій**, прамоўца, пісьменнік, выкладчык багаслоўя і філасофіі ў Кіева-Магілянскай акадэміі, затым рэктар, праваслаўны епіскап Магілёўскі (1755–1783), архіепіскап (1783–1795). Уваходзіў у склад Свяцейшага Сінода. | Вядомы як аўтар гісторыка-публіцыстычных твораў у абарону праваслаўя “Права и вольности жителей, греко-восточную веру исповедующих в Польше и Литве” (1767); “Исторические известия о епархии Могилевской” (1775); “Записки о том, что в России до конца XVII столетия не было никакой унии с Римской Церковью.” Яму прыпісваецца таксама аўтарства “Истории русов или Малой России”. | 3, 11, 111 – 114, 120, 123, 126, 159 |
| **Капінскі Ісая** (?–1640), заснавальнік, першы ігумен Багаяўленскага манастыра ў Кіеве і рэктар Кіеўскай брацкай школы (1615), епіскап Перамышльскі (1620, не зацверджаны), мітрапаліт Кіеўскі (1631–1632), заснавальнік некалькіх манастыроў. | Прадстаўнік аскетычна-артадаксальнага накірунку праваслаўя. Выказваў негатыўна-радыкальныя адносіны да царкоўнай уніі, карыстаўся падтрымкай мяшчан і казацтва, адмоўна ставіўся да дзейнасці П. Магілы. Займаў прамаскоўскую пазіцыю, неаднаразова атрымліваў ад Маскоўскага патрыярха Філарэта дапамогу. Найбольш вядомая праца: “Алфавит духовный, в ползу иноком и мирским, богоугодне жити хотящим, написанный” – збор маральных павучэнняў. | 19, 77 |
| **Капысценскі Захарыя** (каля 1590 – 1627), багаслоў, мовазнаўца (лаціна, грэчаская, польская мовы), выкладчык у Кіеўскай брацкай школе, архімандрыт Кіева-Пячорскай лаўры (1624–1627). | Аўтар багаслоўскіх трактатаў: “Книга о вере единственной” (1619–1621), “Книга о правдивом единстве православных християн” (1623), прадмовы да “Беседы Иоанна Златоуста на Послания апостола Павла” (1623), “Номоканон”, некалькіх казанняў (“На честном погребе блаж. мужа и превелебнаго отца Елисея.” Найбольш вядомы як аўтар палемічнага трактата “Палінодыя.” | 9, 27, 35, 57, 59, 60, 71, 91, 92, 121, 125, 139, 143 |
| **Капысценскі Міхаіл**, Перамышльскі праваслаўны епіскап Кіеўскай мітраполіі (1591–1610 ). | Далучыўся да праваслаўных іерархаў пры абмеркаванні пытання Артыкулаў уніі, падпісаў Дэкларацыю, накіраваную каралю і ў Рым у 1595 г. Напярэдадні Берасцейскага Сабора адмовіўся зацвердзіць умовы уніі. | 33, 122, 146–149, 151 |
| **Кисель Адам** (1600–1651), прамоўца, дыпламат, мецэнат, апякун Кіева-Магілянскай калегіі, абаронца праваслаўя. | Пасол на Вальны Сейм ад Луцкай і Жытомірскай шляхты, Сенатар Рэчы Паспалітай (1641), ваявода Кіеўскі (1649), выконваў урадавыя дыпламатычныя даручэнні да Б. Хмяльніцкага і вышэйшай праваслаўнай іерархіі. | 101 |
| **Косаў Сільвестр** (каля 1600–1657), мовазнаўца, выкладчык Кіева-Магілянскай калегіі, паплечнік і пераемнік П. Магілы, праваслаўны мітрапаліт Кіеўскі (1647–1657). | Атрымаў адукацыю ў Віленскай акадэміі і Люблінскім езуіцкім калегіуме. Епіскап Мсціслаўскі, Аршанскі, Магілёўскі (1634–1647), мітрапаліт Кіеўскі (1647–1657), аўтар вядомых твораў “Exegesis” (1635), “Patericon” (1635), “Дідаскалии, альбо науки о седми сакраментах, альбо тайнах” (1637). | 3, 9, 22, 24, 25, 27, 77, 81, 86–90, 99, 127, 181, |

МГПУ им. И.П. Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| | Выступаў за захаванне юрысдыкцыі Канстанцінопальскага патрыярха. | 186 |
| **Корсак Рафаіл** (1595–1640), уніяцкі епіскап Галіцкі (1626–1632), Турава-Пінскі (1632–637), уніяцкі мітрапаліт Кіеўскі (1637–1640) | Вывучаў багаслоўе ў Празе і Рыме. Архімандрыт Віленкага Троіцкага манастыра, прыхільнік рэформаў уніяцкай царквы і паплечнік І. Вельяміна Руцкага, уступіў у Базыльянскі ордэн, імкнуўся да прымірэння ўніятаў і праваслаўных, утварэння адзінага патрыярхату. З гэтай мэтай паехаў у Рым, там памёр. | 26, 52, 62 |
| **М. Кромер** (1512–?), епіскап Вармінскі, “Аб паходжанні і дзеяннях палякаў”, XXX кніг,1555 г. | Твор уяўляў сістэматызаваны гістарычны нарыс падзей да 1506 г., у ім выкарыстаны больш за 100 дакументаў, таксама самай старой польскай хронікі Гала Аноніма. | 57, 108–110 |
| **Крэўза Леў**, доктар багаслоўя, архімандрыт Свята-Троіцкага манастыра ў Вільні (1617–1625), Смаленскі ўніяцкі архіепіскап (1625–1639). | Паплечнік уніяцкага мітрапаліта І. Вельяміна Руцкага. Аўтар палемічнага твора “Абарона царкоўнай еднасці, або доказы, якія сведчаць, чаму грэчаская царква павінна быць аб’яднана з лацінскай” (1617, Вільня), больш вядомага як “Оборона унии”, выдадзенага ў 1878 г. Археаграфічнай камісіяй. | 68, 93 |
| **Кунцэвіч Іясафат** (1580–1623), прапаведнік, архімандрыт Жыровіцкага, затым Віленскага Троіцкага манастыра, Полацкі ўніяцкі архіепіскап (1618–1623). | Актыўна пашыраў уніяцтва, асабліва ў Вільні (перажыў замах на жыццё), яго прымусовыя дзеянні выклікалі паўстанне ў Магілёве (1618) і Віцебску (1623), падчас якога был закатаваны. Лічыцца святым мучанікам каталіцкай і грэка-каталіцкай царквы. | 60, 93, 119, 121, 122, 126, 127, 132, 155, 158 |
| **Лозка Стэфан**, маршалак Мазырскі, пачатак XVII ст. | Меў уладанні ў Кіеве, яго другая жонка ў 1615 г. Лізавета падаравала частку маёмасці Кіеўскаму Багаяўленскаму манастыру, на якім была заснавана брацкая школа. | 21 |
| **Лукарыс Кірыл** (1572–1638), Александрыйскі (1602–1621), Канстанцінопальскі патрыярх (1621–1638). | Экзарх Канстанцінопальскага патрыярха ў Кіеўскай мітраполіі (1597–1601), надаў некаторым брацтвам статус стаўрапігіі (Луцкае), яму пісаў М. Сматрыцкі пра жаданне аб’яднаць хрысціянскія канфесіі. | 24, 151, 152 |
| **Любамірскі Станіслаў** (1583–1649), магнат Рэчы Паспалітай, вайсковец, муж апошняй з роду князёў Астрожскіх Сафіі. | Кракаўскі ваявода, Пераможца ў бітве пад Хоцінам (1621) з туркамі. Фундатар некалькіх касцёлаў і школ, крэпасцей. Яму як каталіцкаму мецэнату і апякуну езуітаў прысвечана Прадмова палемічнай працы “Перспектыва” К. Саковіча. | 55 |
| **Ляшчынскі Станіслаў**, кароль Рэчы Паспалітай (1704–1709; 1733–1734). | У Паўночнай вайне (1700–1721) выступаў на баку шведскага караля Карла XII, супраць яго другога панавання выступілі гайдамакі (надворнае казацтва), закліканыя рускімі ўладамі. | 16 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| **Магіла Пётр** (1596–1647), царкоўны дзеяч, прадстаўнік умерана-кампраміснага накірунку праваслаўя, архімандрыт Кіева-Пячорскай лаўры, Экзарх Канстанцінопальскага патрыярха, мітрапаліт Кіеўскі (1632–1647). З часу яго выбрання афіцыйна ўзноўлена праваслаўная іерархія. | Заснавальнік Кіева-Магілянскага калегіума пасля злучэння школ у Лаўры з брацкай. Пад яго кіраўніцтвам распрацоўваўся і ўдасканальваўся літургічны і багаслоўскі змест набажэнстваў (выдадзены “Евангелие Учительное”, Катэхізіс (вызначэнне дагматаў і канонаў веры), “Требник” (малітваслоў), праводзілася рэфармаванне ўнутранай структуры царквы і рэгламентацыя паводзін святароў у розных абставінах. Вядомы палемічны твор “Ліфас, або камень”, напісаны ў адказ К. Саковічу на польскай мове, дзе тлумачацца ці адвяргаюцца ўсе крытычныя заўвагі аўтара. | 3, 22, 23, 35, 41, 51, 55, 60, 61, 77–84, 86, 87, 90,93, 99, 113, 118. 121, 123, 125. 126, 182, |
| **Мазепа Іван** (1639–1709), гетман Войска Запарожскага Левабярэжнай і Правабярэжнай Украіны, імкнуўся да захавання незалежнасці Гетманату, садзейнічаў эканамічнаму і культурнаму развіццю, атрымаў адукацыю ў Кіева-Магілянскім і Варшаўскім езуіцкім калегіумах, ведаў польскую, лацінскую, нямецкую, італьянскую, французскую мовы, мецэнат (заснаваў цэрквы ў Харкаве, Сумах, Пуціўлі, новы мураваны корпус Кіева-Магілянскай акадэміі.). | У выніку змовы супраць гетмана Левабярэжжа І. Самайловіча ў 1687 г. атрымаў гетманскую булаву, заключыў дамову з Рускай дзяржавай (захоўвалася адміністрацыйная аўтаномія, забаранялася ўмешвацца ў расійска-польскія адносіны). Удзельнічаў у паспяховых ваенных дзеяннях на Правабярэжжы супраць туркаў (паводле Бахчысарайскага мірнага дагавору 1681 г. адыходзіла Асманам), у паходах расійскага князя Галіцына на Крым, азоўскіх паходах Пятра І. Жадаў далучыць да Гетманату Правабярэжную Украіну, казацкія занялі ў 1702–1704 гг. большую частку Правабярэжжа, наказны (прызначаны) гетман Самусь перадаў яму гетманскую булаву і каралеўскі ўніверсал (1704). У Паўночнай вайне паміж Расіяй і Швецыяй быў саюзнікам цара, у 1709 г. перайшоў на бок шведскага караля Карла XII з мэтай захаваць самастойнасць Гетманату (Пётр І планаваў значна абмежаваць казацкую аўтаномію). | 107, 109, 110, 113, 178, 184 |
| **Мацейка Ян** (1838–1893), польскі мастак, найбольш вядомыя яго творы гістарычнага жанру. | Карціны “Грунвальдская бітва”, “Касцюшка пад Рацлавіцамі”, “Прамова Скаргі” і “Рэйтан на сойме 1173 г.” і інш. Апошнія дзве атрымалі Залатую ўзнагароду на выставе ў Парыжы ў 1865 і 1866 гг. | 42 |
| **Міхненка**, казацкі палкоўнік, атрад якога быў накіраваны Б. Хмяльніцкім на паўднёва-ўсходнюю Беларусь летам 1648 г. | Заняў г. Мазыр, які ўтрымліваў да пачатку лютага 1648, быў пакараны смерцю пасля захопу горада войскам гетмана Рэчы Паспалітай Януша Радзівіла. Мазырскі замак і гарадскія ўмацаванні спалены. | 12–13 |
| **Нячай Іван** (? – пасля 1669), паходзіў з | Кіраваў казацкімі палкамі ў Беларусі (1655–1659) падчас вайны Рэчы Паспалітай з | 13, 106 |



МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| беларускай шляхты, беларускі палкоўнік казацкіх палкоў Б. Хмяльніцкага (1656). | Рускай дзяржавай (1654–1667), перайшоў на бок Рэчы Паспалітай (1658), захоплены ў палон і сасланы ў Сібір, верагодна, у 1669 г вярнуўся ў Рэч Паспалітую. | |
| **Палій Сямён** (1640-я–1710) стваральнік казацкіх палкоў на Правабярэжжы паводле "прыпаведных лістоў" Яна Сабескага 1684 г. аб стварэнні наказнога казацтва, казацкі палкоўнік. | Паспяхова ваяваў супраць туркаў. Узняў паўстанне супраць Рэчы Паспалітай пасля соймавай пастановы 1699 г. аб скасаванні казацтва, звярнуўся да І. Мазепы з прапановай аб'яднаць Гетманат. Каб не дзяліць уладу, па загадзе Мазепы арыштаваны і высланы ў Расію, рэабілітаваны пасля "здрады" Мазепы, удзельнічаў у Палтаўскай бітве (1709) са шведамі. | 15 |
| **Пацей Іпацій** (1541–1613) багаслоў, пісьменнік-палеміст, праваслаўны епіскап Уладзімірскі і Берасцейскі (1593–1599), уніяцкі мітрапаліт Кіеўскі (1599–1613). | Адзін з ініцыятараў і стваральнікаў Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г., перажыў замах на жыццё. Аўтар трактатаў у абарону уніі: "Уния, альбо Выклад преднейших артикулов к зъодноченью Греков с костелом Римским належащих" "Гармония, альбо Согласие веры, сакраментов и церемоний святыя Восточныя Церкви с костелом Римским", "Антиррисис" і інш. | 9, 31, 32, 34, 40, 43–47, 61, 70,93, 101, 121, 122, 126, 127, 131, 136, 143, 146–149, 166, 184 |
| **Пегас Мялецій**, патрыярх Александрыйскі (1590–1601). Негатыўна ставіўся да Берасцейскай уніі. | Заклікаў да захавання праваслаўных традыцый, захавалася шмат яго лістоў да караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы, рускага цара, князёў Астрожскага, Вішнявецкага, брацтваў. | 152 |
| **Рагоза Міхаіл**, праваслаўны мітрапаліт Кіеўскі, Галіцкі і ўсея Русі (1589–1596), першы ўніяцкі мітрапаліт (1596–1599). | Незадаволены умяшаннем брацтваў ва ўнутраныя справы царквы далучыўся да ініцыятараў уніі, падпісаў "Артыкулы уніі" ў 1595 г., удзельнічаў у Берасцейскім уніяцкім саборы. | 33, 70, 72, 146, 151 |
| **Радзівіл Януш** (1612–1655), магнат, кальвініст, вайсковец, удзельнічаў у Смаленскай вайне (1632–1634), гетман польны літоўскі (1648–1654), ваявода Віленскі, вялікі гетман літоўскі (1654–1655), прыхільнік захавання самастойнасці ВКЛ. | Паспяхова ваяваў з казакамі Б. Хмяльніцкага на Беларусі ў 1649 г. Арганізаваў контрнаступ войскаў Рэчы Паспалітай у 1654 – пачатку 1655 г. супраць рускіх войскаў, які акупавалі Вільню і значную частку Беларусі. Пасля няўдалых дзеянняў у маі–чэрвені 1654 г. заключыў Кейданскую дамову (унію) са Швецыяй аб саюзе. Супраць выступілі Сапегі. У канцы снежня 1655 г. нечакана памёр. | 13, 14, 38 |
| **Ракушка-Раманоўскі Раман** (1623–1703), казацкі сотнік, наказны нежынскі палкоўнік | Верагодны аўтар "Летапісу Самавідца", генеральны падскарбій ўрада гетмана І. Брухавецкага, выконваў дыпламатычныя даручэнні, святар Стара-Мікольскай царквы ў Старадубе. | 105, 106 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| **Руцкі Вельямін Іосіф** (1574–1637), багаслоў, уніяцкі мітрапаліт Кіеўскі (1613–1637). | Вядомы як рэфарматар уніяцкай царквы (рэарганізаваў Базыльянскі ордэн, стварыў сістэму адукацыі і кнігавыдавецтва), быў ініцыятарам стварэння Патрыярхату, актыўна ўдзельнічаў у рэлігійнай палеміцы. | 9, 25, 34, 46–48, 64–67, 93, 122, 126, 127, 143 |
| **Сабескі Ян**, кароль Рэчы Паспалітай (1674 –1696), перамог у бітве пад Венай (1683) над Асманамі, праводзіў палітыку дзяржаўнай падтрымкі ўніяцтва. | Забаранялася праваслаўным падтрымліваць зносіны з Канстанцінопальскай патрыяр-хіяй, святарам выязджаць без дазволу, брацтвы падпарадкоўваліся мясцовым іерархам (1676). Дазвол фарміраваць казац-кія палкі на Правабярэжжы (1684) для барацьбы з туркамі. | 16 |
| **Саковіч Касіян (Каліст)** (каля 1580–1647 гг.), рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай, паэт, пісьменнік, палеміст, педагог, аўтар некалькіх філасофскіх трактатаў. | Рэктар брацкай школы Кіеўскага Багаяўленскага манастыра (1620–1624), чытаў курсы філасофіі, сцвярджаў неабходнасць адукацыі духоўным і свецкім асобам, ігумен уніяцкага манастыра (прыняў уніяцтва пасля 1625 г.), у 1640 г. перайшоў у каталіцтва. Найбольш вядомы палемічны твор "Перспектыва" (крытыкаваў заганы ўніятаў і праваслаўных). | 3, 9, 21, 35, 41, 48–56. 66, 81, 83–85, 90, 181 |
| **Сангушка Адам Аляксандр** (1590–1653), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай. | Каштэлян (камандуючы войскамі замка), староста (намеснік у павеце), ваявода Падольскі, затым Валынскі, мецэнат (заснаваў некалькі касцёлаў, шпіталь). Адзін з ініцыятараў стварэння аўтакефальнай уніяцкай царквы і аб'яднання праваслаўных і ўніятаў. | 17, 25, 62 |
| **Сафановіч Феадосій** (пачатак XVII ст. – пасля 1674), царкоўны дзеяч, мовазнаўца, пісьменнік, прытрымліваўся прамаскоўскай арыентацыі, але лаяльна ставіўся да ўрада Рэчы Паспалітай і Гетманату. | Выкладчык Кіева-Магілянскай калегіі, пазней рэктар (1653–1655). Быў запрошаны ў 1649 г. рускім царом ў Маскву для перакладу Бібліі з грэчаскай мовы. Ігумен Міхайлаўскага Залатаверхага манастыра ў Кіеве (з 1655 г.) Аўтар адной з першых абагульняльных гістарычных прац "Хроніка з летапісцаў старадаўніх", выдадзенай у пячорскай друкарні (1674). | 3, 96–100, 102, 103, 113 |
| **Скарга Пётр** (1536–1612), багаслоў, езуіт, прамоўца, пісьменнік, першы рэктар Віленскай езуіцкай Акадэміі (1579). | У працы "Аб еднасці царквы" (1577) абгрунтаваў ідэю царкоўнай еднасці (уніі) з тэалагічных, гістарычных, культурных, палітычных пазіцый. Удзельнічаў у Берасцейскім уніяцкім саборы 1596 г. | 9, 33, 34, 40, 42 – 44, 56. 58, 63, 89, 93, 121, 143, 151. 165 |
| **Скумін-Тышкевіч Фёдар** (1538–1618), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, дыпламат, мецэнат. | Займаў адну з першых пасад у дзяржаве – вялікага падскарбія літоўскага (1586–1590), ваявода Навагрудскі (1590–1618 ). Спачатку як праваслаўны магнат выступаў супраць заключэння царкоўнай уніі 1596 г., затым | 33, 139, 146 |

МГПУ имени И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| | прыняў уніяцтва. | |
| **Сматрыцкі Герасім** (?–1594), праваслаўны багаслоў, пісьменнік, педагог, бацька Мялеція Сматрыцкага. | Выкладчык і першы рэктар Астрожскай акадэміі, аўтар палемічнага твора “Ключ царства нябеснага” (1587), выдадзенага у Астрозе, выступаў супраць увядзення грыгарыянскага календара і папскай улады як апостальскай. | 57, 58 |
| **Сматрыцкі Мялецій** (1572?–1633), мовазнаўца і педагог, перакладчык, другі рэктар Кіеўскай брацкай школы, пісьменнік-палеміст, багаслоў, полацкі архіепіскап (не зацвержаны уладамі). | Атрымаў еўрапейскую адукацыю. Аўтар **“**Грамматіки славенскія правилноє синтаґма”(асноўны падручнік па царкоўна-славянскай мове да пачатку XIX ст.), аўтар многіх палемічных твораў супраць уніятаў. Пасля падарожжа ў Егіпет, Палесціну і Канстанцінопаль схіліўся да уніі. Напрыканцы жыцця архімандрыт уніяцкага Дзерманскага манастыра (на Валыні). | 3,9, 12, 19, 20, 24, 25, 27, 35, 41, 47, 48, 57, 61–70, 78, 81, 90, 92, 119, 121, 125, 138, 166, 168 |
| **Солтык Каэтан Ігнацый** (1715–1788), каталіцкі біскуп Кіеўскі (1756–1759), Кракаўскі (1759–1788). | Вядомы як праціўнік вырашэння дысідэнцкага пытання (праваслаўных і пратэстантаў) на Вальных соймах, выступіў супраць прапановы Расіі ураўнаваць іх у правах з каталікамі. Разам з аднадумцамі быў арыштаваны расійскім паслом Рэпніным, вызвалены ў 1773 г. | 156 |
| **Стрыйкоўскі Мацей** (1547 – пасля 1588), ксёндз, паэт, пісьменнік, пачынальнік гістарыяграфіі ВКЛ. | Валодаў лацінай,польскай, рускай нямецкай мовамі, аўтар першай гістарычнай працы “Хроніка Польская, Литовская, Жмудзская і ўсёй Русі”, выдадзенай ў 1582 г. на польскай мове, удзельнічаў у Лівонскай вайне. | 57, 86, 97, 98, 108 – 110, 176 |
| **Сялява Анастасій** (1583–1655), уніяцкі епіскап, затым мітрапаліт Кіеўскі (1641–1655). | Пісьменнік-палеміст, протаархімандрыт Базыльянскага ордэна. Супернічаў з Сільвестрам Косавым (праваслаўным епіскапам, затым мітрапалітам) за пашырэнне ўплыву. | 9, 34, 65, 68, 127 |
| **Тарлецкі Кірыл** (1540-е – 1607), епіскап Луцкі і Астрожскі (1585–1607). | Разам з І. Пацем быў ініцыятарам стварэння Берасцейскай уніі 1596 г., прысутнічаў у Рыме на цырымоніі зацвярджэння уніі ў канцы снежня 1595 г. і Берасцейскім уніяцкім саборы ў кастрычніку 1596 г. | 30–32, 40, 70, 72, 119, 145–149 |
| **Транквіліён-Стаўравецкі Кірыл** (1570–1646), праваслаўны багаслоў, філосаф, выкладчык, паэт і пісьменнік, прыняў ўнію пасля 1626 г. | Аўтар трактатаў “Евангелле навучальнае” (1619) на царкоўнаславянскай мове (артадаксальнае духавенства у ВКЛ і Маскве асудзілі твор), “Люстра Багаслоўя” (1618) і “Перла шматкаштоўнае” (1646) на старабеларускай мове, філасофска-публіцыстычных і вершаваных твораў, павучанняў. | 41, 57, 66, 90, 179 |
| **Трызна Іосіф** (?–1655), рэлігійны дзеяч, | Выступаў за захаванне самастойнасці Кіеўскай мітраполіі (юрысдыкцыю | 3, 62, 77, 81, 88– |

МГПУ им. И.П. Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| паплечнік П. Магілы і С. Косава, архімандрыт Віленскага манастыра Святога Духа (1640–1647), Кіева-Пячорскай лаўры (1647–1655). | Канстанцінопальскага патрыярха), аўтар прадмовы для “Служэбніка” (1653), падрыхтаваў да выдання аўтарскую рэдакцыю “Кіева-Пячорскага патэрыка” (жыцій святых Лаўры) (1661 г.), уключыў гістарычныя звесткі, некаторыя – ўпершыню (заснаванне Тураўскай епархіі 1005 г.). | 90, 100 |
| **Тур Нічыпар**, архімандрыт Кіева-Пячорскай лаўры (1593–1599), негатыўна ставіўся да стварэння уніяцтва. | Удзельнічаў у Берасцейскім праваслаўным саборы 1596 г., не дазволіў передаць манастырскую маёмасць уніятам пры дапамозе мясцовага насельніцтва і ўзброеных манахаў. | 30, 32, 33, 131, 150, 151 |
| **Ужэвіч Іван**, вывучаў тэалогію ў Сарбонне (Парыжскім універсітэце) з 1637 г. Аўтар “Граматыкі славянскай”, выдадзенай у Парыжы ў 1643 г. | Першая граматыка літаратурнай мовы, утрымлівае формы паўднёва-заходніх гаворак украінскай мовы і фанетычная асаблівасці беларускай мовы, напісаная кірыліцай, але тлумачэнні выкладзены лацінскай мовай. Захоўваецца ў Францыі. | 27 |
| **Феафан**, Іерусалімскі патрыярх (1608–1644), вёў барацьбу з папскім прастолам за Галгофу, правёў інтранізацыю Маскоўскага патрыярха Філарэта (бацькі першага цара з дынастыі Раманавых). | Падчас вяртання з Масквы на Блізкі Усход, пасля інтранізацыі Маскоўскага патрыярха Філарэта, у 1620 г. узнавіў у Рэчы Паспалітай праваслаўную іерархію (пасвяціў у сан Кіеўскага мітрапаліта і епіскапаў без згоды караля) пры падтрымцы казацтва, быў абвінавачаны ў шпіёнскай дзейнасці на карысць рускай дзяржавы і Асманскай імперыі, арыштаваны, здолеў збегчы. | 19, 20, 30, 47, 64, 66, 80, 99, 122, 158, 180 |
| **Філіповіч Афанасій** (1595?–1648), царкоўны дзеяч, ігумен Брэсцкі, праваслаўны святы. | Праціўнік царкоўнай уніі, аўтар твора “Дыярыуш”, крытыкаў палітыку урада Рэчы Паспалітай, займаў прамаскоўскую пазіцыю, абвінавачаны ў сувязі з казакамі (чэрвень 1648 г.), закатаваны ў маі 1649 г. | 3, 9, 27, 35, 70–76, 90, 121, 125, 126 |
| **Хрыстафор Філалет** (Праўдалюбец), сапраўднае імя Марцін Бранеўскі (каля 1565–1624), багаслоў, пратэстант, філосаф. | Вядомы як аўтар палемічнага твора “Апокрысіс”, выдадзенага на польскай мове (1597) і старабеларускай (1598), аднаго з першых найбольш абгрунтаваных твораў супраць улады каталіцкай царквы і пашырэння уніі | 34,45,58, 91, 125 |
| **Хмяльніцкі Багдан** (1595–1657), гетман войска Запарожскага, кіраўнік паўстанне супраць Рэчы Паспалітай (1648–1654). Стваральнік казацкай аўтаноміі – Гетманату. | Служыў у войску рэестравых казакоў, уцёк ў Запарожскую Сеч, імкнуўся да стварэння уласнай дзяржавы, у якую разлічваў уключыць паўднёва-ўсходнія землі Беларусі, падчас Пераяслаўскай рады (1654) абвешчаны саюз Левабярэжнай Украіны і Рускай дзяржавы. Каб захаваць самастойнасць Гетманату спрабаваў, дамовіцца з каралём Рэчы Паспалітай, | 12–14, 29, 31, 38, 96, 99, 104–110, 177, 181, 184 186 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | |
|---|---|---|
| | каралём Швецыі, князем Трансільваніі. | |
| **Хмяльніцкі Юрый** (1641–1685), сын Б. Хмяльніцкага, гетман войска Запарожскага (1659–1660). Прыхільнік самастойнаці Гетманату, аб чым спрабаваў дамавіцца з Рускай дзяржавай, Рэччу Паспалітай, Асманскай імперыяй. Пакараны асманскімі уладамі ў 1685 г. | 1559 г. – дамова з рускім царом (Пераяслаўская рада – II, звужала аўтаномію да адміністрацыйнай), 1660 г. – дамова з каралём Рэчы Паспалітай (Слабодадзішчанскі трактат аб прызнанні ўлады караля) і падзел Украіны (Левабярэжжа не прызнала). 1660–1662 гг. – спробы далучыць да Правабярэжжа Запрожскую Сеч, 1663 г. – адмова ад гетманства і манашаскі пострыг, трапіў у польскі палон. 1668 г. – падтрымаў П. Дарашэнку і Ханенку. Пасля пашырэння пратэктарату Асманаў на Правабярэжжы ў “пачэсным турэцкім палоне” (1672–1676). 1676–1681 гг. – гетман правабярэжнай Украіны з тытулам украінскі князь (у васальнай залежнасці ад турэцкага султана, да 1683 г. гетманства перададзена малдаўскаму князю). | 99, 108 – 110, 177 |

МГПУ им. И.П.Шамякина

## ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК

Антановіч У.Б. 4, 10, 15, 16, 31, 130–135, 140, 159.
Аскачэнскі В. 114, 115, 117
Баброўскі П. 115
Балхавіцінаў Я. 100, 113, 115
Бантыш-Каменскі М.М. 114–115, 170
Булгакаў Макарый 83, 85, 118, 173
Бушковіч П. 103, 170
Васіленка, Н.П. 19, 170
Возняк, М. 81, 170
Воўк-Карачэўскі В.В. 15, 16, 170
Гарабец В.М. 13
Грушэўскі М.С. 4, 10, 140–142, 144–150, 171
Гумілёўскі Філарэт 113, 175
Голубеў С.Т. 49, 50, 52–54,85,113, 118, 171
Дзмітрыеў М.В. 103, 171
Доўнар- Запольскі М.В. 159. 171
Жыленка І. В. 100, 103, 171
Жуковіч П. 118, 171–172
Забароўскі, Л.В. 36–39, 172
Ігнаценка А.П. 15, 16, 18, 19,36, 172
Ігнатоўскі Ус. М. 10, 154, 155–157, 172
Ісаевіч Я. 20, 172
Кавальскі М.П. 36, 172
Калакура Я.С. 141, 172
Кастамараў М.І. 53, 76, 172
Карташоў А.В. 84, 172
Каяловіч М.О. 4, 26, 93, 102, 115, 116. 117, 172
Кіпрыяновіч Р. Я. 4, 115, 121–130, 173
Коршунаў А.Ф. 75, 170, 173
Крылоўскі А. 20, 21, 23, 173
Крып'якевіч І.П. 103, 173
Лабынцаў Ю. 88, 173
Лапо-Данілеўскі А. 32, 101, 150, 173
Ластоўскі В. 10, 93, 153–155, 173
Лявіцкі А. І. 10, 31,104–108,135–140, 165, 170, 173
Лісейчыкаў Д. В. 26, 173
Луцэнка Ю. 108, 173
Майхровіч С.К 27, 58, 173
Манькоўскі В.К. 21, 82, 83, 175
Марозава С. 93, 173
Марчанка М. 109, 110. 173
Медынскі Е.Н. 23, 174
Мыцык Ю.А. 102, 103, 174
Нарбут Т. 115, 175
Нічык В.М. 6о, 174
Падокшын С. А. 22, 40, 75, 174
Палуцкая С. 93, 174
Пештыч С.Л. 102, 174
Пічэта У.І. 153, 156, 158, 159, 174
Плохій С.М. 39, 93, 174
Саверчанка І. 87, 164
Сагановіч Г. 93
Смолій В.А. 13, 174
Старасценка В.У. 24, 77, 93, 174
Сцяпанаў Д. 103, 104, 174
Турчыновіч І.В. 4, 63, 115, 119–120, 170, 174
Улашчык М.М. 36, 174
Чыстовіч І. 118, 175
Харламповіч К. 82, 118, 175
Хіжняк, З.І. 21, 82, 83, 175
Цяплова В.А. 112, 175
Шаўчук В.О. 109, 110, 163, 175
Шаўчэнка І. 57, 79, 80, 175
Шчавінская, Л. 88, 173
Ярашэвіч Я. 115
Яромін Е.П. 102, 175

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Навуковае выданне*

**Барсук** Алена Яўгеньеўна

БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННІ
Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ:
ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

Манаграфія

Карэктар *Л. В. Жураўская*
Арыгінал-макета *А. В. Ліс*

Падпісана ў друк 10.11.2017. Фармат 60x90 1/8. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Рызаграфія. Ум. Друк.арк. 11,04. Ул-выд. арк. 11,30.
Тыраж 100 экз. Заказ № 276к.

Установа адукацыі «Мазырскі дзяржаўны
Педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/306 ад 22 красавіка 2014 г.
Вул. Студэнцкая, 28, 247777, Мазыр, Гомельская вобл.
Тел. (0236) 32-46-29

Установа адукацыі «Беларускі гандлёва-
эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».
ЛП № 023301464 ад 27.03.2014 г.
Прасп. Кастрычніка, 50,246029, г. Гомель.
Тел. (0232) 40-17-41

МГПУ им. И.П.Шамякина